ARCHE Зьмест № 6’06

1. Зьмест / Уводзіны
2. ARCHE :: Галоўная
3. Насустрач газаваму крызісу. Круглы стол у рэдакцыі «ARCHE».
4. Юры Чавусаў. Здані і надзеі Кастрычніцкай плошчы.
5. Аляксандр Матыль. Газавая атака на дэмакратыю.
6. Дзяніс Мельянцоў. Заходняе вымярэнне беларускага пытання.
7. Алесь Пашкевіч. Цаглінка ў даволі саліднай гістарыяграфіі.
8. Уладзімер Мацкевіч. Людзі і манэкены.
9. Пётра Рудкоўскі. «Мяне няма»: роздум інквізытара на руінах Акудовіча – II.
10. Кшыштаф Касажэцкі. Кампанія 1660 году ў Літве.
11. Ніна Здановіч. Віртуальны Полацак.
12. Віктар Леаненя. Сялянскі кантынэнт.
13. Міхась Баўтовіч. Горад сэрца.
14. Алесь Анціпенка
15. Падлейшых часоў, бадай, не бывае. Гутарка зь пісьменьнікам Сяргеем Астраўцом.
16. Алесь Шатэрнік. Сонцакрыж. Паэтычны дзёньнік.
17. Anatol Sidarevič. Hulni maryjanetak.
18. Павал Абрамовіч. Глыток вады з крыніцы.

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 6 (46) - 2006**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам Форум

[image]

6[image]-[image]**2006**

аналітыка • крытыка • гісторыя • эсэістыка • літаратура • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

[image]

З ь м е с т

C o n t e n t s

АНАЛІТЫКА

НАСУСТРАЧ ГАЗАВАМУ КРЫЗІСУ Круглы стол у рэдакцыі «ARCHE»
ЮРЫ ЧАВУСАЎ Здані і надзеі Кастрычніцкай плошчы

КРЫТЫКА

АЛЯКСАНДАР МАТЫЛЬ Газавая атака на дэмакратыю
ДЗЯНІС МЕЛЬЯНЦОЎ Заходняе вымярэньне беларускага пытаньня
АЛЕСЬ ПАШКЕВІЧ Цаглінка ў даволі саліднай гістарыяграфіі
УЛАДЗІМЕР МАЦКЕВІЧ Людзі і манэкены
ПЁТРА РУДКОЎСКІ «Мяне няма»: роздум інквізытара на руінах Акудовіча – II

ГІСТОРЫЯ

КШЫШТАФ КАСАЖЭЦКІ Кампанія 1660 году ў Літве

ЭСЭІСТЫКА

НІНА ЗДАНОВІЧ Віртуальны Полацак
ВІКТАР ЛЕАНЕНЯ Сялянскі кантынэнт (нататкі былога вяскоўца)
МІХАСЬ БАЎТОВІЧ Горад сэрца

ЛІТАРАТУРА

АЛЕСЬ АНЦІПЕНКА Лірыка
Падлейшых часоў, бадай, не бывае. Гутарка зь пісьменьнікам СЯРГЕЕМ АСТРАЎЦОМ
АЛЕСЬ ШАТЭРНІК Сонцакрыж. Паэтычны дзёньнік

РЭЦЭНЗІІ

ANATOL SIDAREVIČ Hulni maryjanetak
ПАВАЛ АБРАМОВІЧ Глыток вады з крыніцы

[image]
[image]

№ 6 (46) - 2006
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю, Майстраваньне **[mk]**, Абнаўленьне **[czyk]**
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/08/06
[image]

Powered by phpBB © 2001, 2005 phpBB Group

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 6 (46) - 2006**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам Форум

[image]

[image]2006

Інстытуту

[image] [image] [image]

Насустрач газаваму крызісу

Круглы стол у рэдакцыі «ARCHE»

У круглым стале, які адбыўся 2 чэрвеня, узялі ўдзел галоўны рэдактар інтэрнэт-сайту «Наше мнение» **Сяргей Панькоўскі**, старшыня назіральнай рады Інстытуту прыватызацыі і мэнэджмэнту **Павал Данейка**, галоўны рэдактар газэты «Наша Ніва» **Андрэй Дынько**, палітычны тэхноляг **Аляксандар Фядута**, дырэктар сацыямэтрычнай лябараторыі «Новак» **Андрэй Вардамацкі** і галоўны рэдактар «ARCHE» **Валер Булгакаў**.

Андрэй Дынько: Я б папрасіў сп. Вардамацкага вельмі агульна акрэсьліць, якімі тэндэнцыямі характарызавалася разьвіцьцё беларускай грамадзкай думкі з 2001 г. да 2006 г. Ці можна з гэтага вывесьці, як яны будуць разгортвацца да 2011 г.?

Андрэй Вардамацкі: Калі казаць у тэрмінах колькасных, то насамрэч зьменаў не адбылося. У чыста колькасным сэнсе зьменаў аб’ёму пратэставага электарату (называйце яго як хочаце) няма. Ёсьць адкрышталізаваны электарат Лукашэнкі і адкрышталізаваны пратэставы электарат. Уся дынаміка разгортвалася ня ў колькасных, працэнтавых адносінах. Ні ў воднай з абазначаных катэгорыяў колькасных зьменаў не адбылося – адбыліся якасныя зьмены. І базавай зьменай можна назваць узмацненьне энэргетыкі меншыні, якое выявілася на

Плошчы і пасьля Плошчы і выяўляецца цяпер.

Адносна таго, якія зьмены адбываюцца цяпер: мне здаецца, самай важнай зьменай ёсьць зьяўленьне новых актараў. Я маю на ўвазе зьяўленьне вялікай колькасьці новых людзей, здольных сваімі паводзінамі выказаць сваю палітычную пазыцыю.

Але гэта цягне за сабой істотныя палітычныя арганізацыйныя наступствы. Калі абазначыць у выглядзе круга ўсё поле беларускай апазыцыі, то раней новапрыбылыя займалі невялікі сэгмэнт, а ў асноўным гэта была так званая арганізаваная апазыцыя. Цяпер сэгмэнт новапрыбылых усё больш і больш павялічваецца.

І тут будзе адбывацца адна з самых істотных драмаў – калі ня самая важная! Калі яны ня знойдуць паразуменьня між сабой, узьнікне сумятня – гэта адзін варыянт падзеяў. Другі варыянт падзеяў: ньюкамэры цалкам становяцца дамінантай. І мы бачым ужо шмат прыкладаў гэтага. Трэці варыянт – кумулятыўны эфэкт: калі яны знаходзяць паміж сабой вельмі добрыя варыянты ўзаемадзеяньня, то выйдзе спалучэньне энэргетыкі ньюкамэраў з досьведам нашых традыцыйных палітыкаў.

Галоўнае пытаньне, якое павінна так ці іначай вырашыць цяпер «топавая» апазыцыя, гэта пытаньне пра стратэгію. На каго арыентавацца: на электаральную большыню ці на актыўную меншыню? Тут цяпер разгортваецца тэарэтычная драма: ёсьць аргумэнты на карысьць аднаго і другога. Асабіста я прыхільнік другой канцэпцыі – актыўнай меншыні, бо электаральнай большыні ў праціўнікаў Лукашэнкі ў Рэспубліцы Беларусі ня будзе ніколі. Дзеля мэдыйнай сытуацыі, дзеля асаблівасьцяў нацыянальнага характару, дзеля эканамічнай сытуацыі й г. д. У сэнсе зьменаў гэтая большыня не адыграе ніякае ролі.

Сяргей Панькоўскі: Ня варта забываць, што прынцып большыні і прынцып выбару ёсьць элемэнтамі дэмакратычнай сыстэмы. Беларуская сыстэма не дэмакратычная, а аўтарытарная: яна ў прынцыпе не арыентуецца на выяўленьне думак і рэалізацыю волі народу як канстытуцыйнага прынцыпу.

Бессэнсоўна было б пытацца, ці падтрымлівае бальшыня Івана Жахлівага. Які быў рэйтынг Сталіна? У Беларусі мы сёньня маем рэжым, які, па-першае, у прынцыпе не разьлічаны на зьмяняльнасьць палітычнага кіраўніцтва (акрамя тых выпадкаў, калі яно само будзе прымаць рашэньне пра ўласную зьмену). Па-другое, ён не разьлічаны на тое, каб кіравацца вольна выяўленай думкай насельніцтва. Таму я, як і А. Вардамацкі, прыхільнік прынцыпу «актыўнай меншыні», бо, на мой погляд, ува ўмовах аўтарытарызму звычайныя дэмакратычныя прынцыпы не працуюць паводле вызначэньня.

Валер Булгакаў: Хацелася б сфакусавацца на больш пякучых пытаньнях. У мяне ёсьць прасьцюткая антрапаморфная тэорыя: Беларусь пры Лукашэнку, як і пры Машэраву й іншых кіраўніках, была «прадажнай дзеўкай», якая прадавала Расеі свой гонар. Гэты «гонар» складаўся зь яе этнічнай своеасаблівасьці – мовы, культуры, аўтэнтычных традыцыяў і г. д. Расейская імпэрыя заўсёды заахвочвала асыміляцыю, і акурат гэтай тэндэнцыяй былі выкліканыя беспрэцэдэнтныя інвэстыцыі ў беларускую прамысловасьць пачынаючы з канца Другой сусьветнай вайны. Японскі палітоляг Кімітака Мацузата пісаў, што нібыта савецкае кіраўніцтва столькі інвэставала ў Беларусь пасьля 1945 г. таму, што тут загінуў кожны трэці. Але насамрэч падзеі Другой сусьветнай вайны проста паказалі, што беларусы значна больш, як украінцы ці прыбалты, захоўваюць ляяльнасьць імпэрскай мэтраполіі. Каб нарасьціць яе і прадухіліць магчымасьць ператварэньня беларусаў у нацыю, імпэрыя кінула яшчэ большыя сілы. Лёгіка савецкага капіталу была такая ж, як у заходняга: і першы, і другі імкнуліся ў зону «павышанай інстытуцыйнай стабільнасьці».

З гэтага пункту гледжаньня, апошнія газавыя інцыятывы кіраўніцтва Расеі паказваюць, што там пачалі ўсьведамляць, што Беларусі ўжо няма чаго прадаваць у сымбалічным пляне. Беларусы сталі амаль такія самыя, як і расейцы, таму рэсурс «продажу гонару» практычна скончаны. Калі гэтая лёгіка слушная, то нас непазьбежна чакае сур'ёзнае павышэньне цэнаў на газ.

Павал Данейка: Аўтарытарны рэжым – гэта зусім ня тое, што

таталітарны. Таталітарныя маюць большую ўстойлівасьць, але яны ўсё адно маюць свой цыкль жыцьця. Аўтарытарныя маюць меншую ўстойлівасьць і таксама маюць свой цыкль жыцьця. Яны ператвараюцца ў дэмакратычныя і наадварот – мы гэта бачылі. Таталітарны зазвычай даўжэйшы за цыкль жыцьця чалавека, бо цыкль жыцьця ідэі большы за цыкль жыцьця харызмы.

Калі паглядзець на аўтарытарныя рэжымы, то яны па-рознаму зьмяняліся. Недзе, дзе не было ўнутранага напружаньня й існавала магутная вонкавая падтрымка, яны існавалі да сьмерці кіраўніка, недзе – раней сканчаліся. Але галоўнае, што цыкль жыцьця ідэі даўжэйшы за цыкль жыцьця харызмы.

Наконт расейскага фактару. Я думаю, што ён увогуле ніякага ўплыву ня мае на тое, што адбываецца тут. Па вялікім рахунку, Расея рэальна ня мае ніякай замежнай палітыкі: апошнім часам гэтая замежная палітыка замяняецца замежнай палітыкай «Газпрому». І гэта вялікі крок наперад, бо зьяўляюцца хаця б нейкія рацыянальныя асновы замежнай палітыкі – хай сабе прымітыўныя, але яны дазваляюць весьці з Расеяй дыялёг. І мы бачым, што спробы Расеі, якія яна рабіла, выкарыстоўваючы вонкавыя інструмэнты, весьці замежную палітыку ў дачыненьні да Польшчы, Прыбалтыкі, Украіны, нічым ня скончыліся. Былі ўва ўсіх часовыя непрыемнасьці, але вынікаў ніякіх! Таму, мне падаецца, вельмі перабольшваюцца ўвесь час у аналізе беларускай сытуацыі магчымасьці Расеі.

Але газавая праблема – цяпер у зусім іншым кантэксьце. Як я сказаў, замежная палітыка Расеі на сёньня – гэта вонкавыя інтарэсы «Газпрому». Тэмп капіталізацыі «Газпрому» ёсьць асновай замежнай палітыкі Расеі. Таму няма ніякіх сумневаў, што газ будзе прадавацца для Беларусі дорага. І няма ніякіх сумневаў, што ў бліжэйшыя гады ён будзе дарагім і ў Расеі. 300 млрд USD капіталізацыі – гэта не мяжа. Ёсьць куды расьці, і ў некаторых людзей у Расеі ёсьць мара стаць першай кампаніяй па капіталізацыі ў сьвеце. Гэта сур'ёзная мара, вакол якой ідзе ажыятажнае абмеркаваньне.

Што гэта азначае для Беларусі? Па вялікім рахунку, нічога! Цана ў 100 даляраў за 1000 кубамэтраў ня зробіць якога-

небудзь істотнага ўплыву на разьвіцьцё эканомікі. Ну, магчыма, нейкае скарачэньне тэмпаў росту, пэўныя цяжкасьці ў пэўных прадпрыемстваў. Але беларуская эканоміка мае зусім іншую структуру, чым, напрыклад, украінская, для якой павышэньне цэнаў на газ – цяжкая хвароба. У сабекошце асноўных украінскіх прадуктаў на замежным рынку газ займае значную частку, у Беларусі такіх прадпрыемстваў – па пальцах адной рукі пералічыць можна: фаянсава-шкляныя, «Азот» і яшчэ некалькі. Гэта невялікі сэгмэнт беларускай эканомікі. Астатнія прадпрыемствы атрымаюць вельмі апасродкаванае ўзрастаньне выдаткаў. Ясна, што калі ў нас у 2 разы узрастае цана на газ, а яна складае 50 % у электрычнасьці, то цана электрычнасьці ўжо не вырастае ў 2 разы. А цана электрычнасьці ў сабекошце прадукцыі, напрыклад, 10 % – адпаведна, у канчатковым росьце цэнаў на прадукцыю мы атрымліваем зусім прымальны працэнт, які можа быць элімінаваны актыўнымі дзеяньнямі па разьвіцьці бізнэсу.

Пры гэтым «труба», якой дамагаецца Расея, аддадзеная ня будзе. Гэта вельмі моцнае рашэньне: Беларусь, маючы «трубу», заўжды будзе мець інструмэнт для абмежаваньня росту цаны на газ. Ува Ўкраіне як была прапорцыя кошту газу і кошту транзыту, які забясьпечваў нейкі аб'ём газу бясплатна, так яна і засталася! У Беларусі тое самае адбудзецца. У нас ёсьць, напрыклад, 25 % газу, які мы атрымліваем за транзыт; падымецца цана на газ – падымецца і цана на транзыт, і тыя ж 25 % газу застануцца. Гэтая зброя насамрэч дастаткова абмежаваная.

Валер Булгакаў: Але калі павышэньне адбудзецца, гэта стане шокам для ідэалягічнай ідэнтычнасьці рэжыму.

Павал Данейка: Я б хацеў пагадзіцца. Уся цяперашняя ідэалёгія тлумачыць: «Паглядзіце, як ім кепска, гэтым прыбалтам і ўсім астатнім сьмельчакам, якія рызыкнулі пайсьці ўва ўласнае плаваньне. Ім увесь час закручваюць гайкі, і таму яны кепска жывуць». Але калі нам падымуць цану, тады ўзьнікае пытаньне: а за што мы ўвесь гэты час, як сказаў Булгакаў, «Расеі гонар аддавалі»? Атрымліваецца, за проста так? І гэта будзе шокам.

Аляксандар Фядута: Я ня згодны з тым, што будзе шок. Асновы цяперашняй дзяржаўнай прапаганды будуюцца не на тым, што курс правільны, а – прэзыдэнт правільны (як пішацца вось у нумары «ARCHE», дзе аналізуецца часопіс «Планета»). Ён знаходзіць адзіна правільныя рашэньні. Цэнтральнай фігурай застаецца асоба «ўлюбёнага кіраўніка», і кіраўнік падрыхтаваў грамадзкую думку да таго, што Расея – сволач і ўсё, што яна будзе нам прапаноўваць, няправільна. Ён абсалютна спакойна здольны вадзіць сваю частку электарату 40 гадоў па пустэльні.

Дзяржаўная ідэалягічная машына камэнтуе асноўныя тэзісы кіраўніка дзяржавы. Найбольш яскрава гэта відаць па герархіі выступоўцаў: чым больш блізкая да прэзыдэнта фігура выступае, тым больш яна абмежаваная ў выбары сродкаў і тым больш дакладна цытуе. І так далей, аж да спадара Зімоўскага ці хто там яшчэ (я не гляджу беларускай тэлевізіі), якія ўжо забаўляюцца напоўніцу, але – зноў жа! – у рамках пастуляту, выказанага Аляксандрам Рыгоравічам.

Расея ні на што не ўплывае. Гэта вельмі заўважна па Ўкраіне. Пазыцыя Расеі прывяла да проста супрацьлеглага выбару ў 2004 г. – на цяперашніх парлямэнцкіх выбарах яе было не відаць і не чуваць: Паўлоўскі, які прывёз цэлую каманду на праграму Савіка Шустэра, ціха скрыгатаў зубамі, бачачы, як украінскія палітыкі ўва аўдыторыі пасьмейваліся з усяе гэтае кляўнады. І гэтаксама на наступны дзень сьмяяўся Кіеў: «Жырыноўскага бачыў? – Бачыў. Дурань!» Пасьля таго, як асабісты рэсурс Пуціна быў выкарыстаны на марна ўва Ўкраіне, ён ня будзе запатрабаваны і ў Беларусі. Нейкая частка насельніцтва нэрвова адрэагуе на напружаныя адносіны паміж двума прэзыдэнтамі, але іншых фігураў, здольных хаця б крыху ўплываць на сытуацыю ў Беларусі, у Расеі ў запасе ўжо не засталося.

Андрэй Вардамацкі: Насамрэч вельмі тонкі дэтэрмінантны слой, які нешта вызначае. Прапаганда (і адпаведныя камэнтары) працуе тады, калі гэта трапляе на падрыхтаваную глебу і на інфармацыйную патрэбу. І якімі б ні былі блізкімі і як бы дакладна ні цытавалі кіраўніка ўсе наступныя ступені герархіі, які б ні быў асабісты рэсурс, якія б перадачы ні

рабіліся, усё ж адбудзецца эфэкт, які я называю «18 %». Самы нізкі за ўсю гісторыю рэйтынг у Лукашэнкі быў у позьнюю восень 2001 г. Гэта адбылося тады, калі файна працавала тэлевізія, радыё і г. д. Проста адбылося павелічэньне цэнаў на камунальнае абслугоўваньне. І тут базавае эканамічнае пытаньне палягае ў наступным: ці вытрымае гэта эканоміка Беларусі?

Я не эканаміст, але я ведаю іншыя пункты гледжаньня, якія зь вельмі вялікай колькасьцю аргумэнтаў кажуць, што ня вытрымае. У Расеі няма ніякіх магчымасьцяў уплываць на Беларусь. Але газ дае магчымасьць ажыцьцяўляць сацыяльныя праграмы, трымаць такую колькасьць людзей у форме, такую колькасьць ідэолягаў... Рэальнага ўзьдзеяньня гэтай цэнавай газпромаўскай пазыцыі ня ведае ніхто! Невядома, ударыць гэтае павышэньне па Беларусі ці ня ўдарыць.

Аляксандар Фядута: Пасьля таго моманту, калі Расея адпусьціць цэны на газ (раней я гэта зьвязваў з уступленьнем Расеі ў СГА, бо тады ў яе зьяўляецца нагода), плюс год і яшчэ паўгоду – і мы ляжым.

Андрэй Вардамацкі: Падтрыманьне эканамічнага дабрабыту бяз газавай падачкі азначае пераход на зусім іншыя спосабы мэнэджмэнту эканомікі: разьвіцьцё малога і сярэдняга бізнэсу, пераход на новыя тэхналёгіі ў 6–7 базавых экспартаўтваральных прадпрыемствах і эканамічную свабоду. Гэта пацягне за сабой такі вал агульных сацыяльных наступстваў, які прывядзе да зьменаў.

Сяргей Панькоўскі: Я таксама лічу, што расейскі істэблішмэнт ня мае ніякіх інструмэнтаў простага палітычнага ўплыву на Лукашэнку. Але Расея, прынамсі да апошняга дня, была важнай складовай часткай ідэалягічнага поля, выбудаванага вакол беларускага прэзыдэнта як геапалітычны аргумэнт.

Ці прывядзе павышэньне цэнаў да пагаршэньня эканамічнай сытуацыі? Мы ведаем, што таталітарныя і аўтарытарныя рэжымы цудоўна існуюць у бедных краінах. Я лічу, што менавіта павышэньне ўзроўню жыцьця, эканамічны дабрабыт ёсьць важнымі фактарамі дэмакратычных пераменаў. Я ня

думаю, што зьніжэньне ўзроўню жыцьця ў Беларусі выкліча дэмакратычную рэакцыю ў адказ. Яно можа выклікаць рэакцыю, зьвязаную зь незадавальненьнем канкрэтным лідэрам. Але рэжым, які можа прыйсьці ў выніку яе, не абавязкова будзе дэмакратычны.

Якраз павышэньне ўзроўню жыцьця ёсьць фактарам дэмакратызацыі, бо яно вядзе да павышэньня ўзроўню патрэбаў, у тым ліку палітычных.

Андрэй Вардамацкі: Ёсьць адна з базавых пазыцыяў канцэпцыі свабоды: пры задавальненьні патрэбаў ніжняга ўзроўню абвастраюцца патрэбы вышэйшага ўзроўню. І задавальненьне матэрыяльных патрэбаў цягне за сабой абвастрэньне патрэбаў, зьвязаных з інфармацыяй, духоўнай сфэрай, самарэалізацыяй, эстэтычныя патрэбы. Таму і ў выпадку падзеньня матэрыяльнага становішча сацыяльнае напружаньне будзе ўзрастаць, і ў выпадку матэрыяльнага росту ў цяперашніх інфармацыйных структурах сацыяльнае напружаньне будзе таксама ўзрастаць. Вось у чым палягае парадокс. Эканамічныя варыянты сцэнароў разьвіцьця вядуць да аднаго выніку.

Павал Данейка: Наконт эканомік. Усе гэтыя размовы, што Расея ёсьць спонсарам Беларусі, пустыя. Пытаньні балянсу – невідавочныя, бо Беларусь таксама ёсьць спонсарам Расеі. Ёсьць іншыя рэчы, якія мы ствараем для расейскай эканомікі і якія дазваляюць там зарабляць грошы. Ніхто не спрабаваў падлічыць агульны балянс. Акрамя Лукашэнкі, які заяўляў, што ня ўсё так проста, што ня толькі нас фундуюць, але і мы фундуем. І ён мае рацыю! Беларуская эканоміка і палітыка (у тым ліку ваенная) ствараюць масу прэфэрэнцыяў і магчымасьцяў для расейскай. Так што балянс магчымы. Ён можа быць адмоўны, але гэта не выглядае дужа катастрафічна.

Зь іншага боку, газ – важная рэч, але галоўнае для беларускай эканомікі – гэта нафта. На сёньняшні дзень цэны на нафту вызначаюць дынаміку разьвіцьця беларускай эканомікі. У мінулым годзе адбылося ператварэньне Эўразьвязу ў першага экспартнага партнэра Беларусі – гэта сьведчыць пра кардынальныя зьмены ў структуры беларускай эканомікі. У мінулым годзе на Заходнюю Эўропу, на ЭЗ прыпадала 45 %

беларускага экспарту, у той час як на Расею – толькі 36 %. Сытуацыя практычна перавярнулася. 5 гадоў таму было амаль 60 % на Расею, а 20 % – на ЭЗ. Зьмены кардынальныя. І ўсё гэта – праз рост цэнаў на нафту! Калі мы паглядзім дынаміку росту ВУП, то пабачым, што там цэнавы фактар на нафту ёсьць ключавым. Калі мы паглядзім на беларускі бюджэт, то ўвядзеньне ПДВ па краіне прызначэньня і рост цэнаў на нафту ёсьць ключавымі для напаўненьня бюджэту. Таму насамрэч беларуская праблема не ў павышэньні цэнаў на энэрганосьбіты, а ў магчымым паніжэньні цэнаў на энэрганосьбіты. Падзеньне цаны на нафту стане крыніцай эканамічнага крызісу ў краіне. А гэта прывядзе да таго, што й цэны на газ пойдуць уніз, бо яны ўзаемазьвязаныя.

На гэтым фоне мы маем вельмі складаныя праблемы ў рэальным сэктары. Мы маем устойлівае (зь месяца ў месяц) падзеньне экспарту ў Расею, паступовае нарастаньне крызісных зьяваў у сэктары, які ажыцьцяўляе рэальную перапрацоўку, стварае высокую даданую вартасьць. І гэтыя праблемы зьвязаныя з тым, што расейскі рынак, на якім пераважна прадаецца гэтая прадукцыя, становіцца канкурэнтны. Каб нашыя прадпрыемствы маглі працаваць у канкурэнтным рынку, яны павінны мець адэкватныя арганізацыйныя структуры, фінансавыя мэханізмы і матывацыю ў лідэраў гэтых прадпрыемстваў. Калі гэтага няма, то яны (з рознай хуткасьцю) будуць губляць канкурэнтныя пазыцыі на расейскім рынку.

Аляксандар Фядута: Я б хацеў абмеркаваць іншы бок праблемы: якія палітычныя працэсы будуць адбывацца ў краіне? Лукашэнка разумее небясьпеку, якая яму пагражае, калі ён перастане рэальна кантраляваць эканоміку. Гэта азначае, што яму трэба будзе пазбаўляць эканамічную эліту краіны натуральнага лідэра. Сёньня буйныя бізнэсоўцы, якія ідэальна ўпісаліся ў сыстэму, успрымаюць найлепшым пераемнікам сп. Сідорскага. Калі б Аляксандар Рыгоравіч сёньня надумаў сыходзіць, яны б «скінуліся», каб забясьпечыць яму бязьбеднае існаваньне, абы пакінуў Сідорскага. Таму лёс Сідорскага будзе вартым жалю незалежна ад таго, чым скончацца перамовы пра газ. У кожным разе яны скончацца адстаўкай прэм'ера. Пытаньне ў тым, што будзе рабіць

кіраўнічы клан, які арыентуецца на Сідорскага і асацыяваўся зь імем цяперашняга пасла ў Пэкіне. Калі ў гэтых людзей хопіць сілы (бо грошай-то ў іх хопіць!) пачаць ствараць рэальную прамысловую апазыцыю і шукаць дыялёгу з апазыцыяй ідэалягічнай, гэта азначае, што ўпершыню будзе шанец падпісаць пагадненьне паміж дзьвюма элітамі краіны – інтэлектуальнай і эканамічнай. І Аляксандар Рыгоравіч атрымае насамрэч вельмі небясьпечнага суперніка. Менавіта таму ён, найхутчэй, не дапусьціць такога блёку.

Кажуць, што ўжо прынятае рашэньне ліквідаваць інстытут дарадцаў прэм'ер-міністра. То бок цяпер прэм'ер-міністра пазбавяць «чыпаў з мазгамі», якія раней яму належалі паводле пасады. Лукашэнку задаволіць любы вынік газавых перамоваў, бо ён выдатна ўпісваецца ў канцэпцыю адстаўкі прэм'ера. Здаў «Белтрансгаз» – гэта ўрад здаў «Белтрансгаз», ня здаў «Белтрансгазу» – ня можаш дамовіцца: гэта выдатная нагода памяняць прэм'ера.

Каб быў такі выбар, мусяць удзельнічаць два бакі: з аднаго боку – тая эліта, якую я называю эканамічнай, прамысловай, з другога боку – ідэалягічная. Ці будзе яна ў стане пайсьці на нейкі пэўны кансэнсус з гэтым чынавенскім кланам, прадстаўніком якога ёсьць Сідорскі? Пры гэтым здаючы сабе справу, што ў гэтым разе нас чакае як найбольш становішча малодшага партнэра.

Многія з гэтых людзей ніяк не запэцканыя рэпрэсіямі супраць апазыцыі. Але гэта не азначае, што яны нешта рабілі ня толькі для дэмакратыі, але і для культуры, што яны былі здольныя на нейкія знакавыя ўчынкі, што ў іх, нарэшце, ёсьць каму весьці гэтыя перамовы. Мы дагэтуль жывём зь імі ў дзьвюх розных дзяржавах: ня толькі пад рознымі сымбалямі, але мы рэальна нідзе не перакрыжоўваемся. Адсутнічаюць пляцоўкі, на якіх можна было б весьці дыялёг. Вялікай праблемай будзе пошук супольнай мовы. Пагатоў, яна будзе ўскладняцца праблемай пошуку супольнай мовы ўнутры самой апазыцыі: між сыстэматызаванай апазыцыяй і апазыцыяй Плошчы рэальна існуе праблема пошуку супольнай мовы. Трэба шукаць мэханізмы, пры якіх мабільнасьць і ідэалягічная

незашоранасьць новага пакаленьня, якія прыйшлі ў апазыцыю, можа быць канвэртаваная ў яго статус у агульным апазыцыйным полі.

Тут вельмі вялікае значэньне мае фігура Мілінкевіча. Ясна, што да моманту перамоваў з кіруючай сёньня намэнклятурай (я не кажу асабіста пра Лукашэнку) Мілінкевіч павінен заставацца статуснай асобай беларускай апазыцыі, бо, на жаль, нікога іншага на сёньня намэнклятура ня ведае. Было б вельмі сьмешна, калі б нехта ўзяўся весьці перамовы зь лідэрам «канапнай» партыі ў 700 чалавек, намесьнікам якога быў сп. Альфер. Ніводзін буйны чыноўнік, ніводзін рэальна буйны бізнэсовец проста ня пойдзе ў такую апазыцыю. Мілінкевіч сымбалізуе новую канфігурацыю сілаў: кантактаваць з чалавекам, зь якім кантактуюць канцлер Нямеччыны, міністар замежных справаў Францыі... Як бы я ні крытыкаваў яго за тое, што ён езьдзіць туды часьцей, чым у Слонім ці Рэчыцу, гэта да нейкай ступені павышае яго «капіталізацыю», як сказаў бы П. Данейка.

Пры гэтым трэба здаваць сабе справу, што, на жаль, Аляксандар Мілінкевіч і кожны чалавек, які мог бы стаяць на ягоным месцы, ня зможа стаць прэзыдэнтам нават на першых адносна дэмакратычных выбарах у Беларусі. Таму самае галоўнае – падпісаць саюз з той сілай, якая будзе здольная паставіць новага прэзыдэнта.

Валер Булгакаў: Гэтага моманту не было 12 гадоў, і я ня бачу найменшага шанцу, каб гэта здарылася цяпер. А што вы думаеце наконт паводзінаў Аляксандра Рыгоравіча ў дні Плошчы: у яго была разгубленасьць?

Аляксандар Фядута: Дзякуй Богу, вы не пытаецеся ў мяне, ці быў ён здаровы. Ён быў здаровы! Ён паводзіў сябе як юнак, які абдумвае быцьцё. Яго мысьленьне ўладкаванае так, што ён вырашае задачы ў меру іх паступленьня. У яго была задача «трэці тэрмін» – ён яе рашаў. Як яму здавалася, ён яе рашыў і думаў, што гэтым усё заканчваецца. І тут высьветлілася, што нічога не заканчваецца!

Ён пабачыў, што нічога ня скончылася, бо ён не рашыў супэр-

задачу. Ён аформіў юрыдычна трэці тэрмін, а што потым? Пажыцьцёвае? Сын? Лава падсудных? Лецішча ў бліжнім Падмаскоўі? Ён не рашыў галоўнай задачы – задачы ўласнай будучыні. Ён увесь гэты час думаў пра сваю будучыню. Цяпер перад ім стаіць цэлая куча пытаньняў, на якія ў яго няма адказаў.

Пытаньне «Хто вінаваты?» яго не цікавіць даўно: ён прызначае вінаватых па чарзе. А што рабіць, ён ня ведае, бо цяпер рэзка зьмянілася сытуацыя: рэзка зьмяніўся замежнапалітычны і эканамічны кантэкст. І ён дастаткова добра разумее, што гэты кантэкст будзе мяняцца. А калі кантэкст будзе мяняцца, гэта значыць, што ён, Лукашэнка, не кантралюе сытуацыю ў краіне, бо не кантралюе фактары, якія ўплываюць на сытуацыю ў краіне. Калі ён не кантралюе, то ён стараецца ў такія моманты не прымаць ніякіх рашэньняў. Пакуль у яго была магчымасьць не прымаць ніякіх рашэньняў, ён іх не прымаў.

Цяпер усё адносна ясна. Ясна, як будзе паводзіць сябе Расея, ясна, як паводзіць сябе Захад, – можна прымаць нейкія рашэньні.

Валер Булгакаў: Мы да канца не абгаварылі спэктар пытаньняў, зьвязаны з стратэгіяй А. Мілінкевіча на бліжэйшыя 5 гадоў. Калі яму не памагчы, гэты палітык будзе вымушаны ісьці ўсьляпую ў 2011 г.

Андрэй Дынько: Я б хацеў запярэчыць распаўсюджанаму меркаваньню, што на Плошчу выйшла нейкая група нікім не кіраваных людзей. Вельмі многа людзей выйшла, бо гэта было вынікам звышчалавечых намаганьняў незалежнага грамадзтва. Многія заклікалі прыйсьці на Плошчу, Мілінкевіч двойчы ў сваіх тэлевыступах і двойчы ў радыёвыступах (а таксама на кожным мітынгу) заяўляў, што 19 сакавіка трэба быць на Плошчы. Я за перадвыбарны час, напэўна, 88 разоў пачуў, што 19-га я павінен быць на Плошчы. І гэта дало свой эфэкт!

Мы на сёньня ня можам паўплываць на сыравінную каньюнктуру на рынках, ад якой, як лічаць, тут многае залежыць. Але ці ёсьць такія рэчы, на якія мы можам паўплываць?

Аляксандар Фядута: Ува ўсіх актараў дэмакратычнага сэктару палітычнага поля існуе сёньня задача. Яна палягае ў тым, каб ня даць «адматаць» назад, ня даць адысьці з тых пазыцыяў, якіх мы дасягнулі. Па-першае, ня даць затаптаць Мілінкевіча, ня даць зьнішчыць гэтую пляцоўку для вядзеньня любых перамоваў – з Захадам, з Усходам, з уласнай намэнклятурай, з шырокімі народнымі масамі, з кім заўгодна. Легітымнасьць Мілінкевіча ўнутры будзе доўжыцца яшчэ 2 гады, ён усё яшчэ будзе ўспрымацца як натуральны лідэр. Тры гады пра яго будуць памятаць, што ён нечага дамогся. Далей, калі ня будзе датэрміновых выбараў і чаго іншага, мы ўвойдзем у новы перадвыбарны цыкль. Умоўна кажучы, праз два гады трэба праводзіць Кангрэс. Мілінкевічу трэба выходзіць на яго, здаваць справы з таго, што ён зрабіў і атрымліваць мандат на наступную перадвыбарную кампанію альбо ў якасьці адзінага кандыдата, альбо ў нейкай іншай якасьці – лідэра руху, начальніка штабу... Яму неабходны новы даплыў легітымацыі.

Другі момант. Існуе новае пакаленьне, якое пакуль ня мае сваіх вагароў уплыву на сытуацыю, за выняткам флэш-мобаў і падобнага. Яны могуць праводзіць нейкія акцыі, але ў іх няма ўласнага голасу, уласнага інтэлектуальнага рэсурсу. Яны не ўпісаныя ў цяперашнюю палітычную сыстэму. Гэта азначае, што ў бліжэйшыя 2 гады шэрагу мэдыйных рэсурсаў неабходна абсалютна сьведама даваць ім слова. І таксама абсалютна сьведама частка палітычнага апазыцыйнага істэблішмэнту павінна канстытуяваць унутры сябе гэтую новую генэрацыю, прадстаўнікоў Плошчы. Я не кажу, што яны павінны саступіць ім месцы. Але калі ў палітычна-кансультацыйнай радзе сядзяць людзі, якія не рэпрэзэнтуюць нікога, і іх галасы значаць нашмат болей, чым галасы хлопцаў, якія могуць рабіць хоць нешта, гэта ўжо становіцца сьмешным.

Андрэй Вардамацкі: Ні ў якім разе не канстытуяваць унутры сябе! Каапэрацыя! Ад канстытуяваньня ўнутры адбудзецца распад арганізму.

Занатаваў Зьміцер Дзядзенка
[image]
[image]

№ 6 (46) - 2006
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне [**mk**]. Абнаўленьне [**czyk**].
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/06/17
[image]

ЮРЫ ЧАВУСАЎ

палітоляг. Падчас славутых сёлетніх падзеяў на Кастрычніцкай плошчы быў затрыманы і асуджаны на 10 сутак за дробнае хуліганства.

Юры Чавусаў

Здані і надзеі Кастрычніцкай плошчы

Ганебная капітуляцыя 2001 году чорнай плямай дыскрэдытавала беларускую апазыцыю ўсе пяць год і чорнай зданьню паўставала ў пэрспэктыве 2006 году.

Кампанія 2001 году сымбалічна скончылася, калі Валянціна Палевікова, кіраўніца штабу апазыцыйнага кандыдата Ганчарыка, папрасіла моладзь, якая захапіла будынак Белсаўпрафу, «ачысьціць памяшканьне». Фармальнае абвяшчэньне вынікаў выбараў з боку Ярмошынай ня значыла пасьля гэтага ўжо анічога. Адметнасьць беларускіх выбараў 2006 году ў тым, што момант іх рэальнага заканчэньня ня можна вызначыць дакладна.

Шмат хто з апазыцыйных актывістаў сярэдняга зьвяна былі гатовыя пайсьці хоць на што, абы не паўтарылася ганьба 2001-га. Лідэры (тыя самыя), разумелі гэта і пераконвалі адзін аднаго, што ўжо цяпер мы будзем стаяць да канца. Яны стаялі да канца і захавалі твар, але гэта не пазбаўляе ад неабходнасьці аналізу вынікаў гэтага стаяньня.

Што ж лічыць заканчэньнем выбарчай кампаніі? Палітычны сэзон пакінуў нам некалькі памятных датаў, якія можна лічыць

кропкай у выбарчай кампаніі апазыцыі. Зь іншага боку, канчатковая кропка не пастаўленая дагэтуль, вынікі не падсумаваныя, высновы ня зробленыя, старонка не перагорнутая. Канец дня галасаваньня? Паўстаньне намётавага гарадка? Альбо ягоны разгон? Сутыкненьні зь міліцыяй, абвяшчэньне пра стварэньне шырокага грамадзянскага руху і арышт кандыдата Казуліна 25 сакавіка робяць і гэтую дату адметнай. Паступовае згасаньне масавых вулічных пратэстаў? Пачатак разыходжаньняў сярод удзельнікаў кааліцыі і патрабаваньне скліканьня новага Кангрэсу дэмакратычных сілаў? Калі трэба сьвяткаваць заканчэньне выбарчай кампаніі, няясна. Ярмошына зноў апынулася пабочнай асобай. «Колькі там намалявалі? 83 адсоткі? Малавата… ну добра, перадайце салатку», – рэагавалі на ярмошынскія лічбы ўдзельнікі выбаркамаўскіх пасядзелак на выбарчых участках у ноч з 19 на 20 сакавіка.

Несумненна тое, што лукашэнкаўскі рэжым быў заклапочаны зусім не электаральнай перамогай, на якую столькі ўвагі зьвяртаў палітычны штаб апазыцыі, а ўтрыманьнем улады пасьля выбараў. Магчымую рэвалюцыю трэ было задушыць, але зрабіць гэта легітымным чынам:

Следует контролировать весь цикл продвижения кандидата, начиная с исследования электоральных настроений и заканчивая не днем выборов, а несколькими неделями после их. Необходимо не только добиться желаемого результата, но и утвердить его в общественном сознании, чтобы не осталось сомнений в легитимности президентских выборов – 2006»[1].

1

Першыя высновы, абагульненьні, задаволеныя заявы і цынічныя дамаганьні абвінавачаньні – вось чым адзначанае заканчэньне дамаганьніка «Выбары-2006: капітал на абвінавачаньнях асобных удзельнікаў кампаніі ў раскраданьні грошай[2]. Гэтым разам аналіз кампаніі ўтрымліваецца ў рамках прыстойнасьці, што дазваляе спадзявацца на ягоны рацыянальны характар і плённасьць вынікі», Але плённымі будуць толькі тыя вынікі, якія дазволяць

[1] Цыт. па: Выбары-2006: капітал на абвінавачаньнях асобных удзельнікаў кампаніі ў раскраданьні грошай. – Сьветка выбарчага штаба, 2006. – № 1. – С. 1.

выпрацаваць якасна новую стратэгію на наступны перыяд.

Месца структураў грамадзянскай супольнасьці – адзін з ключавых момантаў гэтай будучай стратэгіі дэмакратычных сілаў, вакол якога адбываецца шмат спрэчак. Прынцыповае значэньне ў гэтых дыскусіях мае апэляцыя да новых людзей – герояў Плошчы, вязьняў Акрэсьціна, удзельнікаў намётавага гарадка, флэш-мобаў і інтэрнэт-супольнасьцяў. Здаецца, няпер кожная больш-менш аўтарытэтная апазыцыйная структура мусіць мець у сваім складзе некалькіх вязьняў Акрэсьціна і як мінімум аднаго Героя Плошчы (які быццам бы каардынаваў працу намётавага гарадка). А лепей мець некалькіх Герояў Плошчы – тады можна ствараць іх аб’яднаньне, каардынаваць іх дзейнасьць, казаць пра выкарыстаньне гэтага новага рэсурсу.

Лічыцца, што новыя грамадзкія сілы, заснаваныя на самаарганізацыі, павінны вызначаць пляны апазыцыі на наступны перыяд. Эфэктнасьць флэш-мобаў, імгненных акцыяў пратэсту без аніякіх прыкметаў каардынацыйнага цэнтру дапамагла зразумець перспэктыўнасьць новых формаў грамадзкай дзейнасьці. «Самаарганізацыя» – самае модныя слова ў большасьці пасьлявыбарных аналізаў палітычнай і грамадзкай дзейнасьці. Гэтую славутую «самаарганізацыю» перацягваюць, нібы коўдру, шматлікія пасьлявыбарныя палітычныя праекты. Палітыкі з традыцыйных палітычных партыяў і з былога штабу адзінага кандыдата збольшага ставяцца да гэтага працэсу насьцярожана. Яны не крытыкуюць яго публічна, але схільныя ігнараваць новых людзей, альбо настроены проста ангажаваць іх да працы ў старых партыйных структурах.

Толькі сытуацыя шаноўнага кіраўніка штабу, колькі «рэсурсаў» было неабходна для рэалізацыі кампаніі пры адсутнасьці пляну правядзеньня кампаніі.

2

Незалежныя аналітыкі засьведчылі вялікі пазытыўны мабілізацыйны эфэкт нязгодных з афіцыйнага кандыдата, адпрацаваныя на ім арганізацыйныя падыходы, часьцей за ўсё дзякуючы

[3] «Grassroots», у тэорыі няўрадавых арганізацыяў, – створаныя на ініцыятывы зьнізу грамадзянскія структуры без пэўнай арганізацыйнай падтрымкі, часьцей за ўсё без фіксаванага

ў якасьці мэтадычнага (у дадатак да ідэалягічнага ды прапагандысцкага) матэрыялу ў органах, што займаліся вывучэньнем дасьведчаньня Лукашэнкі на трэці прэзыдэнцкі тэрмін.

Выключэньне – думка спадара Калякіна, кіраўніка штабу адзінага кандыдата: «В числе недостатков избирательной кампании, проведенной оппозицией, Сергей Калякин назвал ограниченность ресурсов, которых было в 10–15 раз меньше, чем необходимо», отсутствие единого плана проведения кампании, слабую работу креативной и пресс-групп. Кроме того, по словам политика, «все проекты по мобилизации людей оказались фикцией». «Никто реальной работы не вел, хотя и получили под это ресурсы», – заявил Калякин». «Оппозиция поставила сама себе «уд». У адказ на гэтую ўзьзу застаецца

вулічныя пратэсты («Плошча») насуперак рыторыцы палітыкаў былі непадрыхтаваныя, адсутнічаў суб’ект, які б узяў на сабе адказнасьць за гэты працэс. Усхваленьне «самаарганізацыі» дамінуе ў дыскусіях, хоць часам выказваецца скепсіс наконт устойлівасьці «самаарганізаваных» сетак і структураў, колькасьці прыцягнутых новых людзей. Аднак большасьць пагаджаецца, што фактар *grassroots*[3] стане новым штуршком для разьвіцьця беларускага грамадзянскага сэктару ў наступны пэрыяд і яго ня варта разглядаць як просты новы «прызыў-2006» у шэрагі партыяў і грамадзкіх аб’яднаньняў. Новыя грамадзянскія сілы маюць больш энэргетыкі, чым традыцыйныя партыі і НДА, дэманструюць большую гнуткасьць у стратэгіі і тактыцы. Але ж пакуль імаверных дадзеных адносна памераў самаарганізаваных, спантанных рухаў і ступені іх устойлівасьці няма.

Паказальнымі ў дачыненьні да ролі няўрадавых ініцыятываў і грамадзянскіх кампаніяў у межах выбараў былі тыя вынікі нацыянальных сацыялягічных апытаньняў. Апытаньні адлюстравалі невялікую бачнасьць праведзеных грамадзянскіх кампаніяў (гл. Табліцу 1; памылка рэпрэзэнтатыўнасьці – 3 %).

	Ці заўважылі вы дзейнасьць наступных кампаніяў? (Рэпрэзэнтатыўнае апытаньне 19–27 красавіка 2006 году)		* У якасьці камэнтара да табліцы адзначым неверагодна вялікую папулярнасьць сьціплай падказкі/ Цяжка адказаць
	Так	Не	Няма адказу/ Цяжка адказаць
Джынс-Салідарнасьць	12,0	71,9	16,1
За Беларусь — без Лукашенко	14,6	69,2	16,2
Нам лгут	5,4	76,9	17,7
Он свободен (карыкатуры)	6,6	74,7	18,7
Хопіць	9,9	72,6	17,5

* У якасьці камэнтара да табліцы адзначым неверагодна вялікую папулярнасьць сьціплай падказкі/ «За Беларусь — без Лукашенко» — гэта можа тлумачыцца толькі блытанінай у грамадзкай

Я за свабоду	10,4	72,4	17,2

Табліца 1. Бачнасьць перадвыбарных грамадзянскіх кампаній* (Belarus Brief. Civil Society Monitoring. May 17, 2006 – Bontis Foundation)

3

Малы ўплыў грамадзянскага сэктару ў Беларусі – не сакрэт. Усьведамленьне абмежаванасьці ягоных магчымасьцяў можа быць падставай для выпрацоўкі рэалістычных плянаў дзейнасьці. Аднак найбольш трывожным сыгналам у пасьлявыбарнай аналітыцы саміх няўрадавых арганізацыяў зьяўляецца брак крытычнага стаўленьня да сваёй дзейнасьці. Пры гэтым, у адрозьненьне ад папярэдніх часоў, ужо нават не прынята крытыкаваць дзейнасьці канкурэнтаў: калі паслухаць грамадзкіх актывістаў, усе грамадзянскія кампаніі былі пасьпяховыя, пастаўленыя задачы былі выкананыя. Але калі задачы былі выкананыя, а рэжым у краіне не зьмяніўся, значыць, нешта ня так было на стратэгічным узроўні.

Напэўна, своеасаблівым вынікам унутрыарганізацыйнага аналізу ўдзелу ў выбарчых дзеяньнях стаў гучны самароспуск «Зубра». Рэпрэсіі і новая грамадзка-палітычная сытуацыя вымагаюць распрацоўкі новых формаў дзейнасьці, пад якія трэба будаваць асобныя структуры, новыя структуры, не падобныя да тых, што ствараліся ў Беларусі раней.

На парадку дня стаіць стварэньне агульнанароднага дэмакратычнага руху, які будзе здольны аб'яднаць мільёны прыхільнікаў дэмакратычных зьменаў. Мы заклікаем грамадзкія дэмакратычныя ініцыятывы стаць часткай гэтага руху. У якасьці першага кроку моладзевы рух «Зубр» заяўляе аб перапыненьні дзейнасьці пад сваім брэндам і працягу супрацоўніцтва ў межах новага агульнанацыянальнага руху,

– гаворыцца ў зуброўскай заяве[4].

Аднак контуры новага агульнанацыянальнага руху застаюцца

Я за свабоду – сьвядомасьці, якая назіраем эфэкт распаўсюджанасьці пралукашэнкаўскай кампаніі «За Беларусь» (у розных варыянтах). Выклікае зьдзіўленьне таксама адносна вялікі паказчык вядомасьці зусім камэрнай кампаніі «Ідзі свабодзен».

вельмі туманныя. Заявы палітыкаў з Аб'яднаных дэмакратычных сілаў аб працягу дзейнасьці ў фармаце шырокага агульнанацыянальнага руху (альбо кампаніі) «За свабоду» пад лідэрствам Мілінкевіча сьведчаць пра прызнаньне палітыкамі той ролі, якую могуць граць грамадзянскія структуры ў палітычнай барацьбе. Аднак, пагаджаючыся з важнасьцю грамадзкай дзейнасьці, партыйныя дзеячы хочуць ізноў будаваць вэртыкальную піраміду, дзе наверсе будуць палітычныя партыі і адзіны кандыдат, пад іх кіраўніцтвам будуць працаваць няўрадавыя арганізацыі і ініцыятывы, а ў полі будуць дзейнічаць кіраваныя з цэнтру атрады грамадзкіх партызанаў. Уся гэтая сыстэма павінна абапірацца на структуру штабоў, якая склалася падчас выбарчай кампаніі. Натуральна, такая канцэпцыя (апагеем яе рэалізацыі стала скандальная абвестка пра стварэньне пры штабе Мілінкевіча «каардынацыйнага цэнтру па правядзеньні флэш-мобаў») выклікала вострую крытыку з боку грамадзкіх структураў і шараговых актывістаў, а таксама выклікала незадаволенасьць акрэсьцінцаў, удзельнікаў намётавага гарадка, флэш-мобэраў. Сілы самаарганізацыі гатовыя супрацоўнічаць з грамадзянскімі структурамі, карыстаючыся перш за ўсё іх тэхнічнай дапамогай (матэрыяльнае забесьпячэньне дзейнасьці, кансультацыі і юрыдычная дапамога, дапамога рэпрэсаваным), але зусім ня хочуць працаваць у вэртыкальна-адміністратыўнай схеме пад началам палітычнага цэнтру.

моладзевага руху «Зубр».

Працэс выпрацоўкі канцэпцыі абвешчанага палітычнымі сіламі грамадзка-палітычнага руху неапраўдана зацягнуўся. Адбілася і хісткасьць унутры самой кааліцыі, бо Аб'яднаная грамадзянская партыя яўна настроеная на перафарматаваньне ўсяго дэмакратычнага руху і рэвізію вынікаў Кангрэсу дэмакратычных сілаў: заканчэньне выбараў павінна, на іх думку, стаць заканчэньнем мандата Мілінкевіча. У падмацаваньне гэтай тэзы прыводзяцца аргумэнты з таго ж шэрагу захапленьня новымі грамадзянскімі сіламі і аргумэнты пра неабходнасьць інтэграцыі ў дэмакратычны рух гэтых сілаў, таксама як і групы былога кандыдата Казуліна. У такіх умовах кааліцыя ня здольная прыйсьці да ўнутранага пагадненьня адносна выгляду будучага палітычнага суб'екту, што робіць немагчымым фармуляваньне канкрэтнага парадку дня на

бліжэйшы пэрыяд. Максымум канкрэтыкі, які дазваляюць сабе палітыкі, – гэта ініцыяваньне шэрагу традыцыйных кампаніяў сацыяльна-эканамічнай тэматыкі і доўгае чаканьне эвэнтуальнага эканамічнага крызісу, які быццам бы адбудзецца з-за зьмяненьня замежнаэканамічнай каньюнктуры. Апазыцыйныя палітычныя структуры арыентаваныя на відавочную пасіўнасьць у будучай барацьбе, яны відавочна згубілі ініцыятыву.

У гэтых умовах паўстае шэраг пытаньняў адносна тых заяваў аб працягу працы, якія зыходзяць з палітычных партыяў. Запіс у які рух быў зьдзейсьнены падчас пратэставай акцыі 25 сакавіка? Чаму ўсе пазначаныя тэрміны для прэзэнтацыі пасьлявыбарных дзеяньняў пратэрмінаваныя? Чаму заявы розных суб'ектаў кааліцыі пра будучую стратэгію такія супярэчлівыя і неканкрэтныя?

Незадаволенасьць такім станам рэчаў паўстае і ў саміх палітычных колах: гучны розгалас атрымаў «ультыматум», высунуты шэрагам функцыянэраў Партыі БНФ на адрас старога кіраўніцтва з абвінавачаньнямі ў няздольнасьці да працягу палітычнай барацьбы, у няўменьні выкарыстаць здабытыя падчас кампаніі дасягненьні, у нежаданьні праводзіць карэгаваньне старых мэтадаў дзейнасьці[5]. Адказ з боку саміх палітыкаў зь лягеру штабу адзінага кандыдата прагучаў досыць млява і невыразна. Але і ў гэтай групы няма ніякага канкрэтнага пляну працы, іх галоўны рэсурс – тая самая незадаволенасьць і чаканьне новых лідэраў. Іх галоўны плюс – яны дэманстратыўна бяруць пад улік фактар новых сілаў самаарганізацыі і імкнуцца абаперціся на гэты новы рэсурс, хоць таксама, імаверна, перабольшваюць ягонае значэньне.

У сваю чаргу, у адрозьненьне ад палітыкаў, грамадзкія цэнтры плянаваньня згодныя прыняць існаваньне новых плыняў грамадзянскага супраціву і разглядаць новыя сілы самаарганізацыі як самастойны фэномэн. Альтэрнатыўная канцэпцыя руху прасоўваецца з боку грамадзкіх структураў, сутыкаючыся пры гэтым з супрацівам партыйных лідэраў. Згодна зь ёй, палітычныя і грамадзкія сэгмэнты і структуры павінны быць раўназначныя паводле статусу, адзінства дзеяньня

[5] Ацэнкі Міхаіла Пазьняка: «Сёньня ствараецца ўнікальная сытуацыя, калі ў краіне ня ёсьць ніводнай палітычнай партыі, якая б мела ўплыў на большасьць грамадзтва. Гэта дае нам шанец пачаць усё зь нуля, пабудаваць новую структуру, якая будзе ня толькі эфэктыўнай, але і дэмакратычнай».

павінен граць выключна ролю сымбалю, ганаровага грамадскага
які каралюе (асьвячае сваім ужо адносна высокім рэйтынгам
дэмакратычную дзейнасьць), але не кіруе, а асноўнай
дзейнасьці павінна стаць вызначэньне мэтаў дэмакратычнай
супольнасьці. У такой схеме кіраваньне атрадамі
партызанаў не ажыцьцяўляецца. Яны дзейнічаюць
згодна з публічна абвешчанай стратэгічнай мэтай.

Гэтыя дзьве канцэпцыі руху розьняцца прынцыповым чынам.
Калі першая, канцэпцыя палітыкаў, пабудаваная згодна з
прынцыпам адміністратыўнай вэртыкалі, як гэта было ў часе
выбарчай кампаніі, то другая сумяшчае ў сабе тры структурныя
адзінкі, адрозныя сыстэмай пабудовы – палітычная вэртыкаль,
грамадзянская сетка, аўтаномнае валянтэрскае поле. Першая
канцэпцыя выключае зь дзейнасьці шырокія масы пратэстоўнай,
другая – скіраваная на выкарыстаньне рэсурсу спантаннага
грамадзкага пратэсту. Фактычна, ва ўмовах пазыцыі чаканьня,
палітычнай кааліцыі і барацьбы ўнутры яе другая канцэпцыя
пачала рэалізоўвацца без удзелу палітыкаў, бо пакліканая яна
была менавіта самім жыцьцём.

4

Пакуль апазыцыя перабывае ў здранцьвеньні, лукашэнкаўская
адміністрацыя пасьпела пераацаніць працэсы, што адбыліся
падчас палітычнай кампаніі. Відавочная недаацэнка ўдзелам
пратэставага патэнцыялу ў быццам бы задаволеным
эканамічным станам грамадзтве прымушае іх зьвярнуць
пільную ўвагу на грамадзянскі супраціў. Акрамя рэпрэсійных
сродкаў, якія выкарыстоўваюцца шырока і творча, акрамя
ідэалягічнай работы, якая ператварылася ў кармушку для
«ўнутранай партыі» былых палітрукоў і навуковых камуністаў,
паўстала патрэба ў афармленьні канцэпцыі перафармаваньня
грамадзкай актыўнасьці і незадаволенасьці рэжымам у
бясьпечнае рэчышча. Першай ластаўкай у гэтым кірунку
сталася заява лукашэнкаўскага ідэоляга Пралясковіча пра
пабудову ў Беларусі карпаратыўнай дзяржавы[6]. Далей гэтая
тэза была працягнутая ў пасланьні кіраўніка дзяржавы
парлямэнту, у якім большая палова часу была прысьвечаная

грамадзкай
руху
дзейнасьці
актыўнайрызнаным
грамадзкіх
Гэтыруху,
павінен
разбудоўвацца
і накіроўвацца
ня толькі
функцыянальным,
але й
арганізацыйным
зьместам.
Нельга жыць
ад сьвяткаў
да сьвяткаў,
ад выбараў
да выбараў.
Мы хочам
падштурхнуць
лідэраў да
актыўных
дзеяньняў».
(
мы ўзяли
адказнасьць
за нашу,
мы гатовыя
узяць
адказнасьць
за краіну.
Гутарка з
кампэнсатам
наместавага
Мястэчка
Алесем
Мазурам і
яго
найлепшымі
памочнікамі.
// «Наша

пытаньням грамадзянскай супольнасьці замест звыклых праклёнаў на адрас палітычнай апазыцыі.

Рэжым бачыць, адкуль для яго зыходзіць пагроза ўнутры краіны. Бадай што ўпершыню за апошнія гады мы пачулі Лукашэнку ў абароне. Аднак ён рыхтуе контратаку. Ідэя рабіць высновы адносна таго, якая менавіта тактыка ўлетым кірунку будзе абраная. Але сарамлівыя заявы пра тое, прапрэзыдэнцкі рух альбо партыя не павінны ствараць адміністратыўным шляхам зьверху, а павінны ісьці зьнізу – найлепшы сыгнал пра тое, што ў хуткім часе такія ініцыятывы зьявяцца. Фармаваньне лукашэнкаўскай грамадзянскай супольнасьці прадугледжвае ня толькі разьвіцьцё прыдзяржаўных грамадзкіх аб'яднаньняў, але і новыя формы працы. Зразумела, у гэтым працэсе таксама шмат адміністратыўнай гульні, барацьбы інтарэсаў унутры лукашэнкаўскай каманды – шмат хто з зайздрасьцю глядзіць на гаспадарку спадароў Арды й Козіка ды хоча стварыць нейкую падобную гаспадарку для сабе. Але такія структуры, напэўна, зь цягам часу будуць адыгрываць усё большую палітычную функцыю – дастаткова прыгадаць, якую ролю падчас пратэстаў на плошчы 19–20 сакавіка выконвала сотня экіпіраваных байцоў з шэрагаў няўрадавага аб'яднаньня «Беларуская асацыяцыя вэтэранаў падразьдзяленьняў спэцыяльнага прызначэньня войскаў МУС «Гонар». Праз грамадзкія структуры рэжым можа дасягаць сваіх мэтаў, у тым ліку і мэты процідзеяньня апазыцыі. Таксама празь іншыя грамадзкія структуры рэжым будзе імкнуцца адолець пратэставыя, рэвалюцыйныя настроі, што высьпяваюць у грамадзтве.

З апошніх заяваў Лукашэнкі вынікае стратэгія барацьбы з пагрозамі для рэжыму адзінаасобнай улады. Рэжым адчувае небясьпеку не ў палітычных партыях, не ў традыцыйных структурах грамадзянскай супольнасьці і ня ў новых сілах самаарганізацыі натоўпу – галоўная сьмяротная пагроза палягае ў аб'яднаньні ўсіх гэтых рэсурсаў у межах адзінай стратэгіі, кансалідаванага пляну канкрэтных дзеяньняў, каб зьмяніць палітычны рэжым.

Ніва. 2006. № 18. 19–25 траўня)

6 Прадача Пяршая А. Ящыр рана тэлеканал БТ «Жесткий разговор», 30 студзеня 2006 г.

* * *

Беларускі дэмакратычны рух – гэта нацыянальны рух, уключаны ў сусьветны дэмакратычны працэс. Супярэчнасьці ў гэтым няма, бо інтарэсы нацыянальнага адраджэньня вымагаюць пераходу да дэмакратычнага разьвіцьця, у працэсе барацьбы з дыктатурай нараджаецца беларуская нацыя. Грамадзянская супольнасьць у гэтым кантэксьце выконвае ролю авангарду, своеасаблівага аналягу пралетарыяту.

Дзеячы структураў грамадзянскай супольнасьці былі для «каляровых рэвалюцыяў» тым, чым быў пралетарыят для рэвалюцыяў сацыялістычных. Аднак пралетарыят гэты аб'яднаны зусім не эканамічнымі фактарамі, таму і лёзунгі рэвалюцыі не павінны быць эканамічнымі, а каштоўнаснымі.

У 2006 годзе, нягледзячы на агульнае прызнаньне рэвалюцыйнай стратэгіі, палітыкі фактычна засталіся ў межах электаральнай стратэгіі. Рэвалюцыя так і ня стала рэальным пунктам парадку дня. Задача здабыцьця электаральнай бальшыні кідала партыйцаў у бок эканамічных лёзунгаў. Рэвалюцыйныя сілы грамадзянскай супольнасьці спрацавалі дарма – іхныя памкненьні аказаліся не патрэбныя палітычным сілам. Адбылося несупадзеньне паміж электаральнай тактыкай палітыкаў і рэвалюцыйнай тактыкай сілаў грамадзянскай супольнасьці.

Вынікі кампаніі-2006 захавалі гонар палітычнай апазыцыі: людзі ёй паверылі, выйшлі па яе закліку на плошчу, ахвяравалі сабой дзеля мэтаў дэмакратыі і свабоды. У гэтым сэнсе кампанія не была правальнай – дэмакраты шчыра зрабілі ўсё, што маглі. Аднак гэтага аказалася недастаткова. Мерыць дасягненьні кампаніі ў тысячах арыштаваных, дзясятках крымінальных справаў і ступені гістэрыкі рэжыму можна. Аднак для зьмяненьня сытуацыі патрэбная новая стратэгія дзейнасьці, і фармуляваць яе трэба неадкладна.
[image]
[image]

[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне [**mk**]. Абнаўленьне [**czyk**].
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2006/06/17**
[image]

АЛЯКСАНДР МАТЫЛЬ
палітоляг, намесьнік дырэктара Цэнтру вывучэньня глябальных зьменаў і адміністрацыі пры Ратгерскім унівэрсытэце. Апошняя манаграфія – «Imperial Ends: The Decay, Collapse, and Revival of Empires» (New York: Columbia University Press, 2001). Гэты тэкст быў перакладзены з кіеўскага месячніка

Аляксандр Матыль
Газавая атака на дэмакратыю

2006 год пачаўся для Украіны драматычна. Чацвёртага студзеня Кіеў і Масква падпісалі пагадненне, якое палажыла канец газаваму канфлікту паміж імі, што рабіўся ўсё вастрэйшы, і аднавіла расійскія пастаўкі газу ва Украіну і Еўропу. Літаральна праз тыдзень, дзесятага студзеня, Вярхоўная Рада пастанавіла адправіць у адстаўку ўрад Юрыя Еханурава нібыта за тое, што той пагадзіўся на нявыгадныя газавыя дамоўленасці. Віктар Юшчанка, у сваю чаргу, назваў рашэнне неканстытуцыйным і пастанавіў захаваць паўнамоцтвы цяперашняга ўраду да парламенцкіх выбараў 26 сакавіка.

ГАЗАВЫ ВЫБУХ

Скандал адносна паставак расійскага газу ва Украіну выспяваў на працягу 2005 года. Улетку 2004 года Расія, каб паўплываць шалі на карысць любага ёй кандыдата на прэзідэнцкіх выбарах ва Украіне, пагадзілася была на незвычайна нізкую цану на свой газ – 50 амерыканскіх долараў за тысячу кубаметраў. Але ў самаабвешчаную расійскую сферу ўплыву ўмяшалася дэмакратыя: Віктар Януковіч выбары прайграў, і Расія

беспаваротна страціўшы Украіну, мусіла прадаваць «Кіраўніка» шалёна нізкай цане, якую вызначала толькі для васалаў накшталт Беларусі. Не дзіва, што падкантрольны дзяржаве расійскі газавы манапаліст «Газпром» патрабаваў іх павялічыць. Не дзіва і тое, што новы ўкраінскі «аранжавы» ўрад настойваў на захаванні выгадных Украіне ўмоваў кантракту 2004 года.

У сярэдзіне снежня 2005 года, не бачачы перспектыў перагляду пагаднення, «Газпром» павысіў стаўкі і паведаміў, што, калі Украіна не прыме павелічэння цаны ў пяць разоў, «Газпром» з 1 студзеня перастане пастаўляць ёй газ. Юшчанка адмовіўся, падкрэсліўшы, што адзіным справядлівым і эканамічна бясстратным выхадам з сітуацыі з'яўляецца паступовае павелічэнне цаны на працягу некалькіх гадоў. «Газпром» праігнараваў яго аргументы і ў першы дзень новага года зменшыў, як і абяцаў, падачу газу. Зрэшты, крыкі пратэсту з нагоды нястачы газу ў Еўропе хутка прымусілі яго адступіць. А неўзабаве Кіеў і Масква паведамілі пра дагавор, які павялічваў цану газу ўдвая і павышаў плату за ўкраінскі транзіт.

Хоць спачатку пагадненне віталі як прарыў, што на пяць гадоў стабілізуе цэны на газ і плату за транзіт паміж Украінай і Расіяй, неўзабаве выявілася, што ў ім поўна дзірак.

Перш за ўсё, цяжка было знайсці рацыянальную эканамічную прычыну падключэння да пагаднення «Расукрэнерга» ў якасці адзінага пастаўшчыка газу ва Украіне і дзякуючы гэтаму пазбыцца падазрэнняў, што адзіная роль гэтай сумнеўнай кампаніі – узбагачаць карумпаваных расійскіх алігархаў. Манапольны статус падкантрольнага Расіі пастаўшчыка, як здавалася, рабіў Украіну закладніцай злачыннай схемы.

Далей тое, што спачатку рэкламавалася як пяцігадовая дамоўленасць аб пастаўках Украіне газу па цане 95 долараў за тысячу кубаметраў, аказалася паўгадавым пагадненнем. Гэта не толькі прадвяшчала аднаўленне расійска-ўкраінскай газавай спрэчкі ў чэрвені 2006 года, але і дадавала козыраў унутраным крытыкам украінскага ўраду. Як можна было, пыталіся яны, узгадняць цану на газ на паўгода, адначасова вызначаючы плату за транзіт на пяць год? Украінскі ўрад, натуральна, даводзіў, што гэтая дамоўленасць была найлепшай, на якую ён

быў здольны.

Сітуацыя пагоршылася яшчэ больш, калі 2 лютага «Нафтагаз Украіны» падпісаў дагавор з «Расукрэнерга», заснаваўшы сумеснае прадпрыемства пад назвай «Укргазэнерга». Дрэнна было ўжо тое, што ўкраінскія чыноўнікі бестурботна аб'ядналі намаганні з патэнцыяльна злачынным пачынам, але яны яшчэ і дамовіліся зрабіць «Расукрэнерга» эксклюзіўным пастаўшчыком цэнтральнаазіяцкага газу для Украіны ў цэлым і яе прамысловасці ў прыватнасці. Паколькі «Нафтагаз Украіны» цяпер атрымліваў менш выгадны спажывецкі рынак, рост яго запазычанасцяў здаваўся немінучы, як і зніжэнне здольнасці ўтрымліваць трубы, што перацінаюць тэрыторыю Украіны ўздоўж і ўпоперак. Да таго ж, быццам бы гэтага было мала, Украіна згадзілася замарозіць транзітную плату не на пяць гадоў, як прадугледжваў дагавор ад чацвёртага студзеня, а на трыццаць. Цяжка было пазбегнуць высновы, што ўкраінскія чыноўнікі – а менавіта міністр паліва і энергетыкі Іван Плачкоў ды старшыня «Нафтагазу» Аляксей Іўчанка – некампэтэнтныя ці карумпаваныя, а можа, і ўсё разам.

Пазнейшыя спробы Юшчанкі і Еханурава растлумачыць, чаму гэтае газавае пагадненне добрае або, можа, нядрэннае ці, можа, цярпімае, здаваліся ў найлепшым выпадку непераканаўчымі, а ў найгоршым – сведчылі пра разгубленасць і страту палітычнага кантролю.

АДСТАЎКА ЎРАДУ

Газавае пагадненне за 4 студзеня дало Вярхоўнай Радзе нагоду адправіць урад Еханурава ў адстаўку. Але, відавочна, гаворка тут ішла пра большае. Усе палітычныя партыі завіхаліся ў пошуках палітычнай выгады, а газавы скандал падаваў у дрэнным святле іх усіх. Юшчанку можна справядліва крытыкаваць за тое, што згадзіўся на сумнеўныя ўмовы. Цімашэнцы можна закінуць, што яна не прадбачыла будучага крызісу, калі ўзначальвала ўрад. Януковічу можна залічыць у рахунак наіўныя запэўніванні, што інтарэсы Украіны патрабуюць моцнага саюзу з Расіяй – якая ў гэтым канфлікце

так выразна прадэманстравала сваю варожасць. Адстаўка Еханурава была зручнай нагодай для Цімашэнка і Януковіча паспрабаваць перакласці ўсю віну на Юшчанку і адцягнуць увагу ад ўласных няўдач.

Яшчэ больш ускладняе сітуацыю тое, што з 1 студзеня набыло моц канстытуцыйнае пагадненне, якім Юшчанка падчас Аранжавай рэвалюцыі заплаціў за тое, каб стары рэжым змірыўся з уласным сконам. Сёй-той з украінскіх аналітыкаў перасцерагаў, што трохмесячны прамежкавы перыяд паміж увядзеннем новай канстытуцыйнай сістэмы (якая нібыта давала Вярхоўнай Радзе паўнамоцтвы адправіць урад у адстаўку, але яшчэ не ўпаўнаважвала парламент ці прэзідэнта назначаць новы) і выбарамі парламента з канстытуцыйным правам прызначаць прэм'ер-міністра прадвяшчае клопат: не зразумела, якія прэрагатывы будуць мець у гэты перыяд Вярхоўная Рада і прэзідэнт, і гэта можа спрычыніцца да напружаных адносін паміж імі. Так і сталася, і хоць эксперты ва Украіне, здаецца, згодныя з поглядамі Юшчанкі і яго прыхільнікаў у тым, што Вярхоўная Рада, адправіўшы Еханурава ў адстаўку, выйшла за межы сваіх паўнамоцтваў, дакладна гэтага не ведае ніхто. А Канстытуцыйны суд, які адзіны мог бы прыняць адносна гэтага канчатковае рашэнне, не дзейнічае, бо не сфармаваны.

Хутчэй за ўсё, пат паміж Вярхоўнай Радай і прэзідэнтам будзе захоўвацца да сакавіцкіх выбараў. Тым часам цяперашні ўрад будзе працаваць, захоўваючы поўныя паўнамоцтвы альбо выконваючы нейкую апякунскую ролю. Амаль дакладна будуць адкладзеныя ўсе вялікія палітычныя ініцыятывы, таму, напэўна, адтэрмінуецца ўступленне Украіны ў Сусветную гандлёвую арганізацыю. Зрэшты, у перадвыбарных умовах палітычная адвага ў любым разе мае дужа мала шанцаў.

Затое лепшымі, чым здаецца на першы погляд, выглядаюць шанцы ўкраінскай дэмакратыі. Тлумныя палітыкі, можа, і мала спрыяюць дэмакратычным рэформам, аднак, урэшце, дэмакратыя патрабуе менавіта тлумных палітыкаў. Прыхільнікі дэмакратыі могуць суцяшацца падабенствам Украіны да дзвюх яе суседак па Цэнтральна-Усходняй Еўропе – Чэхіі і Венгрыі,

дзе бязладдзе дэмакратычнай палітыкі практычна ніколі не заважае эфектыўнаму кіраванню. Яшчэ важнейшае тое, што, хоць першыя тры месяцы 2006 года стануць часам канстытуцыйнай разгубленасці, усе палітычныя актары ва Украіне прытрымліваюцца дэмакратычных правілаў гульні.

САКАВІЦКІЯ ВЫБАРЫ

Сёння ёсць тры асноўныя гульцы са сваімі выбарчымі блокамі: Юшчанкава «Наша Украіна», Блок Юліі Цімашэнка і Януковічавы «Рэгіёны Украіны».

(…)

Праграмна найбліжэйшымі застаюцца Юшчанка і Цімашэнка, у большай ці меншай ступені адданыя дэмакратыі, рыначнай эканоміцы і празаходняй замежнай палітыцы. Асабістыя непаразуменні і нястрымная крытыка, якую справакаваў газавы скандал, маглі перашкодзіць такому саюзу, але ў палітыцы асабістыя прыхільнасці зазвычай адступаюць перад палітычнымі інтарэсамі, так што такая развязка ўсё яшчэ вельмі імаверная. І магчыма, што гэты варыянт мае таксама больш за ўсё шанцаў застацца стабільным.

Нягледзячы на гэта, не адмаўляем і імавернасці двух іншых варыянтаў. У верасні 2005 года Юшчанка быў падпісаў замірэнне з Януковічам, каб дамагчыся ад яго фракцыі падтрымкі назначэння Еханурава прэм'ер-міністрам, потым, калі яна прагаласавала за адстаўку ўраду, адклікаў подпіс, але кааліцыя паміж імі і цяпер досыць мажлівая: зусім не відавочна, што галоўнай сілай у Партыі рэгіёнаў з'яўляецца Януковіч, а не Рынат Ахметаў, чыя прабізнэсовая арыентацыя імпліцытна накладаецца на глабалісцкія і празаходнія прыярытэты Юшчанкавага лагера. Нарэшце, магчыма таксама кааліцыя паміж Цімашэнкай і Януковічам. Гэтыя двое аб'ядналі намаганні з камуністамі, каб дамагчыся адстаўкі ўрада Еханурава, і гэтая акцыя можа азначаць гатоўнасць да супрацоўніцтва пасля выбараў.

Не зважаючы на тое, хто ў сакавіку сфармуе ўрад, цалкам

магчыма, што ён будзе недаўгавечны і гэта неўзабаве прывядзе да новых парламенцкіх выбараў. Амаль напэўна ўзнікнуць непаразуменні паміж Вярхоўнай Радай і прэзідэнтам, асабліва калі ўлічыць, што няясна сці канстытуцыйнай рэформы могуць мець зваротным эфектам узмацненне і Вярхоўнай Рады, і прэзідэнта, не даючы адназначных шляхоў да пераадолення канфліктаў. Тады ва Украіне можа пачацца перыяд зменлівых і нестабільных кааліцыйных урадаў і частых выбараў. Гэта не вельмі добра, але не абавязкова і дрэнна. Паўторныя выбары і магчымасць працаваць ва ўрадавай кааліцыі могуць мець інстытуцыйна пажаданы эфект, прымушаючы Януковіча – як і аранжавых творцаў палітыкі з залішнімі амбіцыямі – канчаткова і на практыцы ўкараніць дэмакратычныя правілы гульні.

ШТО ЎСЁ ГЭТА АЗНАЧАЕ

Пакуль на працягу наступных месяцаў будзе ўтрасацца блытаная ўнутраная палітыка Украіны, варта памятаць, што менавіта паводзіны Расіі ў газавым канфлікце, а не ўнутраная палітыка Украіны будуць мець найглыбейшыя вынікі для Украіны, Расіі і Еўропы.

Хоць «Газпром» красамоўна падкрэсліў глыбіню залежнасці ўкраінскай эканомікі ад расійскага газу, гэтая залежнасць ні для кога не навіна. Больш важна тое, што і «Газпром», і сумнеўныя ўмовы студзеньскіх і лютаўскіх пагадненняў далі зразумець, што павышэнне цэнаў на газ будзе працягвацца.

На першы погляд, гэта жахлівая вестка для Украіны. І сапраўды, у кароткатэрміновай перспектыве пастаяннае павышэнне цаны панізіць тэмпы росту ВУП і павялічыць беспрацоўе ды інфляцыю. Але сярэднетэрміновыя вынікі будуць толькі на карысць Украіны – і, магчыма, таксама Юшчанкі. Украіна транжыруць энергію ў страшэнных колькасцях – у вялікай ступені дзякуючы штучна заніжаным цэнам на газ. Нізкія цэны таксама жывяць карупцыю. Не дзіва, што найбольшае супраціўленне павышэнне цэнаў на газ сустракае з боку карумпаваных алігархаў з расійскамоўнага

ўсходняга прамысловага рэгіёну Украіны. Калі Расія і «Газпром» будуць настойваць на павышэнні цэнаў, Юшчанку, мабыць, удасца спаслацца на форс-мажор, а ўкраінскім алігархам – змірыцца і распачаць інвестыцыі ў энергазберагальныя прадпрыемствы.

Паводзіны на перагаворах Расіі таксама развеялі ілюзіі адносна яе стаўлення да Украіны. Сябар ці партнёр не пагражаў бы суседу павялічыць цану ў пяць разоў у найлюцейшыя зімовыя маразы. Па іроніі, такімі дзеяннямі Расія не толькі выбіла глебу з-пад ног Януковіча, свайго найбліжэйшага саюзніка ва Украіне, які падчас канфлікту трымаўся нязвыкла ціха; яна, магчыма, паспрыяла ўзмацненню аранжавай версіі ўкраінскай нацыянальнай ідэнтычнасці. Бо пакрыўджанымі будуць адчуваць сябе не толькі тыя, хто падтрымлівае дэмакратыю і рынак; магчыма, што сярод іх праціўнікаў многія цяпер захочуць процістаяць запалохванням Масквы, аб'яднаўшы намаганні з аранжавымі ўкраінцамі.

Тады як для Украіны ў газавай сварцы пабліскваe прамень надзеі, для Расіі і расіян яго няма. Канфлікт паказаў, што расійскія эліты бачаць сваю краіну вялікай дзяржавай, якая мае права дамагацца рэгіянальнай гегемоніі, звяртаючыся да найгрубейшых інструментаў рэальнай палітыкі XIX стагоддзя. Расійскі міністр абароны Сяргей Іваноў выказаў гэта простым тэкстам і даволі выразна ў сваім нядаўнім артыкуле «Расія мусіць быць моцнай» (Wall Street Journal, 2006. 11 January).

З гэтага пункту гледжання Расія ў газавым канфлікце дбала не столькі пра цану на газ, колькі пра імкненне да рэгіянальнага панавання. І сапраўды, Украіна сталася не адзінай ахвярай маскоўскага ўціску. «Газпром» таксама прыпыніў пастаўкі газу ў Малдову і падняў цану для Грузіі. Энергія, відавочна, зрабілася палітычнай зброяй у руках расійскага прэзідэнта, які не так даўно аплакваў падзенне Савецкага Саюза – а не, напрыклад, дзве сусветныя вайны, сталінізм ці халакост – як найвялікшую трагедыю XX стагоддзя.

ДЭМАКРАТЫЯ Ў АБМЕН НА ГАЗ

Газавае пагадненне за 4 студзеня засведчыла, што кансорцыум у складзе Пуціна, «Газпрому» і «Расукрэнерга» паспяхова навязаў Украіне свае ўмовы. Але гэта яшчэ не ўсё. Фактычна пагадненне паказала, што Расіяй кіруе дыктатар у змове з «вялікім газам» ды алігархамі і што расійская дэмакратыя мёртвая. Расія не проста паводзіць сябе як рэгіянальны хуліган, яна ператварылася ў аўтарытарную дзяржаву, эліты якой старанна культывуюць у насельніцтва гіпернацыяналістычныя настроі. Пуцін паступова дэмантаваў рыпучыя дэмакратычныя інстытуты, якія атрымаў у спадчыну ад Ельцына, заткнуў рот СМІ, устанавіў жорсткія абмежаванні для няўрадавых арганізацый ды грамадзянскай супольнасці і пашырыў дзяржаўны кантроль над важнымі галінамі эканомікі Расіі.

Тым часам Еўропу газавая спрэчка паставіла перад шэрагам нязручных рэалій, паказаўшы, што Украіна нікуды не дзенецца, а яе праблемы – асабліва ў адносінах з Расіяй – гэта адначасова і еўрапейскія праблемы. Таксама, як Аранжавая рэвалюцыя ў канцы 2004 года прадэманстравала, што Украіна мае дэмакратычныя празаходнія настроі, канфлікт 2006 года паказаў, што ў Еўропы няма іншага выбару, апроч як больш актыўна далучацца да вырашэння цяжкасцяў унутранай і асабліва замежнай палітыкі Украіны. Еўрасаюз, сцвярджае шырокае кола еўрапейскіх аналітыкаў, павінен нарэшце прызнаць неабходнасць выпрацоўкі доўгатэрміновай палітыкі ў дачыненні да Украіны, якая б адпавядала еўрапейскім каштоўнасцям і ўкраінскім жаданням.

Гэта не абавязкова азначае запрасіць Украіну далучыцца да Еўрапейскага Саюза, але гэта ўсё-такі азначае сказаць украінцам – выразна і недвухсэнсоўна: калі яны дасягнуць адпаведнасці патрабаванням членства, іх заяўку з радасцю прымуць. Такі сігнал абсалютна нічога не каштуе ЕС і адначасова падказвае ўкраінскай грамадскасці, што няспынны і працяглы дэмакратычны працэс можа ў нейкі няпэўны момант будучыні прывесці да інтэграцыі ў Еўропу.

Не менш важна тое, што газавы канфлікт паказаў: Еўропа не можа больш рабіць выгляд, нібыта Расія – лагодная дзяржава, а яе прэзідэнт, як сказаў пра Пуціна колішні нямецкі канцлер

Герхард Шродэр у разгар Аранжавай рэвалюцыі, – «бездакорны дэмакрат». Расія выразна прадэманстравала, што яе эліты не зацікаўлены інтэгравацца ў Еўропу, гуляць паводле еўрапейскіх правілаў і далучацца да еўрапейскіх каштоўнасцяў. Ніводная сучасная еўрапейская краіна не пайшла б, нават маючы фармальныя апраўданні, на тое, каб пагражаць суседу пазбаўленнем жыццёва неабходнага прыроднага рэсурсу.

Еўрапейцам цяпер давядзецца вызначыцца, як ураўнаважваць уласную адданасць правам чалавека, вяршэнству права і дэмакратыі з залежнасцю ад расійскага газу ды жаданнем жыць у згодзе з Масквой. Палітыка Еўрапейскага Саюза ў дачыненні да Украіны – краіны, якую ён лічыў за лепшае ігнараваць, пакуль Аранжавая рэвалюцыя не зрабіла гэта немагчымым, – стане выпрабаваннем здольнасці Еўропы ўзгадняць гэтыя процілеглыя прыярытэты. Цяпер ужо варта было б зразумець, што Расія аўтарытарная ў сябе дома і гегеманічная за мяжой. Таксама зразумець варта было б і тое, што Украіна дэмакратычная ў сябе дома і празаходняя за мяжой. Крытыкі ўварвання Злучаных Штатаў у Ірак ставілі пад сумненне законнасць пралівання крыві ў абмен на нафту. Наглядальнікі за эўрапейскай палітыкай могуць спытаць у сябе, ці законна ахвяраваць дэмакратыяй у абмен на газ.

[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне [mk]. Абнаўленьне [czyk].
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/07/16
[image]

ДЗЯНІС МЕЛЬЯНЦОЎ
магістар гуманітарных навук у галіне міжнародных стасункаў, навуковы супрацоўнік Цэнтру па праблемах эўрапейскай інтэграцыі пры ЭГУ, асьпірант катэдры міжнародных стасункаў БДУ.

Дзяніс Мельянцоў Заходняе вымярэнне беларускага пытання

Prospects for Democracy in Belarus / Joerg Forbrig, David R. Marples, and Pavol Demeš (eds.). - Bratislava: German Marshall Fund of US; Heinrich Böll Stiftung, 2006.

УВОДЗІНЫ

Сакавіцкія падзеі 2006 года ў Менску выклікалі шмат супярэчлівых эмоцый як унутры Беларусі, гэтак і па-за яе межамі. Для некага гэтыя выбары сталіся суцэльным расчараваннем: расчараваннем у беларускай палітычнай апазіцыі, якая не здолела скарыстаць пратэстныя настроі і арганізаваць джынсавую рэвалюцыю, расчараваннем у Захадзе, які недастаткова зрабіў для таго, каб беларуская рэвалюцыя стала рэальнасцю і адрэагаваў не зусім адэкватна на гвалтоўныя дзеянні беларускіх уладаў, расчараваннем ва ўласным народзе, які прамяняў каштоўнасці свабоды і дэмакратыі на стабільнасць і чысціню менскіх вуліц. Для іншых выбары і паслявыбарныя акцыі пратэсту сталіся аптымістычным сігналам, які недвухсэнсоўна прадэманстраваў глыбінныя змены ў свядомасці людзей і запаліў надзею на хуткія перамены. Для гэтых апошніх сакавіцкія падзеі сталіся

пачаткам своеасаблівай «рэвалюцыі духу».

Як бы там ні было, але прэзідэнцкія выбары 2006 года нікога не пакінулі абыякавымі. Яны справакавалі не толькі беспрэцэдэнтную хвалю палітызацыі насельніцтва, але і прыцягнулі ўвагу ўсёй сусветнай супольнасці да сітуацыі ў нашай краіне. Не будзе перабольшаннем сказаць, што менавіта на працягу апошніх некалькіх месяцаў Беларусь выйшла на адно з першых месцаў у міжнародным парадку дня, стала прадметам дыскусій на разнастайных прадстаўнічых форумах і асноўнай крыніцай навін для міжнародных інфармацыйных агенцтваў. Менавіта за апошнія некалькі месяцаў «беларускае пытанне» канчаткова выкрышталізавалася ў еўрапейскай і сусветнай палітыцы.

Крышталізацыя гэтага пытання, зрэшты, расцягнулася амаль на дзесяцігоддзе. За гэты час ЗША, Еўрапейскі Саюз і шматлікія міжнародныя структуры ўжывалі разнастайныя інструменты і падыходы ў мэтах уздзеяння на беларускі ўрад, каб вярнуць яго на шлях дэмакратызацыі і рынкавых рэформаў. Аднак гэтыя высілкі аказаліся марныя, і зараз Захад вымушаны мець справу з моцным і кансалідаваным палітычным рэжымам у Беларусі, які да таго ж вельмі непрыязна ставіцца да сваіх «дэмакратызатараў».

Пакідаючы праблему Беларусі на перыферыі сваёй замежнай палітыкі, заходнія лідэры тым не менш спадзяваліся на тое, што гэтае пытанне вырашыцца само сабой, калі скончыцца другі і апошні тэрмін прэзідэнцтва Аляксандра Лукашэнкі, і гэты, такі непрыемны для дэмакратычных краін, палітык вымушаны будзе сысці, адкрываючы сваім сыходам магчымасці для дэмакратызацыі Беларусі і далучэння яе да еўра-атлантычных структур. Не маючы ілюзій наконт прыроды пабудаванай у Беларусі палітычнай сістэмы, большасць заходніх аналітыкаў і палітычных дзеячаў тым не менш разлічвала на тое, што культурная і геаграфічная прыналежнасць нашай краіны да Еўропы не дазволіць спадару Лукашэнку шукаць шляхоў забеспячэння сабе пажыццёвай улады паводле прыкладу некаторых яго азіяцкіх калегаў. Аднак пасля рэферэндуму 2004 года і асабліва пасля сёлетніх выбараў

стала відавочна, што яны памыляліся ў сваіх разліках.

Прэзідэнцкія выбары – 2006, такім чынам, сталі паваротным пунктам ва ўспрыняцці заходнім светам Беларусі і беларускага рэжыму. Падзеі сакавіка гэтага года прадэманстравалі марнасць спадзяванняў на тое, што «беларускае пытанне» вырашыцца само сабою, а таксама паказалі неабходнасць правядзення больш актыўнай, а галоўнае паслядоўнай і эфектыўнай палітыкі ў дачыненні да Беларусі. Якой павінна быць гэтая палітыка, каб яна прывяла да канчатковай мэты – дэмакратызацыі Беларусі? Як збалансаваць санкцыі ў дачыненні да беларускага ўрада з праграмамі развіцця для грамадзянскай супольнасці? Якім чынам прадухіліць самаізаляцыю Беларусі? У чым прычыны неэфектыўнасці папярэдніх стратэгій? Менавіта з гэтых пытанняў складаецца «праблема Беларусі» (або «беларускае пытанне») у міжнароднай палітыцы. Адначасова гэтыя пытанні з'яўляюцца цэнтральнымі для зборніка артыкулаў «Перспектывы дэмакратыі ў Беларусі», які быў выдадзены неўзабаве пасля выбараў у Славакіі пры падтрымцы Нямецкага фонда Маршала і Фундацыі Генрыха Бёля.

1

Пры першым, хуткім праглядзе кніга пакідае ўражанне гэтакага дапаможніка па Беларусі, накіраванага на чытача, не вельмі абазнанага ў беларускай праблематыцы. Гэтае ўражанне падмацоўвае таксама і вокладка, на якой намаляваная мапа Еўропы колеру дэніма з выдзеленай белым колерам Беларуссю. Для тых, хто не надта арыентуецца ў геаграфіі. Значная частка зборніка складаецца з артыкулаў, якія падаюць факталогію падзей выбарчага перыяду, апісваюць храналогію развіцця сітуацыі ў Беларусі, даюць даведку наконт палітычных партый без аніякіх прэтэнзій на аналіз сітуацыі.

Але больш дэталёвае азнаямленне з выданнем дазваляе выявіць яго шматузроўневасць: з аднаго боку, зборнік мае на мэце пашырэнне аб'ектыўнай і нейтральнай інфармацыі пра палітычныя працэсы ў Беларусі, а з іншага – шэраг глыбокіх

аналітычных артыкулаў робяць унёсак у больш поўнае разуменне сітуцыі ў Беларусі і накіраваны на спрыянне выпрацоўцы спецыялістамі больш адэкватнай стратэгіі ў дачыненні да Беларусі. Такая шматузроўневасць дазваляе выданню прыцягнуць увагу максімальна шырокай аўдыторыі чытачоў.

Апрача ўсяго іншага, кніга яшчэ цікавая і тым, што гэта, бадай, самае першае выданне, прысвечанае апошнім прэзідэнцкім выбарам. А свежыя ўражанні заўжды самыя цікавыя, тым больш калі яны зыходзяць ад сур'ёзных аўтараў і складаюць аснову для рэагавання міжнароднай супольнасці на беларускія падзеі. Хуткасць выдання гэтай кнігі сведчыць таксама пра запатрабаванасць аналізу сітуацыі ў Беларусі з боку заходняй аўдыторыі, што, відаць, абумоўлена разуменнем неабходнасці пошуку новых падыходаў і стратэгій у дэмакратызацыі нашай краіны.

Фармальна зборнік прысвечаны перспектывам дэмакратыі ў Беларусі. Не гледзячы на гэта аўтары і ўкладальнікі не здолелі абмінуць тэмы прэзідэнцкіх выбараў і паслявыбарчых падзей, якія, відавочна, і сталі нагодай для выдання гэтай кнігі. Тэма выбараў і тэма джынсавай рэвалюцыі ў Беларусі сталі тымі чыннікамі, якія прыцягнулі міжнародны інтарэс да краіны і актывізавалі абмеркаванне «беларускага пытання» на самым высокім узроўні. Таму натуральнымі выглядаюць пошукі стратэгій дэмакратызацыі Беларусі, якія адштурхоўваюцца ад аналізу апошніх выбараў, перадвыбарнай сітуацыі ў краіне і пратэстаў у Менску, якія былі выкліканыя фальсіфікацыяй вынікаў выбараў.

Ва ўводзінах укладальнікі зборніка Ёрг Форбрыг, Дэвід Марплз і Павал Дэмеш падкрэсліваюць, што менавіта дзякуючы выбарам у сакавіку 2006 года адбыліся важныя зрухі на многіх узроўнях, якія не могуць не адбіцца на далейшых дэмакратычных пераўтварэннях.

Па-першае, апазіцыя і грамадзкія групы аказаліся здольныя зарганізаваць масавыя акцыі пратэсту, нягледзячы на прэсінг улады. Прыкметай спеласці апазіцыі можна лічыць і тое, што яна здолела аб'яднацца і правесці выбарчую кампанію, якая

зрабіла Аляксандра Мілінкевіча пазнавальным для большасці грамадзян краіны. Важным момантам стала таксама ўключэнне грамадзянскай супольнасці ў барацьбу за дэмакратыю. У выніку, сумесныя высілкі прывялі да магчымасці масавага пратэсту ў Менску.

Па-другое, рэжым Аляксандра Лукашэнкі зазнаў значную эвалюцыю, якая характарызуецца шырокім ужываннем прэвентыўных захадаў у дачыненні да апазіцыі і ўзмацненнем рэпрэсій. Аднак, паводле меркавання ўкладальнікаў зборніка, падаўленне акцыі пратэсту нельга разглядаць як сілу кіроўнай улады. Гэта, хутчэй, прыкмета нервовасці. А той факт, што рэпрэсіі закранулі не ізаляваную групу, а ўсё большую колькасна частку грамадства, дазваляе прагназаваць паступовую дэлігітымацыю рэжыму і рост недаверу да дзяржаўных сродкаў масавай інфармацыі.

Па-трэцяе, прэзідэнцкія выбары ў Беларусі і іх наступствы прыцягнулі больш сур'ёзную ўвагу з боку міжнароднай супольнасці.

Кніга адкрываецца прадмовай Аляксандра Мілінкевіча і артыкулам вядомага беларускага палітолага Віталя Сіліцкага. Абодва гэтых тэксты таксама прысвечаныя беларускай рэвалюцыі і пакліканыя ўвесці замежнага чытача ў кантэкст унутрыбеларускай сітуацыі. Будучы абсалютна рознымі паводле стылю і жанру, гэтыя тэксты падобныя сваім мэсіджам. Яго сэнс заключаецца ў тым, што пасля падзей сакавіка 2006 года Беларусь ужо не будзе такой самай, якой яна была напярэдадні выбараў, што спад грамадзянскага пратэсту нельга разглядаць як паразу джынсавай рэвалюцыі, бо гэта толькі пачатак. Пачатак «рэвалюцыі духу», якая ўрэшце прывядзе да вызвалення.

Артыкулы першай часткі кнігі далей паглыбляюць аналіз унутранай сітуацыі ў Беларусі напярэдадні выбараў. Другая частка кнігі засяроджвае ўвагу на міжнародным кантэксце беларускіх падзей, як да выбараў, гэтак і пасля іх. У трэцяй частцы змешчаны больш дэталёвы разгляд саміх прэзідэнцкіх выбараў і акцыі пратэсту, якія былі імі выкліканыя. Апошняя частка зборніка прысвечана пошуку стратэгій і падыходаў у

вырашэнні «беларускага пытання». Цэнтральным для артыкулаў гэтай часткі з'яўляецца пытанне, якім чынам Захад увогуле і Еўропа ў прыватнасці могуць эфектыўна дапамагчы зрабіць дэмакратыю ў Беларусі жыццяздольнай перспектывай.

Аўтараў кнігі і адпаведна артыкулы можна падзяліць на тры групы, зыходзячы з прафесійнай прыналежнасці аўтараў і глыбіні аналізу, пададзенага ў тэкстах. Такім чынам, першая група будзе складацца з навукоўцаў-аналітыкаў, артыкулы якіх будуць найбольш цікавыя для спецыялістаў, знаёмых з беларускай праблематыкай (ім мы надамо большую ўвагу). Да другой групы мы аднясём афіцыйных асоб і полісімэйкераў. У тэкстах гэтай групы нас больш за ўсё будзе цікавіць факталагічны бок і афіцыйная пазіцыя той інстытуцыі, якую рэпрэзентуе аўтар. Да апошняй групы належаць актывісты-інсайдэры і прадстаўнікі фондаў. Гэта група аўтараў найбольш набліжаная да палявых умоваў беларускай рэчаіснасці і таму цікавая перадусім інфармацыяй з першых рук і поглядам знутры на апісваныя падзеі, хаця, трэба прызнаць, іх тэксты часта не могуць пазбегнуць пэўнай долі перадузятасці і ангажаванасці. Таму не будзем забываць пра гэты момант падчас разгляду артыкулаў гэтай групы.

2

Да найбольш цікавых тэкстаў прафесійных палітолагаў, якіх мы аднеслі да першай групы аўтараў, варта аднесці артыкулы Віталя Сіліцкага, Робіна Шэфарда, Дзмітрыя Трэніна і Дова Лінча. Ім мы прысвецім найбольшую ўвагу.

Беларускі палітолаг Віталь Сіліцкі ў сваім артыкуле «Знакі надзеі, а не каляровая рэвалюцыя» дае вычарпальны аналіз падзей 19–25 сакавіка 2006 года ў Менску. У прынцыпе, тыя, хто набыў гэтую кнігу толькі дзеля аналізу «беларускай рэвалюцыі», могуць далей не чытаць. У артыкуле аналізуецца палітычная сітуацыя ў Беларусі і робяцца рэалістычныя і абгрунтаваныя прагнозы будучага развіцця. Галоўная ідэя, якую аўтар праводзіць праз увесь тэкст, заключаецца ў тым, што сакавіцкія акцыі пратэсту – гэта не каляровая рэвалюцыя, а

толькі пачатак «рэвалюцыі духу», якая пакладзе канец дыктатуры.

Фундаментальным фактарам, які папярэдзіў каляровую рэвалюцыю ў Беларусі, варта прызнаць тое, што Лукашэнка мог разлічваць на значную падтрымку беларусаў і выйграць выбары, нават калі б яны былі сумленныя. У паразе масавага пратэсту трэба вінаваціць перадусім не апазіцыю ці сілавыя структуры, а эканамічны рост і сацыяльную стабільнасць, якія здолела забяспечыць існая ўлада.

Беларускі выпадак нельга параўноўваць з ранейшымі каляровымі рэвалюцыямі, у прыватнасці з Памаранчавай рэвалюцыяй ва Ўкраіне. Гэта з'явы зусім рознага парадку, бо, у адрозненне ад даволі слабых палітычных рэжымаў у Грузіі і Ўкраіне, у Беларусі мы маем моцную кансалідаваную аўтакратыю, якая фармуе кардынальна адрозныя ўмовы палітычнай барацьбы. Такія маналітныя рэжымы не могуць прайграць выбары: яны звычайна заканчваюць сваё існаванне ў выніку вонкавага ўмяшальніцтва, унутранай дэзарганізацыі або смерці лідэра. Але разам з тым, рэжым адчувае і недахоп ва ўласнай легітымацыі, бо ў гэтай справе ён не можа абаперціся ні на што, акрамя выбараў. Таму палітычная апазіцыя павінна намінальна захоўвацца, каб выбары заставаліся альтэрнатыўнымі і дзейны прэзідэнт заўсёды меў апанента, якога можна перамагчы падчас выбарчай гонкі.

Нягледзячы на цяжкія ўмовы дзейнасці, апазіцыя здолела зрабіць некалькі сціплых, але важных у беларускай сітуацыі дасягненняў: яна здолела дамагчыся адзінства, а перадвыбарная кампанія скансалідавала апанентаў дзейнай улады. На выхадзе, такім чынам, апазіцыя атрымала двух лідэраў. Аднак, як справядліва зазначае спадар Сіліцкі, аб'ядноўвацца дэмакратычным сілам трэба было нашмат раней, калі ўлада была не настолькі кансалідаванай і ейная вертыкаль не ўздымалася гэтак непрыступна.

Наконт адзінства апазіцыі і кансалідацыі яе высілкаў можна, аднак, і паспрачацца. Чаго варта адна толькі сварка двух дэмакратычных кандыдатаў у разгар «Майдану». Ці варта казаць, што ніводзін палітык у цвярозым розуме не стане

публічна сварыцца са сваім калегам-лідэрам у такі адказны і пераломны момант. Калі толькі гэты палітык не пераследуе нейкую невядомую ўсім астатнім мэту. Завялікая цана кампрамісу была заплачана ў рэгіёнах, дзе пасля абрання Мілінкевіча адзіным кандыдатам у рэгіянальных штабах давялося працаваць разам былым непрымірымым супернікам, што не дадало эфектыўнасці гэтай працы.

Малалікасць «менскага Майдану» аўтар апраўдвае, галоўным чынам, цяжкімі ўмовамі для дзейнасці апанентаў Лукашэнкі: закрыццём газет, амаль татальнай блакадай Інтэрнету і мабільнай сувязі. З гэтым можна пагадзіцца толькі часткова. Насамрэч незалежная прэса ўсё яшчэ існуе (не будзем тут спрачацца наконт умоваў), карыстальнікаў Інтэрнету en masse не трэба агітаваць, і яны ведаюць, што блакаду інфармацыйных сайтаў можна проста абысці пры дапамозе ананімайзера. Мабільную сувязь, дзякуй Богу, пакуль што не адключаюць, а калі і былі 19 сакавіка часовыя цяжкасці з дазвонам, дык толькі з-за вялікай канцэнтрацыі людзей на Кастрычніцкай плошчы. Адну з прычынаў таго, што пратэсты былі дастаткова малалікія і яны не перараслі ў аналаг Памаранчавай рэвалюцыі, Віталь Сіліцкі ўжо назваў – гэта захаванне стабільнасці і падтрымка курсу ўлады значнай часткай насельніцтва. Іншая ж прычына палягае ў слабасці апазіцыі і адсутнасці ў яе плана дзейнасці ў выпадку народнага пратэсту. Пра гэта казалі потым і самі апазіцыянеры, блізкія да штаба адзінага кандыдата, і гэта таксама было бачна няўзброеным вокам увечары 19 сакавіка.

В. Сіліцкі ўпэўнены, што пратэсты – гэта нават не спроба рэвалюцыі. Як вядома, любая рэвалюцыя ўяўляе сабой сітуацыю, калі дзве палітычныя сілы або два палітыкі адначасова выстаўляюць прэтэнзіі на суверэнную ўладу над адной тэрыторыяй. У беларускім выпадку гэтага не адбылося, бо апазіцыя не дэкларавала сваёй перамогі. Гаворка ішла толькі пра лічбы, з якімі перамог Лукашэнка. Дэмакратычныя сілы падчас акцый пратэсту патрабавалі толькі перападліку галасоў ці перагаласавання, чаго было мала для мабілізацыі яе прыхільнікаў. Бо ўсім зразумела, што ўлада ад гэтага не зменіцца.

Як бы там ні было, але пратэсты аказалі пэўны ўплыў і на апазіцыю, і на грамадства. Па-першае, беспрэцэдэнтныя па сваёй масавасці рэпэсіі супраць удзельнікаў акцый пратэстаў прывялі да радыкалізацыі часткі грамадства, якая мае патэнцыял для таго, каб стаць рухавіком далейшых зменаў у краіне.

Па-другое, у выніку выбараў адбылося сталенне грамадзянскай супольнасці. Яно ў вялікай ступені ёсць адваротным бокам недастатковага прафесіяналізму палітычных лідэраў. Паколькі лідэры аказаліся негатовыя зарганізаваць і ўзначаліць акцыі пратэсту, гэтым давялося займацца грамадскім актывістам і простым грамадзянам.

Па-трэцяе, адбылася актывізацыя дэмакратычна настроеных грамадзянаў, якія знайшлі выйсце сваёй энергіі ў новых формах дзейнасці і камунікацыі з грамадскасцю. Не чакаючы распараджэння апазіцыйных структур, яны пачалі самаарганізоўвацца і праводзіць флэш-мобы і іншыя акцыі.

Па-чацвёртае, упершыню Інтэрнет стаў важным сродкам інфармавання і арганізацыі. Шмат якія ініцыятывы і ідэі ўпершыню з'яўляліся на інтэрнет-пляцоўках і потым увасабляліся ў канкрэтную дзейнасць.

Яшчэ адзін важны момант, які закранае ў сваім артыкуле Віталь Сіліцкі, – гэта сацыяльныя наступствы больш як дзесяцігадовага кіравання Аляксандра Лукашэнкі. Разглядаючы палітычную сітуацыю ў Беларусі, аглядальнікі і аналітыкі звычайна звяртаюць увагу на інстытуцыйныя фактары (такія, як выбары) і рэпрэсіўны характар палітычнай сістэмы, забываючы, аднак, пра цэлае пакаленне, якое паспела вырасці пры цяперашнім рэжыме, а таксама пра сістэму залежнасці ад дзяржавы цэлых пластоў грамадства, у тым ліку і тых, якія звычайна разглядаюцца ў якасці пра-дэмакратычных электаральных групаў.

Барацьба за дэмакратыю ў Беларусі не безнадзейная. У існых варунках Памаранчавая рэвалюцыя тут немагчымая, але загаданая раней «рэвалюцыя духу» можа даць свае вынікі.

Супрацоўнік амерыканскага Цэнтра стратэгічных і міжнародных даследаванняў Робін Шэфард (Robin Shepherd) у артыкуле «ЗША і апошняя дыктатура Еўропы» прапануе свой пункт гледжання на стратэгію Злучаных Штатаў у дачыненні да Беларусі. Ён ставіць пытанне: чаму такая адносна нязначная для ЗША ў стратэгічным і эканамічным плане краіна заняла такое высокае месца ў парадку дня цяперашняй адміністрацыі? Беларусь не ўяўляе сабой непасрэднай пагрозы для Амерыкі, і яна не была абвінавачана ў фінансаванні тэрарызму. Каб зразумець палітыку ЗША, што да Беларусі ў апошнія гады, трэба звярнуць увагу на праграму глабальнай свабоды і дэмакратыі, прэзэнтаваную прэзідэнтам Бушам падчас ягонай інаўгурацыйнай прамовы ў студзені 2005 года, і палітыку ЗША ў дачыненні да Расіі. Першая – усталёўвае шырокія тэарэтычныя межы для палітыкі ў адносінах Беларусі. Другая – дапамагае патлумачыць тыя цяжкасці, якія ўзнікаюць на шляху ператварэння тэорыі ў практыку.

Шэфард прапануе думку, што палітыка ЗША ў дачыненні да Беларусі будзе заўжды ўваходзіць у супярэчнасць з палітыкай у дачыненні да Расіі, пры тым што апошняя нашмат важнейшая для Амерыкі, чым першая. Аўтар вызначае прынамсі чатыры абсягі, у якіх важнасць Расіі для ЗША з'яўляецца выключнай. Гэта:

– абмен дадзенымі выведкі і агульнае супрацоўніцтва ў вайне з тэрарызмам;

– нераспаўсюд зброі масавага знішчэння і іншых небяспечных тэхналогій;

– пераарыентацыя паставак энерганосьбітаў далей ад Блізкага Ўсходу: Расія з'яўляецца буйнейшай крыніцай і транзітнай краінай для нафты і газу, таму яе важнасць для ЗША выключна вялікая;

– доўгатэрміновае стрымліванне Кітая.

Успрыняцце міжнародных рэалій афіцыйных асоб, якія прымаюць вонкавапалітычныя рашэнні, можа і не адпавядаць рэчаіснасці. Тым не менш такое ўспрыняцце існуе. І зыходзячы

з гэтага не цяжка ўбачыць, што Расія адыгрывае найважнейшую ролю ў шэрагу найбольш актуальных для ЗША вонкавапалітычных праблем.

У вачах Масквы Беларусь – гэта апошні саюзнік на заходнім напрамку. Пасля страты Украіны ў 2004 годзе Беларусь засталася адзінай краінай у Еўропе, праз якую падтрымліваюцца настальгічныя ілюзіі імперскай велічы Расіі. Транзіт нафты і газу таксама маюць значэнне, але рэальнае палітычнае значэнне Беларусі для Расіі заключаецца менавіта ў псіхалагічным моманце.

Для ЗША, такім чынам, Беларусь паўстае, з аднаго боку, як аб'ект прыкладання праграмы свабоды і дэмакратыі, а з другога – як фактар, які ўскладняе адносіны з Расіяй.

Дык што могуць зрабіць ЗША, каб паспрыяць зменам у Беларусі? Якую палітыку ў дачыненні да Беларусі варта ўжыць?

Такія радыкальныя захады, як вайсковая аперацыя, натуральна, не могуць сур'ёзна разглядацца, часткова з-за блізкасці краіны да Расіі, а таксама з-за таго, што рэжым Лукашэнкі, пры ўсіх яго недахопах, не з'яўляецца ваяўнічым. Беларусь не звязана з тэрарызмам ці распаўсюдам зброі масавага знішчэння, яна не ўяўляе пагрозы (і наўрад ці будзе ўяўляць) для ЗША і іх грамадзянаў. Шэфард упэўнены, што Буш вельмі хацеў бы змяніць рэжым у Менску, але Лукашэнка не разглядаецца як нешта настолькі важнае, каб надаваць яму прыярытэт сярод іншых вонкавапалітычных задач. Таму палітыка Злучаных Штатаў была скіравана на падтрымку «дэмакратычных працэсаў», а не альтэрнатыўных кандыдатаў.

Кажучы больш канкрэтна, палітыка адміністрацыі была пабудаваная вакол стварэння ўнутраных умоваў для дэмакратычных перамен шляхам улівання мільёнаў долараў у праграмы падтрымкі. У адміністрацыі ЗША саспела, урэшце, разуменне таго, што трэба арыентавацца на доўгатэрміновыя стратэгіі ў дачыненні да Беларусі, а не на «аднаразовыя акцыі» па падтрымцы апазіцыі падчас выбараў. Да 2001 года пераважаў менавіта такі падыход, калі ўся дапамога і дзейнасць, скіраваная на спрыянне дэмакратычным

пераўтварэнням, была арыентаваная на выбары і акцыі, з імі звязаныя. У той час як стратэгія беларускага прэзідэнта, пакліканая кансалідаваць ягоную ўладу ў краіне, была разлічаная зусім не на выбары, а на паступовую пакрокавую працу ў прамежках паміж імі. Такім чынам, улады былі на крок уперад дэмакратызатараў. Усвядоміўшы гэты просты факт, ЗША сталі засяроджваць сваю ўвагу на перыяд паміж выбарамі, развіццё і падтрымку грамадзянскай супольнасці і незалежных медыяў.

На думку Шэфарда, Беларусь выклікае дадатковую занепакоенасць у ЗША яшчэ і тым, што яна засталася адзінай недэмакратычнай краінай у Еўропе. Сапраўды, калі Вашынгтон не ў стане даць рады з маленькай Беларуссю Аляксандра Лукашэнкі, ці можа ісці гаворка пра паспяховую дэмакратызацыю Кітая, вялікага Сярэдняга Усходу ці нават Расіі? Што будзе далей рабіць Вашынгтон з Беларуссю?

Шэфард прагназуе, што да канца другога тэрміну Буша буйнейшыя блокі амерыканскай палітыкі наўрад ці істотна зменяцца, калі толькі ў Беларусі не адбудзецца дэмакратычнай рэвалюцыі. Нягледзячы на пахаладанне адносін з Расіяй у апошнія некалькі месяцаў, яны ўсё роўна застаюцца занадта важнымі для вонкавай палітыкі ЗША, каб рызыкаваць імі з-за Беларусі. Адзінай магчымасцю зменаў у такіх варунках можа быць трансфармацыя Масквой свайго курсу ў дачыненні да Беларусі, асабліва калі Пуцін зразумее, што Лукашэнку засталося кіраваць лічаныя дні або што занадта дорага і надалей субсідаваць свайго скандальнага саюзніка.

Урэшце, толькі самі беларусы могуць сябе вызваліць.

Шэфард лічыць, што цяжка прыдумаць, што яшчэ маглі б зрабіць Штаты для спрыяння дэмакратычным пераменам у Беларусі. На яго думку, увядзенне эканамічных санкцыяў было б добрым інструментам уплыву на афіцыйны Менск, аднак лідэры беларускай апазіцыі не пагодзяцца на такі крок. Аўтар, відаць, не дапускае думкі, што тых сумаў, якія выдаткоўвае ўрад ЗША для падтрымкі дэмакратычных сілаў у Беларусі (Шэфард прыводзіць лічбу ў 11,8 мільёнаў долараў у 2005 годзе), можа быць недастаткова для эфектыўнай працы ў тых

умовах, якія ён сам апісвае. Для параўнання: на вяшчанне на Кубу цягам бліжэйшых двух гадоў прадугледжаныя сродкі ў памеры 67 мільёнаў долараў, на глушэнне радыёстанцыі «Свабодная Азія» В'етнаму выдаткоўваецца больш за 9 мільёнаў долараў...

Палітыка Расіі ў адносінах да Беларусі больш грунтоўна разглядаецца ў артыкуле дырэктара Маскоўскага цэнтра Карнегі Дзмітрыя Трэніна. Аўтар у даволі спрошчанай форме паказвае беларускага прэзідэнта ў ролі палітычнага эквілібрыста, які здольны адшукаць выйсце з любой, нават самай складанай для сябе, сітуацыі, выйсці пераможцам з найскладанейшай вонкавапалітычнай бітвы і павярнуць на карысць сабе любое дзеянне апанента. Тым не менш, шмат якія тэзісы аўтара выглядаюць цалкам справядлівымі. Напрыклад такі, што Масква ўважае Беларусь занадта важнай для сябе, каб дазволіць сабе адкрытыя сутыкненні з Лукашэнкам. Але аргументацыя гэтага тэзісу падаецца занадта наіўнай. На думку Трэніна, расійскае кіраўніцтва баіцца, што беларускі лідэр адвярнецца ад свайго ўсходняга суседа і пачне шукаць паразуменне з Захадам, які, магчыма, даруе Лукашэнку яго грахі ў абмен на ўключэнне Беларусі ў еўраатлантычныя структуры. Аўтар забываецца, што прынцыпы Realpolitik ужо не зусім рэлевантныя сучасным міжнародным стасункам і што большасць заходніх дэмакратый у сваіх вонкавапалітычных дзеяннях кіруюцца не толькі імператывамі нацыянальных інтарэсаў, але і каштоўнасцямі, як бы банальна гэта не прагучала. Беларускі лідэр гэта таксама разумее, ці, хутчэй, інстынктыўна адчувае, і таму не спадзяецца на тое, што Захад раскрые яму насустрач свае абдымкі, нават калі ён пакаіцца ў сваіх папярэдніх памылках і адновіць дэмакратычнае кіраванне ў краіне. Некаторыя «памылкі» не даруюцца.

Паводле Трэніна, паміж 2003 і 2005 гадамі адбыліся важныя змены ва ўнутранай і вонкавай палітыцы Расійскай Федэрацыі, якія прывялі да далейшай палітычнай цэнтралізацыі і пагаршэння адносін з Захадам. У вонкавай палітыцы Расія пакінула заходнюю арбіту і прыняла рашэнне будаваць уласную «сонечную сістэму». Асабліва яскрава гэтыя амбіцыі

праявілі сябе пасля Ружовай рэвалюцыі ў Грузіі і Памаранчавай рэвалюцыі ва Ўкраіне. У такіх умовах вонкавапалітычная важнасць Беларусі для Расіі (нават калі браць адзін толькі псіхалагічны момант) павялічылася шматкроць, што не прамінуў выкарыстаць беларускі лідэр, правёўшы ўвосень 2004 года канстытуцыйны рэферэндум з мэтай падоўжыць уласныя паўнамоцтвы. І хаця першапачаткова Пуцін быў праціўнікам гэтай ідэі, яму нічога іншага не заставалася, акрамя як пагадзіцца з «волевыяўленнем» беларускага народу.

Пасля трох каляровых рэвалюцый, якія адбыліся на прасторах былога Савецкага Саюза, і пасля паўстання Супольнасці дэмакратычнага выбару (куды ўвайшлі Грузія, Украіна, Польшча і Літва) сярод расійскай кіроўнай эліты яшчэ больш пашырылася адчуванне таго, што гэтыя падзеі ёсць не чым іншым, як вынікам ужывання Захадам палітычных тэхналогій з мэтай вырваць былыя савецкія рэспублікі з расійскай сферы ўплыву. Згуляўшы на такіх ацэнках расійскіх эліт, Аляксандр Лукашэнка паказаў сябе ў якасці слабога звяна ў новым балта-чарнаморскім cordon sanitaire, якім Захад намагаецца ізаляваць Расію ад Еўропы. Ідэя палягала ў тым, што Беларусь падчас ягонага кіравання будзе выконваць ролю своеасаблівага бар'еру, які не дасць пабудаваць такі кардон. У адваротным выпадку змена рэжыму ў Беларусі прывядзе да таго, што Масква атрымае «другую Украіну».

Што датычыць выбараў 2006 года, то Масква стрымлівалася ад любых крокаў, якія маглі б пашкодзіць становішчу Лукашэнкі перад 19 сакавіка. Сюды можна аднесці і захаванне цэнаў на прыродны газ на ўзроўні 2005 года, і падтрымку беларускага прэзідэнта ў расійскіх медыях, і візіт афіцыйнай расійскай дэлегацыі напярэдані выбараў. Аднак «сакрушальная перамога» Лукашэнкі на трэціх па ліку выбарах не выклікала ў расійскага боку ні радасці, ні захаплення. Хутчэй, было пачуццё расчаравання з-за таго, што ён здолеў зрабіць гэта яшчэ раз.

Паводле меркавання Трэніна, падчас другога тэрміну Пуціна Лукашэнка здолеў значна ўзмацніць свае пазіцыі ў адносінах з Масквой. Ён вынайшаў новыя спосабы эксплуатаваць тэму расійска-беларускага саюза ў мэтах кансалідацыі ўласнага

кіраванне і папярэджанне рэальнай інтэграцыі дзвюх краін. Гэты факт моцна раздражняе Расію, і ў асяроддзі кіроўнай эліты спее пачуццё, што з Беларуссю трэба нешта рабіць.

Але аўтар тут крыху хлусіць, забыўшыся на тое, што менавіта Пуцін здолеў сарваць з Лукашэнкі маску славянскага інтэгратара і манапалізаваць інтэграцыйнае поле. Пасля заяў Пуціна пра тое, што ён згодны на поўную інтэграцыю і ўключэнне Беларусі ў склад Расійскай Федэрацыі, беларускі лідэр даў задні ход і пачаў ператварацца ў незалежніка. Перавод расійска-беларускіх дачыненняў у больш прагматычнае рэчышча, пазбаўленае ідэалагізаванай рыторыкі, а таксама газавыя канфлікты з Масквой пакінулі Лукашэнку няшмат месца для манеўру на інтэграцыйным полі.

Разважаючы пра будучыя сцэнары беларуска-расійскіх дачыненняў, Трэнін зазначае, што Масква наўрад ці адмовіцца ад падтрымкі Лукашэнкі, якога шмат хто ў расійскім кіраўніцтве разглядае ў якасці меншага зла ў параўнанні з празаходняй арыентацыяй беларускіх апазіцыйных палітыкаў. Расійскія аглядальнікі, аднак, не ў стане праігнараваць асноўны вынік выбараў 2006 года, які палягае ў тым, што Лукашэнка можа захаваць уладу, але ён не здольны кіраваць пажыццёва. Беларусь – гэта не Цэнтральная Азія. У параўнанні з папярэднімі выбарамі, апазіцыя пасталела і здолела аб'яднаць свае высілкі. Лукашэнка, як і пабудаваная ім патэрналісцкая сістэма, былі выбарам пасіўнай часткі электарату. Больш актыўныя людзі выступаюць за перамены. І дасягненне крытычнай масы – гэта толькі справа часу. Дэманстрацыйны эфект дэмакратычнага атачэння Беларусі таксама адыграе істотную ролю.

Паводле Трэніна, Крамлю варта было б выкарыстаць інтэргацыю ў якасці інструмента для перамен. Беларусам павінна быць зроблена сур'ёзная і шчодрая прапанова, якая растлумачвае перавагі супольнага рынку з Расіяй і выкарыстання расійскага рубля. Крэмль павінен у той жа час недвухсэнсоўна выказацца ў абарону незалежнасці і суверэнітэту Беларусі. Важна таксама, каб Масква публічна заклікала да аднаўлення палітычных свабод і прыватна дала

зразумець Лукашэнку, што яна не падтрымае далейшага падаўжэння яго прэзідэнцкага мандата. Вось толькі застаецца не зусім зразумелым, ці пагодзіцца Лукашэнка на гэткія прапановы, і, нават калі пагодзіцца, ці здолее здзейсніць такі кардынальны паварот ва ўнутранай палітыцы. Думаецца, што цяжкасці ўзнікнуць таксама і з тым, як спалучыць «незалежнасць і суверэнітэт» з выкарыстаннем расійскага рубля ў якасці адзінай валюты, эмісійны цэнтр якой будзе знаходзіцца ў Маскве.

Але галоўнае пытанне, якое ўзнікае пасля такіх «шчодрых» прапаноў, – ці здольная краіна, якая сама скатваецца да аўтарытарызму, быць натхняльнікам і прыкладам дэмакратычных пераўтварэнняў? Напэўна ж, не. Яна хутчэй будзе схільная пераймаць у суседа «карысны досвед» аўтарытарнага кіравання, напрацаваны за столькі гадоў спробаў і памылак.

Аўтарам яшчэ аднаго артыкула, які прыцягвае ўвагу сваёй арыгінальнасцю, з'яўляецца супрацоўнік еўрапейскага Інстытута даследаванняў у галіне бяспекі Доў Лінч (Dov Lynch). Разглядаючы стратэгіі ЕС у дачыненні Беларусі, ён высоўвае цікавы тэзіс, што Еўрапейскага Саюза папросту не існуе ва ўспрыняцці беларускай кіроўнай эліты і простых грамадзян. Сяброўства ў Еўрапейскім Саюзе выглядае чымсьці нерэалістычным для большасці насельніцтва, а краіны, якія яго складаюць, успрымаюцца як нешта варожае для Расіі і Беларусі. Адпаведна, для ЕС узнікае праблема, з якой ён раней ніколі не сутыкаўся: якім чынам дэмакратызаваць краіну, якой у якасці ўмовы нельга паабяцаць сяброўства ў Еўрапейскім Саюзе?

У 2006 годзе еўрапейцы канчаткова зразумелі, што выбары ў Беларусі не з'яўляюцца выбарамі ў тым сэнсе, у якім іх прызвычаіліся ўспрымаць у Еўропе. І што ў цяперашніх умовах гэтыя кантраляваныя «плебісцытарныя спектаклі» не пакідаюць ніякай надзеі на дэмакратызацыю. Увага ЕС да Беларусі заўсёды была эпізадычнай і прывязанай да электаральнага цыклу. Цяпер гэтая практыка павінна быць спыненая, і ЕС павінен надаваць увагу Беларусі незалежна ад электаральнага

працэсу. Аўтар настойвае на тым, што цяперашняя палітычная дактрына ў дачыненні да Беларусі, якая была прынятая ў 1997 годзе, даўно састарэла і патрабуе карэннага пераасэнсавання. З таго часу сітуацыя на міжнароднай арэне істотна змянілася, ЕС прайшоў этап пашырэння, адбыліся таксама змены і ва ўнутрыпалітычнай сітуацыі ў самой Беларусі, якія яшчэ больш актуалізавалі «беларускае пытанне».

Аўтар прызнае, што ЕС амаль не мае ў сваім распараджэнні рычагоў уздзеяння на сітуацыю ў Беларусі. Праблема палягае яшчэ і ў тым, што Лукашэнку абсалютна не турбуюць тыя спробы ўздзеяння, якія чыніць Еўропа. Больш таго, сама логіка кіравання беларускага прэзідэнта супярэчыць падыходам да палітычнага працэсу, прынятым у ЕС. Ёсць разуменне і таго, што Лукашэнка карыстаецца падтрымкай значнай часткі насельніцтва, і таму будзе даволі цяжка, калі ўвогуле магчыма, уплываць на яго паводзіны.

Гэта, аднак, зусім не азначае, што не трэба выпрацоўваць новай эфектыўнай стратэгіі ў дачыненні да Беларусі. І перш за ўсё ЕС павінен стаць «рэальным» акторам для беларускага рэжыму. Акторам, якога нельга ігнараваць. Па-другое, ЕС павінен стаць «рэальным» акторам у падтрымцы беларускай грамадзянскай супольнасці і апазіцыйных сілаў. Фінансавая падтрымка Еўрасаюза да гэтае пары была абмежаваная, і яе было нялёгка атрымаць. Маштаб і формы еўрапейскай падтрымкі павінны быць перагледжаныя. Урэшце, Еўрапейскі Саюз павінен стаць «рэальнасцю» ў сэнсе той альтэрнатыўнай будучай мадэлі развіцця, якая можа быць прапанаваная беларускаму грамадству. І яшчэ адзін момант, які важна зразумець: «беларускае пытанне» для Еўрапейскага Саюза – гэта не пытанне пашырэння, але пытанне вонкавай палітыкі, якая, як вядома, знаходзіцца толькі ў стане распрацоўкі.

Лінч прапануе таксама цэлы шэраг канкрэтных крокаў, рэалізацыя якіх дазволіць Еўрапейскаму Саюзу больш адэкватна ўплываць на беларускую сітуацыю і спрыяць развіццю дэмакратычных працэсаў у краіне. Паколькі аб'ём і фармат гэтага тэксту не дазваляе спыніцца больш дэталёва на кожнай з прапаноў, адзначым толькі стварэнне агенцтва на

карысць дэмакратыі. Стварэнне такога агенцтва магло б паспрыяць дэмакратызацыі суседніх з ЕС краін, на якія не распаўсюджваецца працэс пашырэння і якія адначасова не далучаныя да еўрапейскай палітыкі суседства. Агенцтва магло б кіравацца супольна Радай Еўропы, Еўракамісіяй і Еўрапарламентам і фінансавацца зыходзячы з канкрэтных задач, якія перад ім стаяць. Патрабаванні да праектаў, якія будуць фінансавацца гэтым агенцтвам па дэмакратыі, павінны ўлічваць усе цяжкасці прасоўвання дэмакратыі ў неспрыяльных умовах. Застаецца спадзявацца на тое, што гэтыя прапановы Лінча знойдуць разуменне і сярод асоб, што прымаюць рашэнні ў ЕС.

3

Другая група аўтараў, куды мы аднеслі, нагадаем, афіцыйных асоб і полісімэйкераў, цікавая не столькі аналізам беларускай сітуацыі і крытыкай падыходаў да яе вырашэння, колькі цяперашняй пазіцыяй той установы, якую рэпрэзентуе той ці іншы аўтар. Зразумела, што дыпламат або чыноўнік маюць магчымасць казаць далёка не ўсё тое, што яны ведаюць ці хочуць сказаць. Таму варта не забывацца на гэта падчас азнаямлення з іх тэкстамі.

Яскравым прыкладам тэксту такога роду з'яўляецца артыкул Пірка Тапіола (Pirkka Tapiola), галоўнага дарадцы па Украіне, Беларусі і Малдове палітычнага аддзела высокага прадстаўніка ЕС па вонкавай палітыцы і палітыцы бяспекі Хаўера Саланы.

У сваім інфарматыўным, але вытрыманым у вельмі дыпламатычных і карэктных танах артыкуле сп. Тапіола сцвярджае, што Еўрапейскі Саюз даслаў афіцыйнаму Менску недвухсэнсоўны мэсідж аб гатоўнасці Саюза будаваць сапраўднае партнёрства, у тым ліку і праз інструменты еўрапейскай палітыкі суседства. Паводле аўтара артыкула, асноўная філасофія ЕС у дачыненні да Беларусі заключаецца ў моцным жаданні спрыяць развіццю Беларусі ў якасці еўрапейскай краіны з моцнай грамадзянскай супольнасцю, развітай дэмакратыяй, вяршэнствам закона і рэальнай

рынкавай эканомікай. Аднак беларускія ўлады адмовіліся адкрыць краіну, і менавіта яны, на думку Тапіолы, з'яўляюцца перашкодай на шляху да лепшай будучыні для грамадзянаў Беларусі.

Апрача іншага, Тапіола засяроджваецца на апісанні выбарчага працэсу ў Беларусі, парушэнняў, а таксама рэакцыі ЕС і іншых міжнародных структур на падзеі ў краіне. Кажучы пра палітыку ЕС у дачыненні да Беларусі, сп. Тапіола падкрэслівае прынцыповае значэнне двух яе кірункаў: несупрацоўніцтва з адказнымі за фальсіфікацыю выбараў і гвалт у адносінах да апанентаў улады, праца з насельніцтвам і грамадзянскай супольнасцю. Пры гэтым ЕС не будзе разглядаць ніякія формы санкцый, што маглі б негатыўным чынам адбіцца на насельніцтве, а таксама будзе супраціўляцца далейшай ізаляцыі Беларусі.

Тапіола лічыць, што Беларусь цяпер знаходзіцца на раздарожжы: з аднаго боку, улада яшчэ больш кансалідавала сваю моц, а з другога – з'явіліся новыя магчымасці для палітычных перамен. Палітыка ў дачыненні да Беларусі не можа будавацца на адных толькі санкцыях. Іх трэба збалансаваць далейшымі акцыямі і праграмамі па падтрымцы беларускага насельніцтва. ЕС разумее, што дэмакратычныя змены не адбудуцца за адну ноч, таму патрэбны паслядоўны доўгатэрміновы падыход. На думку Тапіолы, важнай ёсць таксама супраца з ЗША, якія падзяляюць мэты ЕС у дачыненні да Беларусі (пабудова моцнай, дэмакратычнай і квітнеючай Беларусі). Шмат хто робіць спробы знайсці непаразуменні ў партнёрстве ЕС–ЗША па Беларусі. Але насамрэч розніца толькі ў нюансах, мэта ж – адна.

Аўтар справядліва адзначае, што Расія застаецца адзінай краінай у рэгіёне з моцным патэнцыялам уплыву на Беларусь, заснаваным на моцных гістарычных і эканамічных сувязях, элементах супольнай культурнай спадчыны. Расія, разам з гэтым, з'яўляецца стратэгічным партнёрам ЕС. На саміце Расія–ЕС, які адбыўся ў 2005 годзе, бакі дамовіліся, апрача ўсяго іншага, працаваць на карысць стабільнасці ў рэгіёне, заснаванай на супольных каштоўнасцях. Для ЕС, па словах

Тапіолы, канцэпт стабільнасці шчыльна звязаны з кансалідацыяй дэмакратыі. У гэтым кантэксце ЕС працягвае звязваць сваю заклапочанасць пытаннем дэмакратыі з Расіяй.

Выглядае так, што ў прыведзеным лагічным ланцужку выпадае адзін элемент. А менавіта той, дзе гаварылася б пра тое, што ЕС лічыць Расію краінай з кансалідаванай дэмакратыяй. Толькі ў такім разе было б лагічна спадзявацца на Расію ў справе дэмакратызацыі Беларусі. Магчымасць недэмакратычнай Расіі дэмакратызаваць яшчэ больш недэмакратычную Беларусь мы ўжо абмяркоўвалі вышэй. Таму было б цікава даведацца пра расійскае разуменне паняцця «стабільнасць», якую было вырашана падтрымліваць на саміце-2005. Гэтае разуменне Крамля добра патлумачыў Дзмітры Трэнін у гэтай жа кнізе, прывёўшы ў якасці прыкладу дзейнасці на карысць стабільнасці падтрымку Пуціным рэжыму Іслама Карымава пасля крывавага падаўлення апошнім выступлення ў Андзіжане. Ці варта казаць, што такое разыходжанне ў інтэрпрэтацыі паняццяў не паспрыяе пераменам у Беларусі?

Пытанні еўрапейскай дапамогі беларускай грамадзянскай супольнасці сярод гэтай групы аўтараў закранаюцца таксама ў артыкулах супрацоўніка Дзярждэпартамента ЗША Дэвіда Крамэра (David J. Kramer) і дэпутата нямецкага бундэстага Маркуса Мекеля (Markus Meckel). У той час як першы больш дэталёва паглыбляецца ў праблему каардынацыі дзеянняў ЗША і Еўрапейскага Саюза ў справе дапамогі Беларусі, другі засяроджвае сваю ўвагу на прапанове стварэння еўрапейскай фундацыі ў падтрымку дэмакратыі, якая б дапамагла пераадолець існы недахоп інструментаў для спрыяння дэмакратычным пераўтварэнням у суседніх з ЕС краінах. Цікавыя некаторымі фактамі і прапановамі, гэтыя тэксты, аднак, не ўтрымліваюць нічога прынцыпова новага для

4

Да трэцяй групы (актывісты-інсайдэры і прадстаўнікі фондаў) можна аднесці толькі два тэксты. Гэта артыкул Балаша Ярабіка (Balazs Jarabik), прысвечаны разгляду эфектыўнасці міжнароднай дапамогі Беларусі, і артыкул Андрэя Саннікава і

Іны Кулей, які апавядае пра ролю грамадзянскай супольнасці ў барацьбе за свабоду.

Галоўным тэзісам у артыкуле супрацоўніка Інстытута фундацыі Понціса Балаша Ярабіка з'яўляецца канстатацыя правалу папярэдніх стратэгій ЗША і ЕС, накіраваных на дэмакратызацыю Беларусі. У тым, што Лукашэнка здолеў ператварыць Беларусь у «квазітаталітарны рэжым», сп. Ярабік вінаваціць Захад, які доўгі час не праяўляў дастатковага інтарэсу да «беларускага пытання». Аўтарам таксама ўздымаецца праблема фінансавай дапамогі, прывязанай да выбараў, і адсутнасці доўгатэрміновых стратэгій дэмакратызацыі. Больш за ўсё крытыкі дасталося Еўропе, якая ўвогуле амаль не цікавілася Беларуссю і якая не здольная эфектыўна распараджацца рэсурсамі, выдаткаванымі на дапамогу дэмакратычным сілам. Паводле Ярабіка, ЕС занадта засяродзіўся на падтрымцы грамадзянскай супольнасці праз вялікія праекты, якія праходзяць дзяржаўную рэгістрацыю ў Беларусі, у той час як трэба падтрымліваць дэмакратычны рух праграмамі малых грантаў.

У артыкуле Іны Кулей і Андрэя Саннікава абвяшчаецца аб пачатку новай фазы развіцця грамадзянскай супольнасці ў Беларусі. Праўда, застаюцца не зусім зразумелымі крытэры выдзялення гэтай новай фазы. Аўтары падкрэсліваюць выключна цяжкія ўмовы, у якіх развіваюцца недзяржаўныя арганізацыі, і менавіта гэта вымусіла іх далучыцца да палітычнай апазіцыі ў іх змаганні за свабоду. З першых жа радкоў кідаецца ў вочы некарэктнае ўжаванне ў дачыненні да беларускай палітычнай сістэмы тэрміна «таталітарны рэжым», што для магістра палітычных навук Іны Кулей, па ідэі, павінна быць непрымальным.

Кулей і Саннікаў адстойваюць ідэю адзінства палітычнай апазіцыі і грамадскіх арганізацыяў у Беларусі. Прычым менавіта ўлада аб'яўляецца вінаватай у тым, што падштурхнула НДА да палітычнай дзейнасці і справакавала новы ўзровень палітычнай барацьбы. Як і належыць тэкстам грамадскіх актывістаў, ён насычаны пафаснымі абаротамі, а таксама французскімі і лацінскімі выразамі.

* * *

У цэлым кніга пакідае добрае ўражанне. У тэкстах пераважнай большасці заходніх аналітыкаў прысутнічаюць адэкватныя ацэнкі беларускай сітуацыі і, у прыватнасці, выбараў 2006 года і паслявыбарных падзей. Прысутнічае разуменне небяспекі самаізаляцыі Беларусі, а таксама неабходнасці распрацоўкі доўгатэрміновых стратэгій, накіраваных на паступовыя змены ўнутры краіны, у тым ліку і пры дапамозе суседніх з Беларуссю дэмакратый. На жаль, гэтага пакуль нельга сказаць пра афіцыйных асоб у ЕС, якія адказваюць за прыняцце вонкавапалітычных рашэнняў. Але дзякуючы такім кнігам, як гэта, ёсць спадзяванне, што гэта толькі часовая праблема.
[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/06/18
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 6 (46) - 2006**

[image]

[image]

[image]

крытыка [image]2006
ад Зтыкатук
ана**лі**тыка • **крытыка** • гісторыя • эсэістыка • літаратура • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

Алесь Пашкевіч Цаглінка ў даволі саліднай гістарыяграфіі

АЛЕСЬ ПАШКЕВІЧ (нар. у 1978 г.) – гісторык. Яго апошняя публікацыя выйшла ў «ARCHE» пад назвай «Псыхалёгія здрады» (6/2005).

Kurkiewicz M. *Sprawy białoruskie w polityce rządu Władysława Grabskiego.* – Warszawa: Neriton, 2005. – 131 s. Пасьля краху камуністычнай ідэалёгіі айчынная гістарычная навука, нягледзячы на ўсю спэцыфіку постсавецкага разьвіцьця краіны, зрабіла прыкметны крок ва ўсіх сваіх галінах. Дзякуючы гэтаму Заходняя Беларусь у складзе міжваеннай Польшчы цяпер уяўляецца нам ня толькі як «краіна шыбеніц і карных экспэдыцыяў». Але ж сур’ёзных навуковых дасьледаваньняў на гэтую тэму, аформленых у выглядзе манаграфіяў, у сучаснай Беларусі па-ранейшаму вобмаль.

Ня тое – у Польшчы. Хоць беларуская праблематыка там традыцыйна знаходзіцца на маргінэсе ў параўнаньні з украінскай ці габрэйскай, аднак жа і выхад кніжкі пра той ці іншы аспэкт жыцьця беларусаў у II Рэчы Паспалітай – таксама ня рэдкасьць. Вось і напрыканцы мінулага году ў Варшаве выйшла кніга пад назвай «Беларускія справы ў палітыцы ўраду Ўладзіслава Грабскага». Яе аўтарам зьяўляецца гісторык і журналіст Міхал Куркевіч. Адзначаная манаграфія – першая для Куркевіча, хоць і раней ён выступаў з артыкуламі ў польскай прэсе, прысьвечанымі гісторыі польска-беларускіх

дачыненьняў.

Храналягічна праца ахоплівае надзвычай важны ў гісторыі гэтых дачыненьняў пэрыяд са сьнежня 1923-га па лістапад 1925 г. У гэты час беларускае пытаньне пачало набываць для польскіх афіцыйных уладаў не вядомую раней вастрыню. Зруйнаваная шматлікімі войнамі і рэвалюцыямі заходнебеларуская вёска чакала з боку ўраду канкрэтных захадаў на паляпшэньне свайго становішча і, не дачакаўшыся, пачала ўсё больш адкрыта выяўляць сваю незадаволенасьць. Дывэрсійная акцыя, якая падтрымлівалася і накіроўвалася перш за ўсё з-за ўсходняй мяжы, да пачатку 1924 г. набыла такі размах, што сур'ёзна пагражала польскай уладзе ў Заходняй Беларусі. Таму навастворaны ўрад на чале з У. Грабскім, урад тэхналягічны, сфармаваны першапачаткова выключна дзеля правядзеньня патрэбнай для краіны грашовай рэформы (гэта задача, дарэчы, была пасьпяхова выканана), мусіў задумацца дадаткова і пра выпрацоўку дзяржаўнай нацыянальнай палітыкі. Але сама сьпешнасьць, зь якой адбывалася выпрацоўка асноваў гэтай палітыкі, перадвызначала яе супярэчлівасьць і недасканаласьць.

Першая і другая часткі працы Куркевіча – уводныя. У першай аўтар дае агляд агульнай эканамічнай і палітычнай сытуацыі ў паўночна-ўсходніх ваяводзтвах Польшчы, адмыслова падкрэсьліўшы нават у самой назьве разьдзелу, што гэтыя тэрыторыі былі «беднай правінцыяй зруйнаванай краіны» (с. 12). З разьдзелу вынікае, што праблемаў для неадкладнага вырашэньня да часу сфармаваньня ўраду Грабскага на т. зв. «крэсах» намножылася вельмі шмат. Практычна не праводзілася зямельная рэформа, слаба пасоўвалася пасьляваенная адбудова, высыланыя на «крэсы» вайсковыя асаднікі пагаршалі стаўленьне мясцовага насельніцтва да палякаў. Гаспадарчыя праблемы ўзмацняліся палітычнымі, зьвязанымі перш за ўсё з шырокім разьвіцьцём леварадыкальнага руху, які актыўна сілкаваўся з тэрыторыі СССР і нярэдка набываў формы ўзброенага супраціву польскай адміністрацыі. Асабліва спрыяла распаўсюджваньню т. зв. «дывэрсіі» «празрыстасьць» польска-савецкай дзяржаўнай мяжы.

Бальшавіцкая агітацыя знаходзіла ў Заходняй Беларусі найпрыдатнейшую глебу. Аўтар кнігі асабліва падкрэсьлівае, што «сыстэма, створаная на паўночна-ўсходніх ускраінах ў першыя гады існаваньня міжваеннай Польшчы, адзначалася здольнасьцю хуткага павелічэньня незадаволеных людзей» (с. 22–23). Сапраўды, не задаволеныя польскімі ўладамі былі практычна ўсе катэгорыі насельніцтва. Сяляне дабіваліся зямлі, беларуская інтэлігенцыя – нацыянальных школаў (колькасьць якіх зьменшылася за першыя гады польскага кіраваньня з 350 да 32 (с. 19–20), праваслаўныя вернікі патрабавалі спыненьня рэвіндыкацыі сваіх храмаў і г. д.

Другі разьдзел працы прысьвечаны аналізу поглядаў на вырашэньне беларускага пытаньня асноўных тагачасных польскіх палітычных асяродкаў. Аўтар перш за ўсё аналізуе асабістыя погляды на праблему тых асобаў, якім воляй лёсу было вызначана распрацоўваць асновы нацыянальнай палітыкі ўва ўрадзе Ўладзіслава Грабскага – Станіслава Грабскага і Станіслава Тугута. У другой частцы разьдзелу выкладаюцца пазыцыі ў нацыянальным пытаньні тых польскіх партыяў, якія мелі вялікія фракцыі ў парлямэнце і такім чынам мелі непасрэдны ўплыў на фармаваньне дзяржаўнай палітыкі. У асноўным, як вынікае, суперніцтва ішло паміж дзьвюма галоўнымі канцэпцыямі вырашэньня нацыянальнай праблемы. Першая зь іх была нацыянал-дэмакратычная (эндэцкая) і прадугледжвала як мага большае ўзмацненьне польскага элемэнту на ўскраінах і палянізацыю славянскіх меншасьцяў. Акрамя саміх нацыянальных дэмакратаў, гэтую канцэпцыю ў цэлым падтрымлівалі сябры Польскай народнай партыі «Пяст», а яе выразьнікам ува ўрадзе быў Станіслаў Грабскі. Другі погляд, якога трымаліся ў асноўным сябры Польскай народнай партыі «Вызваленьне» і Польскай сацыялістычнай партыі, рэпрэзэнтаваў ува ўрадзе Станіслаў Тугут. Гэта была канцэпцыя т. зв. «дзяржаўнай асыміляцыі», згодна зь якой меншасьцям даваліся дастаткова шырокія правы ў нацыянальна-культурнай сфэры ўзамен за іхную ляяльнасьць у дачыненьні да польскай дзяржавы.

Акрамя аналізу поглядаў асноўных тагачасных палітычных сілаў, аўтар чамусьці наважыўся на апісаньне ў гэтым

разьдзеле бачаньня беларускай праблемы віленскімі кансэрватарамі, а таксама будучымі прыхільнікамі Пілсудзкага. Гэтае рашэньне не выглядае ўдалым: усё ж сам аўтар адзначае, што тыя ж віленскія кансэрватары «ў разгляданы пэрыяд ня мелі ўплыву на палітыку ўраду ў Варшаве, аднак атрымалі яго пасьля травеньскага пераваротy» (с. 52), гэта значыць у 1926 г., ужо пасьля адстаўкі ўраду У. Грабскага. Падаецца, што перабольшвае аўтар і ўплыў на беларуска-польскія дачыненьні сярэдзіны 1920-х гг. таго факту, што кіраўнік Цэнтральнай управы ўсходніх земляў Ежы Асмалоўскі яшчэ ў траўні 1919 г. падчас перамоваў з прадстаўнікамі Гарадзенскай цэнтральнай беларускай рады нібыта паабяцаў апошнім залішне шмат (с. 51–52).

Непасрэднае апісаньне і аналіз асноўных праектаў і практычных захадаў ураду Ўладзіслава Грабскага ў сфэры нацыянальнай палітыкі Міхал Куркевіч пачынае з трэцяга разьдзелу. Гэтыя захады можна агулам зьвесьці да трох асноўных: 1) распрацоўка і прыняцьце законаў аб правах моваў нацыянальных меншасьцяў на «ўсходніх крэсах»; 2) узмацненьне аховы ўсходняй мяжы Польшчы з мэтай супрацьдзеяньня дывэрсійным акцыям у Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне; 3) распрацоўка праектаў законаў, якія мелі на мэце палепшыць эканамічны стан заходнебеларускага насельніцтва і такім чынам дабіцца калі ня шчырых сымпатыяў, то прынамсі ляяльнасьці апошняга да польскай дзяржавы. Першыя законы, якія рэгулявалі ўжываньне нацыянальных моваў у школах, адміністрацыйных органах і ў судах былі канчаткова прынятыя соймам 31 ліпеня 1924 г., але, хоць і давалі пэўныя абмежаваныя правы нацыянальным меншасьцям, на практыцы выконваліся слаба. Другі плян ураду Грабскага атрымаў увасабленьне ў стварэньні на ўсходняй мяжы ваенізаванага Корпусу аховы памежжа, які замяніў няздольную да рэальных дзеяньняў мясцовую паліцыю. Былі праведзеныя і рэпрэсіўныя акцыі з мэтай выкрыцьця і разгрому ячэек Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі. Урэшце, сам Уладзіслаў Грабскі распрацаваў плян паляпшэньня эканамічнага становішча заходнебеларускай вёскі, які прадугледжваў прымусовы продаж памешчыкамі лішкаў зямельных уладаньняў Зямельнаму банку з мэтай іх наступнай

парцэляцыі паміж мясцовымі сялянамі, а таксама аказаньне апошнім значнай дзяржаўнай дапамогі пры правядзеньні пасьляваеннай адбудовы. Гэтыя праекты, аднак, былі адкінутыя Палітычным камітэтам Рады міністраў як занадта радыкальныя (с. 75–76).

Чацьвёртую частку працы аўтар адмыслова прысьвяціў пэрсанальнай дзейнасьці ўва ўрадзе Грабскага аднаго з найбольш выбітных прадстаўнікоў тагачаснай польскай дэмакратыі, аўтара і суаўтара многіх праектаў урадавых законаў – Станіслава Тугута. Некаторы час працы ўраду ён афіцыйна курыраваў у ім пытаньне палітыкі «ўсходніх крэсаў». Прыклад Тугута сьведчыць пра тое, што сярод тагачасных польскіх палітыкаў былі людзі, якія ня толькі фармальна, але і на справе імкнуліся ўнармаваць польска-беларускія адносіны, прытым гатовыя былі пайсьці на значныя саступкі на карысьць беларусаў. 1 траўня 1925 г. Тугут падаў на ўзгадненьне прэм'еру плян працы кіраванай ім сэкцыі па нацыянальных справах Палітычнага камітэту Рады міністраў Польшчы. У ім ён прадугледзеў забесьпячэньне некаторых культурна-асьветніцкіх патрэбаў беларускага насельніцтва, якія яшчэ за два гады да гэтага былі праграмай-мінімумам беларускіх паслоў у сойме. Так, Тугут выказаўся за тое, каб усе пададзеныя бацькамі вучняў заявы на адчыненьне школаў на роднай мове былі задаволеныя з пачатку 1925/1926 школьнага году. Беларускія настаўнікі, якія ў 1922–1923 гг. скончылі курсы паляністыкі ў Кракаве і затым накіраваныя на працу на этнічна польскія тэрыторыі, мусілі вярнуцца на радзіму. У Вільні павінны былі адкрыцца беларускія настаўніцкія курсы на 40 чалавек, і іх выпускнікам мусілі гарантавацца месцы працы ў паўночна-ўсходніх ваяводзтвах. Прадугледжваліся дзьвюхмоўнасьць Віленскай настаўніцкай сэмінарыі, дзяржаўнае прызнаньне атэстату Віленскай беларускай гімназіі і чвэрцьмільённы крэдыт фірмам, якія заняліся б выпускам беларускамоўных падручнікаў. Акрамя таго, плянавалася стварэньне катэдраў беларускае філялёгіі ў Віленскім унівэрсытэце імя Сьцяпана Батуры і Studium Slavicum у Ягелёнскім унівэрсытэце ў Кракаве. У віленскім, беластоцкім і берасьцейскім кураторыях Тугут прапаноўваў увесьці пасады рэфэрэнта па справе меншасьцёвага школьніцтва і прызначыць на іх беларусаў.

Значныя саступкі меншасьцям прадугледжваліся Тугутам таксама і ў гаспадарчай і рэлігійнай сфэрах (с. 85–87). Большасьць праектаў гэтага дзеяча таксама засталіся на паперы.

У пятым разьдзеле М. Куркевіч паспрабаваў прасачыць дачыненьні ўраду У. Грабскага зь беларускімі пасламі ў польскім сойме. Аўтар падкрэсьлівае прынцыпова апазыцыйную ў дачыненьні да ўраду пазыцыю беларускіх прадстаўнікоў і іх пастаянную радыкалізацыю, пацьвярджаючы сваю думку вялікімі (часам больш чым на паўстаронкі) цытатамі з соймавых выступленьняў аднаго зь лідэраў Беларускага пасольскага клюбу Браніслава Тарашкевіча (с. 94–95, 99–100). Сьцісла апісаная гісторыя ўтварэньня Беларускай сялянска-работніцкай грамады (БСРГ) у чэрвені 1925 г., падкрэсьліваецца значная роля ў яе ўтварэньні камуністаў і аналізуюцца асноўныя палажэньні праграмы партыі. Адносна шмат увагі надаецца спробам польскага ўраду размаўляць зь беларускім насельніцтвам, мінаючы выбраных ім афіцыйных прадстаўнікоў. Дзеля гэтага ўрад усялякімі спосабамі падтрымліваў стварэньне палянафільскіх арганізацыяў, але не дасягнуў пастаўленай мэты з-за нізкага маральнага ўзроўню іх лідэраў і, адпаведна, адсутнасьці аўтарытэту ў насельніцтва (с. 95–98). Агульная выснова аўтара –

на працягу двухгадовага кіраваньня Ўладзіслава Грабскага безумоўную перавагу ў беларускім руху здабылі камуністычныя і пракамуністычныя элемэнты, якія атрымлівалі дапамогу з-за мяжы. Гэта было вынікам прадуманай палітыкі ўраду БССР і яго цеснага супрацоўніцтва з камуністамі ў Польшчы (с. 103–104).

Урэшце, у апошнім, шостым, разьдзеле разглядаецца практычная дзейнасьць мясцовай польскай адміністрацыі дзеля рэалізацыі ўрадавых праектаў. Аўтар ужо напачатку гэтага разьдзелу падкрэсьлівае, што «значна большы ўплыў, чым віцэ-прэм'ер Тугут, чым нават урад, на дзеяньні адміністрацыі меў на тэрыторыі пэўнага ваяводства ваявода» (с. 105). Вялікія паўнамоцтвы ваяводы дапускалі спэцыфіку ўва ўвядзеньні ў жыцьцё прынятых цэнтрам законаў. Дзеля пацьвярджэньня

сваёй думкі М. Куркевіч знаёміць чытача з выказваньнямі па нацыянальным пытаньні прызначаных у 1924 г. навагрудзкага ваяводы Мар'яна Жэготы-Янушайціса і палескага – Казімежа Младзяноўскага. Першы зь іх трымаўся выразна эндэцкага погляду на вырашэньне беларускага пытаньня, другі ж быў больш лібэральны. Праўда, аўтар абмежаваўся толькі прывядзеньнем шырокіх цытатаў зь іх публічных выступленьняў, але не ўдакладніў, ці мела нейкія прынцыповыя адрозьненьні практычная рэалізацыя імі тых жа «моўных законаў» у названых ваяводзтвах. Але ў цэлым ён сьцьвярджае, што мясцовая адміністрацыя на «крэсах» мела рэпрэсіўны характар, і бачыць у гэтым «адзін з найважнейшых чыньнікаў, які фармаваў нэгатыўнае стаўленьне беларускіх элітаў і ўсяго беларускага насельніцтва да Польскай Рэспублікі» (с. 110).

Агульнае ўражаньне пасьля азнаямленьня з працай Міхала Куркевіча даволі супярэчлівае. З усяго тэксту відаць, што аўтар намагаўся захоўваць аб'ектыўнасьць і, наколькі магчыма, пазьбягаць аднабаковасьці ацэнак. Мабыць, імкнучыся гэта падкрэсьліць, аўтар часта спасылаецца ў працы на думку іншых аўтарытэтных дасьледчыкаў – «знаўцаў тэмы», прыводзячы ў тэксьце даволі вялікія цытаты зь іх твораў. Безумоўна, навуковую сумленнасьць заўсёды можна толькі вітаць, але ж, як любяць казаць палякі – *co za dużo, to nie zdrowo*. Падаецца, што Куркевіч усё ж залішне захапіўся цытаваньнем высноваў іншых дасьледчыкаў, дзеля чаго складаецца ўражаньне пэўнай кампілятыўнасьці ягонай уласнай працы, нягледзячы нават на выкарыстаньне арыгінальных матэрыялаў з фонду Прэзыдыюму Рады міністраў Польшчы з варшаўскага Архіву новых актаў.

Належыць прызнаць, што літаратуру па тэме аўтар вывучыў вельмі добра, але, што трэба асабліва падкрэсьліць – амаль што выключна польскую. З працаў беларускіх аўтараў Міхал Куркевіч у сваёй манаграфіі выкарыстаў толькі артыкулы паслоў польскага сойму Фабіяна Ярэміча ды Васіля Рагулі – дарэчы, чыста прапагандысцкага характару – надрукаваныя ў 1927 г. у часопісе «Natio», артыкул Віктара Ярмалковіча пра Беларускую хрысьціянскую дэмакратыю, надрукаваны ў часопісе «Wiкц» у 1986 г. ды працы беластоцкіх гісторыкаў

Яўгена Мірановіча і Алега Латышонка. Усе згаданыя выданьні – выключна польскамоўныя, што дае падставы рабіць прыпушчэньне пра моўны бар'ер як асноўную прычыну настолькі сьціплай прэзэнтацыі беларускіх крыніцаў.

У выніку найменш новай і арыгінальнай інфармацыі зьмяшчаецца ў тых разьдзелах працы, у якіх разглядаюцца дачыненьні ўраду Грабскага з заходнебеларускім нацыянальным рухам. Наагул з гэтым рухам М. Куркевіч знаёмы даволі павярхоўна, што відаць хоць бы са шматлікіх фактаграфічных памылак у тэксьце працы. Так, напрыклад, Беларуская хрысьціянская дэмакратыя была створаная не ў 1915-м, а ў 1917 годзе, раскол у Беларускай сацыялістычнай грамадзе і стварэньне па яго выніках Беларускай партыі сацыялістаў-рэвалюцыянэраў і Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі – не ў 1917-м, а ў 1918 годзе (с. 24). Беларуская настаўніцкая сэмінарыя месьцілася не ў Баранах, а ў Барунах (с. 20). Сакратар Галоўнай управы БСРГ меў прозьвішча Бурсевіч, а не Брусевіч (с. 102). Прэм'ера БНР Цьвікевіча звалі не Аляксеем, а Аляксандрам (с. 101), і, наадварот, беларускага сэнатара Назарэўскага – Аляксеем, а не Аляксандрам (с. 23). Антон Луцкевіч ніколі ня быў дзеячам, «блізкім да беларускіх эсэраў» – ён быў сацыял-дэмакратам (с. 27). Вячаслаў Багдановіч сапраўды цесна супрацоўнічаў з расейскім рухам у Польшчы, асабліва праваслаўна-царкоўным, аднак жа манархістам пры гэтым ён ня быў (с. 26). Радаслаў Астроўскі, Язэп Шнаркевіч і Мікалай Марцінчык, ахарактарызаваныя аўтарам як «беларускія дзеячы, не зьвязаныя з «Грамадой» (с. 100), усё ж такі былі зь ёй зьвязаныя, прытым даволі цесна. Шнаркевіч і Марцінчык абодва стаялі ля вытокаў Грамады і ў студзені 1927 г. былі арыштаваныя разам зь іншымі лідэрамі партыі, амаль год пасьля правёўшы ў турме. І проста няёмка казаць пра незаангажаванасьць у грамадоўскія справы Радаслава Астроўскага, які быў віцэ-старшынём БСРГ і нават, як лічылі некаторыя беларускія дзеячы, яе ценявым кіраўніком. Наагул, гэты дзеяч за сваё доўгае жыцьцё паслужыў самым розным ідэям і ўладам, заслужыўшы сабе далёкую ад бездакорнай рэпутацыю ў сучасьнікаў. Таму цяжка пагадзіцца з М. Куркевічам, што менавіта гэты дзеяч (як таксама ня менш

спрэчная фігура – Фабіян Акінчыц) мог «трактаваць БССР як этап на шляху да беларускай незалежнай дзяржавы», у адрозьненьне ад Браніслава Тарашкевіча, Пятра Мятлы, Сымона Рак-Міхайлоўскага і Паўла Валошына, якія нібыта камунізм падтрымлівалі ідэйна (с. 102). У другой палове 1925 г. была распрацаваная не канчатковая праграма Грамады, а толькі яе праект, забракаваны дзеля залішняй блізіні да праграмы камуністаў. Той жа напісаны Б. Тарашкевічам дакумэнт, які мы цяпер ведаем як праграму БСРГ, быў прыняты толькі 12 траўня 1926 г. (с. 101). «Камунікат» прыхільнікаў т. зв. «сэцэсіі» ў КПЗБ з вострай крытыкай палітыкі Камуністычнай партыі Польшчы быў зьмешчаны ня ў пятым (с. 34), а ў другім нумары партыйнага органу «Большевик». Саму ж «сэцэсію» канчаткова ўдалося ліквідаваць вясной не 1925-га (с. 35), а 1926 г. Плянаваны кіраўніком палянафільскай Часовай беларускай рады Арсенем Паўлюкевічам зьезд Заходняй Беларусі, да якога, паводле Куркевіча, «не дайшло ні ў гэты (красавік 1925 г. – **А. П.**), ні ў які-небудзь іншы час» (с. 98), усё ж адбыўся ў Вільні з 27 па 28 чэрвеня 1926 г. Іншая справа, што ён, як і большасьць іншых мерапрыемстваў згаданага дзеяча, ня меў шырокага грамадзкага рэзанансу.

Такіх памылак можна пры жаданьні знайсьці ў тэксьце болей. А пазьбегнуць большасьці зь іх можна было, зазірнуўшы хоць бы ў шасьцітомную «Энцыкляпэдыю гісторыі Беларусі», што ў поўным камплекце ёсьць у варшаўскіх бібліятэках. Аднак шырока выкарыстаць у сваёй працы беларускія матэрыялы, аўтар, на жаль, чамусьці не палічыў патрэбным.

Наагул, на нашу думку, праца зь беларускімі крыніцамі, у першую чаргу з матэрыяламі пэрыядычнага друку, зьяўляецца самым слабым месцам сучаснай польскай гістарыяграфіі. Цяжка зразумець лёгіку польскіх дасьледчыкаў, але ў большасьці іхных працаў на беларускую тэматыку амаль заўсёды выкарыстоўваюцца толькі тыя крыніцы, якія адлюстроўваюць выключна польскі погляд на тую ці іншую праблему. Гэтая ня вельмі пазытыўная тэндэнцыя, вядома, не датычыць тых гісторыкаў беластоцкай школы, якія зьяўляюцца этнічнымі беларусамі. Характэрна, што М. Куркевіч, спасылаючыся на іх працы, акрэсьлівае іх саміх як

прадстаўнікоў ня польскай, а беларускай гістарыяграфіі (с. 102).

Калі працягваць ужо закранутае пытаньне крыніцазнаўчай базы дасьледаваньня, то прынамсі зьдзіўленьне выклікае рашэньне аўтара з усёй разнастайнасьці пэрыядычных выданьняў у міжваеннай Польшчы абмежавацца толькі віленскім «Siowem». Цікава абгрунтоўвае аўтар свой выбар менавіта гэтай «найважнейшай» крыніцы ў якасьці адной з асноўных:

Гэтую кансэрватыўную штодзённую газэту фінансавалі сярод іншых праф. Мар'ян Зьдзяхоўскі, Мар'ян Бруль-Плятэр, Станіслаў Ваньковіч, Ян Тышкевіч і нясьвіскі ардынат Альбрэхт Радзівіл. На «Siowo» таксама давалі грошы наступныя інстытуцыі: Саюз памешчыкаў, Саюз закардонных палякаў і Віленскі зямельны банк (с. 8).

Ужо з аднаго гэтага пераліку фундатараў вынікае, што «Siowo» было друкаваным органам зусім канкрэтнага палітычнага кірунку – кансэрватыўнага, і менавіта яго пункт гледжаньня адлюстроўваўся у матэрыялах, што зьмяшчаліся на старонках газэты. Таму выкарыстаньне аўтарам пры дасьледаваньні выключна гэтага пэрыядычнага выданьня азначае тое, што ён у пэўнай ступені, сьвядома ці несьвядома, глядзеў на беларускую справу вачыма віленскіх кансэрватараў. Віленскія ж кансэрватары не былі нэўтральнымі ў нацыянальным пытаньні, цьвёрда трымаючыся канцэпцыі асыміляцыі беларускага насельніцтва, пра што выказваліся зусім адкрыта на старонках свайго друкаванага органу.

Пры ўсім гэтым зусім не падлягае сумненьню, што само па сабе «Siowo» было выданьнем салідным і вядомым далёка за межамі Вільні. Праўда і тое, што яго супрацоўнікі намагаліся «дакладна апісваць кожны дывэрсійны напад, інфармаваць пра дзейнасьць беларускіх эмігрантаў у Ковенскай Літве і адносінах, якія панавалі ў БССР» (с. 8) (іншая справа, наколькі дакладнай і аб'ектыўнай іх інфармацыя аказвалася ў выніку). Пытаньні выклікае толькі мэтазгоднасьць выкарыстаньня гэтай газэты (як і любой іншай) у якасьці безальтэрнатыўнай

крыніцы. Усё ж нават дзеля простай навуковай карэктнасьці пажадана было б паралельна выкарыстоўваць таксама друкаваныя органы іншых палітычных кірункаў, і, вядома ж, беларускую прэсу.

Сьвядомае ці несьвядомае невыкарыстаньне беларускіх крыніцаў пазбаўляе дасьледчыка ня толькі пэўнага карыснага фактаграфічнага матэрыялу, але таксама не дае яму магчымасьці глянуць на разгляданую праблему шырэй, вачыма ня толькі польскага ўраду, але і беларускіх дзеячаў. Таму ў працы Куркевіча ў нязьменным выглядзе прыводзяцца некаторыя замацаваныя ў польскай гістарыяграфіі стэрэатыпы ў дачыненьні да беларускага пытаньня. Так, характарызуючы пазыцыю беларускіх паслоў у дачыненьні да «моўных законаў» (а яны разам з дэпутатамі іншых нацыянальных меншасьцяў выступілі зь іх рэзкай крытыкай і ў выніку дэманстрацыйна пакінулі залю паседжаньняў), М. Куркевіч не адыходзіць ад традыцыйнага погляду, ацэньваючы, што «вінаватыя ў гэтым становішчы (пазьнейшым невыкананьні законаў на практыцы. – **А. П.**) таксама беларускія і ўкраінскія паслы. Адкідаючы *en bloc* моўныя законы, яны ня спраўдзіліся палітычна, не дарасьлі да ўжываньня тактыкі «браць, не расьпісваючыся» (с. 65). Пацьвярджае аўтар сваю думку вялікай цытатай з «Аўтабіяграфіі» Станіслава Тугута.

Думаецца, што ўсё ж ускладаньне нават часткі адказнасьці за дрэннае выкананьне моўных законаў на беларускіх парлямэнтароў не зусім апраўданае, хоць у цэлым можна пагадзіцца, што ва ўменьні весьці чыста парлямэнцкую працу многія польскія паслы значна пераўзыходзілі беларусаў. Але, каб зразумець беларускую пазыцыю, неабходна паставіць шэраг пытаньняў і паспрабаваць даць на іх адказ. Напрыклад, ці мелі беларусы рэальныя падставы пратэставаць супраць законаў? Ці была іх пазыцыя належным чынам аргумэнтаваная? Ці магчымае было іншае разьвіцьцё сытуацыі ў выпадку прыняцьця імі на ўзбраеньне больш памяркоўнай тактыкі?

Пазыцыю беларускіх паслоў нельга разглядаць без уліку ўсіх асаблівасьцяў тагачаснага як унутрыпольскага, так і міжнароднага жыцьця. Да ліпеня 1924 г., калі адбываўся

разгляд моўных законаў у парлямэнце, Беларускі пасольскі клюб працаваў у польскім сойме ўжо больш чым паўтара году, таму пэўны досьвед непасрэдных дачыненьняў з польскімі ўладамі беларускія паслы і сэнатары мелі. Гэты досьвед даваў беларусам поўнае права сумнявацца ў шчырасьці намераў польскіх уладаў на справе, а не на словах забясьпечыць нацыянальныя правы меншасьцям на «паўночна-ўсходніх крэсах».

Так, яшчэ перад усеагульнымі парлямэнцкімі выбарамі, якія адбыліся на ўсёй тэрыторыі Польшчы ў лістападзе 1922 г., польскія ўлады сваёй палітыкай пасьпелі настроіць супраць сябе ўсе без выключэньня нацыянальныя меншасьці. Найбольш яскравай праявай гэтага было аб'яднаньне іх падчас выбараў у адзіным блёку. Характэрнай рысай гэтага блёку было тое, што ў ім аб'ядналіся прадстаўнікі самых розных палітычных арыентацыяў і сацыяльных групаў, часта з кардынальна процілеглымі інтарэсамі, аб'яднаць якіх не магло нішто, акрамя наяўнасьці супольнай пагрозы, у гэтым выпадку польскіх уладаў. Вядомы ў той час журналіст Бернард Сінгер, характарызуючы Блёк, адзначаў:

Ісак Грынбаўм (адзін зь лідэраў польскіх сіяністаў. – **А. П.**), *ксёндз-канонік Клінке, Браніслаў Тарашкевіч, беларускі сацыяліст-рэвалюцыянэр, Паўло Васыньчук, украінскі сацыял-дэмакрат, а побач прозьвішчы папоў, рабінаў, хасыдаў, сялянаў, памешчыкаў, дзеячаў з псэўдарэвалюцыйнай маркай. У гэтым таварыстве маршыраваў таксама знойдзены на бруку Варшавы мясцовы расеец Сярэбранікаў. Расейцы, якія выявіліся ўкраінцамі, народныя настаўнікі, якія рабілі толькі першыя крокі ў палітыцы, скампрамэтаваныя артадаксальныя дзеячы на габрэйскай вуліцы і нібыта нават пятлюраўцы – усе апынуліся ў адным сьпісе*[1].

Стварэньне Блёку нацыянальных меншасьцяў у падобным выглядзе павінна было самім фактам свайго зьяўленьня прымусіць польскія ўрадавыя колы сур'ёзна задумацца над яго прычынамі і тэрмінова прыняць захады на выпраўленьне сытуацыі. Тым больш што ў сойме беларускія паслы, як і іншыя нацыянальныя меншасьці, не занялі адразу ж бескампрамісную

[1] Singer B. Od Witosa do Sławka. Paryż, 1962. S. 115.

і неканструктыўную пазыцыю. Наадварот, яны прынялі важнае рашэньне ўзяць актыўны ўдзел у выбарах прэзыдэнта Польшчы ў канцы 1922 г. У тагачасных умовах такое рашэньне мела перш за ўсё сымбалічны характар як дэманстрацыя ляяльнасьці да дзяржавы: адмова меншасьцяў ад удзелу ў выбарах магла мець непрыемныя наступствы для міжнароднага аўтарытэту Польшчы. Нават пасьля разгортваньня кампаніі пад антыменшасьцевымі лёзунгамі супраць выбранага ў тым ліку і іх галасамі прэзыдэнта Нарутовіча (які ў выніку яе быў забіты) беларусы палічылі патрэбным аказаць вотум даверу сфармаванаму ў студзені 1923 г. ураду Ўладзіслава Сікорскага (пра гэта Куркевіч згадвае на с. 25). Канчаткова ў апазыцыю яны перайшлі толькі ў чэрвені 1923 г., пасьля таго, як стала відавочным, што Сікорскі не зьбіраецца ўлічваць іх інтарэсаў.

Такім чынам, беларускія палітыкі са свайго боку прадэманстравалі гатоўнасьць да супрацоўніцтва з польскімі ўладамі. Аднак жа гэтыя ўлады ніколі не ўспрымалі іх як сур'ёзнага палітычнага партнэра, што, па сутнасьці, нават і не хавалася. У выніку да часу сфармаваньня ўраду Грабскага за цэлы год працы беларускія паслы ня здолелі дабіцца ад польскіх уладаў ніводнай сур'ёзнай саступкі. У той жа самы час працягвалася дзяржаўная палітыка, скіраваная на закрыцьцё рэшты беларускіх школаў, мясцовая адміністрацыя адкрыта парушала забясьпечаныя Канстытуцыяй правы беларускага насельніцтва, а на пададзеныя інтэрпэляцыі (запыты) у міністэрствы паслы атрымлівалі зьдзеклівыя адпіскі. Таму натуральна, што да ліпеня 1924 г., калі «моўныя законы» разглядаліся ў сойме, беларусы ня мелі аніякіх ілюзіяў адносна сапраўдных намераў польскіх уладаў, тым больш што аўтарам галоўнага з законаў – аб арганізацыі школьнай справы – быў выразьнік эндэцкага гледзішча Станіслаў Грабскі, які трымаўся думкі, што беларускага народу не існуе, і ў сваіх працах засьцерагаў ад яго штучнага стварэньня (с. 43). Улічваючы гэта, не было нічога дзіўнага, што беларускія прадстаўнікі ў парлямэнце паставіліся да чарговых прынятых палякамі прававых актаў крытычна, асабліва ўлічваючы ўмовы іх распрацоўкі: кулюарна, за зачыненымі дзьвярыма і безь ніякага ўзгадненьня з парлямэнцкімі прадстаўнікамі нацыянальных меншасьцяў. Прэтэнзіі да законаў, якія неаднаразова публічна

выказваліся беларускімі дзеячамі на розных узроўнях, былі зусім канкрэтныя і абгрунтаваныя. Найбольш коратка і выразна іх выклаў на старонках газэты «Крыніца» пасол сойму ксёндз Адам Станкевіч у сваім артыкуле «Новыя законы аб мовах», апублікаваным пад псэўданімам Ігнат Папараць:

Агулам трэба адзначыць, што гэтыя законы прынятыя Соймам ня дзеля інтарэсаў нашага народу, а для таго, каб прад сьветам, прад Эўропай Польшча магла паказацца акуратнай у адносінах да народных меншасьцяў. Праўду кажучы, нам усе правы нашай мовы, нашай культуры абясьпечваюць польская Канстытуцыя, Трактат Вэрсальскі і Трактат Рыскі, а тым часам польскія ўрады правоў гэтых нам не даюць (вылучэньне нашае. – **А. П.**). *Дык ясна, што і гэтыя сьвежыя законы ў жыцьцё ўведзеныя ня будуць*[2].

Такая была адкрыта выказаная афіцыйная пазыцыя беларускіх дзеячаў, якая многім магла падавацца тупіковай, неканструктыўнай і нават правакацыйнай. Аднак нельга пры гэтым забывацца на тое, што беларускія дзеячы, няпомачы на сваё вельмі крытычнае стаўленьне да законаў, тым ня менш не адмовіліся ад спробаў скарыстаць іх на практыцы. Пасьля прыняцьця законаў яны распачалі шырокую кампанію збору подпісаў бацькоў за адкрыцьцё беларускіх школаў (Куркевіч піша пра гэта на с. 62–65). Якраз у гэты момант патрабавалася цьвердая пазыцыя польскага ўраду, скіраваная на няўхільнае выкананьне прынятых соймам законаў. Урад мусіў засьведчыць нацыянальным меншасьцям: мы далі вам пэўныя правы, большага даць ня можам і ня хочам, але тое, што дадзена належыць вам з поўным правам і рэвізіі не падлягае. Тым самым з рук беларускіх паслоў быў бы выбіты магутны козыр, бо павісалі б у паветры іхныя аргумэнты наконт «экспартнага» характару законаў і няшчырасьці польскага ўраду. Толькі ў такім выпадку можна было разьлічваць на некаторае зьмякчэньне ўзаемных польска-беларускіх дачыненьняў.

Выйшла, аднак, цалкам іначай. У 1925 г. заходнебеларускія сяляне падалі 16 тысячаў заяваў на адкрыцьцё 400 школаў на роднай мове, а ў выніку (што адзначае і М. Куркевіч) былі створаныя 27 польскіх і 15 дзьвюхмоўных школаў (с. 62). Пры

[2] Paparaćiz Nowyja zakonnyja mowach // Krynica. 1924. 16 lipca.

[3] Thugutt S. Autobiografia. Warszawa, 1984. S. 167.

[4] Рапарты Р. Зямкевіча ў II аддзел Генеральнага штаба польскага войска за 1922 г. / Публікацыя А. В. Пашкевіча і А. М. Чарнякевіча // Беларускі археаграфічны штогоднік. Вып. 6. Мінск, 2005. С. 248-260; Чарнякевіч А., Пашкевіч А. Псіхалогія здрады: беларускі нацыянальны рух вачыма канфідэнта II аддзела польскага Генеральнага штаба // Arche. 2005. № 6. С. 214-271.

гэтым шматлікія перашкоды чыніліся ўладамі ўжо на самым першым этапе збору подпісаў. Звычайна моўныя законы няўхільна выконваліся толькі пры патрэбе ліквідаваць беларускую школу, створаную ў той ці іншай мясцовасьці раней. Асабліва належыць падкрэсьліць, што падобнае стаўленьне да праблемы не было толькі сваволяй мясцовых адміністрацыйных уладаў: на ўсе пададзеныя беларускімі пасламі запыты ўраду яны атрымлівалі толькі адпіскі, вінаватае ж у ігнараваньні законаў чынавенства ніякай адказнасьці за парушэньні ня несла. Часта цытаваны Куркевічам Станіслаў Тугут сам прызнаваў у сваёй аўтабіяграфіі:

Мушу з жалем сказаць, што падазрэньні меншасьцяў, што гэтыя законы ня будуць на практыцы выконвацца, падазрэньні, якія я поўнасьцю адкідваў, у пэўнай меры спраўдзіліся, асабліва калі казаць пра школьныя законы. Я меў магчымасьць пераканацца ў гэтым аж занадта часта, атрымаўшы пасьля мноства скаргаў на дзейнасьць ніжэйшых уладаў пры падліку колькасьці дзяцей іншых нацыянальнасьцяў і бацькоў, якія імкнуліся стварыць школы зь іншай мовай навучаньня[3].

Ці была такая палітыка польскіх уладаў толькі адказам на дэманстрацыю беларускіх паслоў у сойме? Можа, калі б беларускія дэпутаты законы пакрытыкавалі, але ўрэшце іх падтрымалі, то яны выконваліся б належным чынам? Але не на карысьць гэтага сьведчыць сытуацыя, у якой апынуліся соймавыя паслы ад габрэйскай нацыянальнай меншасьці пры тым жа ўрадзе У. Грабскага. Большасьць габрэйскіх прадстаўнікоў не былі асабліва радыкальныя ў сацыяльных пытаньнях, і ляяльнасьць да польскай дзяржавы імкнуліся пастаянна падкрэсьліваць. Такая памяркоўнасьць зрабіла магчымым укладаньне 7 ліпеня 1925 г. польска-габрэйскага пагадненьня, згодна зь якім габрэйскія палітыкі абавязваліся не рабіць ніякіх дзеяньняў, скіраваных на парушэньне цэльнасьці дзяржавы і яе ўнутранай кансалідацыі, а польскія ўлады, у сваю чаргу, абавязваліся скасаваць дыскрымінацыйныя ў адносінах да габрэяў законы. Уклаўшы гэтае пагадненьне, габрэі сапсавалі свае дачыненьні з

прадстаўнікамі іншых меншасьцевых фракцыяў у сойме, але ніякіх канкрэтных саступак ад уладаў так і не дачакаліся. Ужо ў канцы 1925 г. Габрэйскае кола ў сойме зноў афіцыйна абвясьціла аб сваім пераходзе ў апазыцыю з-за невыкананьня ўмоваў пагадненьня з боку ўраду.

Міхал Куркевіч у сваёй працы апісвае эвалюцыю пазыцыі Беларускага пасольскага клюбу ў дачыненьнях з польскім урадам і адпаведна стаўленьня беларускіх дэпутатаў да СССР і БССР, але робіць гэта даволі схематычна. Са зьмешчанай у кнізе інфармацыі складваецца ўражаньне, што на ляяльных да Польшчы пазыцыях увесь 1923 г. стаяў у БПК адзін Браніслаў Тарашкевіч, бо менавіта праз прызму дзейнасьці аднаго гэтага чалавека разглядаецца палітыка ўсяго Клюбу (гэта, дарэчы, характэрна для ўсёй польскай гістарыяграфіі). Між тым насамрэч усё было куды складаней. У 1922–1923 гг. толькі нямногія зь беларускіх паслоў адназначна выступалі ў падтрымку БССР, а асноўная іх частка ў той пэрыяд яшчэ ня вызначылася канчаткова са сваёй арыентацыяй, уважліва адсочваючы асноўныя тэндэнцыі ва ўнутраным і міжнародным палітычным жыцьці. Унутранае жыцьцё тагачасных віленскіх беларускіх асяродкаў з пастаяннымі ваганьнямі і ўзьдзеяньнем на сытуацыю разнастайных замежных і ўнутраных чыньнікаў добра адчуваецца пры чытаньні нядаўна апублікаваных рапартаў у II аддзел Генэральнага штабу яго канфідэнта Рамуальда Зямкевіча[4]. Пры гэтым, як выглядае, польскі ўрадавы чыньнік быў у гэтых умовах найслабейшы, бо палякі ня здолелі прапанаваць беларусам годнай альтэрнатывы нават тым вельмі супярэчлівым працэсам, якія ішлі ў шасьці паветах Менскай губэрні, што на той час складалі БССР.

Праўда, пэўны час адзначаная ўрэзанасьць тэрыторыі БССР і непасьлядоўнасьць у правядзеньні прадэкляраванай беларусізацыі выклікалі стрыманасьць заходнебеларускіх дзеячаў і ў адносінах да СССР. Гэтым у значнай ступені тлумачыцца тое, што амаль год беларускія паслы намагаліся прыйсьці да паразуменьня калі ня з польскім урадам, то з польскімі левымі фракцыямі. Але ў сакавіку 1924 г. Прэзыдыюм Усесаюзнага Цэнтральнага выканаўчага камітэту прымае пастанову «Аб перадачы БССР раёнаў зь пераважна

беларускім насельніцтвам», згодна зь якой Беларусі вярталіся большасьць з забраных раней тэрыторыяў былых Віцебскай і Магілёўскай губэрняў. Агульнавядома, што гэтым актам былі вернутыя далёка ня ўсе этнаграфічна беларускія землі, але найважнейшым было тое, што сама пастанова не засталася на паперы, і далучэньне тэрыторыяў адбылося рэальна. Не была папяровай і палітыка беларусізацыі, пад якую якраз у 1923–1924 гг. была канчаткова падведзеная заканадаўчая база.

Вяртаньне БССР часткі ўсходніх тэрыторыяў стала тым пераломным фактам, пасьля якога шалі беларускіх сымпатыяў у Польшчы канчаткова схіліліся на бок Саветаў. Прасавецкую арыентацыю прынялі і тыя дзеячы, што перад гэтым ставіліся да Савецкай Беларусі крытычна і ў цэлым аддавалі перавагу Польшчы. Ня мае рацыі М. Куркевіч, калі сьцьвярджае, што канцом палянафільскіх ілюзіяў Браніслава Тарашкевіча стала ягоная размова са Станіславам Тугутам у верасьні (ці ўсё ж у сьнежні?) 1923 г., калі апошні зьбіраўся фармаваць урад (с. 26). Спадзяваньні «на парлямэнцкае (калі ня мірнае) укладаньне польска-беларускіх дачыненьняў» ён захоўваў яшчэ некаторы час, хоць у значна меншай ступені, чым раней. Вядомы ягоны ўдзел разам з сэнатарам Аляксандрам Уласавым у заснаваньні Польска-беларускага таварыства разам з прадстаўнікамі польскіх віленскіх дэмакратычных колаў у лютым 1924 г. (гэта каштавала Тарашкевічу пасады старшыні клюбу). А вось пашырэньне тэрыторыі БССР, відаць, і зрабіла на Тарашкевіча вырашальны ўплыў. 17 сакавіка 1924 г. ён яшчэ заяўляў з соймавай трыбуны, што «наданьне шырокай аўтаноміі… толькі ад гэтага пункту, панове, можа наступіць такі патрэбны паварот у адносінах», аднак ужо ў чэрвені таго ж году канстатаваў: «Тэрытарыяльная аўтаномія на доўгі час ня вырашыла б справу, але, можа, трохі б яе залатала. Аднак… беларускі народ бачыць толькі факты і сёньня ўсё больш зьвяртае свае вочы на ўсход, дзе ёсьць магчымасьць культурнага разьвіцьця і шмат робіцца, каб цяжкое сёньняшняе эканамічнае становішча селяніна было палепшана».

Такім чынам, поўная бязьдзейнасьць польскага ўраду ў сфэры нацыянальнай палітыкі аж да 1924 г. прывяла да страты ім ініцыятывы ў гэтым пытаньні. Гэтую ініцыятыву перанялі

камуністычныя ўлады суседняга СССР, якія, у адрозьненьне ад палякаў, у той час мэтадычна і пасьлядоўна працавалі як з насельніцтвам Заходняй Беларусі, так і зь яго палітычнай элітай. Куркевіч таксама згадвае пра гэта, адзначаючы, што «параўнаньне ўмоваў беларускага нацыянальнага жыцьця на тэрыторыі Польскай Рэспублікі і БССР выглядала тады выразна не на карысьць Польшчы» (с. 32). Фактычна польскі ўрад цалкам прайграў неаб'яўленую вайну за душы заходніх беларусаў бальшавіцкім уладам з Масквы і Менску. І менавіта тут, а ня ў сойме, заходнебеларускія дзеячы праявілі недасьведчанасьць, паддаўшыся на правакацыю бальшавікоў, што ў далейшым мела трагічныя наступствы для ўсяго беларускага руху.

Адным зь нямногіх у польскім урадзе, хто ў той час усьведамляў небясьпеку такога разьвіцьця падзеяў і імкнуўся яе выправіць шляхам рэальнага забесьпячэньня ня толькі матэрыяльных, але і культурна-адукацыйных патрэбаў насельніцтва «крэсаў», быў Станіслаў Тугут. Куркевіч, даючы ў сваёй кнізе падрабязнае апісаньне ўсіх ягоных праектаў, ані словам, аднак, ня згадвае пра тое, як безумоўна дэмакратычныя і карысныя меншасьцям распрацоўкі Тугута ўспрымаліся прадстаўнікамі беларускай грамадзкасьці. А гэты аспэкт вельмі важны для разуменьня спэцыфікі тагачасных польска-беларускіх дачыненьняў. Выйшла так, што Тугут практычна апынуўся паміж двух агнёў. Мала таго, што ягоныя праекты не былі прынятыя польскім урадам і фактычна засталіся на паперы, але ўся ягоная дзейнасьць была скрытыкаваная таксама і зь беларускага боку. Гэта толькі падкрэсьлівае глыбіню той прорвы, якая ўтварылася паміж беларускай і польскай нацыянальнымі элітамі. Няма сумневу, што Тугут трымаўся дэмакратычных і выключна лібэральных у адносінах да меншасьцяў поглядаў зусім шчыра, пра што сьведчыць уся ягоная біяграфія. Але адначасова з тым безумоўнай каштоўнасьцю для Тугута як паляка была польская дзяржава, інтарэсы якой ён стараўся захаваць пры распрацоўцы сваіх праектаў. У той жа самы час беларусаў мала хваляваў лёс польскай дзяржавы як такой. Яны сапраўды ня сталі яе ляяльнымі грамадзянамі, у першую чаргу таму, што сама дзяржава не прыклала дзеля гэтага належных намаганьняў.

Гісторыя ня мае ўмоўнага ладу, але, тым ня менш, цікава, як разьвіваліся б беларуска-польскія стасункі ў міжваеннай Польшчы, калі б усе распрацаваныя ўрадам Грабскага праекты былі прынятыя і, што ня менш важна, не засталіся б пустымі дэклярацыямі. Куркевіч не рашыўся рабіць нейкіх значных рэфлексіяў на гэтую тэму, адзначыўшы толькі, што «нельга выключаць, што каб вышэйзгаданыя праекты ўвасобіліся ў жыцьцё, то сытуацыя на Крэсах разьвівалася б зусім нечакана» (с. 77). Мы ж рызыкнём прыпусьціць, што наўрад ці нават у такім выпадку былі б дашчэнту зьліквідаваныя бальшавіцкія ўплывы ў Заходняй Беларусі. Прыцягальнасьць камуністычных ідэяў нават саміх па сабе ў той час была вялікая: пад іх уплыў падпалі многія дастаткова рэспэктабэльныя дзеячы нават у разьвітых краінах Эўропы. Да таго ж відавочна, што ў любым выпадку палякі не маглі сабе дазволіць зрабіць такія саступкі меншасьцям, як гэта зрабілі бальшавікі ў СССР – гэта рэальна пагражала б цэльнасьці іхнай дзяржавы. Але ж, несумненна, у выпадку больш дальнабачнай нацыянальнай палітыкі палякі маглі б разьлічваць на стварэньне ў заходнебеларускім нацыянальным руху як альтэрнатывы камуністам уплывовай палянафільскай групы, да якой маглі б далучыцца беларускія дзеячы зь менш заплямленай рэпутацыяй, чым Арсень Паўлюкевіч, Яўген Міткевіч, Янка Шурпа і іншыя, малаэфэктыўную дзейнасьць якіх М. Куркевіч апісвае на старонках 95–98. Спроба польскага ўраду абаперціся на гэтых дзеячаў справе толькі пашкодзіла, бо яны яшчэ да пачатку супрацоўніцтва з палякамі мелі благую рэпутацыю. Самае цікавае, што камуністычныя ўплывы адчуваліся нават і ў гэтых асяродках: пад іх прыкрыцьцём радыкальныя элемэнты часам праводзілі выразна антыпольскую дзейнасьць. А сам сымбаль тагачаснага беларускага палянафільства Арсень Паўлюкевіч, паводле сьведчаньня Францішка Аляхновіча, які яго добра ведаў, у 1928 г. быў асуджаны польскім судом як агент… савецкага ГПУ. Прыход пад польскія сьцягі беларускіх палітыкаў з больш-менш прыстойнай рэпутацыяй і безумоўнымі заслугамі перад беларускім рухам, такіх, як Антон Луцкевіч ці Янка Станкевіч, адбудзецца толькі ў канцы 1920-х гг., калі пачало выразна пазначацца, што экспэрымэнт зь «беларусізацыяй» у БССР заканчваецца, а «Беларускі П’емонт» з цэнтрам у Менску аказаўся толькі рамантычнай

марай. Да таго ж зьмену сытуацыі адчулі і польскія ўлады, якія пасьля разгрому Грамады ў пачатку 1927 г. рашыліся на падтрымку памяркоўных беларускіх элемэнтаў і пайшлі на пэўныя, хоць і кароткачасовыя, саступкі ім у культурна-адукацыйнай і гаспадарчай сфэры. Аднак жа нельга таксама адназначна сказаць, як гэта робіць М. Куркевіч на с. 117, што пачатак рэпрэсіяў у СССР «аўтаматычна зьліквідаваў сацыяльную базу антыкамуністычнай беларускай ірэдэнты ў міжваеннай Польшчы». Аўтарытэт камуністаў сапраўды значна зьнізіўся ў 1930-я гг. (як, дарэчы, і беларускіх нацыянальных партыяў), але аж да свайго роспуску ў 1938 г. яны мелі пэўную падтрымку ў Заходняй Беларусі.

Такім чынам, праекты У. Грабскага, даволі дэмакратычныя па сваёй сутнасьці, у цэлым ня здолелі кардынальна зьмяніць сытуацыі на «крэсах» і прадухіліць нарастаньня міжнацыянальнага антаганізму паміж беларусамі і палякамі, тым больш што збольшага засталіся на паперы. Яны з самага пачатку былі нэгатыўна ўспрынятыя як насельніцтвам, так і заходнебеларускай палітычнай элітай. М. Куркевіч на старонках сваёй працы некалькі разоў адзначае, што пазытыўнае вырашэньне нацыянальнага пытаньня на «крэсах» было немагчымае ў першую чаргу з-за маральнай непрыгатаванасьці да гэтага польскага грамадзтва, выхаванага на ідэях «Трылёгіі» Гэнрыка Сянкевіча, значная частка сюжэту якой адбываецца на тэрыторыі былога Вялікага Княства Літоўскага. Увогуле, згодна з Куркевічам, «значная частка літаратурнай творчасьці (і наагул мастацкай), якая адыгрывае істотную ролю ў стварэньні нацыянальнай міталёгіі, зьвязаная з Крэсамі» (с. 54). Вядома, гэты фактар нельга цалкам скідваць з рахунку. Але нельга забывацца і пра ўзьдзеяньне яшчэ аднаго міту, які быў распаўсюджаны перш за ўсё ў польскіх палітычных колах і браў пачатак з самага зараджэньня беларускага нацыянальнага руху ў канцы XIX – пачатку XX ст. Гэта міт пра штучнасьць беларускай нацыянальнай ідэі, пра яе інсьпіраванасьць вонкавымі сіламі. Перад рэвалюцыяй улады Расейскай імпэрыі ўспрымалі беларускі рух як «польскую інтрыгу», а пасьля аднаўленьня незалежнай Польшчы ўжо палякі сталі лічыць беларускасьць інтрыгай бальшавіцкай. Адпаведна і мэтады барацьбы зь ёю ня шмат розьніліся ад

мэтадаў барацьбы з камунізмам.

Куркевіч у сувязі з гэтым адзначае, што «іронія лёсу – але найбольш трывалую памяць па адносна лібэральным у крэсовай палітыцы ўрадзе Грабскага меў Корпус аховы памежжа» (с. 116). Тут можна пагадзіцца з аўтарам, але трэба пры гэтым адзначыць, што перашкодай для агульнай тэндэнцыі радыкалізацыі беларускага руху ў Польшчы гэтыя захады таксама ня сталі. Былі толькі спыненыя яе скрайнія вонкавыя праявы – узброеная партызанская барацьба і дывэрсійныя налёты з-за мяжы. Ураду ўдалося ня вылечыць хваробу, а толькі загнаць яе ўсярэдзіну. І хвароба час ад часу давала рэцыдыў, самай выразнай праявай чаго быў маланкавы рост у другой палове 1926 г. колькасьці сяброў выразна апазыцыйнай у дачыненьні да польскіх уладаў Беларускай сялянска-работніцкай грамады.

У цэлым праца Міхала Куркевіча – цаглінка ў даволі саліднай польскай гістарыяграфіі беларускага пытаньня ў міжваеннай Польшчы. Рэвалюцыі ў ёй яна ня зробіць, але і зусім незаўважанай, хутчэй за ўсё, не застанецца. Польскі погляд на праблему аўтар выклаў, але беларускім гісторыкам ёсьць яшчэ што сказаць са свайго боку. Ці ня гэта меў М. Куркевіч на ўвазе, зьмяшчаючы напрыканцы сваёй манаграфіі рэзюмэ ня толькі на ангельскай, але і на беларускай мове клясычным правапісам?
[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/07/16
[image]

УЛАДЗІМЕР МАЦКЕВІЧ

Уладзімер Мацкевіч Людзі і манэкены

мэтадоляг. Апошняя публікацыя ў «ARCHE» – «Базіс і сьвядомасьць. Дыялектыка Шаўцова» (6/2005).

Дементей Н. *Уроки жизни.* – Минск: БелТА, 2005.

Гриб М. И. *Белорусский мост: история, факты, события.* – Минск, 2005.

Маннергейм К. г. *Мемуары.* – Москва: Вагриус, 1999.

Наленч Д., Наленч Т. *Юзеф Пилсудский – легенды и факты.* – Москва: Политиздат, 1990.

На маім стале ляжаць чатыры кнігі. Дзьве зь іх мне даў Валер Булгакаў, прапанаваўшы прачытаць іх і выказаць сваё меркаваньне, а яшчэ дзьве я зьняў з паліцы сам, каб мець нейкі ўзор для параўнаньня. Першыя дзьве – гэта мэмуары Мікалая Іванавіча Дземянцея і Мечыслава Іванавіча Грыба, а для параўнаньня я ўзяў мэмуары Карла Густава Манэргейма і біяграфію Юзафа Пілсудзкага.

Шчыра кажучы, першы ж мой погляд на жыцьцё і дзейнасьць Дземянцея і Грыба быў не нэўтральны, а хутчэй ангажаваны. Падзеі, зь якімі зьвязаная дзейнасьць гэтых палітыкаў, вельмі ўжо блізкія ад сёньняшняга дня. Мы яшчэ не аджылі наступстваў гэтых падзеяў, і яны не здаюцца нам як цалкам гістарычныя, а хутчэй як актуальныя палітычныя падзеі. Таму

мне было проста неабходна параўнаньне іх мэмуараў зь біяграфіямі Пілсудзкага і Манэргейма, каб памятаць пра маштаб падзеяў, пра ўзровень патрабаваньняў да палітычных дзеячаў, якія воляю лёсу апынуліся на гістарычных пераломах, калі на руінах буйных імпэрыяў паўставалі маладыя нацыі і малыя дзяржавы.

Я з самага пачатку меркаваў, што пасьля прачытаньня Дземянцея і Грыба буду параўноўваць іх з палітычнымі дзеячамі іншых народаў, якія жылі і дзейнічалі ў аналягічных гістарычных абставінах. Праўда, я ня думаў, што гэтае параўнаньне кардынальным чынам зьменіць стыль і жанр маёй рэцэнзіі, а здарылася менавіта так.

Разгарнуўшы кнігу Дземянцея, я адразу ж настроіў сябе на вясёлы й іранічны лад. Зь першых жа старонак у мяне склаўся вобраз аўтара, і падчас чытаньня ўзьнікалі розныя вобразы і нават цэлыя выразы для будучай рэцэнзіі. Я й меркаваў, што гэтая рэцэнзія будзе накшталт фэльетону. Але потым я адмовіўся ад гэтай ідэі. Такую эвалюцыю ў сваім стаўленьні мне важна адзначыць, бо прачытаць кнігу Дземянцея можна толькі ў пэўным настроі. Без іроніі яе нельга дачытаць да канца альбо, каб зрабіць гэта, трэба мець такі ж склад розуму, як і ў самога Дземянцея. Да таго ж, пры чытаньні ягонай кнігі я памятаў, што трэба будзе чытаць і Грыба. А я ўжо меў гонар чытаць ягоную папярэднюю кнігу, а калісьці нават напісаў артыкул з крытыкай ягонага выступу як кіраўніка дзяржавы. Карацей, я меў вельмі перадузятыя меркаваньні. Але падчас працы я іх зьмяніў. У выніку тэкст атрымаўся кароткі, карацейшы, чым я меркаваў напачатку, і зусім не вясёлы. Такім чынам, па парадку.

Я не засьпеў Мікалая Дземянцея ў якасьці кіраўніка дзяржавы. У тыя гады я жыў у іншых частках напаўразваленага СССР. А калі вярнуўся ў Беларусь, то пра Дземянцея чуў толькі показкі і жарты накшталт «у нас хто как хаціт, тот так і гаварыт» або «не стойте в заднем проходе». Зразумела, што веданьне такога кшталту не настройвае на сур'ёзнае стаўленьне да чалавека. А першыя ж старонкі кнігі Дземянцея толькі паглыбляюць гэтае ўражаньне. Рэч у тым, што напісаныя яны захапляльным

стылем «Пионерской зорьки», у амаль забытым жанры савецкай журналістыкі, калі вакол усё так добра, што пра гэта можна казаць толькі «с чувством законной гордости», хаця й «встречаются у нас кое-где еще порой отдельные недостатки». Сур'ёзна чытаць гэта проста немагчыма. Гэтай кандовай мовай газэтных перадавіцаў часу застою напісаная ўся першая палова кнігі. Усе пэрсанажы называюцца па імю й імю па бацьку. Усе, а таксама і аўтар, «участвуют в великих свершениях» як «скромные труженики». Гадоў да пяцідзесяці аўтар быў аточаны гераічнымі партызанамі, перадавымі калгасьнікамі, мудрымі настаўнікамі, клапатлівымі кіраўнікамі. Усё вакол адбывалася правільна, гладка, разумна, юны Дземянцей упэўнена хістаўся разам зь лініяй партыі. Ці ствараліся МТС, ці ўзбуйняліся калгасы, ці дзяліліся райкамы паводле вытворчага прынцыпу, ці засейваліся палі кукурузай – усё ў любым разе сканчалася прысуджэньнем сьцягоў, узнагароджаньнем граматамі і прасоўваньнем юнага Мікалая Іванавіча па службе. У мэмуарах няма аніводнай спробы аналізу і асэнсаваньня падзеяў. Аўтар пераяжджае з раёну ў раён, з вобласьці ў вобласьць, мяняе адну працу на іншую. І нідзе ў яго не ўзьнікае жаданьня асесьці, спыніцца, заняцца нечым дзеля ўласнага самавызначэньня ці пакліканьня. Не, ён заўсёды там, куды пасылае яго кіраўніцтва. Сьмешна, але ў гэтым няма нават патасу камсамольскіх воклічаў кшталту таго, што «куда партия пошлет…». Усё больш проста і будзённа, Дземянцея заўсёды пасылае кіраўніцтва. Усе кіраўнікі «имели большой практический опыт», былі «наделены житейской мудростью» і г. д. Праўда, незразумела, чым жа быў надзелены сам Дземянцей? Трэба сказаць, што я не адрываючыся прачытаў кнігу да канца, таму што зь першых жа старонак у мяне ўзьнікла пытаньне, на якое я нецярпліва хацеў атрымаць адказ: ці зьдзейсьніў Мікалай Дземянцей хаця б АДЗІН УЧЫНАК у сваім жыцьці? Калі ён і зьдзяйсьняў учынкі, то палічыў нявартым паведамляць пра гэта ў сваіх мэмуарах. Адзіная згадка пра нешта падобнае – у апісаньні таго, як, апраўдваючыся за затрымкі ў сяўбе перад Машэравым, Дземянцей аднойчы пасьмяяўся, што патрабаваць ад сельскай гаспадаркі плянавых паказьнікаў гэта ўсё адно што патрабаваць ад цяжарнай нараджаць, калі час яшчэ не прыйшоў. Другі намёк на ўчынак – сыход на пэнсію з пасады

старшыні Вярхоўнага Савету пасьля жнівеньскага путчу 1991 году. Але гэта выдае хутчэй маё жаданьне бачыць учынкі. Сам жа аўтар мэмуараў ня лічыць патрэбным пісаць пра свае ўчынкі, ён ня цэніць гэтага ў сабе.

Думаю, што кніга Дземянцея – добры ўзор пэўнага тыпу асобы. Гэты тып спэцыяльна гадаваўся ў Беларусі некалькі пакаленьняў. Ён шырока распаўсюджаны сярод кіраўнікоў і намэнклятуры, і гэтае шырокае распаўсюджаньне дасягаецца мэтанакіраванай сэлекцыяй. У кіраўніцтва абіраюць людзей паслухмяных, ня здольных на ўласныя ўчынкі, людзей, якія ня маюць уласнага меркаваньня.

Такія людзі – поўная супрацьлегласьць іншаму тыпу, які мы прывыклі называць амэрыканскім выразам self-made man – чалавек, які зрабіў сябе сам. Дземянцей і яму падобныя – людзі, якіх рабіла намэнклятура дзеля самой сябе, для ўласнага ўзнаўленьня. У адрозьненьне ад сэлфмэйдмэнаў іх называлі вылучэнцамі. Гэтыя людзі ня робяць кар'еры, іх прасоўваюць. Яны наагул нічога ня робяць, ні за што не адказваюць, але іх прасоўваюць узровень за ўзроўнем. І калі не адбываецца нічога надзвычайнага, яны могуць даслужыцца да вельмі высокіх пасадаў. Да вельмі высокіх, але ніколі да першых і галоўных. Усё-ткі першыя і галоўныя месцы займаюць людзі, здольныя на ўчынкі. Так здарылася і зь Дземянцеем, ён стаў старшынём Вярхоўнага Савету БССР у ліпені 1989 году, то бок яшчэ ў Савецкім Саюзе, а не ў сувэрэннай краіне. Да таго ж нават у імпэрскім рэгіёне гэтая пасада не была галоўнай, старшыня Вярхоўнага Савету быў трэцяй асобай пасьля першага сакратара ЦК КПБ і старшыні Савету міністраў. Менавіта на гады старшынёўства Дземянцея прыпадае пералом, калі партыйныя сакратары губляюць уплыў, а сьпікеры парлямэнтаў выходзяць на першыя ролі. Так на першую пазыцыю ў дзяржаве трапляе чалавек, зусім ня здольны на самастойныя ўчынкі. Гэта мае аграмадную важнасьць у кантэксьце кнігі самога Дземянцея. Ён некалькі разоў задаецца пытаньнем пра тое, чаму і як разваліўся СССР. Але адказ ёсьць у ягонай кнізе – СССР разваліў Мікалай Іванавіч Дземянцей і кіраўнікі, падобныя да яго. Апісаньне ўдзелу аўтара ў Віленскіх падзеях 1991 году, апісаньне ягоных

уражаньняў ад ГКЧП і ўласных паводзінаў – усё гэта выразна паказвае, што дзяржава з такімі кіраўнікамі нежыццяздольная.

Кніга Дземянцея відавочна дзеліцца на дзьве часткі. Першая – радаснае і бессэнсоўнае дзяцінства, якое цягнецца гадоў да пяцідзесяці. Стыль першай часткі наіўна-захоплены, стыль другой – незадаволена-буркатлівы. На стыку абедзьвюх гэтых частак – пагібель Машэрава і вялізная колькасьць фатаздымкаў зь пяцідзесяцігадовага юбілею самога аўтара.

Ні ў першай, ні ў другой частцы кнігі немагчыма знайсьці фактаў, якіх не было б у газэтах адпаведнага пэрыяду. Пра пагібель Машэрава мы не даведваемся нічога новага. Гэтая падзея апісана вельмі сьцісла, хаця на лёсе самога аўтара яна пакінула вялікі сьлед, як і на лёсе ўсёй Беларусі. Няўжо ж аўтар нічога ня ведаў, акрамя таго, што было паведамлена афіцыйна? Мо і ня ведаў ці не жадаў ведаць. Як і пра чарнобыльскую аварыю, пра ГКЧП, пра ўсё важнае і значнае для краіны і для эпохі. Меней ведаеш – лепш сьпіш.

Дземянцей зьбярог свае нэрвы. Ён бадзёры і актыўны на восьмым дзясятку жыцьця, адной з самых неверагодных падзеяў якога быў падпал ягонага лецішча. Але й гэта ўладзілася. Цяпер ён паважны й заслужаны пэнсіянэр, і гэта заканамерны вынік доўгага і аднастайнага жыцьця чалавека, ня здольнага на зьдзяйсьненьне ўчынкаў.

На фоне такой аўтабіяграфіі жыцьцё Мечыслава Грыба выглядае бурлівым і авантурным. Кантрастам зьяўляецца менавіта тое, што трэцяга старшыню Вярхоўнага Савету 12-га скліканьня пазбавілі пэрсанальнай заслужанай пэнсіі.

Пасьля кнігі Дземянцея Грыб успрымаецца зусім іначай. Яшчэ да прачытаньня кнігі пра яго я ведаў значна болей. Для мяне важнымі былі тры рэчы, якімі запомніўся Грыб:

1. Ягоны ўдзел у «віцебскай справе». Ужо адзін гэты факт біяграфіі Грыба робіць яго кантрастам Дземянцею. З тым у жыцьці ўсё адбывалася само. А «віцебская справа» не магла быць раскрытая сама сабой, без намаганьняў і ўчынкаў. Трэба было мець вялікую сьмеласьць, каб у савецкі час давесьці да

канца гэтае расьсьледаваньне. Сьмеласьць была ня толькі ў тым, каб знайсьці сапраўднага злачынцу, але і каб рэабілітаваць невінавата асуджаных і выявіць заганы ў сыстэме праваахоўных органаў.

2. Фатаздымак у красавіцкіх газэтах 1995 году, на якім старшыня ВС Рэспублікі Беларусь М. Грыб выпівае з прэзыдэнтам краіны А. Лукашэнкам на наступны дзень пасьля зьбіцьця 18 дэпутатаў проста ў Авальнай залі. (Шкада, што гэты фатаздымак ня трапіў у кнігу Грыба. Думаю, што калі будзе напісана не аўтабіяграфічная кніга, а гістарычная біяграфія, бяз гэтага фатаздымку не абыдзецца.)

3. Правальныя назіраньні за ходам выбараў пад кіраўніцтвам генэрал-лейтэнанта МУС, заслужанага юрыста й г. д., што ня мелі аніякіх юрыдычных наступстваў для злачынцаў і парушальнікаў усіх нормаў выбарчага права.

Аднак усё пазнаецца ў параўнаньні. На фоне вылегчанай гісторыі краіны і лякаванай аўтабіяграфіі ў мэмуарах Дземянцея, кніга Грыба можа падацца выбітным дакумэнтам эпохі. Непрыўкрашанае апісаньне даваеннага і паваеннага дзяцінства, вядомая, але практычна не сустраканая ў савецкіх і беларускіх кнігах дваістая праўда пра партызанаў. Згадка пра «нацыянальных партызанаў», то бок пра існаваньне ўзброенага супраціву савецкай уладзе аж да 1954 году. Нармальныя чалавечыя меркаваньні пра калгасны лад, пра жыцьцё ў СССР – усё гэта істотна розьніць кнігу Грыба ад кнігі Дземянцея.

У тэксьце Грыба прысутнічае аўтар, з уласным стаўленьнем да таго, што адбывалася, да таго, у чым сам аўтар актыўна ўдзельнічаў. Удзельнічаў, зьдзяйсьняў учынкі, памыляўся, перамагаў і прайграваў. Грыб робіць нават спробы аналізу тых падзеяў, у якіх браў удзел.

Праўда, калі падыходзіць строга, то гэта толькі спробы аналізу. Па вялікім рахунку, у кнізе Грыба таксама няма нічога такога, што нельга было б прачытаць у газэтах. Толькі гэта ня тыя газэты, якія чытае і любіць Дземянцей. Грыб таксама павярхоўны ў аналізе, таксама хавае факты, якія замоўчваліся ў газэтах адпаведнага пэрыяду.

Паміж Грыбам і Дземянцеем вялізная розьніца. Гэта грамадзяне розных краінаў, прадстаўнікі розных пакаленьняў. Дземянцей усяго толькі на восем гадоў старэйшы за Грыба. Але адзін нарадзіўся ў савецкай Беларусі, а другі – у Заходняй. Жыцьцё і дзейнасьць абодвух ішлі ў трох сумежных абласьцях: Віцебскай, Гарадзенскай і Менскай. Але адзін – грамадзянін СССР, а другі – грамадзянін Рэспублікі Беларусі. Першы ўзначальваў найвышэйшы прадстаўнічы орган рэгіянальнай улады на тэрыторыі з абмежаванай аўтаноміяй, другі быў другім кіраўніком незалежнай дзяржавы – Рэспублікі Беларусі. Прычым Дэкларацыю незалежнасьці напісаў, прапанаваў і падпісаў першы.

Парадокс у тым, што Дземянцей быў апошнім кіраўніком савецкай Беларусі, а Грыб другім (пасьля Шушкевіча) стаў на чале незалежнай Рэспублікі Беларусі, але абіраліся яны ў суседніх акругах і ўзначальвалі адзін і той жа склад Вярхоўнага Савету 12-га скліканьня. Апошні савет БССР і першы парлямэнт Рэспублікі Беларусі.

Дземянцей і Грыб, здавалася б, сучасьнікі, але, з другога боку, яны жывуць у розны час, яны прадстаўнікі розных культураў. Ці магчыма паміж імі паразуменьне? Бо нават мовы іх мэмуараў цалкам адрозныя. Абодва ўспаміны напісаныя па-расейску, і тым ня менш гэта розныя мовы. Гэтая акалічнасьць зь вялікай цяжкасьцю ўсьведамляецца ў Беларусі. Водападзел, бездань, барыкада ў нашай краіне праходзяць не паміж русскоязычными і беларускамоўнымі, а паміж карыстальнікамі нармальнай чалавечай мовай і тымі, хто гаворыць на штучнай навамове. Навамова апісана Дж. Оруэлам у рамане «1984». Гэтая мова там яшчэ называецца «ангсац» – г. зн. ангельская сацыялістычная мова. Такая штучная мова можа быць створаная на аснове любой натуральнай, напрыклад, «русский социалистический язык» або «баларуская сацыялістычная мова». Хто-кольвек, хто прачытае першую частку мэмуараў Дземянцея, зможа атрымаць дастатковае ўяўленьне пра «русский социалистический язык». А на старонках 58–59 зьмешчаны ўрывак з раённай вушацкай газэты «Патрыёт», зь якога можна атрымаць пэўнае ўяўленьне і пра «беларускую сацыялістычную мову», хіба што там тэксту мала. Для паўнаты

трэба слухаць перадачы першай праграмы беларускага радыё.

Розьніца паміж нармальнай мовай і навамовай не такая, як паміж наркамаўкай ды тарашкевіцай (хоць навамова і грунтуецца цалкам на наркамаўцы). Першасная розьніца палягае на ўзроўні сэмантыкі словаў, іх сэнсу і зьместу. Зьмест словаў навамовы не дазваляе перадаваць чалавечых пачуцьцяў, сэнсаў, зьвязаных з правамі чалавека, духоўнымі каштоўнасьцямі, найперш – каштоўнасьцямі свабоды, чалавечай годнасьці і гонару.

Другая частка кнігі Дземянцея значна адрозьніваецца ад першай. Ці то зьмяніўся літаратурны апрацоўшчык або сьпічрайтэр, ці то ў сталым веку аўтар набыў здольнасьць да чалавечых пачуцьцяў. Ён пачынае з чымсьці не згаджацца, штосьці адмоўна ацэньваць. Гэта тычыцца і перабудовы, і дзеяньняў Гарбачова, і дзейнасьці Вярхоўнага Савету, якім сам аўтар і кіраваў. Крытычныя заўвагі, праўда, ніяк ня сьведчаць пра наяўнасьць аналізу. Гэта проста незадаволенасьць.

Іншая справа – крытычныя выказваньні Грыба. Дзе-нідзе Мечыслаў Грыб спрабуе асэнсоўваць падзеі і ўчынкі. Спробы спробамі, а для аналізу чагосьці не хапае. І мэмуары Грыба шмат у чым базуюцца на штампах і трафарэтах павярхоўных дэмакратычных газэтаў, якія ён чытаў. Складваецца ўражаньне, што нават вобраз самога сябе як палітыка і дзяржаўнага дзеяча Грыб запазычыў у тых жа газэтах.

Чытаючы мэмуары Грыба, я лепш разумею яго самога, матывацыю ягоных дзеяньняў. Але я не знаходжу там нічога новага, нечаканага. Нават пра знакамітую і легендарную «віцебскую справу». Можа, толькі апавяданьне пра дзяржаўны пераварот 1996 году можа супярэчыць маёй папярэдняй тэзе. Мне было сапраўды цікава пазнаёміцца зь меркаваньнем непасрэднага ўдзельніка гэтых лёсавызначальных падзеяў. Разумею, што гэта суб'ектыўныя меркаваньні, але гэта меркаваньні грамадзкага і дзяржаўнага дзеяча, які стаяў досыць блізка да эпіцэнтру падзеяў, займаў выразную пазыцыю і рабіў тое, на што быў здольны. Праўда, здольны, як паказала гісторыя, быў не на многае. Як і іншыя ўдзельнікі тых падзеяў.

І гэта вельмі істотна. Бо такія людзі, як Дземянцей, паспрыялі спачатку заняпаду СССР, а потым і развалу яго, а такія людзі, як Грыб, паспрыялі таму, што мы маем у незалежнай Беларусі той рэжым, які сёньня маем.

Гісторыя не карыстаецца мэтадам спробаў і памылак. Што адбылося, тое адбылося. Ці магло быць іначай? Ці ёсьць аўтарытарызм і дыктатура абавязковай фазай у разьвіцьці маладой нацыі і дзяржавы?

Мяркую, што ня варта займацца варажбой з нагоды абмеркаваньня варыянтаў гістарычнага разьвіцьця. Гісторыя вымагае асэнсаваньня, з аднаго боку, і актыўнага дзеяньня, з другога. У гісторыі бываюць моманты, калі асабісты ўчынак, можа, нават аднаго чалавека, вызначае гістарычны лёс. Гэта калі асобныя людзі твораць гісторыю на дзесяцігодзьдзі і стагодзьдзі. Як у сельскай гаспадарцы адзін дзень год корміць, так і ў пераходныя пэрыяды гісторыі паводзіны аднаго чалавека вызначаюць лёс нацыі.

Яскравым прыкладам такога чалавека для мяне заўсёды быў адзін з самых знакамітых стваральнікаў незалежнай Фінляндыі Карл Густаў Манэргейм. Афіцэр і генэрал войска Расейскай імпэрыі і кіраўнік незалежнай краіны, які пад старасьць вымушаны быў узначаліць вайну свайго народу супраць былой мэтраполіі, і выйграў яе. Біяграфія Манэргейма – прыклад асобы, пра якую гісторыя захавала толькі станоўчыя зьвесткі.

Трохі іншы прыклад дае жыцьцё і дзейнасьць Юзафа Пілсудзкага, гістарычнай асобы, да якога і сучасьнікі, і нашчадкі заўсёды ставіліся амбівалентна. У Манэргейма і Пілсудзкага шмат супольнага, як у жыхароў і афіцэраў адной імпэрыі, і шмат адрознага, як у кіраўнікоў розных дзяржаваў – Фінляндыі, якая пад кіраўніцтвам маршала Манэргейма ўпершыню ў гісторыі набыла незалежнасьць, і Рэчы Паспалітай Польскай, якая пры актыўным удзеле маршала Пілсудзкага сваю незалежнасьць аднавіла.

Не да месца цяпер абмяркоўваць жыцьцё і дзейнасьць гістарычных пэрсанажаў іншых народаў. Проста іх постаці, іх біяграфіі стаялі перад маімі вачыма, калі я чытаў мэмуары

Дземянцея і Грыба.

Усё пазнаецца ў параўнаньні. Мечыслаў Грыб – у параўнаньні зь Мікалаем Дземянцеям, і яны абодва – у параўнаньні з Карлам Манэргеймам і Юзафам Пілсудзкім.

Чытаючы і перачытваючы ўсе гэтыя кнігі, я думаю пра Беларусь. І галоўны зьмест гэтых думак – чаго мы можам чакаць і патрабаваць ад нашых кіраўнікоў? Пакуль мы не адкажам сабе на гэтае пытаньне, мы будзем падпарадкоўвацца тым, хто ня здольны на ўчынкі, ня тое што на гістарычныя дзеяньні. Мы ніколі ня зможам убачыць сярод свайго народу такіх, як К. г. Манэргейм ці Ю. Пілсудзкі.

А ці ёсьць такія сярод беларусаў? А ці патрэбныя яны нам?
[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне [**mk**]. Абнаўленьне [**czyk**].
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2006/06/18**
[image]

ПЁТРА РУДКОЎСКІ
філёзаф і багаслоў, сталы аўтар «ARCHE».

Пётра Рудкоўскі «Мяне няма»: роздум інквізытара на руінах Акудовіча – II

Акудовіч, Валянцін. *Мяне няма. Роздумы на руінах чалавека*. – Менск: БГАКЦ, 1998.

Акудовіч, Валянцін. *Дыялогі з Богам*. – Мінск: Логвінаў, 2006.

Ах, што ж гэта за божышча такое,
да якога хор шляхетных духаў
клікма кліча: «Гора!
Ты пабурыў наш сьвет кулаком сваім магутным,
валіцца, развальваецца!»

Фрыдрых Ніцшэ.
Народзіны трагедыі з духу музыкі

Інквізыцыю ніколі не цікавілі і не цікавяць бязбожнікі або

атэісты. Яе цікавяць *выключна* рэлігійныя людзі. Ян Гус, Джардана Бруна ці наш славуты Казімер Лышчынскі пайшлі на вогнішча не за бязбожнасьць, а *за рэлігійнасьць*. Так, іх называлі бязбожнікамі і здрайцамі веры, але, мабыць, самі іхныя абвінаваўцы ў глыбіні душы адчувалі, што ў сэрцах гэтых «бязбожнікаў» больш веры ў Бога, чым у сэрцах іх саміх.

Інквізыцыя ў гісторыі хрысьціянства – гэта мэтафізычны парадокс. З падобным парадоксам мы мелі дачыненьне таксама тады, калі Богам-абраны-Народ аддаў на ўкрыжаваньне Богам-абранага-Чалавека. Альбо тады, калі свабодалюбныя Атэны асудзілі на сьмерць свабодалюбнага Сакрата. Набожнага Сакрата абвінавацілі ў атэізьме, а з Хрыстом увогуле выйшла нешта неверагоднае: перад рымскімі ўладамі яго абвінавацілі ў антырымскай дзейнасьці («лічыць сябе каралём Ізраілю, забараняе плаціць падатак цэзару»), а перад юдэйскімі – у антыюдэйскай (маўляў, «хоча разбурыць сьвятыню» – апошні сымбаль і апірышча юдэйскага народу). Калісьці адданых вернікаў-хрысьціянаў у Рымскай імпэрыі называлі атэістамі. Сёньня найбольш заўзятых змагароў за беларускасьць абвінавачваюць у «антыбеларускай дзейнасьці» ў нашай краіне. Беларуская сытуацыя – гэта, бадай, апошняе рэха таго самага Парадоксу.

З усьведамленьнем гэтага парадоксу я і прыступаю да чытаньня кніг Акудовіча. У гэтых кнігах ёсьць багата тэматычных адзінак: «архіпэляг Беларусь», «першае каханьне», «кніга», «Расея», «утульнасьць», «няма». Сярод розных аб'ектаў арыгінальнай рэфлексіі гэтага філёзафа зьяўляецца Бог. Па інэрцыі сказалася: «сярод аб'ектаў», а тым часам Бог у разважаньнях Акудовіча *не аб'ект*, а *суб'ект*. Акудовіч ня піша пра Бога, ён *размаўляе з Богам*. І ў гэтым пляне Акудовічава тэалёгія вельмі цікавая. Мала хто з артадаксальных тэолягаў размаўляе з Богам. Артадаксальныя *тэолягі загналі Бога ў космас тэкстаў*, скавалі Яго сылягізмамі і дэдукцыямі, ператварыўшы ў дасканалую мумію, падставу статычнага быцьця. Калі б пасадзілі Яго ў звычайную турму альбо зладзілі Яму выгнаньне на які-небудзь востраў на зямлі, дык лягчэй было б Яго знайсьці. А так – Бог закансэрваваны ў тэкстах, і няма эфэктыўнага мэтаду, каб разарваць тканіну словаў, сказаў

і нарацыяў і ўбачыць пад гэтай тканінай Яго – *Бога Жывога*.

Артадаксальныя тэолагі нагадваюць таксама *экспэртаў*, якія сваё заданьне бачаць перш за ўсё ў тым, каб правесьці экспэртызу на прававернасьць: сьцьвердзіць, ці пэўны тэзіс адпавядае ці не адпавядае *дагматыцы*. Такім чынам, Божыя слугі становяцца *слугамі Тэксту*. Такая тэалёгія-экспэртыза забівае жывы досьвед Боскага. Бог уцякае ад богазнаўцаў і шукае для сябе месца сярод «атэістаў» кшталту Сакрата альбо *першых хрысьціянаў*. А цалкам магчыма, што шукае месца таксама сярод *апошніх не-хрысьціянаў*, такіх, як Акудовіч.

ЧАСТКА ПЕРШАЯ.
ПАРАДОКСЫ АКУДОВІЧАВАЙ РЭЛІГІІ

Акудовіч – глыбока рэлігійны чалавек. Так, ён ёсьць *re-ligiosus* у тым першапачатковым сэнсе слова, які заключаны ў этымалёгіі: *re-ligio* – «усьцяж аднаўляная лучнасьць», «інтымная повязь». Далёка ня кожнага, хто называе сябе «веруючым», можна прызнаць *рэлігійным* чалавекам. Для многіх «веруючых», выхаваных на схаластычнай ці нэасхаластычнай дагматыцы, Бог застаецца Богам статычным, дадзенасьцю, *завершанай і непахіснай ад пачатку да канца*. Бог для іх – папросту Absolutus – Далёкая і Недасяжная Істота-Загадка, зь якой немагчыма завязаць асабісты пачуцьцёвы кантакт. З такім Богам, абсалютным Трансцэндэнсам, немагчымая інтымная повязь, гэта значыць, немагчыма *re-ligio*. А Акудовічу патрэбны прысутны Бог, такі, які «мае пэўны абрыс і лёгіку быцьця». «Мне любы мой Бог сваёй дваістасьцю, сваім сымбіёзам рэальнага і ідэальнага...»

Прыгадваецца тут Жорж Батай (George Bataille), які – таксама проціпастаўляючыся трансцэндэнтнаму Богу – шукае боскае ў... жывёльным сьвеце: «Жывёльны сьвет, – піша ў сваёй «Тэорыі рэлігіі», – ёсьць сьветам іманэнтнасьці і непасрэднасьці, паколькі сьвет гэты (...) ёсьць такім у такой ступені, у якой нельга знайсьці ў ім сьлядоў трансцэндаваньня». Тое, чым быў для Батая жывёльны сьвет «безь сьлядоў трансцэндэнцыі», тым для Акудовіча ёсьць Этнас, безь Якога, кажа, «я – нішто, камяк

жывога рэчыва, адзінае прызначэньне якога – вялічыць аб'ём біясфэры на зямной кулі. А прыстаўшы да Яго, я сам раблюся Ім».

* * *

На гэты матыў – пошук іманэнтнага Бога і прага злучыцца (*re-ligare*) зь Ім – трэба глянуць у шырэйшай філязафічнай пэрспэктыве. Іммануіл Кант, прымаючы выклік эпохі – апрацаваць мэтады *рацыянальнага* пазнаваньня рэчаіснасьці, – узяўся за грунтоўную крытыку чалавечага пазнаньня. Вынікам гэтае крытыкі сталася заява, што чалавечае пазнаньне мае дачыненьне адно толькі з *фэномэнамі*, г. зн. тым-што-явіцца ў наглядным пазнаньні. У пазафэнамэнальны сьвет мы ня можам выйсьці. Рэчы-самі-ў-сабе (*Dinge an Sich*) застаюцца непазнавальныя.

Вынікі Кантавай экспэртызы выклікалі існы бунт усіх, з выняткам рацыянальнае, сфэраў чалавека. Што значыць, што *рэчы-самі-ў-сабе непазнавальныя*? Хто сказаў, што *нам наканавана вечна гойсаць у сфэры фэномэнаў*? Гэта сказаў Розум, *intellectus illuminatus*, ён жа *intellectus modernus*. Лёгацэнтрычны розум (арыентаваны на *лёгіку* і *эмпірыку*) забараняў думаць пра Боскае, разьвейваў мары пра магчымасьць *re-ligio* (злучэньня з Боскім), пазбаўляў чалавека *ўтульнасьці*... Цяпер паспрабуйма здагадацца, што меў на ўвазе Акудовіч, кажучы: «Чалавеку толькі здаецца, што ён прагне Бога, грошай, свабоды... Насамрэч ён заўсёды і ўсюды прагне аднаго – утульнасьці».

Жаданая ўтульнасьць немагчымая ў сьвеце фэномэнаў. І няма значэньня, ці мы перабываем у *хаосе фэномэнаў* ці ў *космасе фэномэнаў*. Утульнасьць абавязкова прадугледжвае *пачуцьцё еднасьці*, лучнасьці з кімсьці альбо, яшчэ лепш, з Чымсьці. Таму нічога дзіўнага, што сваю рэфлексію пра ўтульнасьць Акудовіч заканчвае згадкай пра свайго Бога: «Чалавек можа знайсьці сабе прыстанак дзе заўгодна, але кожны, хто здалёк вяртаўся на радзіму, ведае, што адразу за памежным слупом робіцца і зацішней, і цяплей, нават калі ён вяртаецца ў непагадзь». Радзіма. Тутэйшае. Этнас. *Principium unionis*. Акудовіч увесь час

марыць *вярнуцца* ўва ўлоньне Этнасу, гэтаксама як Батай марыў *вярнуцца* ўва ўлоньне жывёльнага. Першы носіць у сабе амаль містычны досьвед лучнасьці яго адзінкавага жыцьця з жыцьцём этнічнай супольнасьці, а другі з настальгіяй згадвае пра этап жывёльнага існаваньня, этап, які ён параўноўвае да «*быцьця вады ў вадзе*».

Лёгацэнтрычная культура неўзабаве стала ўспрымацца як культура *фалалёгацэнтрычная*. Пачынаючы ад Лякана, дыктатура Розуму асацыюецца з дыктатурай Фаласа: непадзельнай дамінацыяй у культуры мужчынскіх каштоўнасьцяў і арыенціраў. Пісьменьніца Вольга Гапеева супрацьпаставіла мужчынскаму фаласу жаночыя грудзі, як «сымбаль творчай прадуктыўнасьці і жыцьцядайнасьці жаночага пачатку» (характарыстыка Ганны Кісьліцынай). Цікава, аднак, тое, што апазыцыя ў стасунку да фалалёгацэнтрызму і спроба пераадолець гэты «цэнтрызм» пры дапамозе «жаночых» каштоўнасьцяў («улоньне», «утульнасьць», «цэльнасьць», «еднасьць») нарадзілася ў мужчынскім асяродзьдзі. «Шмат прыўкрасных грудзей на сьвеце / ды ня ўспоіць цябе ні адна», – піша Караткевіч пра беларускую мову, якая, гэтаксама як Акудовічаў Этнас, функцыянуе як крыніца ўтульнасьці і патолі. «Мастацэнтрызм» (ад грэцк. *mastos* – смочак) замацаваўся як спантанны пошук ураўнаважвальнай сілы. Мужчыны ня менш, чым жанчыны, адчуваюць патрэбу ў «сымбалі творчай прадуктыўнасьці», які зьяўляецца адначасова сымбалем *утульнасьці* і *супакаеньня*, растварэньня ў акіяне быцьця...

* * *

Хто сказаў, што «рэчы самі ў сабе» непазнавальныя? – гэтае пытаньне запачаткавала фармаваньне *новай культурнай лявіцы*. Гэтаксама, як Розум у свой час супрацьпаставіўся дагматызму, манархізму, цемрашальству, традыцыі і ўсяму, што асацыявалася з *ансьен рэжымам*, так цяпер нейкая новая, бліжэй не акрэсьленая стыхія захацела супрацьпаставіцца Розуму і ўсяму таму, што ён з сабою нясе: лёгіцы, праўдзе, парадку, уладзе. Рацыяналісты, якія яшчэ ў палове XVIII ст. функцыянавалі ў грамадзтве як левакі-бунтаўнікі, пад канец

XVIII і на пачатку XIX ст. пачалі ўжо функцыянаваць як адназначна Правая Сіла. «Быць рацыя-налістам» значыла «мець рацыю», а «мець рацыю» значыла «мець уладу». І ўжо тады – дзесьці ў першай палове XIX ст. – пачала фармавацца згаданая ўжо новая культурная лявіца, якая зоймецца мэтадычнай і вытанчанай кантэстацыяй лёгацэнтрычнага парадку. Стагодзьдзе пазьней яна атрымае цікавую назву – *post-modernismus* і аформіцца ў самастойны, самасьвядомы дыскурс. А тады, у часох Міцкевіча і Каліноўскага, Шапэнгаўэра і Ніцшэ, яна будзе функцыянаваць як *безназоўнае, пад-сьвядомае* і *маргінальнае*.

Гданьскі пэсыміст Артур Шапэнгаўэр супрацьпаставіць *волю* і *ўяву* (*Wille und Vorstellung*). «Уява» – гэта кантаўскі сусьвет фэномэнаў, у які мы ўблытаны, але які мае жыцьцёва малое значэньне. Сусьвет фэномэнаў можна параўнаць да плятонаўскіх «ценяў» альбо індуісцкае «майі». Ня варта заставацца ў павуціньні майі, скрозь яе *можна прарвацца ў сфэру «рэчаў-у-сабе»*! Гэты «прарыў» магчымы дзякуючы *Волі*, разуметай як спантанны жыцьцёвы імпэт, памкненьне, вітальная дынаміка. Такім чынам, Шапэнгаўэр, дэкляратыўны аматар Канта, неўпрыкмет наносіць моцны ўдар па лёгацэнтрычным Розуме, да інтранізацыі якога Кант між іншым спрычыніўся…

А неўзабаве зьявіцца падмога, салідная і неацэнная падмога. На сцэну вялікай культуры выходзіць сапраўдны бунтаўнік-лявак новага тыпу, нэўротык-няшчасьнік, стыхійны мысьляр, клясычны філёляг па адукацыі, майстар пяра Фрыдрых Ніцшэ. Гэта яго зьяўленьне справакуе лямант і крык як абаронцаў прэмадэрністычнай традыцыі, так і спавядальнікаў мадэрністычнага рацыяналізму. Старыя і новыя багі аб'яднаюцца ў дружны хор і пачнуць крыкма клікаць: «Гора! Ты пабурыў наш сьвет магутным кулаком сваім, валіцца, развальваецца!»

Ніцшэ станецца чарговым буйным пасьля Шапэнгаўэра разбуральнікам лёгацэнтрычнага валадарства і сымбалем вяртаньня да «рэчаў-у-сабе». Кантаўскі «сусьвет фэномэнаў», а шапэнгаўэраўская «ўява» – гэта для Ніцшэ *апалінская культура*.

«Апалінская тэндэнцыя ўпачварылася ў лягічны схематызм» – піша ў сваіх «Народзінах трагедыі». Каб разьбіць гэты пачварны схематызм, Ніцшэ кліча на дапамогу грэцкага бога Дыяніса, які сымбалізуе памкненьне *натуры*, мэтай якога – «разарваньне заклятага кола індывідуацыі і адкрыцьцё дарогі да мацераў быцьця, да найглыбейшага ядра ўсіх рэчаў». «Разарваньне кола індывідуацыі» Юрген Габэрмас трактуе як спосаб уцяканьня ад мадэрну.

Сьледам за Ніцшэ пойдзе Гайдэгер, згаданы ўжо Батай і наш Акудовіч. Такім чынам, Акудовіч месьціцца на лініі традыцыі *penetration*, ідэі праніканьня ўглыб, вяртаньня да «рэчаў-у-сабе». Ён хоча вырвацца са сьвету фэномэнаў і пранікнуць да *Dinge an sich*, выйсьці за апалінскае «кола індывідуацыі» і злучыцца (*re-ligare*) з «мацерамі быцьця»; ён хоча, нарэшце, *разарваць павуціньне ўявы-майі і прарвацца да найглыбейшага ядра ўсіх рэчаў*, дзе можна будзе знайсьці жаданую *ўтульнасьць*...

І тут – Бог.

Бог, які знаходзіцца ў цэнтры сусьвету фэномэнаў.

Бог, які ўтварае моцны асяродак гравітацыі, вакол якога табе наканавана кружыць, кружыць, кружыць...

Бог – *principium individuationis*, гарант цэльнасьці і непарушнасьці «кола індывідуацыі».

* * *

Драматычныя дыялёгі з Богам Валянціна Акудовіча – гэта ня што іншае, як спробы *разарваць павуціньне ўявы-майі*. У цэнтры гэтага павуціньня – Бог-павук, які ня толькі не дазваляе разарваць гэтае павуціньне, але наадварот – аблытвае сваімі павуціннымі ніткамі сьмельчака, які наважыўся прарывацца да *найглыбейшага ядра ўсіх рэчаў*, і высмоктвае зь яго ягоную волю: волю праніканьня ўглыб, волю пазнаньня рэчаў-у-сабе...

«...Цябе няма!» – раз-пораз, выціраючы з лобу пот, паўтарае

Акудовіч і ніяк ня можа зразумець: «*Але з чаго тады цяжар нябёсаў і млосьць у сэрцы?*»

* * *

«Павуціньне», якое не дазваляе нам патрапіць да «рэчаў-у-сабе» – гэта паняткавая сыстэма, замацаваная ў нашай сьвядомасьці ў ходзе біялягічнай і культурнай адаптацыі да асяродзьдзя. Гэта сукупнасьць паняцьцяў, катэгорыяў, «ісьцінаў», якія панараджаліся ў нашых галовах як вынік пазнаваньня і асвойваньня навакольнага сьвету. Гэтае «павуціньне» выконвае да пэўнага моманту пазытыўную ролю – дазваляе нам арыентавацца ў прасторы і часе, паразумецца зь іншымі прадстаўнікамі нашага віду, выяўляць свае думкі і іншае. Але адначасна гэтае павуціньне абмяжоўвае і зьнявольвае нас...

Ня раз і ня два нам, пэўна, прыходзілася гаманіць зь некаторымі людзьмі і зьдзіўляцца: як моцна яны зьняволеныя ўласнымі ўяўленьнямі і догмамі. Думаю, дэмакратычныя агітатары ў Беларусі, якія дзясяткі разоў перажылі балесную паразу падчас спробаў пераканаць простых людзей у неабходнасьці дэмакратыі, свабоды ці нацыянальных каштоўнасьцяў, могуць пацьвердзіць гэта.

Майстэрства, аднак, ня ў тым, каб выявіць узровень зьняволеньня ўласнымі паняцьцямі ў *іншых*, а каб выявіць гэта ў *самога сябе*. Наша паняткавае павуціньне можа быць вялізным і прасторным. Мы можам самазадаволена параўноўваць сваё павуціньне да павуціньня іншых і цешыцца: ах, які вялікі мой арсэнал паняцьцяў і апісальных сродкаў, якія вялікія мае апэрацыйныя магчымасьці! Тым ня менш, мы так і застаёмся нявольнікамі гэтага – хай сабе і прасторнага – *уяўнага* сьвету.

Паняткавае павуціньне – гэта *ўява, майя, віртуальная рэальнасьць*. Яна не дазваляе спазнаць праўду быцьця. Больш таго: яна *фальшуе быцьцё*.

Але ці можам мы вырвацца з гэтага павуціньня? Драматызм гэтай ініцыятывы ў тым, што ўсё тое, што мы, кіруючыся

жаданьнем выйсьці па-за павуціньне, скажам ці падумаем, *аўтаматычна* становіцца часткай гэтага павуціньня! Яно аўтаматычна заінфэктаванае лёгікай, водле якой сплеценае *гэтае* павуціньне! Роспачная барацьба з вобразным жывапісам мастакоў пэрыяду Вялікага Авангарду першай паловы ХХ ст. паказвае, наколькі драматычны з аднаго боку і настойлівы з другога можа быць працэс барацьбы з *уявай*.

Універсальная Воля Шапэнгаўэра, *Дыяніс* Ніцшэ, *прыгадваньне-быцьця-ў-ягонай-спачатнасьці* Гайдэгера, *animalitas* Батая ну і, нарэшце, сьціплы *Этнас* Акудовіча – вось магчымыя спосабы-спробы вызваліцца ад сьвету фэномэнаў. Ці яны эфэктыўныя? Невядома.

Вядома толькі тое, што калі хтось аднойчы захацеў прарвацца ў кірунку *найглыбейшага ядра ўсіх рэчаў*, мусіць сустрэцца твар у твар з Богам. Амбівалентным Богам, які, быццам павук, будзе яшчэ больш ублытваць цябе ў сеткі тваіх уласных паняцьцяў.

* * *

Бог-павук – гэта частка тваёй паняткавай сыстэмы, прычым прывілеяваная частка. Ён надае сэнс усім тваім словам, і сказам, і тэкстам. Безь яго ты нічога ня можаш сказаць, ня можаш падумаць, ня можаш нічога ўявіць. Адначасна ж Бог-павук – гэта, як і само павуціньне, – *майя-ўява*, нешта віртуальнае і несапраўднае. Ён – адно толькі Функцыя, Функцыя зь вялікай літары – *аснова* твайго думаньня, *падстава* лёгікі. Ты крытыкуеш сваё мысьленьне, дэмаскуеш уласныя фікцыі, але тым самым толькі пашыраеш абсяг павуціньня, а аніяк не вызваляесься ад яго. Ты крычыш свайму Богу: «Цябе няма!», а ён пры дапамозе гэтага «няма» яшчэ больш цябе скоўвае і затрымлівае пры сабе...

Так сталася з Акудовічам. Даведзены да крайнасьці, вычарпаны змаганьнем са сваім Богам, ён скарыстоўвае найбольш моцную, здавалася б, зброю: «НЯМА!». Прэдыкацыя «няма», прыстаўленая да слова «Бог», павінна была канчаткова зьнішчыць «ілюзію Бога». Чалавек з раньняга дзяцінства навучыўся праганяць страхі і здані пры дапамозе магічнага

«няма», таму нічога дзіўнага, што спантанным рэфлексам Акудовіча ў адказ на зьяўленьне Бога-павука стала амаль дзіцячае «Цябе няма!».

...І ты думаў, што пад уплывам гэтага «НЯМА!» Бог зьнікне, а павуціньне, ім сплеценае, разблытаецца, ты бесклапотна выйдзеш па-за гэтае павуціньне і апынесься ўва ўлоньні жаданых *рэчаў-у-сабе*? Ты думаў, што такім чынам пранікнеш і злучысься зь ніцшэанскімі *мацерамі быцьця*?

А выйшла іначай! Ты сказаў Богу: «Няма», а ён з гэтага «няма» саткаў тканіну новага павуціньня, якое беспраблемна сталася інтэгральнай часткай ранейшага павуціньня, якое так моцна трымала цябе ў сьвеце фэномэнаў! Трымала, трымае і будзе трымаць. Пустое «няма» напоўнілася багатай сэмантыкай, абрасло ў паняцьці і сказы, сталася чарговым інструмэнтам у руках Бога, каб затрымаць цябе пры сабе.

Акудовіч, хочучы застацца шчырым перад сабой і перад чытачом, папросту пацьвердзіў вышэй сказанае, пішучы адмысловае міні-эсэ пад назовам «Няма». Аказваецца, пад прыватыўным прэдыкатам «няма» хаваецца нешта вялікае і каштоўнае – наша беларуская доля:

Пакуль іншыя народы прырасталі здабыткамі, мы мацаваліся стратамі. І цяпер мы багатыя на «няма», як ніхто. У нас няма гісторыі, няма мовы, няма свабоды, няма ладу, і, магчыма, зноў ня будзе сваёй дзяржавы. Ды і пра саміх беларусаў хто ўпэўнена скажа: ці то яны ёсьць, ці то іх няма?..

А цяпер можам ужо па-новаму глянуць на словазлучэньне «Цябе няма». Калі пад прэдыкат «няма» падставім «беларуская доля», а займенньнік «Цябе» паставім у назоўным склоне, атрымаецца: «Ты – беларуская доля». А што такое «беларуская доля»? Гэта ж *чарговая сукупнасьць словаў, сказаў, аповедаў*! Чарговая ліпкая тканіна, у якую мы добраахвотна закручваемся, каб праз колькі часу пераканацца, што яна – ніякая ня «рэч-у-сабе», а ўсяго толькі новая *майя-ўява*, з новым «пачварным апалінскім схематызмам».

Беларуская доля – гэта новае павуціньне, у цэнтры якога – новы Бог-павук: Этнас.

Акудовіч *пакахаў* гэтага новага Бога. Асабліва палкай любоўю ён загарэўся да аднаго з атрыбутаў этнічнага Бога – *беларускай мовы*. Яна для яго, дакладна як і для Караткевіча, набыла сапраўды *эратычны* характар: «Я ашалеў, – прызнаецца беларускі філёзаф. – Я сноўдаўся самнамбулай, як закаханы. Зрэшты, чаму «як»? Я і быў закаханы ў «матчыну» мову. (...) Я бяз стомы прамаўляў розныя словы ды сказы (і ўголас, і сам сабе), што нават пачалі пабольваць цягліцы твару».

Цікава, што стыхійнае захапленьне *беларускаю мовай* ператвараецца ў Акудовіча ў ня менш стыхійнае захапленьне *«няма»*. Як вынікае з тэксту, гэтае захапленьне зьявілася храналягічна пазьней, як бы замяніўшы тое першае. Але, калі глянем на гэта праз прызму вышэй прыведзенай гермэнэўтыкі «няма» і «беларуская доля», якая выявіла тоеснасьць гэтых двух паняцьцяў, дык можам сьцьвердзіць, што маем дачыненьне папросту з мэтамарфозай *аднаго і таго ж* захапленьня. Вось што піша Акудовіч напрыканцы кнігі «Дыялёгі з Богам»: «Мая абыякавасьць да таго, што некалі прынесла столькі асалоды, не была штучнай, паколькі тады я ўжо быў захоплены ня тым, што ёсьць, а тым, чаго няма. Нават не, не захоплены – я быў зачараваны *фэномэнам няма*».

Нават з чыста фармальнага гледзішча дзьве апошнія цытаты паралельныя: і ў першай, і ў другой дзеля падкрэсьленьня свайго палкага пачуцьця (у першым выпадку – да мовы, у другім – да фэномэну «няма») скарыстана аднолькавая рытарычная фігура: *correctio* (у першым: «*...як закаханы. Зрэшты, чаму «як»? Я і быў закаханы...*», у другім: «*...я быў захоплены (...) тым, чаго няма. Нават не, не захоплены – я быў зачараваны...*»).

І што выйшла з гэтага каханьня?

Акудовіча спасьцігла трагічная доля вядомага нам усім Эдыпа. Акудовіч забіў бацьку-Бога, каб злучыцца (*re-ligare*) у інцэстуальным акце з *матчынай* мовай, то бок, беларускаю доляй, то бок, *фэномэнам «няма»*. Беларускі Этнас, які Акудовіч

аб’явіў сваім уласным Богам, насамрэч зьяўляецца Маткай-Багіняй, узьлюбленай абраньніцай Бога-Бацькі, зь якім Акудовіч жорстка расправіўся.

«Але з чаго тады цяжар нябёсаў і млосьць у сэрцы?» – раз-пораз пытаецца ў самога сябе Акудовіч. А вось з чаго: з пачуцьця віны за зробленае.

Расправа з Богам-бацькам была спрычынена незадаволенасьцю, нежаданьнем перабываць у павуціньні фэномэнаў і воляй прарвацца да *Dinge an sich*. Але ці забойства зьмяніла сытуацыю? Ніяк не. Да ранейшай незадаволенасьці дадалося яшчэ пакутлівае пачуцьцё віны, якое ў сваю чаргу ператварылася ў сэрыю абвінавачаньняў на адрас Бога-бацькі. Усе злосныя эпітэты, якімі Акудовіч апантана абкідвае Бога-бацьку, можна растлумачыць пры дапамозе гэтага «комплексу Эдыпа». Акудовіч пачаў праектаваць уласны грэх на Бога. Зрэшты, да такой інтэрпрэтацыі падштурхоўвае і сам Акудовіч, калі, прызнаўшыся ў каханьні да *матчынай* мовы, у дужках пытае самога сябе: «Ці не такім чынам сублімаваўся і выявіўся ў мяне «комплекс Эдыпа», якога, засвоіўшы Фройда, ніяк ня мог знайсьці ў сабе адносна роднай маці».

Сам Акудовіч пацьвярджае і іншую нашу тэзу, а менавіта, што інцэстуальнае злучэньне з Багіняй-Этнасам не прынесла яму жаданай сатысфакцыі: «У гэтым салодкім шаленстве трывожыў мяне адзін момант. Чым больш я нагружаў сябе мовай, тым меншым рабіўся мой мэнтальны сьвет, у якім я знаходзіў сябе раней». Пацьвярджае нашу тэзу і той факт, што «няма», якое чаруе, Акудовіч называе… «фэномэнам». Тым самым ён сам прызнае, што так і не патрапіў у каралеўства «рэчаў-у-сабе», а застаўся палоньнікам *уявы-майі*. Акудовічава «няма» так і не разарвала заклятага «кола індывідуацыі» і не дазволіла яму пранікнуць да «мацераў быцьця». *Затрымала яго* ў сьвеце фэномэнаў…

Дык чаго ён дасягнуў усім гэтым? Ня многа і ня мала: стварыў прыгожую *ілюзію спачынку і ўтульнасьці*: «Так, я пераапрануўся ў зрэбную сьвітку, затое яна была майго памеру. Божачкі, як мне зрабілася хораша!»

* * *

«Мяне няма» – гэтыя словы мог вымавіць толькі той, хто, дашчэнту змучаны барацьбой са сваім павуціньнем і сваім Богам, пачынае помсьціць самому сабе за сваю звышсьмелую ініцыятыву. Цікава, аднак, што вастрыё гэтай помсты скіраванае на лёгацэнтрычны розум. Бо «няма» – гэта тая мяжа, за якой можна больш-менш бясьпечна схавацца ад татальнага Розуму. Розум спыняецца перад гэтай мяжой, ня можа яе пераступіць. Часам зьбянтэжана адыходзіць, ня ведаючы, што сказаць, а часам наадварот – пагардліва кідае Пармэнідаву фразу: «Быцьцё ёсьць, а небыцьця няма!», даючы тым самым зразумець, што такая мяжа, за якой заканчваецца быцьцё, а пачынаецца «няма», не існуе… Маўляў, усё, што існуе, існуе ў межах маёй імпэрыі. *Маё царства* і *існае* – паняцьці ізамарфічныя – даводзіць лёгацэнтрычны Розум.

Менавіта Ён, Яго Вялікасьць Розум спансаруе існаваньне анталягічна несамастойнага Бога-павука, які, як мы ўжо сказалі, зьяўляецца адно толькі вялікай Фікцыяй, *Функцыяй захаваньня цэльнасьці мэтанарацыі*.

Бог-павук, Бог-супэрэга, Бог-функцыя.

Гэта ня Бог. Гэта толькі «Бог».

* * *

Бог-павук, які не дазваляе прарвацца да *ядра рэчаў*, можа прымаць розныя іпастасі. Гэта можа быць Навука. Можа быць Камунізм. Цывілізацыя. Чалавецтва. Дзяржава. Кароль. Прэзыдэнт. Бог-павук можа, нарэшце, явіцца ў выглядзе Этнасу…

Чаму Акудовіч, разрываючы ўласныя катэгорыі-паняцьці, змагаецца менавіта з хрысьціянскім Богам? Чаму *такі* Бог так моцна замацаваўся ў паняткавай структуры гэтага філёзафа, што, спрабуючы выйсьці па-за гэтую структуру, ён атакуе менавіта Яго – *хрысьціянскага Бога*?

У мяне ёсьць дзьве вытлумачальныя гіпотэзы. Магчыма, прычына гэтаму – суб'ектыўная. Справа ў тым, што хрысьціянскі Бог, выцесьнены Акудовічам у несьвядомае ў пэрыяд разгулу камуністычнага атэізму, у пэўны момант «выйшаў на паверхню» і запаланіў яго розум. Як кажа Юнг, тое, што было выцесьнена ў несьвядомае, характарызуецца ўзмоцненай энэргетыкай. Такім чынам, хрысьціянскі Бог, выйшаўшы «наверх» зь нетраў несьвядомага, папросту спалохаў мысьляра сваёй празьмернай «экспансіяй». Магчыма, звыклага чалавека так не напалохаў бы, але *для мысьляра* «Божае нараджэньне» ў яго сьвядомасьці – гэта ўжо выклік. Акудовіч пачаў баяцца, што гэты Бог абмяжуе альбо і заблякуе яго мысьленьне, пазбавіць самастойнасьці. Гэтая гіпотэза многае тлумачыла з таго, што знаходзім у Акудовічавых тэкстах, але ня буду ўпарціцца, калі хтось скажа, што яна – марная. Сапраўды, як і ўсякія іншыя псыхааналітычныя гіпотэзы, яна нефальсыфікавальная: пад яе можна падцягнуць усё, што заўгодна. Адсюль яе слабасьць.

Тады можам прыняць гіпотэзу, што прычына – аб'ектыўная. Гэта значыць, што прычына таго, што Акудовіч пачаў успрымаць хрысьціянскага Бога як абмежавальніка мысьленьня, ляжыць у *спэцыфіцы хрысьціянскага дыскурсу*. Магчыма, хрысьціянскі дыскурс папросту даў падставу Акудовічу абвінавачваць Яго ў самых розных крамолах.

Думаю, найбольш плодны ў эўрыстычным пляне будзе *зьмешаны падыход*: прыняцьце, што маем дачыненьне з сувыступаньнем аб'ектыўнага і суб'ектыўнага фактараў. Прычына і ў дыскурсе, і ў Акудовічу. Гэткім мэтадалягічным прынцыпам і будзем кіравацца ў далейшых разважаньнях.

ЧАСТКА ДРУГАЯ.
ПАРАДОКСЫ ХРЫСЬЦІЯНСКАЙ РЭЛІГІЙНАСЬЦІ

Акудовічава забава ў кнізе «Мяне няма» арганізавана водле прынцыпаў *канструкцыі* і *дэканструкцыі*. «Руіны» выконваюць функцыю рэгулятарнай ідэі, прычым «рэгулятарнасьць» тут палягае насамрэч на *дэрэгуляцыі*, адыходзе ад усякае regula.

«Руіны» маюць на мэце раз-ладзіць, раз-губіць лёгацэнтрычны інтэлект, які пагарджае ўсякімі руінамі і пазьбягае бязладзьдзя. *Руіны – гэта нязгода на дыктат татальнага Розуму*.

Тым ня менш, аўтар займаецца і *будаваньнем*: будуе тэарэтычную мадэль пад назовам «архіпэляг Беларусь». Акудовіч таксама сварыцца з Богам, і гэтая сварка мае сапраўды *разбуральны* характар: вынікам яе ёсьць разбурэньне вобразу Бога, «Словабога», як ён кажа. Ну, ёсьць яшчэ пара іншых забаваў (канструкцыяў-дэканструкцыяў) у кнізе, але яны занадта бяскрыўдныя, каб маглі зацікавіць інквізыцыю. Таму павандруем трохі па «руінах Бога» і «руінах чалавека».

* * *

Чалавек ня мае сутнасьці. Ён нявечны. Жыцьцё яго пазбаўленае сэнсу. Яму наканавана *толькі* «адбыць быцьцё». Чалавек не ўяўляе якойсьці «вышэйшай» вартасьці. Як утрапёна ні пераконвалі б прапаведнікі-аптымісты, «я – гэта семдзесят кілё костак, тлушчу, цягліц і вадкасьці чырвонага колеру».

Гэты крайні антыгуманізм Акудовіча спалучаецца зь візіяй канца: «Час чалавека сканчаецца – у самых розных сэнсах. І ў сэнсе часу, дарэчы, таксама». А «сьмерці чалавека» папярэднічае «сьмерць Бога», сьмерць падставы сэнсу. І ў гэтай прорве нігілізму і абсурду філёзаф будуе для чыста прыватных патрэбаў вобраз факультатыўнага Бога – згаданы ўжо Этнас, які явіцца не суцэльна, а фрагмэнтарна: «Архіпэляг Беларусь». А так увогуле Бог памёр, пад намі – нішто, над намі – нішто і «Я-чалавек – нішто, якое зьяўляецца зь ніадкуль і зьнікае ў нікуды».

Гэтая выснова грунтуецца на «археалёгіі» – філязафічным асэнсаваньні чалавечае гісторыі. Мінуў пэрыяд панаваньня Татэму, Міту і ідзе да завяршэньня панаваньне Тэксту. Разам са сьмерцю Тэксту памірае і Бог. Крайні антыгуманізм і крайні атэізм – вось вынік археалягічных дасьледзінаў Акудовіча. І тут закралася ў мяне паняверка: *вынік* ці *прычына*?

* * *

Акудовіч сварыцца з Богам, і добра. З Богам сварыліся і Майсей, і Гіёб і амаль усе прарокі. У Кнізе Ісаі Бог сам гаворыць: «Хадзеце і спрачайцеся са мной» (1:18). Але Акудовічава сварка нейкая вульгарная і маналягічная. Акудовіч дакарае Бога за тое, што той быццам бы забараніў Адаму й Еве займацца сэксам, заяўляе, што Яго ўцелаўленьне – доказ паталягічнага стану, а сьмерць на крыжы – праява садамазахізму. Каб апісаць усе злачынствы Бога, кажа Акудовіч, трэба было б высекчы ўсе дрэвы, ды і таго не хапіла б. Божыя злачынствы пераўзыходзяць злачынствы Сталіна, і людзям трэба б не чакаць другога прыйсьця, а паслаць Богу позву ў суд (толькі невядома, куды пісаць). Такога Бога Акудовіч бачыць у Бібліі, зборніку тэкстаў пра Бога. Увесь час мысьляр застаецца верны перакананьню, што Бог тоесны з Тэкстам, Бог не існуе па-за Тэкстам.

Адкуль Акудовіч ведае, што Бога па-за тэкстам няма? Адкуль ён ведае, што пасьля сьмерці – сьмерць? Ці ён ужо быў памёрлы, даведаўся, што нічога пасьля сьмерці няма і цяпер ласкава нам гэта аб'явіў?

Давайце, можа, пагодзімся наконт таго, што мы *ня ведаем*, што пасьля сьмерці. Канец чалавека, гэтаксама як і пачатак (маю на ўвазе філягенэтычны пачатак) губляецца ў таямніцы, ну, каб быць больш нэўтральным: у невядомым. Ня ведаем, як і калі ўзьнікла рэфлексійная сьвядомасьць, ня ведаем, за кошт чаго зьявілася жыцьцё ў космасе, ня ведаем, што было перад «біг бэнгам» і ня ведаем, што ёсьць за мяжой сусьвету.

Калі Акудовіч гаворыць, што пасьля сьмерці – невараць, небыцьцё, абсалютны канец, то не таму, што *ведае*, а таму, што гэтак *верыць*. Тое, што ён у юнацтве мог *«мілавацца зь дзяўчынай на заімшэлай магільнай пліце»*, яшчэ не даводзіць таго, што няма ўваскрасеньня, роўна як і таго, што калі некаторыя людзі здольныя ставіць патэльню на Бібліі, ня ёсьць доказам неіснаваньня Бога. Толькі вось людзі чамусьці вельмі востра адчуваюць розьніцу паміж кімсьці, хто мілуецца на магіле, і тым, хто ўскладае кветкі. І насамрэч няма ніякіх падставаў лічыць, што ў будучым людзі «пазбавяцца ілюзіяў» і

гэтыя два дзеяньні будуць для іх раўнавартыя.

Давайце таксама пагодзімся, што *ўсякія* анталягічныя цьверджаньні датычна межавых пытаньняў абапіраюцца на веру. Альтэрнатыва «*вера* ў існаваньне Бога альбо *веда* аб неіснаваньні Бога» гэтаксама абсурдная, як і альтэрнатыва «*вера* ў існаваньне чагосьці перад біг бэнгам альбо *веда* аб неіснаваньні нічога перад біг бэнгам». У гэткіх выпадах няма альтэрнатывы «*вера* альбо *веда*», ёсьць адно толькі альтэрнатыва: «*вера* альбо *вера*». Ну, а той, хто лічыць для сябе прыніжэньнем верыць у што-небудзь, павінен да канца застацца верны сваім эмпірычным прынцыпам і сьцьвердзіць коратка: «Ня ведаю». Бо ані існаваньне Бога, ані Яго неіснаваньне няма шанцаў сьцьвердзіць навуковым шляхам. Навуковы атэізм гэтаксама немагчымы, як і навуковы тэізм. (Экс-марксіст Лешак Калакоўскі лічыць, што аргумэнты за існаваньне Бога і аргумэнты за Яго неіснаваньне раўнавартыя ў лягічным пляне.)

Такім чынам, гэтак, як Акудовіч мае права на атэістычны дыскурс, я маю права на дыскурс тэістычны. Роздум гэтага беларускага філёзафа ёсьць неблагой нагодай пераасэнсаваць хрысьціянскі доўгавяковы дыскурс і правесьці своеасаблівую археалёгію: перакапаць розныя напластаваньні і запытацца пра першапачатковы сэнс веры і першасны досьвед Бога. Гэта не арыгінальная спроба, такога тыпу археалёгіяй займаліся мысьляры як на Захадзе (Іў Кангар, Карл Ранэр), так і, больш асновасяжна, на Ўсходзе (М. Бярдзяеў, С. Булгакаў, В. Розанаў, Л. Шастоў, В. Іваноў і інш.). Але ў беларускім кантэксьце і ў новай мэнтальнай атмасфэры (пасьлясучасьсе) гэта асабліва, думаю, патрэбна.

* * *

Сапраўды, вера ў Бога мае ненавуковы характар. І ўсё ж ёсьць нейкая сіла, якая прымушае мяне і мільярды іншых людзей гаварыць пра Яго і настойваць на тым, што наша гаворка адносіцца да *рэальнага* Быцьця. Сытуацыя вельмі няпростая, але, здаецца, можна прывесьці пэўныя *этычныя* аналёгіі: калі хтосьці прызнаецца ў каханьні, то насамрэч бяззбройны перад кімсьці, хто ня верыць у каханьне. Усякі жэст, слова і дзеяньне

чалавека, які кахае, атрымлівае інтэрпрэтацыю толькі ў залежнасці ад *веры* таго, хто ацэньвае. Калі дзеяньні таго, хто кахае, хтосьці захоча інтэрпрэтаваць як праявы эгаізму і аблуды, то той, хто кахае, ня мае шанцаў даказаць, што ў сэрцы ягоным ёсьць каханьне. Гэтая аналёгія ёсьць адно толькі этычнаю, а не анталягічнаю, бо існаваньне каханьня і існаваньне Бога ёсьць адрозным існаваньнем.

Тым ня менш, можна прывесьці таксама *анталягічныя* аналёгіі. Гэтымі аналёгіямі можа быць мноства паранармальных зьяваў, якія безупынна рэеструюцца псыхолягамі і мэдыкамі. Парадаксальным чынам, існаваньне сатанізму стварае ўскосны «доказ» існаваньня Бога. Зьняволеньне людзей, якія падпісалі пакт з Сатаною, іх звышнатуральная нянавісьць да ўсякіх атрыбутаў і сымбаляў Хрыста цяжка растлумачыць, калі ня прымем рэальнага існаваньня і Сатаны, і Госпада-Хрыста.

Апрача таго, тысячы вернікаў людзей сутыкаюцца з Божым аб'яўленьнем ня толькі праз пасярэдніцтва тэкстаў, але і больш непасрэдна. Найчасьцей гэта адбываецца сярод удзельнікаў руху «Харызматычная аднова ў Духу Сьвятым». Праройцтвы, прамаўленьне невядомымі мовамі, аздараўленьні, харызматычныя малітвы, звышнатуральныя зьявы і г. д. былі ўва ўсіх эпохах, але апошнім часам у некаторых хрысьціянскіх супольнасьцях гэта «на парадку дня». Мне здаецца, што і традыцыйныя спробы апастарыёрнага падмацаваньня веры ў Бога таксама застаюцца актуальныя: гармонія космасу і загадка фэномэну жыцьця. Апрача таго, інтуіцыя таямніцы, устаноўка на Невядомае настолькі ўкарэненыя ў чалавечую істоту, што ані асьветніцтва, ані сучасьсе не змагло гэтага знэўтралізаваць.

Сучасьсе выпрацавала пэўную парадыгму рацыянальнасьці, якая нярэдка абясьсільвае некаторыя вераваньні і пазбаўляе сэнсу некаторыя тыпы пакланеньняў. Юзаф Жыцінскі, навуковец і каталіцкі ярарх, прапануе ў галіне філязофіі пазнаньня канцэпцыю «поля рацыянальнасьці» (ПР). ПР – гэта папросту каньюнкцыя адкрытага і неадкрытага. *«Абсяг разумнасьці» – бясконцы, але пакуль што мы ў ім асвойталі толькі невялікі кавалак*. У нашым сусьвеце процьма абшараў, нам не вядомых.

Тым ня менеў, чалавек вельмі часта праяўляў тэндэнцыю празмерна прывязвацца да таго, што ён *ужо* здабыў і да чаго прывык. Тое, наколькі сучасная парадыгма рацыянальнасьці запаланіла розумы, паказвае размова двух навукоўцаў, псыхоляга і фізыка. Псыхоляг кажа: «Ведаеш, дагэтуль не магу паверыць: адзін чалавек, седзячы ў адным пакоі, перасоўваў мэблю, якая знаходзіцца ў іншым пакоі». Фізык на гэта: «Але ты *бачыў* гэта?» «Так, канечне ж, бачыў». Фізык: «Ну, то што ў такім выпадку мне гаварыць: я дваццаць гадоў дасьледую кванты, але ніколі іх так і ня бачыў...»

Гэта ўжо такі нораў «гома мадэрнуса»: ён без праблемаў *паверыць* у тое, што Зямля круглая (нагадаю, што мы гэтага *ня бачым*, гэтае наша пераканаьне – толькі адзін зь некалькіх дзясяткаў агменяў ланцуга *веры* ў тое, што нехта сапраўды гэта адкрыў і сапраўды не памыліўся), але, скажам, стыгматы айца Піё (многімі бачаныя), цуды ў Люрд ці Фаціме (дакумэнтальна пацьверджаныя) – гэта альбо выдумка, альбо нешта падазронае (галюцынацыя ці псыхапатыя).

Гаварэньне пра Бога заўжды было цяжкім, нават калі адрасатамі былі веруючыя. Калі гавару «Бог ёсьць», то ня ведаю, пра Каго гавару, хоць адначасна адчуваю рэфэрэнцыйнасьць сваіх словаў.

Як гаварыць пра Бога?

Майсей, які перажыў тэафанію, заўзята адмаўляўся ісьці да ізраільцянаў і фараона і гаварыць ім пра Бога: «*Ну – іранізуе Майсей – пайду вось так да ізраільцянаў і скажу ім: Бог вашых бацькоў паслаў мяне да вас. А калі яны запытаюцца, якое Яго імя, то што ім скажу?*» (Кніга Выхаду 3: 13). Пасьля доўгай спрэчкі з Богам Майсей заяўляе: «Даруй, Госпадзе, але я ня дужа красамоўны, ад учора і пазаўчора, а нават з таго часу, як Ты прамаўляеш да свайго слугі. Цяжкія вусны мае ды язык зрабіўся непаваротлівы» (тамсама, 4:10).

Майсей заікаўся, і яго заіканьне мае сымбалічны сэнс. Акудовіч далёка ня першы заўважыў, што хрысьціяне, гаворачы пра свайго Бога, заікаюцца, гавораць няскладна, нязграбна, нелягічна. «Хітрыкі» Яна Багаслова, зь якіх пакеплівае

Акудовіч, чытаючы Пралёг, думаю, не былі незаўважныя і для самога Яна, і для першай супольнасьці хрысьціянаў.

Так, *мы заікаемся, гаворачы пра Бога*. Вытанчаны філёзаф Плятын мог паблажліва, а то і з пагардай глядзець на нейкіх там пасьлядоўнікаў Хрыста, штопраўда, добрых, але недарэчных у сваёй філязофіі Бога. «*Добрыя, слабыя, дурныя*» – так характарызаваў нас, хрысьціянаў, Фрыдрых Ніцшэ.

* * *

«На пачатку было Слова, і Слова было ў Бога, і Богам было Слова» (Ян 1:1). Што ж, лягічны аналіз, праведзены згодна з патрабаваньнямі сучаснасьці, здольны лёгенька «разьбіць боскасьць» гэтых словаў. Калі было *слова*, то паўстае пытаньне, *якое* слова. «Слова» – тэрмін недаакрэсьлены. Калі «слова было ў Бога», то навошта яго атаясамліваць з Богам, а калі слова было Богам, то навошта казаць, што яно *ў Бога*? Далей, пра які *пачатак* ідзе гаворка, бо сучаснасьць ведае толькі рэлятыўны або кантэкстуальны пачатак. Ну, і што мы можам адказаць?

Можам сказаць: Слова *ня сталася лёгікай*. Слова *сталася целам*. Мы можам паказаць на маці Тэрэсу з Калькуты, на брата Альбэрта, на Францішка Асыскага і інш., адзначаючы, што іх дзеяньні ня ўпісваюцца ў лёгіку, але сьведчаць пра Божае *ўцелаўленьне* і *пражываньне сярод нас*. У адказ можна будзе пачуць заўвагу, што безьліч нехрысьціянаў, агностыкаў і атэістаў служылі і служаць бліжнім ня горай, чым хрысьціяне. Мы можам адказаць: бо і там ёсьць Лёгас, той самы. Нам тады могуць сказаць: ну, такая трактоўка справы занадта ўнівэрсальная. Ня споўнены прынцып фальсыфікавальнасьці. І гэта праўда. Ізноў вяртаемся да таго, што наша вызнаваньне Бога абапіраецца на *веру*, а не на *навуку*. Некаторыя хрысьціяне сьпяшаюцца тут дадаць: «А вера вышэйшая за навуку...» Гм, ці не празьмерная прэтэнцыёзнасьць?

Думаю, што невыпадкова пра Бога гаворым на падставе *веры*, а не навукі, а нашыя тэзіцы называем *догматамі*, а не навуковымі сьцьверджаньнямі. Плятон выдзеліў чатыры ступені пазнаньня: *eikasia, pistis, dianoia, noesis*[1]. Першыя дзьве ступені

1 Ілюзія, вера, разумаваньне, веда.
2 Меркаваньне.
3 Пазнаньне.

ў Старажытнай Грэцыі *doxa*[2], а другія, а *episteme*[3]. Як бачым, вера і сфера (ці) хаўлення (ці) ведання, пераканання, адкаліцца.

Вера для Плятона – гэта ніжэйшая ступень пазнаньня, пераканаьне, прастацкае пазнаньне. Цяпер зьвернем увагу, што словы *doxa* (dok-sa) і *dogma* (dok-ma) маюць той сам корань: *dok* і паходзяць ад таго ж самага дзеяслова *dokein*, якое значыць ня што іншае, як «здавацца», «меркаваць». «Догма», гэтак як і «докса», ня маюць нічога супольнага зь ведай пэўнай, моцнай, цьвёрдай. Ані вера, ані догма не належаць да прывілеяванага спосабу пазнаньня, пазнаньня *эпістэмалягічнага*.

Вера і догма – гэта «ніжэйшыя слаі» ў Каралеўстве Пазнаньня.

Нічога дзіўнага, што кароль гэтага каралеўства, Розум, неадназначна ставіцца да гэтых нізкіх слаёў, часам не хавае сваёй пагарды і адчужэньня.

Хрыстос аднойчы ў момант вялікага ўзрушэньня ўсклікнуў: «Праслаўляю Цябе, Божа, Госпадзе неба і зямлі, што закрыў гэтыя справы перад мудрымі і праніклівымі, а аб'явіў простым людзям!» (Мц 11:25; пар. Лк 10:21). Богааб'яўленьне цераз *веру* і *догму* – пагарджаныя формы пазнаньня! – надта добра ўпісваецца ў цэльнасьць «лёгікі» Хрыстовай місіі. Ён нарадзіўся ня ў Рыме і нават не ў Ерусаліме, жыў не ў артадаксальнай Юдэі, а ў пагарджанай усімі (і жыдамі, і грэкамі, і рымлянамі) Галілеі, бываў у кампаніі пагарджаных мытнікаў, прапаведаваў у схізматыцкай Самарыі ды ўрэшце памёр на крыжы. Усьведамленьне таго, што мы – *веруючыя* і *дагматыкі*, ставіць нас у пазыцыі *ўмоўнага падпарадкаваньня* ў Каралеўстве Пазнаньня.

Пазнаньне Бога цераз *веру* і *догмы* павінна было выключыць усякія спробы пераўтварэньня хрысьціянства ў агрэсіўную ідэалёгію і інструмэнт трыманьня ў паслухмянасьці. Ня выключыла...

І тут, бадай, ёсьць пара рэчаў, якія могуць аб'яднаць мяне і Акудовіча. Ну, па-першае, мая аўтадэканструкцыя як інквізытара. Далей, дэсакралізацыя гісторыі хрысьціянства і

дэсакралізацыя тэкстаў. Гэта *можа* аб'яднаць, але справа не такая простая. Дэсакралізацыя хрысціянскай гісторыі азначае для мяне зьняцьце *табу* на маральнае ацэньваньне царкоўнага інстытуту, прызнаньне яго абумоўленьня гісторыяй. Тым ня менеў, для мяне важнае захаваньне тэалягічнага панятку «Эклесіі» – *хрысьціянскай супольнасьці, скліканай Хрыстом*. Праваслаўная рэлігійная рэфлексія выпрацавала ідэю «саборнасьці» – народу, Богам сабранага.

Што да дэсакралізацыі тэксту, то пачну, можа, з таго, што Акудовіч дарэмна ў сваёй гістарыязофіі лякалізуе гэты працэс у эпосе навачасься. Тое, што «паверхня» біблійнага тэксту прэзэнтуе ўсяго толькі *гістарычны* сэнс, было шырока распаўсюджаным поглядам ужо ў старажытным хрысьціянстве і падтрымана ў сярэднявеччы. Культ Божага Слова не перашкаджаў бачыць гістарычны, «рукатворны» характар тэкстаў Пісаньня. Багасловы амаль заўсёды адрозьнівалі *sensus litteralis seu historicus* і *sensus spiritualis* (*tropologicus, alegoricus, anagogicus*)[4]. Такім чынам, прынамсі, часткова Пісаньне было дэсакралізаванае. А гэта ўжо немалаважна, бо з гэтага вынікае, што ад самага раньня хрысьціянства адмовілася ад фундамэнталісцкай трактоўкі Бібліі. Гэта праўда, што поруч з дэсакралізацыяй сэнсу *litteralis seu historicus* ішла сакралізацыя «духоўнага сэнсу».

Сёньня мы мусім прызнаць, што сэнс біблійны *паўстае* (а ня ёсьць раз і назаўсёды дадзены), і то паўстае *ў сумленьні*. Сэнс паўстае ў сумленьні ў выніку спражэньня трох элемэнтаў: Тэксту, Традыцыі і Супольнасьці, і ўтварае трохкутнікавую структуру з упісанымі канцэнтрычнымі коламі:

[image]

Кожны з трох элемэнтаў – гэта свайго роду мікракосмас. Біблійны Тэкст уяўляе сабою бясконца багатую поліфанію, безьліч розных галасоў, часта супярэчлівых між сабою. Традыцыя – гэта мноства *спосабаў* чытаньня і разуменьня Бібліі на працягу гісторыі, а Супольнасьць – гэта Царква, супольнасьць вернікаў, якія дзеляцца між сабою адкрытым сэнсам і абвяшчаюць Божае слова вонках Царквы.

У выніку дзяленьня Словам і прапаведваньня паўстае больш або менш устойлівы *con-sensus*, што трэба разумець як су-адчуваньне. Кожны з гэтых мікракосмасаў зьяўляецца «каралеўствам», якое характарызуецца ўнутранай арганізацыяй і ярархізацыяй. Тэкст не абмяжоўваецца графічным корпусам кніг Біблії, бо сюды ўваходзіць і «абслугоўвальны» корпус – біблійная філялёгія, біблійная археалёгія, эпахальныя кантэксты; у Традыцыі ж маем ня толькі галасы Айцоў Царквы ды навуку вялікіх багасловаў, але таксама мноства парадыгмаў, асяродзьдзі і інтэлектуальную «каньюнктуру», а ўсё гэта абумоўлівала такое ці іншае чытаньне сэнсу; у Супольнасьці, апрача прывілеяванай пазыцыі інстытуту Настаўніцтва, ёсьць мноства багаслоўскіх школаў, мноства духовасьцяў і харызмаў, якія па-рознаму прэзэнтуюць досьвед біблійнага сэнсу. А кожнае з гэтых каралеўстваў мяжуе зь іншымі каралеўствамі: так, каралеўства Тэксту мяжуе зь іншымі тэкстамі (напр. мэсапатамскімі, эгіпецкімі, грэцкімі і інш.). Пазнаньне гэтых сумежных тэкстаў мае немалы ўплыў на паўставаньне біблійнага сэнсу. Каралеўства Традыцыі мяжуе з рознымі філязафічнымі і сьветапоглядным традыцыямі, а Каралеўства Супольнасьці ўплеценае ў самыя разнастайныя кантэксты: нацыянальныя, культурныя, цывілізацыйныя, філязафічныя, рэлігійныя і г. д.

Тэкст утварае *матрыцу* сэнсу, Традыцыя – *гісторыю* сэнсу, а Супольнасьць – *геаграфію* сэнсу. Але бракуе яшчэ *зьбіральніка* сэнсу – Сумленьня.

Тое, што я назваў «Сумленьнем», трэба разумець вельмі шырока. Сумленьне – гэта, можа, найбольш багаты мікракосмас у гэтай структуры. Яно ёсьць перш-наперш зьбіральнікам усяго ўнутранага досьведу чалавека. У ім канцэнтруюцца галасы Эга, Ід і Супэрэга. Сумленьне – гэта далёка не гарманічная структура, у ім – сьціжма разрозьненых і супярэчлівых галасоў. Псыхааналіз паказаў нам надзвычай яскрава, наколькі складаным ёсьць нутро чалавека. Унутры кожнага з нас праходзіць барацьба розных жаданьняў, жарсьцяў і памкненьняў.

Магчыма, з такою пастаноўкай справы маглі б пагадзіцца і

атэісты, і агностыкі. Тэкст – артэфакт, Традыцыя – артэфакт, Супольнасьць – артэфакт, Сумленьне – безь містыфікацыі. Ня толькі паверхневы сэнс, але і глыбокі сэнс, здавалася б, дэсакралізаваны. І ўсё ж хачу стварыць момант напружаньня: *унутры гэтай складанай структуры прысутнічае таямнічы «Спонсар сэнсу» – Дух Сьвяты*. Ён зьяўляецца адным з удзельнікаў гэтае драмы, якая праходзіць у сэрцы чалавека, знаходзіцца ў вэрхале гэтых разрозьненых галасоў. (Адсюль ясна, чаму духоўныя настаўнікі ўва ўсіх рэлігіях і ўва ўсе часы настойвалі на ўнутраным выцішэньні; ясна таксама, чаму і вялікі багаслоў сьвяты Аўгустын, і вялікі чалавеказнаўца Карл Юнг аднадушна настойваюць: *Noli foras ire, in teipsum redi, in interiore homine habitat veritas*[5].)

Дык калі паставім пытаньне: *што* ёсьць асновай сэнсу, гідзі даць адказ амаль дэрыдаўскі: асноваю сэнсу ёсьць *différence*, рознасьць. Сэнс – гэта ня фініш рознасьці, ён ёсьць увайдзі ў момантам сустрэчы, духоўнага судакрананьня. Дух Сьвяты ня толькі не касуе рознасьці, але наадварот – зьяўляецца кульмінацыяй дыфэрэнцыяцыі: «Дзе Дух – там свабода» – кажа Пісаньне. Слова «сэнс» варта тут разумець згодна з этымалёгіяй: *sensus* ад *sentire* – чуць, адчуваць, перажываць, даваць адчуць, а не як «с-мысл» – адпаведнасьць мысьленьню, прынцыпам мысьленьня (=лёгіцы), інтэлігібэльнасьць. Гэтаксама кан-сэнсус, які паўстае ў Супольнасьці, ёсьць адно толькі момантам гарызантальнага судакрананьня, сумеснага «пражываньня», «перажываньня» і «перажоўваньня» народжанага сэнсу. Кансэнсус мае характар *саборны* і не павінен ператварацца ў калектыўную ідэалёгію.

«Не павінен» – лёгка сказаць. Гісторыя хрысьціянства поўная прыкладаў, калі і кансэнсус станавіўся ідэалёгіяй, і сэнс рабіўся ідэалягемай. Гвалціўся і Тэкст, і Традыцыя, і Саборнасьць, яшчэ болей – Сумленьне, а найболей – Дух Сьвяты. Фундамэнталісты абсалютызавалі Тэкст, традыцыяналісты – Традыцыю, а інстытуцыяналісты (калектывісты) – Супольнасьць, гарызантальнае Адзінства. Вялікія рэфарматары – Мартын Лютэр ды Ульрых Цьвінглі націск паклалі на Сумленьне, і гэта быў сутнасны момант у гісторыі чытаньня Бібліі. Тым ня меней, непажаданай была

[5] Не гідзі ўсім *différence*, увайдзі ў сабе. Сьвяты ўнутраным чалавека ісьціна жывець.

чарговая абсалютызацыя – абсалютызацыя Сумленьня, што прывяло да рэлігійнага «салізму» (празьмернага індывідуалізму). А Дух Сьвяты найбольш свабодна прамаўляе ўва ўмовах саборнасьці, а не манархізму ці салізму.

* * *

...На пачатку быў ЛЁГАС, а потым была лёгіка. Спачатку было аб'яўленьне, потым абазначэньне габрэйскімі, арамэйскімі ды грэцкімі словамі, а потым была спроба *прачытаць* гэтыя абазначэньні. Яшчэ пазьней надышоў момант балеснага сутыкненьня з культурным сьветам – адукаванымі грэкамі, якія ўжо навучыліся быць ня толькі спрытнымі сафістамі, але й зьедлівымі скептыкамі, а некаторыя пасьпелі сутыкнуцца з водарам велічнага мудралюбства адноўленага плятанізму. Калі апостал Павал пачаў гаварыць пра ўваскрасеньне, пачуў ад грэкаў у адказ: «Паслухаем цябе іншым разам». Можна сабе ўявіць, якія камэнтары маглі сыпацца з вуснаў грэцкай эліты, знаёмай з думкамі Філёна Александрыйскага, калі чыталі або чулі пралёг Яна Багаслова. Філён таксама вучыў пра Лёгас, але гэты Лёгас быў упісаны ў пэўную структуру: ёсьць Бог і ёсьць сьвет, ёсьць дух і матэрыя, ёсьць душа і цела, а паміж імі мусіць быць пасярэднік – Лёгас. Але калі Лёгас – пасярэднік, то нікому ў галаву не прыходзіла казаць, што «Лёгас быў Богам», ані тым болей што «Лёгас стаўся целам». «Ат, аматар нейкі, філёзаф дамаруслы» – у найлепшым разе такія маглі быць рэакцыі адукаваных грэкаў на тэкст Яна.

Так, Ян заікаецца, гаворачы пра Бога, як у свой час заікаўся Майсей. І ня бачу сэнсу пратэставаць, калі Ніцшэ гаворыць, што мы – «*добрыя, слабыя, дурныя*». Хачу зьвярнуць увагу на іншае: хрысьціяне па-рознаму перажывалі *быцьцё заікамі*. Гэтак, як у пэрыяд перасьледу Антыёха IV некаторыя жыды здолелі пазбыцца нават знаку абразаньня, каб прыпадобніцца да элінскай эліты, так і некаторыя хрысьціяне захацелі любой цаной прыпадобніцца да высакародных мудрацоў гэтага сьвету.

Хрысьціяне не хацелі заікацца, хацелі гаварыць пра Бога гладка, прыгожа, *лягічна*. Так пачала стварацца хрысьціянская клясыка.

* * *

І я зусім не шкадую, што паўстала хрысьціянская клясыка, наадварот, гэта і добра, бо яна паспрыяла цывілізацыйнаму поступу Эўропы. Праблема ў тым, што хрысьціяне па-за гэтай клясыкай ужо не ўяўлялі існаваньня хрысьціянства. Абагаўленьне клясыкі было пасунута аж да абсурду: ярархі пачалі абмяжоўваць, а нават забараняць вернікам чытаць Сьвятое Пісаньне! Клясыка – гэты космас думкі, велічны хорам – асьляпіла многіх хрысьціянаў, і яны праняліся пераканаьнем, што іх вера мае статус *эпістэмэ*, а ня *докса*. А калі так, то ўсе, хто не прызнае гэтую эпістэмэ – дурні, слугі цемры і антыхрысты... Такім чынам, у «Індэксе забароненых кніжак» апынуліся сотні больш і менш выдатных навуковых і літаратурных працаў, як «Мэдытацыі» Дэкарта, працы Лёка, Юма, Канта, ня кажучы ўжо пра Лютэра ці Вальтэра. Паўстаў «парадокс Інквізытара»: абмяжоўваньне Лёгаса ў імя служэньня Лёгасу, змаганьне з Хрыстом у імя служэньня Хрысту.

Лёгас быў падменены Лёгікай. Якая тут розьніца? Давайце пачнем *ад пачатку*.

* * *

Εν αρχη ην ο λογος. Адразу відаць, што гэты сказ ня можа выконваць інфармацыйнай функцыі. Бо што хаваецца за словамі «архэ» і «лёгас»? Акудовіч сказаў бы: НІШТО. Я б толькі ўдакладніў: *нішто з таго, што нам дадзена ў сьвеце фэномэнаў*. Гэты сказ Янавага Пралёгу выконвае дзьве функцыі: *эўхатычную* і *«мэтанаічную»*. Эўхатычная, інакш: малітоўна-сузіральная функцыя палягае ў прызнаньні здольнасьці гэтых словаў *зьдзяйсьняць* лучнасьць з Богам (*re-ligio*) і з супольнасьцю. Вернае маленьне гэтымі словамі *азначае* і *зьдзяйсьняе* спатканьне Бога і чалавека.

Другая функцыя таксама мае рэлігійны посмак, тым ня менш, з увагі на тое, што яна ёсьць свайго роду гермэнэўтыкай, можа быць прызнаная агностыкамі і атэістамі. *Meta-noia* – гэты грэцкі назоўнік цяжкаперакладальны. На сёньняшні момант нам

хопіць узяць пад увагу толькі адно са значэньняў гэтага слова: духоўная мабільнасьць. *Пэўныя словы могуць стацца нагодай такога думаньня, якое мае наступствы ў духоўнай сфэры.* (Думаю, кожны меў такі досьвед, калі, скажам, пачынаў паглыбляцца ў які-небудзь мастацкі твор або філязафічны тэкст і перажыў нейкае «прасьвятленьне».)

Вось жа *мэта-ноя* была падмененая *мэта-фізыкай*. У пэрыяд сьвецкай эманцыпацыі і ўпартай барацьбы за прэстыжнае для сябе месца ў *гэтым* сьвеце хрысьціянства паспрабавала надаць больш-менш адназначны сэнс паасобным словам Бібліі і ўвогуле пераадолець шматлікасьць дыскурсаў, наяўных у тэкстах Пісаньня. Менавіта тады паўстала багазнаўства, якое «замарозіла» творчага Бога і замацавала адну зь перадхрысьціянскіх тэалёгіяў, цэнтральным паняткам якой быў «Akinetos» – «Нерухомы». І што тут можна адказаць Акудовічу, які дэманструе сваю нелюбоў да Бога, сварыцца зь Ім і потым адмаўляе Яго існаваньне? Нічога дзіўнага: «Трансцэндэнтны Бог статычны, ён дадзенасьць, завершаная і непахісная ад пачатку да канца». Няма таксама нічога дзіўнага ў тым, што Акудовіч зрабіў гэткую выснову: «Бог – гэта татальная параза розуму. Ён – межавы камень, які пазначае апошнюю магчымасьць мысьленьня, тую скрань, за якой чалавечаму розуму ня дадзена абазнацца».

Для Акудовіча праблема малая – ён ня верыць у існаваньне Бога па-за тэкстам. А для мяне гэта праблема, бо я зацікаўлены ў тым, каб вызваліць *досьвед Бога*.

Εν αρχη ην ο λογος. Гэты сказ *не інфармуе* пра абсалютны пачатак, як гэта здавалася схалястыкам. «Arche» мае пяць значэньняў, а кожнае з гэтых значэньняў мае некалькі варыяцыяў, а гэтыя варыяцыі маюць яшчэ свае сэмантычныя адценьні. А пяць асноўных значэньняў гэта: *1)* пачатак; *2)* прычына; *3)* падстава-грунт; *4)* прынцып; *5)* улада (дзяржава). Варты ўвагі адзін з варыянтаў перакладу на старацаркоўнаславянскую мову: «Искони...». Прысутнічае тут корань «кон», які складае ўва ўсіх славянскіх мовах слова «*кон*-ец». У беларускай мове гэты корань утварае і самастойнае слова: «кон» – лёс, гэты ж корань прысутнічае і ў слове

на*кан*аваньне. Неакрэсьленасьць слова «архэ» адлюстроўвае неакрэсьленасьць нашага *досьведу гранічнасьці*. Але словы Пралёгу ня толькі адлюстроўваюць нашу разгубленасьць перад абліччам той *кан*чатковай мяжы, яны таксама яе *накіроўваюць*, не даюць ёй расьсеяць наш духоўны сусьвет: ...БЫЎ ТОЙ-ЛЁГАС. («Той» – гэта магчымая інтэрпрэтацыя артыклю «о», які выконвае ўказальна-нагадвальную функцыю.)

Тут трэба «адкапаць» той перашапачатковы досвед, які зьвязваўся са словам «Лёгас». Як я ўжо згадваў, для Філёна Александрыйскага (амаль сучасьніка Хрыста) Лёгас быў пасярэднікам між матэрыяй і духам, Богам і чалавекам, душою і целам. Раскол на «верхні» і «ніжні» сусьветы ў тыя часы вельмі востра адчуваўся. У выніку новых заваёваў Рымскай імпэрыі пашыралася геаграфія, пашыралася поле разнастайнасьці і супярэчнасьцяў. «Ніжні сусьвет» здаваўся нейкім хаосам. Адсюль, ідэя Лёгаса-Пасярэдніка не магла ня выклікаць хваляваньня ў адукаваных элінаў. А Ян Багаслоў зьвязвае Лёгас з асобаю Ісуса Хрыста, які быў раскрыжаваны! (І ўваскрос.)

Лёгас становіцца не гарантам лёгікі, як гэта хацелася клясыкам, а рэпрэзэнтантам супярэчнасьцяў!

Янаў Лёгас тоіць у сабе змаганьне Жыцьця і Сьмерці. Боскі Лёгас ёсьць носьбітам фундамэнтальнае драмы, якая разыгрываецца ўнутры чалавека: быць ці ня быць. Лёгас уяўляе сабой канцэнтрацыю напружаньня паміж быцьцём і небыцьцём.

Сэмантыка і гермэнэўтыка «Лёгасу» адкрывае чарговыя аспэкты абмяркоўванага досьведу. Амаль на ўсе мовы «λογος» перакладаецца як «Слова» (лац. Verbum, анг. Word, літ. Žodis). Але магчымыя тут і іншыя пераклады, гляньма ў цэлым кантэксьце:

На пачатку быў Розум…
На пачатку была Думка…
На пачатку быў Сказ…
На пачатку быў Прынцып…
На пачатку была Ідэя…
На пачатку быў Сэнс…
На пачатку быў Лад...

Усе гэтыя значэньні варта трымаць у памяці. Але, думаю, невыпадкова інтуіцыя хрысьціянаў-перакладальнікаў прыхілілася да «слова». Слова зьяўляецца фіксатарам нашага досьведу, носьбітам і камунікатарам досьведу. У слове наш досьвед працягвае сваё існаваньне. Цераз слова адбываецца аб'ядноўваньне досьведу розных людзей, што спрычыняецца да дынамізму і духоўнай напоўненасьці чалавечай супольнасьці. Слова – гэта акумулятар духоўнай энэргіі, мэдыюм і сіла.

Адначасова *слова характарызуецца надзвычай кволым існаваньнем*, яно радыкальна залежнае. Яно зьнікае амаль у момант зьяўленьня. Яно ёсьць інтэнцыянальным быцьцём, залежыць ад графічных, гукавых або кінэтычных знакаў і атрымлівае існаваньне ад канкрэтнага суб'екту. Яно заўсёды ўплеценае ў кантэкст, падпарадкаванае прынцыпам сынтаксісу, а шанцы «словазьяўленьня» абумоўленыя сытуацыяй. Слова – гэта кволая і несамастойная істота ў агромністым космасе.

Слова – гэта фатон, які вылятае з крыніцы сьвятла і анігілюецца, аддаўшы сваё быцьцё і ўсю энэргію іншаму быцьцю.

Слова чыніць магчымым «фатасынтэз» у космасе чалавечага духу, яно адказвае за фармаваньне «злучальнай тканкі», якая аб'ядноўвае чалавечы досьвед. Гэткая інтэрпрэтацыя апраўданая яшчэ й тым, што ў Пасланьні да габрэяў (1:4) Хрыстос названы *apagausma tης doxης* – бліск, промень, адлюстраваньне славы (Айца). А ў тым жа Пралёгу (1:4) чытаем: *n autτ **dz**τη ηn, kai hη dzτη ηn to **ph**τs tτn anthrτpτn* – у Ім было **жыцьцё** і жыцьцё было **сьвятлом** людзей.

Гэты сказ яшчэ болей разьвівае і засяроджвае наш досьвед. «Дзоэ», «жыцьцё» – гэта эквівалент габрэйскага слова «ХАВА», а «ХАВА» – гэта імя жаночага архетыпу, які нам вядомы ў трохі змадыфікаванай форме пад словам «Эва». Але гэта ня ўсё. Імя Бога, якое было аб'яўлена Майсею: «Я-ЁСЬЦЬ-ЯКІ-ЁСЬЦЬ» у габрэйскім арыгінале складаецца з двойчы паўторанага слова з тым самым коранем, які прысутнічае ў слове «Эва»: «ЭХ'Е-АШЭР-ЭХ'Е» – вось арыгінальнае гучаньне таго, што мы перакладаем пры дапамозе дзеяслова «быць». «Эх'е» – гэта першая асоба адзіночнага ліку ад неазначальнай формы

дзеяслова «хайя», ад якога і паўстала слова «хава» – жыцьцё.

* * *

Схалястыка пахавала гэтае жыцьцё, упіхнуўшы Божае імя ў пракрустаў ложак Арыстотэлевай мэтафізыкі, да чаго найболей спрычыніўся сьвяты Тамаш Аквінскі. Дынамічнае і імпэтнае «Эх'е» вельмі блякла гучыць у лацінскім перакладзе «Sum», а яшчэ болей блякла і халодна ў інтэрпрэтацыі Тамаша, які падпарадкаваў яе адыёзнай тэалягеме Арыстотэля:«Ακινετος», «Immobilis», «Нерухомы». Так, гаварылася тады шмат і пра «жыцьцё» Бога, і пра Яго «дзеяньне»[6], і пра Ўцелаўленьне[7], і пра Яго любасьць... Але ўсё гэта было падпарадкавана вярхоўнай «ісьціне» – Яго Нязьменнасьці.

Ня менш балесным ёсьць тое, што тэалягема нерухомасьці супраглася з тэалягемай мысьленьня. Схалястыка ня толькі пераняла Арыстотэлева «акінэтос», але таксама тэзіс: *oesis autou noeseτs noesis* – мысьленьне Яго ёсьць мысьленьнем мысьленьня. Бог характарызаваўся як Мысьленьне, Інтэлект, што мела таксама і станоўчае значэньне. Але найчасьцей такая характарыстыка не спрыяла ані богапазнаньню, ані Нерухомым, значыць, *праўдзівае мысьленьне* павінна характарызавацца нязьменнасьцю і нерухомасьцю...

Цяпер нерухомасьць Бога – Акудовіч змагаўся з хрысьціянскім Богамя варта атаясамліваць тамізм і кансэрватызм. На грунце тамізму паўстаў і свайго роду экзыстэнцыялізм (Эт'ен Жыльсан) і пэрсаналізм (Караль Вайтыла), а адзін з сучасных дамініканцаў, Тадэвуш Бартась, пасьпяхова бароніць аўтаномію чалавечага сумленьня менавіта на подзе тамізму.

* * *

Былі таксама спробы шуканьня выхаду з супярэчнасьцяў і паралягізмаў, у якія трапляла схалястыка. Амаль аднадушна быў прыняты тэрмін *absolutus*, які павінен быў растлумачыць наяўнасьць супярэчнасьцяў у багазнаўстве. *Ab-solutus* паходзіць ад *ab-solvere* – ад-вязаць, звольніць, ад-даліць. Тэонім «Абсалют» павінен быў даць нам зразумець, што Божая сутнасьць насамрэч недаступная нашаму пазнаньню: Бог-у-сабе знаходзіцца па-за сусьветам фэномэнаў, якія можам апісваць і растлумачваць.

[6] Адны з ёсьць імёнаў Бога ў: *oesis autou noeseτs noesis* – мысьленьне Яго ёсьць мысьленьнем мысьленьня. Тамізм – гэта багазнаўства – «Actus purus» – мысьленьню. Калі Бог ёсьць Мысьленьнем і адначасова ён ёсьць чыстае дзеяньне.

[7] Якое, здавалася б, павінна радыкальна разьбіць уяўленьне пра «нерухомасьць» Бога.

[8] Адно

Гэта была роспачная спроба, бо насамрэч спараджала новую супярэчнасьць. На практыцы тэорыяпазнаўчы (водле пачатковай інтэнцыі) тэрмін «абсалют» пачаў успрымацца як *інфармацыя* (!) пра Божую сутнасьць. І якая ж гэта інфармацыя? Тое, што Ён – *далёкі, незразумелы і недасяжны*. Нельга зь Ім навязаць пачуцьцёвага кантакту, нельга Яго адчуць, нельга Ім захапляцца. Агонь, які Майсей бачыў падчас аб'яўленьня Божага імя «Эх'е-Ашэр-Эх'е», амаль цалкам пагас у схаластычным імені «Нерухомы», а куст, які гарэў і не згараў у прысутнасьці Майсея, пакрыўся халодным шэранем у клясычным дыскурсе сярэднявечнага багазнаўства.

Разгублены чалавек пачаў пытацца: дык дзе Бог і хто Ён?

Ён – Нязьменны і Недасяжны Розум, таму трэба некрытычна слухацца тых, хто на зямлі рэпрэзэнтуе Яго Волю і Яго Ісьціну. Біч носьбітаў незразумелага «Абсалюту» і холад інквізыцыйнага арбітралізму наваліўся на людзей сярэдніх вякоў. «Сьмерць Бога» першым адчуў зусім ня Ніцшэ, а ультрахрысьціяне на Захадзе і Ўсходзе позьняга сярэднявечча. Паляваньне на чарадзеек, танцы сьмерці, масавыя псыхозы – усё гэта – наступства «сьмерці Бога» на Захадзе, а тэрор апрычніны, «самоизжигательство» і апакаліптычныя галюцынацыі – наступства «Божай сьмерці» на Ўсходзе.

* * *

Сьв. Тамаш стварыў салідную багаслоўска-філязафічную сыстэму згодна з інтэлектуальнымі патрабаваньнямі сваёй эпохі, і яго сыстэма адлюстроўвае плюсы й мінусы тагачаснай навуковай парадыгмы. Непамысным усё ж было замацаваньне фальшывага перакананьня, што хрысьціянская вера мае статус навуковага пазнаньня, што належыць да *эпістэмэ*, а ня *докса*. Ды і сам Аквінат пад канец свайго жыцьця прызнаў, што «Ўсё, што напісаў – гэта салома», але ніхто гэтага сур'ёзна не ўспрыняў. Першапачатковая забарона царкоўнымі ўладамі Тамашовай дактрыны спрычынілася да таго, што дамініканцы пачалі любой цаной бараніць тамізм, і калі нарэшце Царква прызнала прававернасьць гэтай навукі, дамініканцы пачалі трыюмфаваць. Тамізм, які яшчэ ў XIII–XIV ст. асацыяваўся з прагрэсізмам і наватарствам, з часам стаўся ўлюбёнай

цьвярдыняю кансэрватараў[8]. Караткевіч у сваім рамане «Хрыстос прызямліўся ў Гародні» бязьлітасна выкрывае дамініканскі кансэрватызм у XVI ст. у вобразе Флярыяна Басяцкага, «каплана-мніха касьцёлу псоў Пана Бога», сымбалі рэакцыі і цемрашальства.

Але ў той жа сярэднявечнай дамініканскай традыцыі паўсталі і іншыя вэрсіі багазнаўства. Ян Таўлер (XIV ст.) піша пра «трайныя народзіны» Бога – з Айца без маці, з Маці без айца і «штодзённае нараджэньне Бога ў кожнай добрай душы». У падобным духу разважалі й Настаўнік Экхарт з Гэнрыхам Сузо.

* * *

Вернемся ж цяпер да Слова: Και ο λογος σαρξ εγενετο… Слова сталася целам. Паспрабуйма ўваскрасіць тое пачуцьцё шоку, а можа, нават абурэньня тагачасных адрасатаў (пераважна элінаў), калі яны чулі гэтыя словы. Боскі Лёгас, сымбаль «верхняга сусьвету» становіцца… ня тое што целам, а *саркс*! «Саркс» – гэта найбольш пагарджаная форма жывой матэрыі.

У часы напісаньня Пралёгу ўжо існавала паўсталая на подзе плятанізму канцэпцыя трох сфэраў у чалавеку: сферы цялеснай, душэўнай і духоўнай. Першая сфэра – гэта *sτma*, цела, якое мае сталую форму, але заслугоўвае на ігнараваньне і пагарду з прычыны свае сьмяротнасьці. Сфэру «сома» характарызуе ганебнае быцьцё-к-сьмерці, і таму добра робіць той, хто максымальна ігнаруе саматычныя (цялесныя) патрэбы. Другая сфэра – гэта *psych*η, душа, якая ёсьць прынцыпам жыцьця цела. Яна мае большую вартасьць, бо знаходзіцца ў блізкай сутычнасці з духам, г. зн. зь несьмяротнасьцю, але сама яна пазбаўленая гэтай велічнай рысы. Урэшце, найвышэйшая сфэра ў чалавеку – *pneuma*, дух, найболей трывалы аспэкт чалавечага быцьця. Калі чалавек «вызваліцца» зь вязьніцы ніжніх сфэраў, тады мае шанец стаць несьмяротным.

У зьвязку з гэтым паўстала канцэпцыя самавызваленьня і самазбаўленьня, асабліва папулярная сярод гностыкаў. Аснову яе складаюць тры этапы: а) вызваленьне ад цела шляхам ачышчэньня, якое палягала ў радыкальнай аскезе (у індуізьме гэтаму магла б адпавядаць сыстэма ёгі) і насіла назву *katharsis*;

б) вызваленьне ад душы шляхам асьвячэньня, якое палягала ў сузіраньні ісьціны (ідэі), засяроджаньні на Адным і называлася *phτtismos* і в) дасягненьне кульмінацыі духу шляхам злучэньня з Адным (г. зн. з Богам) – *enτsis*. У залежнасьці ад таго, ці хто стаў на шлях самавызваленьня, ці не, і ад таго, на якім этапе знаходзіўся, гностыкі дзялілі людзей на «цялесьнікаў», «душэўнікаў» і «духоўнікаў» (sτmatikoi, psychikoi, pneumatikoi)).

Але чым сталася Слова? Слова сталася ня духам, не душою і нават ня целам, *Слова сталася саркс*! Саркс – гэта настолькі пагарджаная форма жывой матэрыі, што гностыкі, а пазьней і нэаплятонікі не палічылі патрэбным даць хоць якое месца ў сваім чалавеказнаўстве. *Саркс* – гэта сфэра найбольшай зьменлівасьці, няўстойлівасьці і хаосу, сфэра нізкіх інстынктаў, жарсьцяў і лібіда, сьметнік калектыўнага і індывідуальнага несьвядомага, апрычонае і праклятае месца чалавечага быцьця!

* * *

Уцелаўленьне Хрыста чыніць магчымым ураtаваньне «праклятых» сфэраў чалавека. Уцелаўленьне пазначае пачатак Новае Эры, якую Таяр дэ Шардэн называе *эрай хрыстагенэзу*. Наша цела, душа, дух і розум разам з паняткавым «павуціньнем» уключаныя ў Вялікую Эвалюцыю. Хрыстагенэз – гэта паступовае вызваленьне з абшараў *уявы*, рух у кірунку пункту Ω: злучэньня зь *невядомым боскім*.

ЗАМЕСТ ЗАКАНЧЭНЬНЯ

Дык з кім урэшце змагаўся Акудовіч на старонках «Мяне няма» і «Дыялёгаў з Богам»?

Змагаўся з прывідам, які на пэўным этапе яго індывідуальнай гісторыі вылез зь несьвядомага і явіўся перад ім як жорсткі Абсалют, які толькі тое і робіць, што кладзе сваю халодную лапу на ўсякую жывую думку, забівае любое пачуцьцё, забараняе шукаць і кахаць, высмоктвае рэшткі волі.

Гэта быў псэўда-Бог.

Бог-павук, Бог-норма, Бог-супэрэга.

Шкада ўсё ж, што Акудовіч, забіўшы гэтага «Бога», не захацеў ісьці далей і глыбей, а цалкам даверыўся племянному божышчу – Этнасу. Багіня-Этнас аказалася для яго больш прывабнай, чым хрысьціянскі дыскурсіўны «Бог». Таму што *яна* здолела падарыць яму *ілюзію ўтульнасьці*.

* * *

Этнічная рэлігія можа ператварыцца ў новую мэта-нарацыю.
[image]
[image]
Пачатак Цалкам Форум
№ 6 (46) - 2006
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне [**mk**]. Абнаўленьне [**czyk**].
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2006/07/23**
[image]

да зместу
археалогія • архітэктура • **гісторыя** • эсэістыка • літаратура • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

Кшыштаф Касажэцкі Кампанія 1660 году ў Літве

КШЫШТАФ КАСАЖЭЦКІ Нарадзіўся ў 1967 г. у Аструдзе. Выпускнік Хрысьціянскай тэалягічнай акадэміі ў Варшаве і Інстытуту гісторыі Варшаўскага ўнівэрсытэту. З 2000 году дактарант у Інстытуце гісторыі Варшаўскага ўнівэрсытэту пад кіраўніцтвам праф. др. габ. Тадэвуша Васілеўскага. Займаецца гісторыяй вайсковай справы

УСТУП ДЛЯ БЕЛАРУСКАГА ЧЫТАЧА

Летам 2005 году я атрымаў ліст, у якім выдавецтва «Arche» зь Беларусі папрасіла ў мяне дазволу на пераклад і выданьне маёй кнігі «Kampania roku 1660 na Litwie». Гэта стала для мяне вельмі прыемнай нечаканасьцю і сапраўдным гонарам.

Зь вялікім задавальненьнем я прывітаў надзею, што мая кніга мае шанец патрапіць у рукі чытача зь Беларусі, паколькі пераважная большасьць апісаных у кнізе падзей адбываецца менавіта на яе сёньняшніх тэрыторыях. З гэтай прычыны шмат беларускіх чытачоў зможа бязь цяжкасьці лякалізаваць іх у канкрэтных мясьцінах свайго краю і праз старонкі кнігі паглядзець на некалькі нязьмерна багатых на падзеі гадоў гісторыі беларускіх зямель другой паловы XVII стагодзьдзя. Зьмест кнігі датычыць нашай супольнай гісторыі, тых часоў, калі землі сёньняшняй Польшчы і Беларусі складалі адзін арганізм у рамках даўняй Рэчы Паспалітай. Гэта былі часы, калі яе грамадзянін, які паходзіў зь зямель цяперашняй Польшчы, і той, які нарадзіўся дзесьці на землях цяперашняй Беларусі, меў тыя самыя правы, удзельнічаў у тых самых

соймах, выбіраў агульнага манарха, абараняў адну новую, правы і свабоды, якія яна яму гарантавала і якімі ён і спарыўся.

Землі, якія расьцягваліся ад Падляшша на захадзе да Смаленшчыны і Севершчыны на ўсходзе, уваходзілі з часоў вялікай літоўскай экспансіі XIII–XIV ст. у склад Вялікага Княства Літоўскага. Імкнучыся на ўсход, літоўскія законы вялікую частку якіх складалі ваяры з занятых яшчэ ў XIII ст. беларускіх зямель, разьмешчаных на Дзьвіне і на захад ад Бярэзіны, увайшлі на землі, ахопленыя ўплывамі маскоўскіх князёў, якія з XIV ст. паволі, але няспынна нарашчвалі сілы. Яшчэ мала каму вядомыя ўладары на мяжы XIV–XV ст. спынілі марш ліцьвінаў на ўсход. Зрабіць гэта было лягчэй, бо ў той час вялікія літоўскія князі павінны былі абараняць сэрца свайго краю ад усё больш магутных атакаў крыжакоў. Унія з Польшчай дазволіла супольнымі сіламі адолець моц крыжацкага закону і ў пачатку XV ст. ліквідаваць сьмяротную небясьпеку зь ягонага боку.

Як паказалі чарговыя стагодзьдзі, сапраўдная пагроза для літоўскага панаваньня знаходзілася на ўсходзе – у Маскве. Скінуўшы татарскае іга, маскоўскія князі няспынна ўмацоўваліся. Пад канец XV ст. на ідэалягічнай глебе яны дамагліся таго, што вялікія літоўскія князі прызналі іх вялікімі князямі і царамі. У Вільні разумелі небясьпеку, якая вынікала з гэтага, бо адначасова Рурыкавічы з Масквы ўсё больш адкрыта выступалі са сваімі прэтэнзіямі як адзіныя законныя ўладары рускіх зямель. Вялікая іх частка знаходзілася ў руках Літвы, і было вядома, што раней ці пазьней дойдзе да вайны за іх. Заўважальная пад канец XV ст. слабасьць Літвы і яе досыць няўдалыя пачынаньні ў дачыненьні да прымежных рускіх князёў прывялі да першай вайны. Войскі Івана III Суровага дабіліся пэўных посьпехаў і вырвалі кавалак зямель ва ўладароў зь Вільні. Далейшыя гады прынесьлі чарговыя посьпехі. У 1550 г. ліцьвіны панесьлі цяжкую паразу над Вядрошай. Гэта стала сапраўдным шокам, бо першы раз маскоўскія войскі нанесьлі ліцьвінам цяжкую паразу ў полі. Праз пару гадоў быў страчаны Смаленск, які быў своеасаблівай брамай у глыб Літвы. Толькі дапамога польскіх войскаў дазволіла стрымаць маскоўскі наступ. Зь іх падтрымкай былі

Новыя часу, гістарыяў Вялікага Княства Літоўскага ў XVII–XVIII ст. і функцыянаваньнем магнацкіх уладаньняў, між іншым Гадзівілаў і Сабескіх. Аўтар навуковых і навукова-папулярных артыкулаў, прысьвечаных гэтым тэмам.

адбітыя захопнікі ў 30-я гады XVI ст., калі яны наблізіліся да Менску і нават падышлі недалёка да Вільні. У пачатку другой паловы XVI ст. у атаку на Літву рушылі войскі цара Івана IV Жахлівага. Сытуацыя Вялікага Княства Літоўскага станавілася драматычнай, а праз страту Полацку пад пагрозай апынулася сама Вільня. Станавілася ўсё больш зразумелым, што бяз польскай дапамогі ВКЛ ня здолее даць адпор мацнейшаму праціўніку, якім у той час было Вялікае Княства Маскоўскае. Толькі наступ караля Стэфана Баторага ў 1579–1581 г. на чале літоўскіх і польскіх сілаў дазволіў разьбіць і разграміць праціўніка.

Глыбокі крызыс, які хутка пасьля гэтага ахапіў Маскву, аддаліў пагрозу. У пачатку XVII ст. ён нават схіліў швэдаў і Рэч Паспалітую да інтэрвэнцыі. Здавалася, што дасягнутыя посьпехі польска-літоўскіх войскаў і заняцьце Масквы і Смаленску могуць прывесьці нават да ўзьнікненьня уніі Рэчы Паспалітай з Масквой. Аднак, з аднаго боку, неразуменьне культурнай і рэлігійнай адметнасьці маскоўскага насельніцтва, гвалт польскіх і літоўскіх войскаў, амбіцыі караля Жыгімонта III Вазы, а з другога боку, падазронасьць і антыпатыя ў дачыненьні да каталіцкіх інтэрвэнтаў з боку пераважнай большасьці маскоўскага грамадзтва прывялі ўрэшце да паўстаньня і доўгай вайны. Была страчаная Масква, але захаваны Смаленск і шырокія землі на ўсходзе, страчаныя ў XVI ст. Спроба адбіць іх Масквой у 1632–1634 г. закончылася паразай, якая, здавалася, на доўгі час пацьвярджала абсяг панаваньня Рэчы Паспалітай і дасягнутую ёй перавагу над усходнім суседам.

Новы разьдзел ва ўзаемнай гісторыі адкрыў 1648 г. і казацкае паўстаньне Багдана Хмяльніцкага ва Ўкраіне. У адрозьненьне ад ранейшых, яно прынесла вялікія паразы войскам Рэчы Паспалітай. У Маскве ўважліва назіралі за разьвіцьцём падзей. Спачатку расейцы меркавалі нават аказаць падтрымку палякам, паколькі баяліся падобных выбухаў у сябе. Аднак паступова непакой саступаў месца надзеі на тое, што Рэч Паспалітая пагрузіцца ў глыбокі крызыс, які дазволіць Маскве выцягнуць з гэтага максымальную выгаду. Ужо ў 1650 г. у Варшаву прыбыло пасольства братоў Пушкіных, якое прынесла

правакацыйныя патрабаваньні ў дачыненьні да польскага боку. Вялікая параза Хмяльніцкага пад Берастэчкам у 1651 г. затармазіла маскоўскія прэтэнзіі, але польскія паразы ў наступныя гады і ўсё глыбейшы ўнутраны крызыс прымусілі зноў умяшацца ў справы Рэчы Паспалітай.

Тым часам Хмяльніцкі, зразумеўшы, што ня можа перамагчы Рэч Паспалітую, а яго татарскі саюзьнік зусім не жадае яму ў гэтым шчыра дапамагаць, пачаў зьвяртацца да цара Аляксея Міхайлавіча з прапановамі прыняць яго і Ўкраіну ў сваё падданства. У Маскве выкарысталі нагоду і ў канцы 1653 г. згадзіліся з гэтым. Для ўжо вельмі аслабленай Рэчы Паспалітай гэта азначала чарговую вайну з моцным суседам. А для Масквы надыходзіла пара помсты за ўсе паразы першай паловы XVII ст. Царскія войскі ўвайшлі ў літоўскія межы на мяжы траўня і чэрвеня 1654 г. Яны мелі вялізную перавагу. Маштаб посьпехаў зьдзівіў самога цара. Былі разьбітыя невялікія літоўскія сілы, заняты Полацак, здабыты Смаленск і шэраг фартэцый на ўсходзе і поўначы Літвы. Да канца году маскоўскія войскі абаперліся аб лінію Дзьвіны і Бярэзіны. Такім чынам, яны дасягнулі мяжы зямель, якія ў той час лічыліся спадчынна падпарадкаванымі цару, на якія ён заяўляў прэтэнзіі як на сваю вотчыну. Гэтую здабычу ўдалося абараніць, калі зімой 1654–1655 г. рушыў літоўскі наступ. Вясной царскія арміі, падмацаваныя казацкімі палкамі пайшлі ў чарговы наступ. Літоўскі супраціў быў нязначны. Пала Вільня, Горадня, Коўна, царскія войскі падышлі нават пад Берасьце-Літоўскае. Ад далейшага маршу і заняцьця Жамойці іх стрымала агульнае зьнясіленьне і, перш за ўсё, уваходжаньне ў рэшту літоўскіх зямель швэдзкіх войскаў. Такім чынам, амаль усё Вялікае Княства Літоўскае апынулася пад уладай Аляксея Міхайлавіча, а мясцовая літоўская і беларуская шляхта апынулася перад вялікай дылемай: застацца вернымі пераможанаму польскаму каралю, які ўцёк за межы краю, ці прысягнуць на вечную вернасьць новаму гаспадару – маскоўскаму цару. Надзвычай імклівая зьмена падзей прыводзіла да таго, што гэтае пытаньне станавілася асабліва істотным. Рэч Паспалітая ўздымалася з упадку і распачынала наступ супраць швэдаў. Восеньню 1656 г. яна ўклала замірэньне і антышвэдзкі хаўрус з Масквой, а цару паабяцалі выбраць яго на польскі трон і хутка распачалі

супольныя дзеяньні супраць швэдаў у Інфлянтах. Заставалася толькі пытаньне, ці хаўрус, укладзены ў прымусовай сытуацыі і на вельмі цяжкіх для Рэчы Паспалітай умовах, зможа вытрываць выпрабаваньне часу і абсалютна супрацьлеглыя памкненьні абедзьвюх дзяржаў.

У кнізе зроблена спроба адказаць на гэтыя пытаньні, а таксама паказаць фактары, якія прывялі да спыненьня супрацоўніцтва і выбуху змаганьняў паміж Рэччу Паспалітай і Расеяй у 1658 г. Апісваюцца ваенныя дзеяньні гэтага году і змаганьні, якія вяліся ў 1659 годзе. Ад падзей, зьвязаных з пачаткам наезду князя Івана Хаванскага позьняй восеньню таго году, пераходжу да ўласна зазначанай у назьве тэмы. Яна ахоплівае наезд Хаванскага, яго дзеяньні на Наваградчыне, а потым наступ літоўскіх і польскіх войскаў, які дазволіў прагнаць маскоўскія войскі за Дзьвіну і Дняпро. У яго рамках знаходзяцца апісаньні бітваў пад Палонкай, на Басі, пад Талочынам і Друцкам, а таксама меншых сутыкненьняў. На разьвіцьцё падзей на літоўскіх і беларускіх землях, у тым ліку і ваенных, уплывала мноства фактараў. Таму я стараўся паказаць нязвыклую складанасьць тагачасных палітычных дачыненьняў паміж трыма бакамі, якія ваявалі на польскіх і літоўскіх землях – Швэцыяй, Рэччу Паспалітай і Расеяй. Падзеі ў Літве і Беларусі былі цесна зьвязаны з сытуацыяй ва Ўкраіне і са своеасаблівым дыпляматычным спаборніцтвам паміж Расеяй і Рэччу Паспалітай, якое мела на мэце хутчэйшае заключэньне міру са Швэцыяй. Дзеяньні літоўскіх гетманаў былі моцна абумоўленыя канфліктам літоўскага магнацтва з каралеўскім двaром. На паводзіны самога войска вялізны ўплыў мелі праблемы з платай, якія ўсё больш настойліва непакоілі яго, праблемы з абяцанымі ўзнагародамі, а таксама выкарыстаньне найвышэйшымі вайскаводцамі жаўнераў у сваіх палітычных канфліктах. Як па літоўскім, так і па маскоўскім баку немалую ролю адыгрывала ўзаемная антыпатыя і нават проста варожасьць паасобных вайскаводцаў. Праблемаў было больш – я згадаў найважнейшыя.

Кніга мае разбудаваную частку, прысьвечаную падзеям, што папярэднічалі ўласна 1660 году. Было б цяжка зразумець падзеі гэтага году без паказаньня ранейшых. Да таго ж я пастараўся,

маючы на ўвазе зацікаўленьне беларускага чытача, дапоўніць і паправіць апісаньне падзей, якія адбываліся на беларускіх землях у 1658–1659 г. Яны былі сапраўды багатыя на такія захапляльныя, але так малавядомыя падзеі, як паўстаньне Івана Нячая, абарона Старога Быхава ці выправа корпусу Сасноўскага. Надзвычай цікавая з розных прычын гісторыя паўстаньня насельніцтва Беларусі ў тыя гады супраць маскоўскага прыгнёту. Яго паходжаньне і разьвіцьцё, прычыны пазыцыяў ад вернасьці цару да рашучага супраціву – усё гэта патрабуе грунтоўных дасьледаваньняў. У параўнаньні з польскім выданьнем я значна дапоўніў апісаньне гэтых выпадкаў. Дапамагло мне ў гэтым і тое, што пасьля публікацыі кнігі ў Польшчы я атрымаў доступ да чарговых архіўных крыніц, якія дадалі новай інфармацыі.

Разумею, што гэтая праца не вычэрпвае праблемы і ў шмат якіх месцах яе, напэўна, можна паправіць і дапоўніць. Гэта – поле для чарговых гісторыкаў, а цікавыя матэрыялы надалей хаваюцца ў архівах і бібліятэках розных краін. У гэтым месцы я жадаю сардэчна падзякаваць спадару Генадзю Сагановічу, кніга якога «Невядомая вайна 1654–1667» у свой час натхніла мяне на гэтыя дасьледаваньні.

Маю надзею, што праца сустрэнецца з зычлівым прыёмам беларускіх чытачоў. Як я зазначыў вышэй, яна датычыць фрагмэнту нашай супольнай гісторыі. Кніга напэўна выкліча шмат пытаньняў і камэнтароў. Гэта добра, бо яны заўсёды ствараюць нагоду для канструктыўнай дыскусіі, якая можа высьветліць шмат яшчэ малавядомых эпізодаў нашай гісторыі. І ў гэтым ёсьць патрэба, бо вайна 1654–1667 г. паміж Рэччу Паспалітай і Расеяй надалей застаецца вельмі слаба дасьледаванай і ўвесь час шукае сваіх гісторыкаў.

Кшыштаф Касажэцкі.

Поўны тэкст кнігі «Кампанія 1660 году ў Літве»
чытайце ў папяровым «ARCHE»

Замовіць у распаўсюднікаў

Замовіць у інтэрнэт-кнігарні knihi.net
[image]
[image]

№ 6 (46) - 2006

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/07/25
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 6 (46) - 2006**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам Форум

[image]

[image]

эсэістыка [image]2006

да Зьмітук

ўдалітыка • крытыка • гісторыя • **эсэістыка** • літаратура • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

Ніна Здановіч Віртуальны Полацак

НІНА ЗДАНОВІЧ
археоляг, спэцыялістка па беларускай кераміцы і кахлі. Выкладае ў Беларускім дзяржаўным пэдагагічным унівэрсытэце імя Максіма Танка. Друкуецца ў «ARCHE» ўпершыню.

Паняцце «віртуальная рэальнасць» трывала ўвайшло ў наш лексікон бадай што толькі ў апошняе дзесяцігоддзе. Большасць людзей разумее пад гэтым кампутарную рэальнасць. Аднак ёсць катэгорыя людзей, для якіх паняцце «віртуальная рэальнасць» існуе вось ужо два стагоддзі. Гэта археолагі. Асаблівасці прафесіі дазваляюць ім убачыць тое, што для астатніх людзей – не больш чым віртуальны свет.

Часам адчуванне такой «іншасці» археолага робіцца асабліва вострым. Памятаю, адна з полацкіх чыноўніц, стоячы над раскопам з печышчам, аўтарытэтна абвясціла: «*Ну я же говорила, что здесь ничего не было!*» (надта ж не хацелася, каб знайшлі сляды пабудоваў). А мне карцела залямантаваць: ды вы ж стаіцё ля печы XVIII стагоддзя! Але, згадаўшы славутае «Не кідайце перлаў сваіх перад...», я стрымалася, а ўвосень спакойна паклала ёй на стол контраргумент аб’ёмам на сорак старонак.

Таму давайце ўключым свой «археалагічны» камп’ютэр і паблукаем па вулках Полацка, паспрабуем «завітаць у госці» ў дамы да некаторых полацкіх месцічаў.

XVI – ПАЧАТАК XVII СТАГОДДЗЯ

Адчуванне «рэальнасці» такога дома кожны раз іншае. Упершыню, і вельмі востра, я адчула гэта ў 1980 годзе ў Мазыры, калі мы раскапалі паўзямлянку XII стагоддзя. Стоячы на каменных прыступках дома, я раптам зразумела, што мне хочацца пастукаць у няісныя дзверы, перш чым пераступіць цераз парог, справа ад якога былі бачныя сляды печы-каменкі, а злева, мяркуючы па кавалках шкляных бранзалетаў і слядах ад акаванага меддзю куфра, была «чыстая» палоўка.

З полацкім домам XVI стагоддзя было крыху інакш. Гадоў праз пяць пасля раскопак я чытала інвентар маёнтка Смаргонь пачатку XVII стагоддзя: «Дом у садзе. Перад домам ганак. Ля ўвахода ў сені дзверы на завесах з ручкаю і нутраным замком...». І раптам мне стала ўсё зразумела з тым полацкім домам, і з рознакаляровых шкельцаў склалася аб'ёмная мазаічная карціна. Перад вачыма паўстаў драўляны дом пад пляскатаю дахоўкай, размешчаны на адлегласці каля пяці метраў ад вуліцы Ніжнепакроўскай (цяпер Леніна). На прасторы паміж ім і вуліцай размяшчаўся кветнік і сад (мяркуючы па мацерыковых ямках). Акно (ці вокны) з трохкутнымі і прастакутнымі шыбкамі было зроблена ў паўднёвай сцяне і глядзела на Дзвіну. Уваход у дом быў з усходняга боку, уваходныя дверы зачыняліся трохкутным навясным замочкам.

Унутранае планаванне дома стварала адчуванне прадуманасці і ўтульнасці. Адразу за дзвярыма, справа, быў куток гаспадыні – кухня. Менавіта тут мы знайшлі найбольш кавалкаў кухоннага посуду, у тым ліку два амаль цэлыя моцна закураныя гаршкі. Відаць, як і звычайна, яны размяшчаліся на палічцы-«градцы», што вісела побач з печчу. За кухняй размяшчалася «святліца». Мяркуючы па адсутнасці слядоў капітальнай перагародкі, раздзяляліся яны лёгкай перагародкай з дошак. Памятаю яшчэ два свае адчуванні, звязаныя з гэтай часткаю дома: прысутнасць асобы гаспадара і «сям'і». Пра яго асобу гаварыў герб «Ляліва», што змяшчаўся на печы. Уявіце сабе: вы адчыняеце дзверы на «чыстую» палову – і якраз пасярэдзіне пакоя, насупраць вас, стаіць прыгожая,

кампактная (метр на метр) печ з травяніста-зялёнай кафлі з гербам у цэнтры. Падлога ў пакоі драўляная, але ля самай печы дбайны гаспадар выклаў яе цагляными пліткамі. З той самай мэтай супрацьпажарнай бяспекі печ размяшчалася на адлегласці паўметра ад сцяны (уяўляеце, які ўтульны запечак утварыўся?). Дзве абутковыя падкоўкі (мужчынская і жаночая), знойдзеныя непадалёк ад печы, яшчэ раз нагадалі, што тут жыла сям'я.

Трагедыя адбылася з жыхарамі дома двойчы (падчас войнаў) – і абодва разы здарыўся пажар. Але першы раз, мабыць, гаспадары засталіся жывымі, бо аднавілі дом на тым самым месцы, у тых самых абрысах. Мабыць, дапамаглі і грошы, выхапленыя з падпечка, што хавалі ў кубышцы. Менавіта «выхапленыя», бо непатрэбную пасудзінку папросту выкінулі. Другі раз нешта здарылася з самімі гаспадарамі, бо жыццё тут не аднаўлялася аж да XVIII стагоддзя.

Раскопкі на пляцоўцы перад домам № 35 па вуліцы Леніна пакінулі адчуванне няскончанасці справы. Тут размяшчаўся не проста дом, а сядзібны комплекс, у які ўваходзілі тры дамы. Другі стаяў метраў за восем на поўнач ад першага. Мяркуючы па заглыбленасці пабудовы, «простай» печы з гаршковай кафлі і малой колькасці рэчаў, у доме маглі жыць служкі.

У трэці дом, што размяшчаўся на адлегласці чатырох метраў на захад ад першага, крыху наўскасяк, мне так і не ўдалося «ўвайсці». Вонкавы бок яго драўлянай сцяны выявіўся якраз у заходняй сценцы раскопу. Але на даследаванне не было ўжо ні грошай, ні часу. Па жменьцы знаходак (кавалак кафлі з тым жа гербам «Ляліва», кавалкі шклянога посуду) можна меркаваць, што ў ім жыў прадстаўнік таго ж роду, што і ў першым, верагодней за ўсё, сын. Мяркуючы паводле матэрыялаў інвентароў, такі сядзібны комплекс абгароджваўся плотам з брамаю. Вось і выходзіць, што на колішняй Ніжнепакроўскай у канцы XVI – сярэдзіне XVII стагоддзяў у засені саду стаяла прыгожая драўляная сядзіба.

XVII СТАГОДДЗЕ

Хрэстаматыйна вядома, што беларускі горад у XVII стагоддзі з драўлянага ператвараецца ў мураваны. Вось і ў Полацку я пераканалася ў гэтым чарговы раз, капаючы пляцоўку ля дзіцячай мастацкай школы (вуліца Карла Маркса, 1). Мяркуючы паводле печы, цагляны дом (ці дом на цагляным падмурку) быў пабудаваны тут у дваццатыя гады XVII стагоддзя. Ацяпляўся ён самай «шляхетнай» печкай з усіх, што мне давялося даследаваць. Уявіце сабе, што большасць паверхні печы выкладзена кафлямі з «Пагоняй». На кафлі – выкананая высокім рэльефам выява вершніка са шчытом адмысловай формы. Добра відаць, што форма для адліўкі рабілася ў простай праекцыі, з гатовай кафлі, на якой вершнік рухаўся ў левы бок, на захад. У выніку выйшла, што конь з прыўзнятымі пярэднімі нагамі рухаецца ўправа (на Маскву), але і меч вершнік трымае не ў правай, а ў левай руцэ. Мабыць, такі кірунак руху тады быў больш актуальны.

Другі тып кафлі з гэтай печы – са сцэнай палявання. На кафлі адлюстраваны рыцар, што сядзіць на кані, пакрытым чапраком, і кіруецца ўправа. Побач са стрэмем бяжыць сабака. Парасткі і кветкі спераду і ззаду ад каня, як і старанна намаляваная лінія ўнізе, ствараюць уражанне луга, па якім рухаюцца вершнік і сабака. Рыштунак вершніка і конская вупраж вымаляваны вельмі дэталёва. У наяўнасці кафляў з такім сюжэтам няма нічога дзіўнага, бо, як вядома, рыцар аднолькава добра павінен быў рабіць тры справы: ваяваць, баляваць і паляваць. І ўсе яны зафіксаваныя на выявах.

Якую форму мела тая «шляхетная» печ, сказаць немагчыма, таму што на яе месцы збудавалі іншую, а старую кафлю выкарысталі для забутоўкі, у падмурак. Бо, як вядома, век печы – каля пяцідзесяці гадоў, а пасля – рамонт ці перабудова. Пляцоўка каля сучаснага дома па вуліцы Карла Маркса, 1 лічылася вельмі прэстыжнай: яна была шчыльна заселена ад XVII да XIX стагоддзяў. Кожная з камяніц мела некалькі пакояў, а адпаведна і некалькі печаў. Застаецца толькі здзіўляцца іх разнастайнасці. Дарэчы, менавіта тут, ля мастацкай школы, для мяне набылі матэрыяльную абалонку славесныя вобразы-апісанні печаў. З пісьмовых крыніц я ведала, што ёсць так званыя «печы універсальныя» (звычайна з доўгім прастакутным

ніжнім ярусам і квадратным верхнім) і «печы парадныя» (што мелі квадратны ў плане ніжні ярус, на які пастаўлены яшчэ адзін ярус аналагічнай формы, крыху меншы памерам). Ведала таксама, што будуюцца яны як у асобным пакоі, так і на мяжы двух памяшканняў. І вось у адным з памяшканняў мы раскапалі цагляны падмурак печы даўжынёй 185 сантыметраў і шырынёй адзін метр. З паўночнага (тарцовага, супрацьлеглага ад дарогі) боку ўпрытык да падмурка знайшлі кавалак падлогі з керамічных плітак памерам трыццаць на трыццаць і таўшчынёй пяць сантыметраў (ізноў – дбанне пра супрацьпажарную бяспеку). Таму мы мяркуем, што топка была менавіта ў тарцавым баку печы, і, магчыма, выходзіла ў іншае (непараднае) памяшканне. Гэта значыць, печ сваёй функцыяй адрозная ад папярэдняй, паколькі прызначалася для абагрэву некалькіх памяшканняў. Не выключана, што гэта і ёсць адна з «печаў з камінам», што вядомыя па інвентарах другой паловы XVII – XVIII стагоддзяў. У іншым памяшканні гэтага ж дома печ мела цыліндрычную форму і месцілася ў адным з кутоў.

Гэта быў вялікі дом, з капітальнымі перагародкамі і прыбудовамі, і размяшчаўся ён амаль на лініі сучаснага тратуара. А ззаду, за ім, у двары сучаснай мастацкай школы, у сярэдзіне XVII стагоддзя стаяў яшчэ адзін шляхецкі дом. Шляхецкі, таму што печ у ім была выкладзеная часткова з гербавай кафлі. Паводле вызначэння Дзяніса Дука, такі герб належаў роду Сяляваў. Памеры дома мы не змаглі вызначыць усё з тых жа фінансавых прычын, аднак пра гаспадароў пэўнае ўяўленне склалася. Трэба сказаць, што ў параўнанні з найбліжэйшымі суседзямі жылі яны больш сціпла. Відаць гэта хаця б з таго, што ў доме была адзіная універсальная печ (і кухонная, і парадная), а падлога ўздоўж яе была зроблена не з плітак, а проста з гліны, што ўласціва, хутчэй, простым месцічам, а не шляхце. Для нас, аднак, гэты дом адметны тым, што мы здолелі «зазірнуць» у склеп да гаспадароў. Ён знаходзіўся пад падлогаю. І нам не трэба была лесвіца, хаця яна знаходзілася тут жа, у хаце, і была даволі арыгінальнаю (гэта тоўстае бервяно з высечанымі ў ім прыступкамі). Разабраўшы падлогу, мы знайшлі ў склепе кадушку літраў на сорак. Што захоўвала там гаспадыня – гуркі ці капусту – не мела на той момант для нас істотнага значэння. Магчыма, дом

быў пабудаваны пасля вайны 1654–1667 гадоў, і таму гаспадары не асабліва раскашавалі. Аднак печы і ў доме пры дарозе, і ў гэтым часткова былі складзены з адной і той жа кафлі – з выяваю букета ў вазе (гэта значыць будаваліся адначасова). Розніца была, аднак, у суадносінах. У доме пры дарозе гэта кафля, што была «стандартнай», масавай, а не замоўнай, складала менш за траціну пячнога набору (астатняя печ складалася з замоўнай геральдычнай кафлі з двухгаловымі арламі) і прызначалася, хутчэй за ўсё, для часткі печы, што выходзіла ў кухню ці сенцы. У другім доме яна была асновай пячнога набору, а гербавая кафля толькі дапаўняла яго (з яе выкладзены не больш за адзін кафляны рад). Пра заможнасць гаспадароў дома ўздоўж дарогі сведчыць яшчэ і наяўнасць вялікай колькасці дэкаратыўнай керамікі – талерак і збаноў, размаляваных белай глінай – ангобам – пад празрыстую паліву зеленаватага колеру. Выкарыстоўваўся ён для ўпрыгожвання памяшканняў – талеркі развешваліся на сценах або разам са збанамі ці, радзей, куфлямі расстаўляліся на паліцах у тых жа парадных памяшканнях. Мяркуючы паводле колькасці распісных фрагментаў, гаспадары не пашкадавалі на гэта грошай.

Даследаваць выяўленыя дамы да канца (дайсці да мацерыка, як кажуць археолагі) перашкодзіла вайна. Тая самая, як ні дзіўна, 1941–1945 гадоў. Рэч у тым, што падчас яе, а таксама пры зносе цэлага шэрагу дамоў, якія некалі стаялі пасярод вуліцы Карла Маркса (якраз на месцы сквера) была канчаткова разбурана старая дрэнажная сістэма ў гэтай частцы горада. Сляды яе мы знайшлі недалёка ад мастацкай школы: вялікую дубовую кадушку без дна, укапаную ў зямлю, і дубовыя трубы, што далучаліся да яе з розных бакоў. Вось і выходзіць, што ў тым, што сутарэнні суседніх дамоў перыядычна заліваюцца вадою, вінаватая ізноў вайна.

XVIII СТАГОДДЗЕ

Пра яго апавядаюць тры непадобныя адзін да аднаго дамы. Знаходзіліся яны ўсё на той жа Ніжнепакроўскай вуліцы. Два першыя былі традыцыйна драўляныя і размяшчаліся на

пляцоўцы ля дома № 35, трэці (цагляны) – на другім баку дарогі, крыху на захад ад драўляных.

Драўляныя дамы былі збудаваныя праз некаторы час (прыблізна праз пяцьдзесят гадоў) пасля знішчэння дамоў XVI стагоддзя. Падобна на тое, што ўладар дома, збудаванага ўздоўж дарогі, застаўся верным ранейшай традыцыі – належаў да шляхецкага стану, пра што сведчыць наяўнасць гербавай кафлі ў печы. Праўда, на печы з зялёнай кафлі з лаўровымі вянкамі і белымі калонкамі па кутах была толькі адна гербавая кафля, але ўсё ж была! У развале печы знойдзена расійская манета – «денга» 1735 года.

Дзіўнае супадзенне (і ці супадзенне?), але менавіта такой манетай зроблены адбітак на печы дома, збудаванага ў глыбіні пляцоўкі. Гэта быў незвычайны ў нейкім сэнсе дом – вузкі і доўгі (прыкладна дзесяць на пяць метраў) і стаяў тарцом да дарогі. Але запомніўся ён мне не столькі захапленнем гаспадароў рэчамі (раскопкі дома далі рэкордную колькасць разнастайных знаходак – дзесяць тысяч), колькі амаль што фізічным адчуваннем прысутнасці ў доме дзяцей. Нідзе больш па Беларусі (не толькі ў Полацку) не знойдзена такой колькасці дзіцячых цацак і цацак-свісцёлак. Прычым, мяркуючы паводле таго, што знойдзены як гліняная лялька, так і свісцёлкі ў выглядзе вершнікаў, там жылі і дзяўчынка, і хлопчык. Свісцёлкі былі розных памераў (каб трымаць у пальцах ці ў далоні), а таксама розныя сюжэтна (конікі двух памераў і вершнік). Самае цікавае, што такія цацкі былі папулярныя ў полацкіх дзяцей у пачатку XVIII стагоддзя, бо кавалкі іх знаходзілі падчас раскопак у розных частках горада. Аднак самае каштоўнае – тое, што яны адлюстроўваюць мясцовую традыцыю вырабу керамікі – з размалёўкай белым ангобам. Падобна, што і гэтаму дому не пашанцавала з вайной – на гэты раз 1812 года. Месца, дзе ён стаяў, было часткова забрукавана камянямі (двор новага дома?), а над брукоўкай была знойдзена манета, выбітая ў 1811 годзе (гэта значыць, брукоўка зроблена не раней за гэтую дату).

Між тым, нідзе ў іншым месцы я не адчула так востра страшныя наступствы ВАЙНЫ для горада і чалавека, як на

гэтай пляцоўцы ля дома № 35 па вуліцы Леніна. Але, з іншага боку, нідзе так не выявілася і сіла жыцця, таму што праз чатыры вайны (1632–1634, 1654–1667 гадоў, Паўночнай і вайны 1812 года) жыццё на гэтым месцы ізноў аднаўлялася.

Трэці дом па гэтай вуліцы – цагляны будынак канца XVIII стагоддзя – гэта так званы «Эканамічны дом», што ўваходіў у комплекс Богаяўленскага манастыра. Ён размяшчаўся з усходняга боку ад храма і над ім цяпер – зялёны газон. А шкада: дом быў вельмі арыгінальны паводле свайго канструкцыйнага вырашэння дзеля размяшчэння на даволі крутым схіле: яго вулічны фасад меў два паверхі, а дваровы – тры. Нават паўднёва-заходняя паўсутарэнная частка дома з самага пачатку мела жылую функцыю. Пра гэта сведчыць падмурак печы памерам 91 на 109 сантыметраў, зроблены з цэглы таго ж памеру, што і падмуркі дома. Складалася печ з гладкай кафлі з белай і зялёнай эмаллю. «Эканамічны дом» паспяхова перакачаваў у наступнае, XIX стагоддзе.

XIX СТАГОДДЗЕ

Менавіта ў гэты час (у канцы сямідзесятых гадоў XIX стагоддзя) і была прыстасаваная пад жыллё паўднёва-ўсходняя частка «Эканамічнага дома». Тут была збудаваная новая печ з белай гладкай кафлі і зроблены знутры прыступкі ў паўсутарэннае памяшканне. Умовы, зразумела, не асабліва камфортныя. Таму здаваліся кватэры людзям не вельмі заможным. З адным з іх мы «завочна» пазнаёміліся ажно праз стагоддзе – тут жыў рамізнік. У кватэры быў знойдзены медны паддужны звон з датаю 1887 і «рэкламным» надпісам на ім пра тое, што з ім будзе весялей паганяць конікаў. Знайшлі і частку няхітрага скарбу – манетку пяць капеек выпуску 1870 года.

Такім чынам, у XIX стагоддзі ўваходаў у дом было некалькі: цэнтральны пасярэдзіне галоўнага фасада з вуліцы і з боку двара, і бакавы з усходняга боку. Прычым, мяркуючы паводле рэштак дваровага фасада, дом быў вытрыманы ў найлепшых традыцыях класіцызму: увесь фасад раўнамерна праразалі высокія прастакутныя вокны (архітэктар спрабаваў

кампенсаваць сырасць паўсутарэннага памяшкання добрым асвятленнем). Вузкі калідор, размешчаны па цэнтры дома, падзяляў яго на дзве роўныя часткі.

«Эканамічны дом» быў не адзіным цагляным домам на гэтай вуліцы. На ўсё той жа пляцоўцы ля дома № 35 адначасова з ім (пра што сведчаць аднолькавага памеру цагліны з муроўкі) быў цалкам збудаваны з цэглы ці з цагляным цокальным паверхам яшчэ адзін дом даўжынёю адзінаццаць метраў уздоўж дарогі. Муроўка захавалася на вышыню 180–190 сантыметраў. Будынак быў атынкаваны.

А калі рухацца ў кірунку да Сафійскага сабора, то праз квартал ад яго на мяжы XIX і XX стагоддзяў быў збудаваны вялікі цагляны дом, размешчаны на перакрыжаванні дзвюх вуліц. Гэта побач з існуючым цяпер домам па вуліцы Леніна, 25. У адпаведнасці з новай горадабудаўнічай традыцыяй абодва фасады дома размяшчаліся «пад шнурочак», па так званай «чырвонай лініі» вуліцы. Але запомніўся ён нават не сваімі шматлікімі вокнамі, а шыкоўнымі мадэрновымі печамі з антычнымі вазамі, лірамі і амурамі, што вянчалі кожную з трох печак.

Гэты будынак актыўна выкарыстоўваўся ў XX стагоддзі, яшчэ да вайны. Сляды гэтага ў выглядзе злепленых у клубок гаплікаў для палітонаў і пістонаў для чаравікаў мы знайшлі на колішнім складзе.

«Эканамічны дом» таксама захоўвае сляды падзей XX стагоддзя. Аказваецца, у часе вайны тут жыў нехта з герояў-падпольшчыкаў. Мы зразумелі гэта, калі падчас расчысткі падмурка ў закутку калідора з-пад яго пасыпаліся схаваныя там набоі. Што сталася з іх гаспадаром і чаму ён іх не выкарыстаў – невядома.

А яшчэ некаторы час (магчыма, адразу пасля вайны і да разбурэння) гэты дом выкарыстоўваўся пад школу. У заходняй частцы дома з боку двара знаходзіўся клас. Старая печка XVIII стагоддзя ўжо не функцыянавала ці была разбурана, таму ў куточку, на выхадзе ў калідор, склалі грубку і абшылі яе металёвымі лістамі. Наверх на печку часам ставілі драўляную

скрыначку з чарніліцамі-невылівашкамі. Адна з такіх скрыначак завалілася за печку і дасталася археолагам ужо праз пяцьдзесят гадоў. Было відаць, што збіралі чарніліцы з розных месцаў, бо там былі і шкляныя, і нават парцалянавыя вырабы.

А яшчэ мы знайшлі сляды заняткаў дзяцей «зімовымі відамі спорту» – цэлая нізка іржавых канькоў ляжала ў куце аднаго з памяшканняў. Такія канькі добра памятае пакаленне «дзяцей вайны» – «снягуркі», што мелі дзве пляцовачкі каля носа і пад пяткаю і прывязваліся вяроўкамі да абутку – валёнак, боцікаў, чаравікаў – у каго што было.

А потым дом разбурылі. І на яго месцы пасадзілі дрэвы, якія выраслалі хутчэй за ўсіх – таполі. І карані дрэваў дабурылі тое, што пакінулі людзі. У канцы 1980-х пачалі рабіць праектную дакументацыю дзеля аднаўлення дома пад будынак для музея. І раскопкі праводзілі з гэтай жа мэтай. Але аднойчы прыйшоў тагачасны полацкі епіскап і сказаў дырэктару музея: «Будуйце, а потым мы адбярэм». Лепш бы ён крыху памаўчаў, і тады на цяперашняй пустцы стаяў бы прыгожы дом. А як бы яго выкарыстоўвалі – гэта была б справа дзесятая.

* * *

Прыгадваючы свае адчуванні падчас раскопак полацкіх дамоў – акрамя захаплення адкрыццямі – памятаю, бадай што, два. Першае – гэта пачуццё нейкай няёмкасці перад гаспадарамі – як бы ўварваўся ў чужы дом без дазволу і раскрыў усе іх сакрэты (вось гэтыя збіралі грошы ў кубышку і хавалі іх пад печчу, а гэтыя любілі папесціць дзяцей цацкамі), густы (наколькі гаспадыня любіла ўпрыгожваць свой дом ці наколькі гаспадар ганарыўся сваім родам). Другое пачуццё – шкадаванне. Шкадаванне, што ніколі і ніхто, акрамя цябе, не ўбачыць твой дом, твой віртуальны дом. Але раптам я прыгадваю словы, якія часта паўтарала мая мама: «Ніколі не кажы «ніколі», не заракайся». І на душы робіцца трохі лягчэй. І мне хочацца сказаць проста – да пабачэння, полацкія сядзібы.
[image]
[image]

№ 6 (46) - 2006
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне [**mk**]. Абнаўленьне [**czyk**].
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/07/26
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 6 (46) - 2006**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам Форум

[image]

[image]

[image]2006

аналітыка • крытыка • гісторыя • **эсэістыка** • літаратура • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

Віктар Леаненя Сялянскі кантынэнт (нататкі былога вяскоўца)

ВІКТАР ЛЕАНЕНЯ нарадзіўся ў 1940 г. на Случчыне. Паэт, эсэіст. Жыве ў Полацку. У «ARCHE» друкаваліся яго нататкі «Герадотава мора».

«КАПЕЛЮШЫ ПРЫЙДУЦЬ»

Пасьля 1945 году, калі большасьць франтавікоў-заходнебеларусаў павярталася дамоў, савецкае начальства ўсё настойлівей пачало напіраць, каб народ запісваўся ў калгасы. Вёска аднеквалася, адмоўчвалася…

Хто ў Нямеччыне скончыў вайну, хто – у Чэхіі, Аўстрыіі, Мадзяршчыне. Ніякага агулу там і повіду не было, а сяляне жылі заможна, іх аднаасобніцтва давала добры плён. Зайздросьцілі іхнай культуры, уменьню гаспадарыць. Марылі і ў сябе дома зажыць гэтак жа: замяніць саламяныя стрэхі на бляшаныя ці з дахоўкі, падлогі памаляваць, прыбіральні цёплыя наладзіць, двары вымасьціць хоць брукам…

А ўлада даводзіла: адзін табе, селянін, шлях – у калгас, як жартавалі вяскоўцы, – пад адну коўдру.

На пасядзёнках мужыкі перагаворвалі, быццам сам маршал

Жукаў абяцаў франтавікам-сялянам не заганяць іх у калгасы – падчас вайны яны на акупаванай тэрыторыі ўсюды развалiліся. Дзядзькі бажыліся, што чулі тое сваімі вушамі.

Некаторыя франтавікі сутыкнуліся на Эльбе з амэрыканскімі вайскоўцамі, пабачылі іх тэхніку, франтавы побыт, зброю. Дзівіліся, што іхныя кішэні напоўнены галетамі, што кураць яны – нават шарагоўцы – толькі цыгарэты, а не махорку ўроссып. Запалі ў вочы амэрыканскія капелюшы.

Франтавікі-вяскоўцы прыперлі пару трафэйных радыёпрыймачоў, дык да іх у хаты зьбіраліся вечарамі суседзі. Мужчыны смалілі самасад, з трывогай слухалі па радыё «Голас Амэрыкі». Адтуль абвяшчалі, што камунізм ня пройдзе і новы паход супраць яго не за гарамі.

Франтавікі казалі:

– Пачакайце «саветы», вось прыйдуць «капелюшы», навядуць парадак! Будуць вам калгасы!

Верылі і ня верылі. Хутчэй – не. Ведалі: калі сам у сваёй хаце лад не ўсталюеш, дык сусед не дапаможа. «На Бога спадзявайся, а справу – рабі!»

ПАТЭФОН

Дзе і якую музыку чуў беларус гадоў гэтак пяцьдзясят таму? На вясельлі, на фэсьце гралі гармонікі, гучалі дуды, скрыпкі пілікалі ды бубны-барабаны грукалі.

Радыё пасьля вайны доўга не было, а тут – прывезьлі пасьля Другой сусьветнай франтавікі трафэйныя патэфоны! А ў гарадох на сала выменялі кружэлкі савецкія.

Бывала паставяць патэфон ля расчыненага акна, накруцяць спружыну, іголку навостраць, паставяць кружэлку «з Русланавай» – і нясецца па сяле: «Валенки, валенки…» Альбо хрыплаватага Ўцёсава: «От Москвы до Бреста…» А рамансы пра каханьне? Хто і дзе іх чуў? Вось цяпер з патэфона і даведаліся.

Адна справа пад гармонік польку скакаць, а іншая – пад патэфон вальс танчыць. Гэта як цяпер з «Запарожца» на «Фольксваген» перасесьці.

Песьні ўсе да адной сьпяваў патэфон на расейскай мове. Тут мы адчулі сваю непаўнавартаснасьць: няздатныя мы ані патэфон вырабіць, ані песьні беларускія запісаць на кружэлкі…

Толькі калі ў вясковыя хаты правялі правадное радыё, дык праз дынамікі загучалі і нашыя песьні на роднай мове. Уздыхнулі: бач, і мы нешта ўмеем.

«ПОЙДЗЕМ НА ПОЎДЗЕНЬ!»

З 1944 па 1954 гады Полацак быў абласным цэнтрам. Ну і, канечне, меў абкам кампартыі, які месьціўся ў цяперашнім так званым Доме афіцэраў. Па сталінскай завядзёнцы першым сакратаром абкаму партыі, як і ўва ўсіх саюзных рэспубліках, пераважна прызначалі расейца, гэтак жа сталася і ў Полацку.

Тым ня менш, па той самай завядзёнцы ўсе партыйныя даклады на пленумах рабіліся на беларускай мове.

Сакратару абкаму, расейцу, надрукавалі даклад на беларускай мове. Сяк-так ён яго прачытаў. Абвяшчае перапынак на полудзень, пры гэтым хоча пахваліцца веданьнем беларускай мовы:

– А цяпер, таварышы, пойдзем на поўдзень!

Сход стрымана сьмяецца: начальства памылілася.

А ў 1959 годзе адзначалася афіцыйнае саракагодзьдзе з дня ўтварэньня БССР. Адзначалі яго і ў Пінскім гідратэхнікуме. У актавай залі даклад для нас, студэнтаў, рабіў завуч Я. С. Ліўшыц. Зразумела, што даклад трэба рабіць на беларускай мове. Я. С. Ліўшыц крыху ведаў яе, але недасканала, і даклад, падрыхтаваны ім на расейскай мове, пераклаў выкладчык.

Сядзім у залі.

Ліўшыц Я. С. хуткім крокам выходзіць да трыбуны, пачынае чытаць даклад. І тут ён прамаўляе: «у тысяча дзевяцьсот дзевятнаццатым год-дзе». Вушы нашыя натапырыліся самі сабой, – робіцца цікавей.

Чакаем, што будзе далей. Паколькі даклад юбілейны, дык даты паўтараюцца часьцяком і слова «год-дзе» зноў гучыць неаднаразова. Мы ўжо сьмяемся адкрыта. Ліўшыц Я. С. устрывожана паглядае ў залю: чаго сьмешна гэтым сялянскім хлапцам, што зьехаліся вучыцца зь вясковай глухамані? Няўцям яму, што гаворыць ён па-беларуску зь вялікім акцэнтам, таму нам і сьмешна.

У 1959 годзе ў беларускіх вёсках жыло яшчэ каля сямідзесяці адсоткаў насельніцтва, якое на дзевяноста пяць адсоткаў гаварыла на беларускай мове. Па тым часе беларускія школы яшчэ дзейнічалі на ўсю, а выкладаньне расейскай мовы пачыналася ў школе толькі зь пятай клясы, як і замежнай.

ДЫСПУТ

У мястэчку Кабыльнік (цяпер Нарач) – два касьцёлы і праваслаўная царква.

Аднойчы, а было гэта ў 1961 годзе, бачу афішу: перад кінасэансам адбудзецца лекцыя на антырэлігійную тэму. Усялякай лухты наконт рэлігіі наслухаўся яшчэ са школы. Ды ўсё ж – вырашыў зайсьці, а потым і не пашкадаваў – зрабіўся сьведкам надзвычай цікавага дыспуту.

Заля клюбу – напаўпустая, наперадзе сядяць чатыры ксяндзы і бацюшка. Зьдзівіўся: а чаго яны тут? Лекцыя ж антырэлігійная?

Чытаў яе лектар ажно з Цэнтральнага Камітэту кампартыі БССР. Чытаў без паперак, адчувалася яго высокая адукаванасьць.

Найперш лектар апавёў пра сябе. Родам ён з Заходняй Беларусі. Напярэдадні вайны ў 1938 годзе паехаў у Ватыкан вучыцца на ксяндза. Адзявалі, кармілі, далі інтэрнат. Кожны

навучэнец мог скласьці для сябе мэню ў сталоўцы на тыдзень. Цяжка давалася лацінская мова.

Скончылася вайна, якраз завяршылася і вучоба, але працягвалі вучыцца яшчэ год. Прычына? Многім ксяндзам прыйдзецца працаваць у савецкай зоне акупацыі. Прадбачылі служкі Ватыкану, што саветы ўладкаваліся надоўга і тут пачнуць усталёўваць камуністычны лад. А ксяндзы павінны ведаць сваю паству. Таму яшчэ год чыталі лекцыі, але ўжо не рэлігійнага кшталту, а марксісцка-ленінска-сталінскага ў пэўнай інтэрпрэтацыі.

Вось тыя лекцыі пасеялі першыя сумненьні ў маладога ксяндза-беларуса. Ён убачыў, што камуністычныя пастуляты ў нечым супадаюць з… вучэньнем Хрыста, апосталаў: роўнасьць людзей, абарона бедных, асуджэньне празьмернага багацьця, сквапнасьці.

Ня ведаў малады ксёндз, што тэорыя – адно, а практыка – зусім іншае.

Накіравалі яго на працу ў касьцёл ува Ўсходняй Нямеччыне, у савецкую зону. У складзе камісіі ўдзельнічаў у дасьледаваньні былых фашыстоўскіх канцлягераў. Тое, чаго нагледзеўся ў гітлераўскіх катавальнях, зусім зьбіла яго з тропу. Ён раней і ўявіць сабе ня мог, да якой жорсткасьці і бязьлітаснасьці можа дайсьці чалавек.

Малады ксёндз ня вытрымаў і склаў зь сябе сьвятарскі сан, дабіўся дазволу ў савецкіх уладаў ды вярнуўся на радзіму.

Камуністычныя ідэолягі не маглі так проста выпусьціць з учэпістых рук такую ідэалягічную здабычу. Ды зрабілі былога ксяндза… агітатарам супраць рэлігіі.

У пацьвярджэньне, што ён сапраўды вучыўся ў Ватыкане, лектар дэманстраваў свой дыплём, заліковую кніжку, у якой стаялі адныя адзнакі «выдатна».

Ксяндзы і бацюшка, якія ў паўсядзёнцы былі ідэалягічнымі супраціўнікамі, на гэты раз аб’ядналіся і кінуліся атакаваць

ксяндза-расстрыгу, кампартыйнага паслугача. Выступалі рэзка. Лектар не заставаўся ў даўгу, сыпаў цытатамі з Эвангельля, Бібліі. Дыспут кіпеў з гадзіну. Вынік – нічыя. Ніхто не саступіў, не адрокся.

У супрацьлеглым канцы залі ў прыцемках сядзелі нешматлікія вернікі, пляваліся на лектара:

– Цьфу! Новы д'ябал у чалавечым абліччы!

Слалі праклёны лектару. Праўда, нягучна.

ЖАБРАК

Помнік Сталіну ў Клецку ўзьвялі праз колькі гадоў пасьля вайны. Людзі яшчэ зь зямлянак ня ўсе выйшлі, саромнае месца ня мелі чым добра прыкрыць, хлеб на стале, як госьць, сіроты галодныя. А тут – мармур, бронза, фігура правадыра мэтры ў тры вышынёй.

Стаяў савецкі ўладар сярод плошчы, а побач – братэрская магіла воінаў-вызваліцеляў. Ён і тут не даваў спакою мёртвым, стаяў з узьнятай наперад рукою, быццам зноў пасылаў іх на бой зь нябачным ворагам.

Ды вось жа, дапякло некаму. Прачынаецца ўзімку Клецак, а ў Сталіна цераз плячо вісіць мурзатая торба, як у жабрака! Вось быў шок!

Ішлі людзі ўраньні на працу, азіраліся: хто са страхам, хто – з ухмылкай, хто ледзьве сьмех стрымліваў, глянь ты – мала, відаць, падалі «жабраку», руку выцягнуў, яшчэ просіць.

Улада спаць любіць, а ёй ніхто і не даклаў зранку аб праяве на плошчы. І зьняць пабаяліся: а раптам у торбе міна? Тырчыць жа нешта. Дык торба вісела на сталінскім плячы ажно да паўдня – пакуль мінэры прыехалі, пакуль корпаліся, правяралі. Адно міліцыянты людзей ад плошчы праганялі, праўда, без імпэту.

У торбе аказалася мерзлая бульба.

Вось жа перапуду было ўладнікам ды спэцслужбам! На ўсю БССР зьняславіліся!

Наляцелі службісты зь Менску. Перакапалі Клецак ды ўсё навакольле, а таго сьмельчака-«дывэрсанта» так і не знайшлі.

ПРАВАДЫР У ЗАПАСЕ

Дзевяць гадоў прайшло, як памёр Сталін. Новы лідэр СССР Хрушчоў літаральна сьцёр у парашок заслугі былога правадыра, разьвянчаў яго культ асобы, граміў тыранічнае кіраваньне, апавёў пра ГУЛАГ.

А тут – заходжу я ў вайсковую бібліятэку і бачу ў куце мяшкі, сургучом запячатаныя.

Пытаюся ў радавога байца-бібліятэкара:

– Што за сакрэт хаваем?

– Якія сакрэты? – усьміхаецца. – Кнігі Сталіна склалі ў мяхі ды запячаталі. Паліць – забаронена, чытаць – таксама.

Вось табе на: правадыр, аказваецца, яшчэ ў запасе, як бальшавіцкі браняпоезд.

СКАРЫНА І КАСЫГІН

Калі хто ня ведае, Касыгін – гэта быў такі савецкі старшыня Савету міністраў. Ну а хто такі Скарына, тлумачыць, спадзяюся, ня трэба.

Касыгін часьцяком наведваў Беларусь (тады – БССР). У нас яго цікавілі ня фэрмы, а прадпрыемствы, якія прыносяць валюту. На Віцебшчыне найперш прывабліваў наваполацкі нафтаперапрацоўчы камбінат.

Валюта і тады валютай лічылася, хоць наш працоўны люд яе ня бачыў у вочы. На валюту закуплялася для савецкага народу

шмат чаго, у тым ліку і ежа: найперш пшаніца ў Канадзе і ЗША.

Вось і езьдзіў Касыгін з праверкамі, як на Беларусі валюту здабываюць.

Прыляцеў аднойчы савецкі прэм'ер у Наваполацак, паглядзеў «Нафтан», іншыя тутэйшыя хімічныя гіганты. Задаволены беларусамі. Нашыя ўладнікі вырашылі наладзіць шаноўнаму госьцю культурную праграму – павезьлі паказаць Сафійскі сабор. Зьдзівіўся Касыгін:

– Что вы мне костел показываете?!

Аказваецца, расейскі чалавек-атэіст, усё адно праваслаўны. Вось і заўважыў Касыгін, што «макавак» на саборы няма.

Тады павезьлі госьця падзівіцца на новы помнік Францішку Скарыну. І зноў канфуз. Касыгін хмура глянуў на помнік з задумлівым першадрукаром і спытаў:

– А зачем этого монаха в центре города поставили?

Доўгая адзежа друкара выклікала непажаданыя асацыяцыі.

За савецкім часам помнікаў славутым палачанам у Полацку больш не зьявілася.

РАЧУЛКА МАЧЫХА

Экалягічныя праблемы, зьвязаныя з разьвіцьцём у Беларусі прамысловасьці ды ўрбанізацыяй, узьніклі ня сёньня.

У 1905 годзе пан Юзаф Вайніловіч у сваім маёнтку Кунцаўшчына на Клеччыне збудаваў сьпіртзавод з паравым катлом. Пад той час узрос попыт на сьпірт, і хваткія беларускія памешчыкі кінуліся перарабляць бульбу ў хадавы тавар.

Гэта – першае прамысловае прадпрыемства ў маіх родных мясьцінах, якое скідвала неачышчаныя аб'ёмныя сьцёкі ў рачулку Мачыху – прыток Морачы. Для іх адводу да рэчкі пракапалі канал.

Сяляне прыкмецілі нядобрыя перамены ў русьле рачулкі: у завадзях зь ціхаю плыньню адкладваліся бульбяныя адкіды, яны гнілі, сьмярдзелі. Гінула рыба.

Сельскі сход накіраваў да Вайніловіча дэлегацыю, але станоўчых вынікаў яна не дабілася. Падалі скаргу павятовым уладам. Прыехаў спраўнік разьбірацца на месцы. Канечне ж, ён спыніўся ў панскім маёнтку. Пан Вайніловіч за вячэрай добра ўпаіў чыноўніка, а раніцой той ахвотна апахмяліўся. Тут гаспадар і прапанаваў:

– Чаго табе, пане, лазіць па балотнай твані, мурзацца ў гразі? Давай я пашлю свайго слугу, ён і набярэ з рэчкі вады для аналізу.

Чыноўнік пагадзіўся.

Панскі служка не пайшоў, канечне, да рачулкі Мачыхі, а набраў у бутэлькі пробы вады… зь вясковых калодзежаў. З тымі «пробамі» чыноўнік зьехаў.

Празь месяц сяляне атрымалі адмоўны адказ на сваю скаргу: маўляў, вада ў рэчцы чыстая, амаль пітная, бруду са сьпіртзаводу ня знойдзена. Толькі пахне вада кароўскімі экскрэмэнтамі, то значыць, кароваў трэба пасьвіць далей ад берагоў Мачыхі.

Пашкраблі сяляне патыліцы ад такога мудрагелістага адказу, ледзь разабраліся, што «экскрэмэнты» – гэта тыя ж кароўскія ляпёхі. Плюнулі: пугай абуха не перасячэш.

На тым экалягічны рух у нашых ваколіцах і заглух. А рачулка паволі зацягнулася ілам, затхнулася вада. Паводкі затаплялі паплавы, дарогу ў лес.

У 1939 годзе прыйшло Чырвонае войска. Пана арыштавалі, заводзік перастаў працаваць. Нехта адкруціў шрубу, нешта адламілася, упала, разьбілася, сапсавалася. А ўночы нехта адкрыў вэнтылі на агромністых цыстэрнах са сьпіртам, і ён хлынуў на зямлю, сьцякаючы ў нізкія месцы.

Сяляне навакольных вёсак назапасіліся ім надоўга. Больш таго, яны пракапалі ў нізінах канавы, сьпірт высочваўся зь зямлі на дно ямінаў, яго зьбіралі ў вёдры, цадзілі, ды пілі.

Адыходы сьпіртзаводу паволі перагнілі ў рачулцы, нешта зьнесьлі паводкі. Рэчка Мачыха ачомалася, з Морачы зайшла рыба. Але рэчышча так і засталося крывым, паўзаплылым. Ды ўсё ж сялянкі бялілі тут палотны, палошчучы іх у рэчцы ды высьцілаючы па берагох.

А ў 1975 годзе мэліяратары на месцы Мачыхі пракапалі канал пад нумарам «М-2», дык жыхары ўжо і назву рачулкі забылі. Яна зьнікла з мапы Беларусі.

У вясковых калодзежах «села» вада, вёдры шкрабалі па дне. Але сяляне самі паглыбілі іх, пачысьцілі ад жвіру ды зноў пілі чыстую ваду.

А хутка пачаў сохнуць недалёкі хваёвы лес, бо панізіліся на мэтар грунтовыя воды, аслабелыя дрэвы лёгка рабіліся ахвярамі шкодных насякомых. Савецкія сяляне ўжо нікуды ня скардзіліся. Хворы лес яны ахвотна сьпілавалі на дровы, іх хапіла гадоў на дзесяць. Балазе ўлада аддала іх задарма.

Полацак
[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/07/30
[image]

аналітыка • крытыка • гісторыя • **эсэістыка** • літаратура • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

Міхась Баўтовіч Горад сэрца

МІХАСЬ БАЎТОВІЧ полацкі краязнаўца. Узначальвае полацкае грэка-каталіцкае выдавецтва «Сафія». Зрэдагаваў выдадзены ў 1999 зборнік «Архіў уніяцкіх мітрапалітаў».

ПЕРАДГІСТОРЫЯ

Пра Горад пачуў я ў самым маленстве. Я нават ня ведаю, якое слова засвоіў раней – Рыга або Менск. У тыя часы з чатырох найбліжэйшых сталіцаў (Вільні, Масквы, Менску і Рыгі) складаней за ўсё было дабрацца да беларускае. Дзьвіна – гэты водны гасьцінец адвеку лучыў крыўскую сталіцу з Рыгай. У Полацку існавала грамада выхадцаў з гістарычнай Лівоніі, што гуртавалася вакол лютаранскай царквы: Зільбэрдорфы, Штэрнгросы, Мічэрліхі, Ёрданы, Вітэ, Баладзітсы, Кілблаксы. Сувязі разарваліся пасьля абвяшчэньня ў 1918 годзе Латвійскай Рэспублікі. На заходняй мяжы СССР апусьцілася жалезная заслона. Беларуска-латвійскія стасункі ваенных часоў мелі ўжо іншы характар. НКВД плянавала праз свае дывэрсійныя групы арганізаваць у Латгаліі антынямецкі супраціў, як у Беларусі. Плян праваліўся, бо латвійская самаахова эфэктыўна зьнішчала закінутыя з Масквы групы. Тады вырашылі замацавацца ў Беларусі і адсюль рабіць рэйды ўглыб Латгаліі. У ваколіцах Асьвеі базаваўся сфармаваны з латышоў дывэрсійны аддзел. Ягоным камандзірам быў Вільгельм Лайвіньш, камісарам – Отамар Откалн. У часе карнае апэрацыі нямецкіх і латыскіх частак дзеля стварэньня буфэрнай зоны ўздоўж латвійскай

мяжы былі зьнішчаныя блізу 60 беларускіх вёсак. Жыхароў або забілі, або выслалі ў канцэнтрацыйны лягер Саласьпілс.

Жыцьцё дзедавай сям'і было цесна зьнітаванае зь Дзьвіной. Большасьць свайго вольнага часу дзед аддаваў ёй, каб зь ейных дароў карміць дзяцей. У хаце часта апавядалі пра сваякоў, што яшчэ да крутога павароту 1917 году зьехалі ў Рыгу. І хаця ў міжваенным часе сувязяў не было, але пасьля вайны яны неяк аднавіліся, і сёй-той зь дзедавай радні нават наведаў крэўных у латвійскай сталіцы.

Ня памятаю, чаму я пастанавіў ехаць вучыцца ў Рыгу. Можа, сваю ролю адыграла тое, што ў дзясятую клясу перавялі мяне з выпрабаваўчым тэрмінам. Прычынай таму быў «зрыў палітычна важнага мерапрыемства», а канкрэтна тое, што кляса не ўзяла ўдзелу ў чарговым конкурсе патрыятычна-маршавай песьні. Ініцыятыва была мая, і інфарматары паведамілі школьнаму кіраўніцтву пра гэты «брыдкі» ўчынак. У якасьці пакараньня мне таксама далі ў школьным спэктаклі паводле паэмы Пушкіна «Барыс Гадуноў» самую непачэсную, з пункту гледжаньня школьных ідэолягаў, ролю – Ілжэдзьмітрыя. Да сёньня памятаю словы, якія прамовіў у Самборы да Марыны Мнішак прэтэндэнт на маскоўскі пасад у часе іх начнога рандэву ля фантану:

Теперь иду – погибель иль венец
Мою главу в России ожидает,
Найду ли смерть, как воин в битве честной,
Иль как злодей на плахе площадной...

На загубу ў Маскву ехаць не хацелася, да таго ж ад Полацку да Рыгі цягніком было ехаць амаль столькі ж часу, як і да Менску.

СУСТРЭЧА (1975 ГОД)

Вось нарэшце і Горад, эўрапейскі горад часоў позьняй Савецкай імпэрыі. З вуліцамі Савецкай (Padomju), Леніна, Сьвярдлова, Горкага, з Камсамольскай узьбярэжнай, Кастрычніцкім мостам,

з паркамі Камунараў і Кірава. У Старой Рызе (Vecrīga) ставяць навабуды, якія старажытнае асяродзьдзе выпхае зь сябе як нейкую інфэкцыю. Як для савецкіх людзей, дык горад занадта чысты. Але ад старых можна пачуць, што да камуністаў ён быў значна чысьцейшым.

Галоўны корпус політэхнічнага інстытуту (цяпер тэхнічны ўнівэрсытэт) месьціцца ў самым сэрцы Гораду на плошчы Чырвоных Латыскіх стралкоў (Sarkanas strelnieku laukums). Гэтыя самыя стралкі і сёньня яшчэ пільна ўглядаюцца ўва ўнівэрсытэцкія вокны.

Напачатку Горад не захапіў, хоць адразу зачаравала постаць мітычнае Мілды-Свабоды. Узбураў розум незразумелы подпіс «Tevzeme un brīvība» (Айчына і свабода): ці можа быць айчынай краіна, дзе свабода забітая? Помнік збудаваны ў 1935 годзе і ўвасабляе вольную Латвію, што трымае ў руках тры злучаныя зоркі, сымбалі трох этнаграфічна-гістарычных частак краіны: Відзэмэ, Курзэмэ і Латгалію. Ад сваіх латыскіх сяброў я неяк пачуў сумны жарт, што помнік Свабоды на самай справе – прадстаўнік турыстычнае фірмы, бо ўскладаньне да яго п'едэсталу кветак гарантуе бясплатнае падарожжа ў Сібір.

Неяк позна ўвечары ехаў тралейбусам з Ілгуцыемсу, што ў Пардаўгаве (па-нашаму Задзьвіньне) да цэнтру. Людзей у салёне амаль не было. Недзе ў раёне Агенскалну заскочылі два сталыя латышы трохі нападпітку. Не заўважыўшы нумару тралейбуса, у які яны патрапілі, адзін запытаўся ў мяне: «А куды ідзе гэты тралейбус?». Я не задумваючыся адказаў: «Да Свабоды». Толькі потым зразумеў двухсэнсоўнасьць свайго адказу. Адзін з маіх спадарожнікаў запытаўся: «А ці ведаеш ты, што такое Свабода?» – і, не дачакаўшыся адказу, разарваў сваю кашулю. На грудзях ля сэрца была вытатуяваная выява помніка. Я разгубіўся. Для мяне звычайным было бачыць у асобаў гэткага пралетарскага тыпу, на якіх выглядалі мае спадарожнікі, на згаданым месцы выяву Сталіна, а тут раптам Свабода. Вось так. Свабода на сэрцы, Свабода ў сэрцы.

Як я ўжо згадваў, Горад захапіў мяне не адразу. Жаданьне ўзьняцца на аглядальную пляцоўку сабору Сьвятога Пятра, збудаванага яшчэ ў 1209 годзе за часоў знакамітага

закладальніка Гораду біскупа Альбэрта фон Апэльдэрна, не паўставала ніколі. Што там рабіць? Глядзець і адчуваць сваю вышэйшасьць за старыя камяніцы? Марна. Але флюіды гарадзкіх вулак пранікалі ў мяне. Большасьць факультэтаў былі разьмешчаныя ў цэнтры. Таму штодня некалькі разоў выпадала праходзіць старажытнымі вулкамі Гораду. Ішоў я па Замкавай (Pils), сьпяшаўся па Пясчанай (Smilšu) або шпацыраваў па Валовай (Vaļņu) – пазьбегнуць гэтае інфільтрацыі было немагчыма. Іх я і сёньня ведаю лепей за некаторых маіх сяброў-рыжанаў, што жывуць у новых раёнах кшталту Юглы, Пурвцыемсу або Кенгарагсу, і ў Вэцрыгу трапляюць гады ў рады. Я і з заплюшчанымі вачыма здолею прайсьці ад будынку былога майго факультэту, што на вуліцы Аўсэкля, па трамвайнай лініі ўздоўж бульвара Кронвальда. Збочыўшы на Крапасную (Citadeles), праміну Петрапаўлаўскі сабор, дзе сёньня канцэртная заля «Ave sol», збочу на Вежавую вуліцу (Torņa), выйду на Якубаву (Jekaba) і, пакінуўшы ўбаку каталіцкую катэдру Сьвятога Якуба, насупраць якой будынак Сойму, дасягну Домскага сабору.

За савецкім часам пляц перад саборам меў афіцыйную назву «17-га чэрвеня». Якая абраза! 17-га чэрвеня 1940 году ў Горад на танках уехалі «вызваліцелі» з Усходу, якія паводле завядзёнкі выконвалі свой «інтэрнацыянальны абавязак». Назва не прыжылася, я б сказаў, што і не жыла, і ўсе, без увагі на нацыянальную прыналежнасьць, гэты пляц звалі Домскім. Тут ужо недалёка да галоўнага корпусу тэхнічнага ўнівэрсытэту, які цяпер стаіць на Вапнавай (Kaļķu) вуліцы.

НАТУРАЛІЗАЦЫЯ

Першы студэнцкі інтэрнат, дзе выпала жыць цягам двух гадоў, знаходзіўся на вуліцы імя латыскага савецкага пісьменьніка Андрыса Упіта. Пасьля далучэньня Латвіі да Савецкага Саюзу ён у 1941 годзе браў чынны ўдзел у стварэньні Саюзу латвійскіх пісьменьнікаў. Сваім аўтарытэтам, прыехаўшы ў Рыгу, спрыяў і наш Янка Купала. Ня дзіва, што з мапы ўжо вольнага Гораду зьнікла імя пралетарскага пісьменьніка, як і імя нашага песьняра.

На цяперашняй Школьнай (Skolas) не існуе і інтэрнату. У будынку месьціцца гатэль «Laine» з рэстарацыяй і канфэрэнц-заляй. Студэнцкая паліклініка трансфармавалася ў Рыскі інстытут бізнэсу. Амаль насупраць расчынілі свае дзьверы музэй «Габрэі ў Латвіі» і кашэрная рэстарацыя.

У інстытуце былі дзьве плыні паводле мовы навучаньня: латыская і расейская. Хаця групы нашага факультэту вылічальнай тэхнікі слушней было б менаваць габрэйскімі, бо прадстаўнікоў гэтай нацыянальнасьці было больш за палову, яшчэ траціна расейцаў, рэшта – іншыя нацменшасьці.

Грошай не ставала катастрафічна. Таму даводзілася падпрацоўваць афіцыйна і неафіцыйна то вартаўніком у ПМК, то пакавальнікам макулятуры на папяровай фабрыцы. Трохі гандлявалі кантрабандным таварам: дыскамі, наручнымі гадзіньнікамі «Orient» і «Omax», цыгарэтамі: сур'ёзнымі «Winston», шыкоўнымі «Dunhill» і г. нд. Таварам забясьпечвалі гуртавікі Юрыс і Віліс. Месцам сустрэчы традыцыйна была кавярня «Сігулда», што недалёка ад помніка Свабоды.

Савецкая сыстэма яшчэ пачувалася дужаю, але латышы не гублялі аптымізму. Згадваецца анэкдот: падыходзіць чалавек да прадаўца газэт і пытае: «Праўда» ёсьць?» Той адказвае: «Праўды» няма». Зноўку пытае: «Латвія» ёсьць?» (тут маецца на ўвазе газэта «Савецкая Латвія».) Чуе адказ: «Прадалі «Латвію». «А «Ciņa?» (газэта, назва якой азначае па-латыску «Барацьба») «А «Ciņa» яшчэ будзе».

Нас, студэнтаў, час ад часу ганялі дружыніць разам зь міліцыянтамі. Падшэфны пастарунак месьціўся на плошчы 13 лістапада, дзе ў 1905 годзе была расстраляная дэманстрацыя. Ніхто з нас тады ня ведаў, што гэтае месца і ёсьць самай старажытнай часткаю Гораду, закладзенага біскупам Альбэртам ля ўтоку рэчкі Рыдзэнэ ў Даўгаву. Пазьней тая рачулка высахла і ў другой палове XIX ст. была засыпаная. За нашым часам адзнакаў старажытнага рыскага порту ўжо не было.

МУЗЫКА

У нашым пакоі магнітафон мог іграць усю ноч. Рэпэртуар быў без папсы. Найбольш мяккай з групаў, якія слухалі, была «Uriah Heep» і далей да «Black Sabbath». Хаця шабашнікаў слухалі няшмат, бо тыя занадта былі інфэрнальныя. Музыка тагачаснага Гораду для мяне цалкам палягала ў hard & heavy. І сёньня стаіць перад вачыма: ранішняя мітусьня пад кампазыцыі «Immigrant Song» ці «Trampled Under Foot» «Led Zeppelin», будзённы рыскі поўдзень пад гіты «Lady Double Dealer» або «I Need Love» «Deep Purple», вечаровыя пагоркі Бастэйкалну паўстаюць пад «Soldier of Fortune» «Deep Purple», «Please Don't Judas Me» «Nazareth», а то і «Return to Fantasy» «Uriah Heep». У кожнага свае густы. Прыкладам, наш сябра наркаман Сэм у любы час аддаваў перавагу «KISS» зь ягоным «I Was Made For Lovin' You». Мы ж на нашых самаробных дыскатэках зь Фімам Бэнцманам і гарачым эстонскім хлопцам Алікам Кітсікам сядалі бліжэй да дыфузораў і разам з Полам Роджэрзам з «Bad Company» раўлі «I'm Ready For Love». Нас ніхто ня чуў, бо ўзровень гуку сягаў, пэўна, за 100 дэцыбэлаў. Зрэдку аднекуль з боку Готлянду з падарожным ветрам прыляталі мэлёдыі «ABBA»:

Flyin' high, high.	Лётаючы высока, высока.
I'm a bird in the sky,	Я птушка ў нябёсах,
I'm eagle that rides on the breeze	Я арол, што сьлізгае на брызе,

але нас яны ня надта хвалявалі.

Калі напачатку затрымка з новымі LP складала недзе год, дык потым тэрмін паступова пачаў скарачацца, і падвойны альбом «Pink Floyd» «The Wall» мы ўжо трымалі ў руках пры канцы 1979 году, амаль адначасова зь яго амэрыканскай прэзэнтацыяй. Не марнуючы часу, зь сябрам Лёшкам зьвярнуліся да знаёмца, які падпрацоўваў на Рыскай фабрыцы грамзапісу. Там было якаснае абсталяваньне. Хлопец на капіявальным апараце нарэзаў зь дзясятак дыскаў і вынес іх з заводу ў вокладках з выявамі Мусьліма Магамаева як дэфэктную прадукцыю. Дыскі танным коштам мы ўмомант распаўсюдзілі сярод знаёмых. Гэта была нашая цагліна ў абарончы мур супраць савецкага афіцыёзу.

Савецка-расейская эстрада ўплыву тут ня мела. Нашай музыкай гэтага часу быў ужо ня цяжкі мэтал, а больш складаны прагрэсіўны рок: альбомы «Works» ELP, «Starless and Bible Black» «King Crimson», «Nightingales & Bombers» ды «The Roaring Silence» «Manfred Mann», «Too Old to Rock'n'Roll, too Young to Die» «Jethro Tull».

Заходніх камандаў за жалезную заслону не пускалі. Але з «краінаў народнае дэмакратыі» сёй-той наведваў Горад на Дзьвіне/Даўгаве. Тады ладзіліся маштабныя канцэрты ў палацы спорту, што на вуліцы Крыш'яна Барана. Гэтак запомніліся візыты вугорскіх гуртоў «Lokomotive GT» і «Omega». Але самыя незабыўныя ўражаньні засталіся ад выступу Чэслава Немэна. Практычна ўвесь канцэрт прайшоў у стылі «one man band», калі Немэн па чарзе граў на розных інструмэнтах. У маіх сяброў было адрознае ад майго ўражаньне, бо перашкодаю тут быў моўны бар'ер. Я ж на той час ужо быў сталым чытачом польскага штотыднёвіка «Panorama», які шмат месца аддаваў пад музычныя навіны. З немэнаўскага канцэрту самай запамінальнай сталася кампазыцыя «Nim przyjdzie wiosna». Некалькі разоў выбіраліся на студэнцкія дыскатэкі, што нерэгулярна ладзілася ў былой англіканскай царкве побач з інстытутам. Але там ужо панавала дыска.

ТРАНСФАРМАЦЫЯ

Горад паступова пранікаў у маё нутро, зацягваў. Аднекуль паўстала жаданьне наведаць Домскі сабор і тэатар расейскае драмы. І гэта замест таго, каб, папіваючы на вольным паветры піва, глядзець аўтагонкі ў Бікерніеку. Далей болей: мастацкая галерэя, музэй замежнага мастацтва, філярмонія ды опэрны тэатар. Не прыцягнулі маёй увагі хіба музэі рэвалюцыі ды латыскіх стралкоў.

Прычыніўся Горад і да абуджэньня майго зацікаўленьня беларускім пісьменствам. Неяк на полацкім вакзале ў чаканьні цягніка на Рыгу набыў у шапіку шпегаўскі дэтэктыў «Эт'ен і яго цень» пра Лява Маневіча. І нечакана для сябе адкрыў, што беларуская літаратура не абмяжоўваецца творамі клясыкаў, што прапаноўвае савецкая школа.

На трэцім курсе мы пераехалі ў новы студэнцкі інтэрнат, які месьціўся на вуліцы Шаўляйскай (Šauļu) у Ілгуцыемсе. Ад гэтага часу лёс шчыльней зьвязаў мяне з Пардаўгавай. Гістарычна Пардаўгава сфармавалася праз аб'яднаньне ў XIX ст. паселішчаў Торнякална, Агенскална і Ілгуцыемса. Гэта быў раён прыватных забудоваў. Вялікіх цікавостак тут няшмат. На старасьвецкіх могілках ля лютаранскай царквы ў Торнякалне можна ўбачыць такія самыя помнікі, як у лютаранскай частцы полацкіх Чырвоных могілак. Прайшоўшы па вуліцы Слокас у кірунку Даўгаўгрывы, аматары вайсковай гісторыі змогуць агледзець абарончыя збудаваньні часоў Паўночнай вайны (1704–1710). У старой Рызе адгэнуль выпадала бываць радзей. Цяпер ужо трамваем або пешшу дабіраліся да вуліцы Калнцыема, а адтуль цераз мост ішлі на востраў Кіпсалу, дзе паўставалі новыя карпусы студэнцкага гарадка. З Кіпсалы ж да старых карпусоў на Аўсэкля або Кронвальда дабіраліся па пантонным мосьце цераз Даўгаву. Выгляд зь яго, зразумела, быў не такі прыгожы, як з вантавага мосту, збудаванага пазьней на тым самым месцы.

АД МАЕРЫ ДА ЛЕЛУПЭ

На чацьвертым курсе ў прафіляктычных мэтах месца ў інтэрнаце нам не далі, бо нашыя суседзі пяцікурсьнікі ўчынілі невялікі дэбош, а пакаралі ўсіх. Зь сябрам Фімам Бэнцманам уладкаваліся на кватэру ў Маеры, што зьяўляецца часткай Юрмалы. Мясьціны былі нам добра знаёмыя, бо цягам трох гадоў улетку ў добрае надвор'е выбіраліся сюды з Гораду. Зранку даяжджалі да Маеры і пачыналі нясьпешны прамэнад уздоўж мора ў бок Рыгі. Там пасядзім на тэрасе вып'ем піва, там згуляем на пляжы ў футбол або валейбол, там уволю панываем пад хвалі, што накачвалі на нас. Паводле завядзёнкі свой напружаны беспрацоўны дзень мы сканчалі на вэрандзе ў Лелупэ ў той час, калі адпускнікі ўжо разбрыдаліся па сваіх санаторыях і дамох адпачынку. Тут за даўжэзным сталом пасьля закрыцьця зьбіралася нямала сяброў і добрых знаёмых з Рыгі і Лелупэ. За півам нясьпешна вяліся млявыя ад летняга сонца размовы пра жыцьцё, прысутныя па чарзе апавядалі цікавыя гісторыі і анэкдоты, грала музыка й гучаў сьмех. Толькі з заходам сонца сядалі ў электрычку і вярталіся ў Горад.

24 чэрвеня на сьвята Ligo, што адпавядае нашаму Купальлю, Горад рабіўся амаль бязьлюдным. Яшчэ ўдзень куплялі напоі, прысмакі і адвячоркам прыяжджалі ў Лелупэ. Сышоўшы на станцыі, пешшу дабіраліся да рэчкі з такой самаю назвай (Lielupe – Вялікая рака), якая коціць свае воды з-пад крыжацкага замку ў Бауске. Сябры звычайна, выцягнуўшы шампуры, ужо насоўвалі на іх кілбаскі. Трохі падмацаваўшыся, далей гаманілі, сьпявалі, хадзілі да суседзкіх вогнішчаў, спаборнічалі, хто хутчэй пераплыве Вялікую раку. І гэтак праз усю ноч. Уранку першай электрычкай дабіраліся дадому і стомленыя валіліся спаць, ісьці ў інстытут моцы не было.

Цяпер лёс паяднаў нас зь Юрмалай яшчэ шчыльней. Уладкаваліся мы на кватэры ў нямоглага старога, які ў часе вайны быў ахоўнікам канцэнтрацыйнага лягеру ў Саласьпілсе. Жыў ён адзін. Зрэдку, звычайна пасьля атрыманьня пэнсіі, наведвалася да яго рослая мажная цётка, якая, трохі прыбраўшы ў хаце, разам са сьмецьцем забірала і грошы. Узімку, прыехаўшы з Рыгі, а гэта звычайна было не раней за дзявятую гадзіну вечара, мы чулі, як дзядок у сваім пакойчыку ціхенька скуголіць: «Ай, Божа мой, паміраю, замярзаю. Каб хто хоць печачку пратапіў». Наслухаўшыся, мы зь Фімам узьнімаліся і ішлі паліць печку, каб наш гаспадар ня зьмерз. Чалавек ён быў абсалютна бяскрыўдны. Гледзячы на яго, я разумеў, што маральны стан грамадзтва залежыць ад паноўнага рэжыму. Добрыя варункі спрыяюць росту маральнасьці. Калі ж пануе зло, як у тую ваенную пару, слабыя робяцца паслугачамі зла, бо для іх важней выжыць.

БУЛЬБЯНЫ БУНТ

Па-савецку сьвяточнага Гораду я ніколі ня бачыў (і дзякуй Богу), бо травеньскую і лістападаўскую дэманстрацыі ігнараваў, спасылаючыся на патрэбу зьезьдзіць дахаты. У часе вучэньня імкнуўся не вытыркацца і рухацца, як кажуць спартоўцы, у пэлетоне. Але да канца ня вытрымаў. Маю падазрэньні, што да гэтага таксама прычыніўся Горад сваімі брукаванымі вулкамі, сьпічастымі дахамі камяніцаў, ветрам з-за мора. Першы мой правал адбыўся ўвосень 1979 году, калі ўсіх, хто мог рухацца, пачалі выганяць на палі. Аднаго ранку

сабралі і нас ля галоўнага корпусу ды пасьля працяглай раскачкі пасадзілі ў аўтобусы і разаслалі па аб'ектах. Наш аб'ект знаходзіўся на самай мяжы зь Беларусьсю. Праз усю Латвію павезьлі нас у вёску Індра, дзе цяпер памежны пункт. Нудотнае чаканьне ад'езду, даўгая дарога, адсутнасьць харчаваньня выматалі ўсіх. На поле прыехалі а 19-й гадзіне вечара. Тут нас чакаў калгасны старшыня, які радасна паведаміў:

– Ну во, бульбы вам накапалі, калі яе зьберацё, пачнём уладкоўваць.

Мы абурыліся і запатрабавалі жытла і ежы. Старшыня адмовіўся, спаслаўшыся на магчымыя прымаразкі. Поле было неабсяжнае, пэўна, мэханізатар з самага ранку пачаў пра нас рупіцца. Я прапанаваў рушыць да вёскі, палова групы са мной пагадзілася. Быў гэта добры габрэйскі аддзел, бо ў ім мы з украінцам Лёшкам Мірошнікам і расейцам Сашкам Крыловым былі інтэрнацыянальнаю меншынёй. Гадзіны празь дзьве прыйшла другая палова групы. Куратар Ацтыньш распачаў сход дзеля разбору сытуацыі. Спачатку абвясьціў, што збор ураджаю – справа палітычнае важнасьці, таму нязгодных будуць караць, як ужо выключылі з інстытуту з гэткае ж прычыны двух латышоў, якія былі накіраваныя ў мястэчка Лімбажы. Нас «взяли на поруки», і наступнага дня мы далучыліся да бульбянай кампаніі.

ПРАБЛЕМЫ КАМУНІСТЫЧНАГА ВЫХАВАНЬНЯ

Аднаві́ліся заняткі. Мы, пяцікурсьнікі, вучыліся ў другую зьмену, то бок ад 14-й да 20-й гадзіны. Студэнцкая сталоўка ў такі час ужо не працавала, і звычайна, купіўшы ў краме насупраць піва і рыбы, мы выпраўляліся ў парк на другі бок вуліцы Ганзэйскай. Гэтак было і тады. Стаяў цудоўны восеньскі вечар. Троху падмацаваўшыся недалёка ад адзнакі расейскай прысутнасьці ў гэтым краі – быў гэта яшчэ не зусім ссохлы, але невылечна хворы дуб, які, паводле цьверджаньняў афіцыйных гісторыкаў, пасадзіў расейскі цар Пётар I, мы рушылі да факультэту. Наступнаю парай былі практычныя заняткі навуковага камунізму. Вёў іх адстаўны палітрук, у якога

фуражка выразна адціснула адну зьвіліну, зраўняўшы іншыя. Трохі часу сядзелі спакойна, слухаючы лухту, якую нёс ваяр ідэалягічнага фронту. Як на бяду, той вырашыў пракантраляваць засваеньне папярэдняга матэрыялу. Задаўшы пытаньне «якія існуюць віды камуністычнага выхаваньня», ён, не шукаючы доўга, выбраў у сьпісе першага, якім аказаўся я. Назваўшы два-тры віды, я ўрэшце згадаў патрыятычнае выхаваньне. Адстаўнік націскаў, патрабуючы поўнага адказу. Я ня вытрымаў і прамовіў:

– Патрыятычнае.

Ён:

– Вы ўжо казалі, а яшчэ.

Я:

– Яшчэ раз патрыятычнае, бо яго ніколі зашмат не бывае.

Выкладчык выгнаў мяне з аўдыторыі і паставіў крыжык ля прозьвішча. Гэтая інфармацыя патрапіла да кіраўніка курсу прафэсара Ашманіса. У наступным сэмэстры ён пачаў даводзіць нам навуковасьць гэтай самай тэорыі. Тады я ўжо наслухаўся альбому «Pink Floyd» «The Wall», які сваёй сьценабітнай «Another Brick In The Wall» разбурыў неакрэплую душу:

We don’t need no education	Даволі з нас адукацыі
We don’t need no thought control	Даволі кантролю над думкамі
No dark sarcasm in the classroom	Досыць чорнага сарказму ў клясе
Teacher leave the kids alone	
Hey teacher leave us kids alone	Настаўнік пакінь дзетак у спакоі Гэй, настаўнік, пакінь нас малых у спакоі

На адным з сэмінараў прафэсар пачаў маляваць перад нашымі вачыма карціну камуністычнага грамадзтва. І тут я запытаўся, якой жа мусіць стаць сям’я. Прафэсар адказаў, што сям’я будзе заставацца традыцыйна манагамнай. Я заявіў, што гэта

выглядае на рэвізію праграмнага «Маніфэсту камуністычнай партыі» Маркса і Энгельса, пагатоў што харызматычны пасол Савецкага Саюзу Аляксандра Калантай ня памятала сваіх партнэраў ня тое што па імёнах, але нават у твар. Прафэсар паставіў насупраць майго прозьвішча яшчэ адзін крыжык.

Надышлі дзяржіспыты. Усё здаў добра, заставаўся толькі гэты самы навуковы камунізм. Надышоў дзень Zero. Традыцыйна рэй на іспытах вядзе адказны за навучаньне. Іншыя сябры камісіі ў справу ня блытаюцца і толькі ставяць свае подпісы пад агульным пратаколам. Ашманіс пачаў мэтадычна шукаць дзіркі ў маіх ведах. Правалтузіўшы з паўгадзіны, калі ўжо стамілася і камісія, ён абвясьціў:

– Вось бачыце, недастаткова вы засвоілі тэорыю навуковага камунізму. Так што мусім паставіць вам двойку.

Аналізуючы тыя падзеі, думаю, чым бы гэта магло скончыцца, калі б навучаўся ў Маскве або Менску. У лепшым разе – адлічэньнем з інстытуту, у горшым – месцам у адной з псыхушак. Калі нашы дзяўчаткі-аднагрупніцы даведаліся ў калідоры аб маім правале, у іх быў шок.

– Што будзеш рабіць далей, – пыталіся яны ў мяне.

– Ды пойдзем зараз сьвяткаваць здачу, – весела ўсім адказваў я.

Скончыўся экзамэн, і прафэсар Ашманіс выйшаў на калідор. Падышоўшы да мяне, запытаўся:

– А скажыце, калега, калі вы будзеце здаваць экзамэн з навуковага камунізму?

Пагадзіцеся, форма звароту цікавая. Я адказаў, усьміхнуўшыся:

– Дык толькі што здаваў жа.

– Дык не здалі ж. Трэба, калега, паспрабаваць яшчэ раз.

Я ў адказ:

– Здаецца, паўторная здача дзяржэкзамену адбываецца праз

год. Вось разьмяркуюся, папрацую, а праз год сустрэнемся.

– Э, калега, рабіце ня так. Ідзіце да дэкана і бярыце дазвол на пераздачу.

– Дык ён жа аб'явіць мне вымову.

– Калега, хай вас не пужаюць вымовы, вы ж ужо спэцыяліст. Бярыце дазвол і прыходзьце да мяне.

Празь дзень напісаў заяву і рушыў да нашага дэкана па дазвол. Дэкан Вульф быў больш падобны да лява, чым да ваўка: буйны, з густой капой сьветлых, трохі кучаравых валасоў. Дазнаўшыся пра прычыну майго візыту, адразу пачаў рычаць:

– Што ты сабе думаеш! Трэба ж, адзіны чалавек у інстытуце, які праваліў такі адказны экзамэн.

Парычаўшы ў меру, зрабіў вымову і даў дазвол.

Яшчэ праз пару дзён пайшоў да прафэсара, які займаўся ўжо справамі прыёмнай камісіі, бо быў прызначаны ейным старшынём. Ашманіс зьвярнуўся да мяне, як да старога знаёмца:

– Ну што, калега, атрымалі дазвол?

– Так, атрымаў. Вось прыйшоў экзамэн здаваць, – прамовіў я, падаючы паперу.

– Э, не, калега. Спачатку будзем здаваць гэтак любыя вам першакрыніцы. Пачытайце трохі, а потым прыходзьце.

Праседзеўшы пару дзён у інстытуцкай бібліятэцы, я зноў паўстаў перад прафэсарам. Крыху паразмаўлялі на зададзеную тэму, і мой экзамэнатар паведаміў:

– Ну, цяпер, калега, можаце рыхтавацца да экзамэну.

Мінула яшчэ колькі дзён. У прызначаны час мы зноў сустрэліся. Пасьля непрацяглае падрыхтоўкі выйшаў да стала. Адказаў на ўсе пытаньні. Ашманіс з падкавыкаю прамовіў:

– Выдатна, калега! Але, выбачайце, паставіць вам пяцёрку не магу, бо здаяце ўжо другі раз. Таму толькі чатыры.

А мой Бог, пражыву я бяз гэтай пяцёркі.

КАМІТЭТ І КАМІТЭТЧЫКІ

Будынак КГБ знаходзіўся на рагу Brīvības (былая Леніна) і Bruņinieku (Рыцарская, а раней Чырвонаармейская). Абсталяваны некалькімі камэрамі вонкавага назіраньня. Цяпер тут месьціцца Дэпартамэнт паліцыі. Неяк адзін просты латыш, зь якім працавалі разам у ПМК у Тарнякалне, скардзіўся, што на адным са сходаў пакрытыкаваў кіраўніцтва за тое, што зь дзяржаўных грошай будуюць сабе дамы:

– Дык якая ж гэта народная ўлада?!

Праз пару дзён яго выклікалі ў КГБ і папярэдзілі:

– Калі яшчэ раз пра цябе пачуем штосьці падобнае, атрымаеш дзясятку, як раней твой бацька.

Пры канцы навучаньня зацікавіла гэтую арганізацыю і мая асоба.

У часе нашага ўрачыстага сьвяткаваньня заканчэньня інстытуцкай навукі, што адбывалася ў рэстарацыі нядаўна збудаванага гатэлю «Latvija», нечакана поруч паўстаў нейкі капітан КГБ. Адвёўшы нас са знаёмцам Артурам, ён паказаў пасьведчаньне і пачаў апавядаць, якая цікавая ў іх праца і што ў гэтай установе кожны дзень ёсьць днём адчыненых дзьвярэй і, даўшы нумар свайго тэлефону, запрасіў зайсьці ў госьці. Паперку з нумарам я адразу выкінуў. Артур жа выявіў незразумелы мне тады энтузіязм і прапанаваў схадзіць у госьці разам. Быў ён хлопцам нейкім выкрутным і хаця навучаўся ў іншай групе, усё нешта цёрся каля нас. Наступнага дня Артур зноў прапанаваў мне схадзіць паглядзець на КГБоўскае жыцьцё знутры. Я адмовіўся. Мабыць, гэта была спроба вэрбоўкі. Падобна, Артур ужо быў сэксотам, а мяне абралі з увагі на «агентурную пэрспэктыўнасьць».

ПАГЛЯДАЮЧЫ З-ЗА МЯЖЫ

Пасьля расстаньня часьцей выпадала бываць у Маскве, Менску або Вільні. Але пра Горад ніколі не забываў. На пачатку 1990-х жыва цікавіўся грамадзкімі працэсамі ў суседняй ужо краіне. Нейкі час выпісваў рыскія газэты «Atmoda»(Абуджэньне) і «СМ – сегодня». Тады ж неяк прачытаў у часопісе «Avots» (Крыніца) артыкул пра Полацкае княства як першую дзяржаву на тэрыторыі Латвіі. Паказаў знаёмым. Тыя, прачытаўшы, крыўдавалі:

– Латышы спрабуюць прысабечыць сабе славу Полацку.

Традыцыйныя сувязі Полацку з Рыгай зьніклі. Час памяняў арыенціры. Стаім адзін да аднаго сьпінамі. З гэтай прычыны зьнікла ў Полацку вуліца Рыская, якой выяжджалі гандляры і службоўцы ў заходнім кірунку. Засталіся два невялічкія завулкі ля збудаванай яшчэ ў 1866 годзе чыгункі Полацак–Дынабург–Рыга. Сёньня і беларускія і латвійскія дасьледнікі няшмат надаюць увагі гісторыі двухбаковых сувязяў. Беларусы больш зважаюць на Польшчу й Літву, пакідаючы па-за сваёй увагай Латвію, хаця для Прыдзьвіньня яе роля была доўгі час вызначальнай.

Дзяюць да сёньня і штампы часоў расейска-савецкай імпэрыі. Расейцы дагэтуль слаба адрозьніваць між сабой балтыйскія краіны. З вуснаў масквіча лёгка пачуць пра «латвійскую сталіцу Вільнюс». Латвійскія ж гісторыкі часта не адрозьніваюць расейцаў і беларусаў. Гэтак у навучальным дапаможніку для агульнаадукацыйных школ пад назваю «Русские в Латвии» пішацца пра расейскіх купцоў з Полацку і Віцебску ды ў дадатак тлумачыцца, што за часамі Рэчы Паспалітай зваліся яны польскімі, бо былі пад Польшчай. Хібы гэтыя можна паправіць толькі інтэнсіўнымі кантактамі палітыкаў і навукоўцаў. Але якое супрацоўніцтва, калі беларускі прэзыдэнт кажа пра паўставаньне нэанацысцкага рэжыму ў Латвіі...

НОВАЕ – СТАРОЕ

За свае пасьляінстытуцкія візыты ў Горад адкрыў для сябе

іншыя месцы, што сталі блізкімі. Гэта касьцёл Сьвятога Францішка з тэалягічным унівэрсытэтам на Каталіцкай вуліцы (Katoļu), дзе ў 1996 годзе праходзіла канфэрэнцыя, прысьвечаная 400-м угодкам Берасьцейскага Яднаньня. Раней вуліца гэтая звалася Кіеўскай і славілася сярод гараджанаў сваім неўтаймаваным начным жыцьцём, якое аздаблялі п'янкі, бойкі і гульлівыя дзяўчаты. Цяпер на Каталіцкай ціха і прыстойна. Касьцёл Маці Божай Тужлівай месьціцца на Замкавым пляцы (Pils laukums) побач з былым крыжацкім замкам, цяперашняй рэзыдэнцыяй прэзыдэнта Латвійскай Рэспублікі. Збудаваны храм у 1764 годзе, і ў ім штодня адпраўляецца служба ў бізантыйскім абрадзе.

Цікавы і этнаграфічны музэй пад адкрытым небам, што месьціцца на паўночна-ўсходнім ускрайку Гораду, у Югле. Тут можна болей даведацца аб этнаграфічных адметнасьцях буйных рэгіёнаў Латвіі: Курзэмэ, Відзэмэ, Зэмгаліі і Латгаліі. Ёсьць музэй гісторыі акупацыі. Падобныя музэі мусяць быць і ў Беларусі, каб паказаць людзям злачынствы таталітарных рэжымаў і захаваць імёны тых, хто аддаў жыцьці за волю і дэмакратыю.

Кожнага разу прыяжджаючы ў Рыгу, знаходжу для сябе нешта новае. Вось і цяпер атрымаў асалоду ад сузіраньня «Дому чорнагаловых», рэканструяванага ў 2000 годзе. Гэткай мянушкай ён абавязаны мурыну Сьвятому Маўрыкію – апекуну таварыства маладых замежных купцоў, што доўгі час тут месьцілася. Хронікі згадваюць пра гэты будынак ужо ў 1334 годзе. Зь ім зьвязаны развой Гораду як гандлёвага цэнтру. Пацярпеў дом ад бамбаваньня ў 1941 годзе, пасьля вайны быў разабраны на цэглу. Перад адноўленым домам усталяваная скульптура рыцара Ролянда, выкананая ў 1896 годзе рыскім скульптарам нямецкага паходжаньня Аўгустам Фольцам. У тыя часы вастрыё мяча адзначала геаграфічны цэнтар Гораду.

А збудаваны ў 1970-х гадах будынак бібліятэкі і эканамічнага факультэту нашага інстытуту разбурылі, і на іх месцы ў 2001 годзе аднавілі ратушу – сымбаль вольнага гораду. Цяпер у ёй адбываюцца паседжаньні рыскага сойму. Адчыніліся старыя вузенькія вулкі, якія за савецкім часам былі ператвораныя ў

двары. Горад сапраўды стаў сталіцай эўрапейскай краіны і ў 2002 годзе за захаваньне культурных традыцыяў атрымаў «Флярэнтыйскую прэмію» (Premie Firenze), якую даюць Эўрапарлямэнт, Міністэрства культуры Італіі і горад Флярэнцыя.

Ня так у маім родным Полацку, дзе ўлады то рашаюць паставіць дзіўнага выгляду ліхтары вакол гарадзкога пляцу, то ўсталяваць помнік, праект якога ня здолеў прайсьці мастацкую экспэртызу, то правесьці піва-гарэлачнае сьвята гораду. Доўгатэрміновыя пляны кшталту аднаўленьня цэнтральнага пляцу з касьцёламі Маці Божай і Сьвятога Сьцяпана або вяртаньне цэнтральным вуліцам іхных гістарычных назваў для іх нецікавыя.

Шмат што зьмянілася ў краіне за часы маёй тут нябытнасьці. Ня ведаю, ці здолеў бы я сёньня ўпісацца ў яго. Але кожнага разу, прыяжджаючы ў Горад, хочацца прамовіць словамі апостала Паўла, які на гары Фавор казаў: «Госпадзе, як добра мне быць тут». Калі сэрца Робэрта Бэрнза засталося навекі ў гарах, сэрца Юзафа Пілсудзкага – у роднай Вільні на могілках Роса, то маё сэрца – у Рызе ля помніка Свабоды.

Рыга–Полацак, травень 2005
[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/08/05
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 6 (46) - 2006**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам Форум

[image]

[image] [image]2006

ад Зыкатук

ана Зыкатук • крытыка • гісторыя • эсэістыка • **літаратура** • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

АЛЕСЬ АНЦІПЕНКА

паэт

Алесь Анціпенка

ТРЫПЦІХ

I. Бяз назвы

Сказ скажае сказанае,
Нявыказаныя думкі
Занурваюцца ў доўгія сны.
Чакаем...
Напэўна, усё ж ткі
Бессэнсоўна чакаем
На ўвайсьцё туды,
Дзе сыходзяцца лініі
Усіх прадметаў і рэчаў.
І дзе зь неакрэсьленых гукаў
Нараджаюцца словы.

II. Руплівец быцьця

На даляглядзе нябытнага
Валянцін Акудовіч
Рупліва ставіць

Памежныя слупы
І вешае на іх
Шыльды,
Каб ніхто не заблукаў
У гэтай небясьпечнай зоне.

ІІІ. Асэнсаваньне Бацькаўшчыны

Валянцін Акудовіч
Ня ведаў слова «мятлушка»,
Таму што ён нарадзіўся
На захадзе, а я –
На ўсходзе Беларусі, –
Вось такая ў нас краіна!

* * *

І. Сіну

ТРЫ ЦЬВІКІ

Сін ня сіні,
Сін мне сьніцца.
Сіньнявокая сіньніца
Не дае мне падавіцца
Чорнай, чорнай, чорнай піццай.
Цьвік, цьвік, цьвік!

* * *

БЯЗЬБЕДНЫ ПАЭТ

Паэт Хадановіч ня жыў на пазыкі,
Бо кожнага дня ён пісаў лімэрыкі,
А потым, прадаўшы тае лімэрыкі,
Да самае раніцы робіць падлікі.

* * *

ДАДАІСТЫЧНЫ ВЕРШ

Абугу, абугу
Не скажу я ні гугу.
Булка, булка –
Га-га-га!
Гакі, гакі, гакі, гакі –
Е-едзем у вёску мы Булгакі!

* * *

Шлях цяжарыць,
Цяжарныя жанчыны пакідаюць Акудовіча –
Ісьці робіцца крыху лягчэй.

* * *

У жабак клопаты
Зямныя і вадзяныя.
А на неба іх узносяць
Бусьлікі.

* * *

Заляцеў шпак у шпакоўню,
Агледзеўся – аднапакаёўка.
Г...но хата.

* * *

НАСЬЛЕДАВАНЬНІ БАГУШЭВІЧУ

Бацьку яго звалі Васіль,
Сам жа ён Валянцін.
Ні зямлі, ні хаты ня маець,
Бо жывець у горадзе.
Калі што запытаесься ў яго,
Адказваець: «Шукайце мяне ў няма».
Славай і багацьцем абкружаны,
Сядзіць ён там поруч з князем Астроскім.
Сам Скарына чытае ім урыўкі з сваёй Бібліі.
Вакол шмат люду літоўскага і беларускага.
Пекна і хораша. А як хто новы ўвойдзець туды,
Дык таго адразу ж Велікодным яйкам і сустракаюць!

* * *

Заўтры зноў народзіцца новы дзень –
Не пасьпаваю мыць пялюшкі.

* * *

РУСКІ КАЛЯНДАР

Крестьянин торжествует.
Грачи прилетели.
Комары да мухи.
Болдинская осень.

* * *

У ПОШУКАХ СЯБРА

Па запрашэньні сьвятога Пётры
Быў учора ў раі.
Акудовіча няма і там.

[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/08/06
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 6 (46) - 2006**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам Форум

[image]

[image]

[image]2006

ад Зтыкатук

аналітыка • крытыка • гісторыя • эсэістыка • **літаратура** • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

Гутарка зь пісьменьнікам Сяргеем Астраўцом Падлейшых часоў, бадай, не бывае

СЯРГЕЙ АСТРАВЕЦ (нар. у 1959 г. у Менску) – пісьменьнік, журналіст. Скончыў журфак БДУ, па разьмеркаваньні трапіў у Горадню працаваць у рэдакцыю абласной газэты. У 1992–1993 гг. рэдагаваў гарадзенскую «Пагоню». Аўтар кніг прозы «Янычары» (1993), «Цэнзарскія нажніцы» (2000), кнігі эсэістыкі «Лісты да

— Пасьля пагаршэньня дачыненьняў Беларусі з Захадам Горадня апынулася ў нейкім «апэндыксе», пры «сьцяне». Нават колькасьць пасажыраў на невялічкім полацкім чыгуначным вакзале мне здаецца заўсёды большай, чым на гарадзенскім. Гарадзенскі вакзал ажывае толькі перад адпраўленьнем дызэля ў бок Беластоку за кошт кантрабандыстаў...

— У маіх апавяданьнях гэта адлюстравана: заходні кут. Куды прывозілі помнікі правадырскія, бюсты, прывозілі ўладу, дзе канчаліся чыгуначныя рэйкі, далей – калючы дрот і... тэра інкогніта, зразумела, варожая. Уздоўж мяжы ўкопвалі паласатыя слупы, запальвалі пражэктары, выпускалі злых сабак, ставілі варту зь сярпочкамі-малаточкамі на шапках. А ў горадзе будавалі завод для вырабу калючага дроту.

Калі я прыехаў сюды жыць, у мяне ў галаве было, што гэта менавіта памежны горад, і мне гэта падабалася, усё ж да сапраўднай Эўропы бліжэй. Побач з маёй газэтнай рэдакцыяй

быў мосьцік праз чыгунку, калі я канчаў працу, дыхтоўбіў хомбіў пастаяць на ім, паглядзець на цягнічок пад нагамі, які ехаў на «Кавярнянуса» дзень якраз у гэты час адпраўляўся ў Беласток. Карабінгнік (2002). быў, пару вагонаў, і пасажыраў былі адзінкі. Але мне гэта дапамагала.

Адчуваньне памежнасьці, тэма памежнасьці ў мяне цяпер адна з асноўных, Кітайскі мур, Бэрлінскі – прыцягальныя для мяне вобразы. Мяжа, ля якой я жыву, зрабілася апошнім часам вельмі вабнай таксама для называных пагранцамі нашымі ды ўладамі «афраазіятаў». Ясна, што гэтая зьява для мяне таксама цікавая, і гэныя «азаафрыкаты» ўзьнікаюць у маіх аповедах. Аднойчы па рацэ, якая перацінае мой горад і якая называлася за каралём Баторыем Кранонам, яны на плыце спрабуюць пераплыць у сумежную краіну, але рака раптоўна замярзае, плыт ня рухаецца, а пагранцы толькі аблізваюцца на беразе, бо лёд яшчэ крохкі.

Месцазнаходжаньне майго пісьмовага стала робіць надзённымі, натуральнымі ў маіх опусах цыраваньне жалезнай заслоны, непушчаньне НАТО, стральбу па паветраных шарах, пушчанска-зубрыныя сцэны, дэгустацыю лясной гарэлкі і нават адбудову Бабілёнскай вежы. Пісаць пра саму мяжу было няпроста, трэба было многаразова яе пераехаць, ператрываць у доўгіх начных чэргах, адчуць мэханізмы яе жыцьця, наслухацца кантрабандыстаў, якіх называю часам проста сьпіртавозамі ці нават бутлегерамі.

Я жыву ў паўночна-заходнім куце краіны, адчуваю сябе на беларуска-польска-літоўскім памежжы і пішу з увагі на гэта. Я таксама адзначаю зьмены ў транспартным руху, рэгрэс, амаль што сьцісканьне шчыгрынавай скуры. Аднойчы я напісаў, што мой горад – гэта месца, куды не лятаюць самалёты. Ёсьць сучасны аэрапорт, але няма авіярэйсаў. Праўда, спробы былі даць працу лётчыкам, цяпер вось рэйс адкрыўся на Калінінград праз «варожую тэрыторыю бязь візы», ня ведаю, ці доўга пратрымаецца.

Зьнікненьне цягнікоў адным часам вельмі нэрвавала, але прызвычаіліся. Можна было раней даехаць цягніком да Варшавы, Шчэціна, Бэрліна і ў іншы бок — да Вільні, Рыгі, так,

да Полацку, Пецярбургу, напрыклад. Цяпер адзіны замежны цягнічок (ня лічачы маскоўскага), які існуе, – расхістаная электрычка да першай памежнай станцыі ў Польшчы. Калісьці віленскі цягнік з файных замежных вагонаў хадзіў на Варшаву праз нас. Але каму спадабаецца двойчы зь невялікім інтэрвалам стаяць на беларускай мяжы, ды яшчэ губляць час, колы зьмяняючы на савецкія і назад? Гэта ж каменны век! Літоўцы зрабілі сваю чыгунку да палякаў, а мы зусім апынуліся ў мядзьведжым куце ў цэнтры Эўропы. Тут можна толькі парадавацца за нашых былых братоў па лягеры, што савецкія рэйкі не праклалі да Бэрлінскага муру і да Эльбы.

Што датычыць культурнага жыцьця, яму ня можа перашкодзіць адсутнасьць авіярэйсаў або цягнікоў. Месцазнаходжаньне гораду ды ягоная мінуўшчына – вось падмурак для мастакоў, напрыклад, для гісторыкаў, для музыкаў і для літаратараў таксама. Яны часам называюць Менск беларускай правінцыяй, хоць зь цягнікамі там значна лепей. У дачыненьні гораду з каралеўскімі традыцыямі ўжываць слова «правінцыя» яны звычайна лічаць не зусім дарэчным, усё ж адсюль да Бэрліна і Парыжу бліжэй.

— У XXI стагодзьдзі ты выдаў дзьве вялікія кнігі прозы…

— Задавальненьне, спадзяваньні? Нават ня ведаю – бадай, ня думаў так пра гэта. Хаця задавальненьне – рэч натуральная. Ясна, мне хочацца выкласьці ў выглядзе тэксту пэўныя свае думкі, уражаньні. Я магу гэтыя тэксты, калі іх дастатковая лічба, склaсьці ў кнігу, а магу гэтага й не рабіць. Бо я ведаю, што рэальна гэта патрэбна толькі мне самому, і калі ў мяне няма адпаведнага настрою, жаданьня, імпэту, надрукаванай кніжкі можа доўга ня быць ці ня быць зусім. Так атрымалася, што апошняя, «Кактэйль Молатава», праляжала зьвярстанай два гады. Там 19 апавяданьняў, я іх напісаў за першыя два гады ў новай кватэры ў Старым горадзе, пачуцьцё навізны ўзмацнялася часам – міленіюмам. Але пасьля гэтага ў мяне склaліся амаль цалкам яшчэ дзьве кніжкі, і мне хочацца іх закончыць, мне гэта цяпер цікавей, чым займацца папярэдняй.

Я ўсьведамляю: ні я, ні мае кніжкі ніякім выдаўцам, напрыклад, не патрэбныя. Праўда, дзьве ранейшыя, якія выйшлі,

прафундавалі замежнікі. Апошнюю выдаю ўласным коштам. Вось такая кухня ў мяне. Кніжкі, можна сказаць, атрымліваюцца для ўласнай паліцы, бо наклады сьціплыя. Але я ніколі не забываюся, што, прыкладам, першыя кніжкі Гэмінгўэя выйшлі прыблізна ў такой жа колькасьці, праўда, у Парыжы. У нашых умовах большы тыраж – увогуле марная, мабыць, справа: бальшыня беларускіх кніжак тады будуць пыліцца ў кнігарнях ці ня бачыць дзённага сьвятла дзесь у скрынях, мне так здаецца. Зрэшты, усё гэта для мяне мала што значыць: галоўнае, я атрымаў задавальненьне, калі пісаў, у гэтым і сэнс.

— Як бы ты назваў сваю прозу?

— Знаеш, мяне бадай лічаць часам нейкім празаіка-журналістам, гэткім «кентаўрам», які больш журналіст, чымся празаік. У мяне комплексаў няма на гэты конт, я называю сваю прозу газэтнай. Хаця яна бывае рознай, але гэта й цікава: пісаць разнастайна.

Ад самага пачатку ў мяне быў том маленькіх апавяданьняў Сымона Кармігелта, які друкаваў іх у сваёй галяндзкай газэце штодня, а пры канцы году выбіраў найлепшыя і рабіў чарговую кнігу. Карацей, я меў рэчаісны прыклад газэтных апавяданьняў.

Дарэчы, я ў сваёй апошняй кніжцы патлумачыў магчымаму чытачу: «Аўтару цяжка пазбыцца рэпартэрскай звычкі, адмовіцца ад спробаў адлюстраваць у апавяданьнях сёньняшні дзень, пісаць па гарачых сьлядох, адбіваць на паперы ўласнае адчуваньне часу, ягоны рытм. Абяцанкі самому сабе скасаваць уласную ролю літаратурнага храніста ды апавядаць пра вечнае, грунтоўнае пакуль застаюцца марнымі. І аўтар працягвае рабіць – паміж газэтным артыкулам, радыёскрыптам, тэленавінамі, пачкам сьвежай прэсы, рок-н-ролам і кубкам кавы – сваю прозу». Адзінае, што прэсы асабліва няма ўжо, а газэты, у якіх я працаваў сам, усе загінулі.

Дзесьці я чытаў: звычайная літаратура – гэта імкненьне трапляць у межы жанру, сучасная, гэтак званы цяперашні мэйнстрым, азначае парушэньне межаў, незважаньне на іх, і гэта, маўляў, літаратура ў чыстым выглядзе, а не імкненьне

абавязкова адпавядаць нейкім шаблёнам, лекалам. Жанры існавалі і будуць існаваць. Але мне адпавядае другое, мне гэта цікава, бо прымушаць сябе рабіць тое, што табе не цікава, гэта ўжо не свабодная творчасьць, а нейкі сацрэалізм. Мяне цікавіла раней тое, што называлі «новым журналізмам», проза, заснаваная на рэпартажы, але я разумеў, што ўсё ж гэта ня мой выпадак.

Я заўсёды адчуваў, што галоўнае зусім ня жанры, а каб кніжку было цікава чытаць. Я ў гэтым пераканаы. Натуральна, што спачатку гэта, безумоўна, некаму было цікава пісаць. Асабліва мне падабаюцца сьмешныя, трагікамічныя рэчы: пісаць і чытаць.

— Ці замінае табе ў літаратуры твой журналісцкі занятак?

— Безумоўна, мяне гэта хвалявала сваім часам: пашкодзіць мне мая газэта ці не? Бо калі я пасяліўся ў Горадні, я меў цьвёрды намер пачаць пісаць прозу, хаця ўпэўненасьці ў сілах у мяне не было. А пачаў я, між іншым, на дзяжурствах у начной рэдакцыі, з гісторыі аб разбурэньні Фары Вітаўта. Цяжка ішло гэтае апавяданьне, але я тады толькі вучыўся пісаць. Дарэчы, пісаў потым часам у рэдакцыі, хаваючы рукапісы ў шуфляду, калі заходзіў хтось з начальства. Для мяне было важна, што ў нашай газэце раней працаваў сам Васіль Быкаў, віншавальныя паштоўкі ад якога прышпільвалі да дошкі абвестак.

Мяне тады цікавілі пісьменьнікі, якія працавалі ў газэтах. Той жа Дына Буцаці, Кармігелт. Хаця я разумеў, што яны маглі адно мець сваю калёнку і ня мусілі «гнаць радкі» на тэму сацыялістычнага спаборніцтва, напрыклад. Дый самі газэты там былі іншыя, само жыцьцё.

Пытаньне наконт таго, ці варта пісьменьніку займацца журналістыкай, ці не пашкодзіць яму гэта, ці не змарнуе ён свой «капітал» на газэтную штодзённасьць, турбавала нарвэскага празаіка Юхана Боргена. Але ён заўсёды адказваў: які ж у такім разе сам гэты капітал, калі яго гэтак баяцца страціць? Няма чаго тады шкадаваць пра такую мізэрнасьць, пра такі неістотны талент. Сам я з часам зразумеў, што газэта мне вельмі дапамагла. Па-першае, я навучыўся пісаць увогуле,

рэгулярна працаваць, пісаць шмат пры патрэбе і навучыўся сьцісласьці.

Для творцы сёньняшні дзень дае шмат уражаньняў. Цікава назіраць за падзеямі, за часам, за зьменамі, за якімі, дарэчы, ты абавязаны сачыць як журналіст. Рэчаіснасьць каляровая, фэерычная, маскарадна-карнавальная, трагікамічная, злавесна-фарсавая. Хаця я адначасова адчуваю, што падлейшых часоў, бадай, не бывае. Карацей, наш час папросту фантастычны для творцы, і гэта трэба выкарыстоўваць. Хаця проста як чалавек, грамадзянін, жыхар Эўропы, я прыгнечаны ўсім гэтым. Усё ж мы знаходзімся не ў Лацінскай Амэрыцы.

— Як ты ўспрымаеш цяпер тую культурную прастору, да якой сябе далучаеш?

— Я, можна сказаць, абсалютна адарваны ад літаратурных тусовак, ад сталічных літаратурных працэсаў. Можна ўявіць: я дзесь на востраве ці ў лесьнічоўцы ў памежнай зоне, дзе не бывае натоўпаў. Хаця болей я адчуваю сябе ў сваёй вежы – мае вокны пад самым чарапічным дахам, мне адтуль усё бачна, што навокал адбываецца ў горадзе. Апроч таго, на маёй вуліцы літаральна мэтраў праз сто стаіць бюст Элізы Ажэшкі і непадалёк яе дом. Для мяне гэта важна, хаця, калі шчыра, чытаць клясычную прозу XIX стагодзьдзя – гэта пакута… Я хутчэй адчуваю сябе на сваім асобным месцы, на пэўнай адлегласьці, але ў агульнай грамадзе тых, хто сёньня піша на беларускай мове, стварае новыя тэксты, імкнецца нашую літаратуру ўразнастаіць, зрабіць цікавейшай.

У літаратурным сэнсе, як ты мог зразумець, я чалавек без асаблівых каранёў, прынамсі ў беларускай празаічнай глебе. Мне заўжды бракавала ў нашай літаратуры несавецкіх падмуркаў, патрэбнага мне духоўнага багажу, якога сам я ня меў, несавецкага досьведу. Я амаль задыхаўся ў яе штучных савецкіх рамках. Мяне не задавальняла, што нашыя пісьменьнікі сканчалі пэдынстытуты, ВПШ, працавалі ў раёнках ці настаўнікамі… Асабліва раздражняла, што калі іх пыталі пра ўлюбёных аўтараў і кнігі, яны пачыналі казаць панэгірыкі «вялікай расейскай літаратуры». Мне было пляваць на вялікую расейскую літаратуру, я заўсёды быў перакананы, што

нямецкая ці французская літаратура нічым ня горшыя.

Ніхто зь іх не вучыўся ў Сарбоне, не пісаў за столікамі кавярняў на Манпарнасе, ня жыў у Каталёніі, не наведваў у нядзелі сярэднявечнага касьцёлу, не купляў у міжземнаморскіх, напрыклад, рыбакоў сьвежай рыбкі папросту з лодкі. Мне не цікавая была традыцыя ейнай скамянеласьцю, мне літаратура здавалася якімсьці траглядытам… Яны марылі трапіць у Маскву, а я далей Воршы ня езьдзіў. Я заўсёды жыў сьпінай на ўсход, прынамсі стараўся жыць. Ясна, гэта была ня іхная віна, а – лёс, можна сказаць. Пазьней памятаю лёгкую расчараванасьць, што ніхто з нашых не пісаў у шуфляду. Але тым жа часам Саюз пісьменьнікаў я заўсёды паважаў, гэтыя людзі былі цытадэльлю беларушчыны. Проста часта мне бывалі ня вельмі цікавыя іхныя творы.

Эмігранцкая літаратура мне таксама мала што дала. На берагох Патамаку сумаваць у вершах па родных гонях, нічога не гаворачы пра эмігранцкае жыцьцё, пра адаптацыю ў чужым асяродзьдзі. Я іх па-людзку разумею, але мне ад гэтага не лягчэй.

А вось сёньняшняя літаратурная моладзь досыць вольна езьдзіць па Эўропе, чытае сучасныя замежныя творы, бачыць іншае жыцьцё, набывае іншы досьвед жыцьцёвы, творчы і не баіцца яго выкарыстоўваць. Да іхных ног не прывязаны сацрэалізм.

— Ці меў пісьменьнікаў-настаўнікаў?

— Ніякіх настаўнікаў назваць я не магу. Хіба можна было б толькі паспрабаваць гаварыць пра нейкія ўплывы, хоць гэта таксама ўмоўная справа. Вясковая чыгуначная станцыя майго маленства Цёмны Лес, як аднойчы даведаўся, аказалася станцыяй Максіма Гарэцкага. Ён, дарэчы, бадай і застаўся маім улюбёным беларускім пісьменьнікам. А таксама Янка Скрыган быў мне вельмі карысны. Калі я быў студэнтам, кнігі Адама Мальдзіса выклікалі захапленьне.

Я ніколі не чытаў кніжак, якія ўсе абмяркоўвалі ў гэты момант: «Дзеці Арбату» ці раманы Быкава, бяз розьніцы. Мяне гэта

падспудна адштурхоўвала: гаварыць пра тое, пра што ўсе гавораць. Атрымлівалася само сабой, што я заўсёды чытаў нешта іншае: Ану Бляндыяну, Дына Буцаці, якія на мяне, мабыць, зрабілі нейкі ўплыў. Яшчэ два пісьменьнікі далі мне шмат: Сэнт-Экзюпэры і Камю, абодвух перачытваю час-часам.

— Якую кнігу марыш напісаць?

— Я б сказаў прасьцей: я пішу, можна сказаць, некалькі кніжак. Хутчэй не адначасова, а па чарзе, вяртаючыся раз-пораз да кожнай. Некаторыя ўдаецца скончыць, у сьпісе зьяўляюцца новыя, наступныя. Напрыклад, зьбіраецца пакрысе кніжка пра краіну майго маленства, пра ГДР, пра 1968-мы і Прагу. Ёсьць іншыя задумы, а таксама дзьве практычна скончаныя кніжкі прозы. Апошнюю зь іх я напісаў амаль цалкам за мінулы год, застаецца пару апавяданьняў дарабіць, усяго іх там будзе 16–17.

Хочацца ўжо іншага – напісаць раман. Адну рэч я пачаў, але зноўку перакінуўся на апавяданьні. Вось тут, напэўна, мая журналістыка не спрыяе якраз напісаньню раману. Але нічога ня зробіш, уявіць сябе без сваёй, спачатку газэтнай, цяпер радыйнай, прафэсіі я не магу. Героі раману павінны мяне зразумець і пачакаць, хаця галоўным героем там увогуле зьяўляецца горад.

Гутарыў Алесь Аркуш
1 траўня 2006 г.
[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/08/06
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 6 (46) - 2006**

[image]

[image]

1962. Скончыў другі курс мастацкай вучэльні. Студэнты на лета разьехаліся хто куды. Мне нейкім чынам удалося ўладкавацца мастаком-дэкаратарам у Рускі драматычны тэатар імя Горкага, які зьбіраўся на гастролі ў Расею.

[image] [image] [image] **АЛЕСЬ ШАТЭРНІК**

Алесь Шатэрнік Сонцакрыж Паэтычны дзёньнік

Скульптурная група «Гуканьне вясны» на праспэкце Пераможцаў у Менску. Аўтар Алесь Шатэрнік.

Сонцакрыж

Уначы грымела навальніца.Часам біў Пярун. Маці хрысьцілася і супакойвала нас. Стомленыя страхам ад раскатаў грому, малыя хаваліся пад коўдру і засыналі.

На раніцу спалі доўга, сонца ўжо пасьпявала высушыць глебу, а ад начнога дажджу заставаліся сьляды маленькіх каньёнчыкаў – высахлых ручаёў, у якіх, калі добра ўгледзецца, можна было назьбіраць прыгаршч цікавых каменьчыкаў, жменьку прыгожых шкельцаў ды нават знайсьці некалькі медных манэтаў. Часам трапляліся зусім малазразумелыя мэталёвыя рэчы, аб прызначэньні якіх мы маглі толькі здагадвацца. Мо гэта была частка аброці ці што іншае... Час усё так моцна ператрусіў, так спрасаваў, што толькі сьляды-парэшткі нагадвалі пра нешта мінулае.

Зямля была абмыта дажджом настолькі чыста, што, здавалася, ніводная пылінка не магла ўзьняцца ў паветра. Праз гэта неба рабілася асабліва блакітным, празрыстым і чыстым.

Недзе апоўдні пачыналі праплываць белыя пухавіны аблокаў, што як плылі сабе, так і плывуць, а час і зямля назапашвалі ўсё новыя сьляды-парэшткі…

Зямля і Неба!..
Бацька і Маці.
Сонца і Крыж…
Дзе сьляды нашыя?.. Ці ня ў промнях СОНЦАКРЫЖА?..
Бацька Крыж!..
Маці Сонца!
Промні СОНЦАКРЫЖА зьзяюць вечна!

Гэта травінка, гэты каменьчык.
Сонца адбітак, у крыніцы праменьчык.
Сьвет над Бажніцай на захад ці ўсход,
Гэта і смутак, і радасьць, і ўзьлёт…

Гэта жыцьцё і Душа чалавека
Над Беларусьсю лунае спрадвеку.
Час і прастора ў кругазварот,
Сымбалем – Верай адзначан народ.

Воблакам-хмараю неба засьціла,
Чорным крылом СОНЦАКРЫЖ засланіла,
Выпусьціў з рук бліскавіцы ДАЖДЖ-БОГ,
У цемры зазьзялі скрыжалі дарог.

Віліся з попелам груганоў зграі,
Ветры ў званіцах званы калыхалі.
Не абуджаецца стомлены люд,
Дзе знайсьці сілу, каб збавіцца пут?

Цяжка са стогнам мяхі ўздыхнулі,
Стылае вугальле ветрам кранулі.
Хваляю ўецца жалезны прамень,

Гартам ствараецца Сонцаструмень.

Так і сплываюць ў прасторы і часе
Цяжар журбы – радасьці, сьлёзы.
Лёс наш такі – выпрабаваньне,
СОНЦАКРЫЖА ВЕЧНАЕ ЗЬЗЯНЬНЕ…

А ўвечары над дахам запальвалася сем зорак Вялікага Зьвязу, згадваючы пра тое, што пад гэтым дахам месьціліся сем родных тоесных Душаў…

Наплывала ціхая, празрыстая летняя Ноч…

2 жніўня 1994 году. Вайшкуны. Сон

Бачу ў сьне Зянона. Нехта мне гаворыць, што вось людзі падчас прэзыдэнцкіх выбараў наракалі на тое, што ў яго няма дзяцей, чаму ён не ажаніўся?

А гэта Беларусі, людзям яе – Боскае выпрабаваньне, бо Зянон – гэта не чалавек, а анёл у абліччы Чалавека, а ад анёлаў людзі зусім не нараджаюцца, ня ў гэтым іх прызначэньне… Відаць, патрэбны яшчэ час, каб гэта ўсе зразумелі.

Працяг сну банальны: бачу, быццам бы асабліва актыўныя прыхільніцы Фронту хочуць выправіць гэтае становішча, але тут мне зь імі прыходзіцца ўступіць у дыялёг, з чым і прачынаюся…

Бывае, што і анёлы ходзяць па зямлі…

26 сьнежня 1996 году

Сёньня маме споўнілася 89 гадоў, вельмі слабая, нават ня можа сядзець на ложку. Але мы зь Люсяй паднялі яе, пасадзілі на крэсла. Спачатку казала, што ёй круціцца галава, пасьля

супакоілася. Люся дала ёй смачнай бабкі, яна паела, а я ёй кажу:

– Маці, сёньня твой дзень нараджэньня.

Яна адказвае, што Бог пачуў яе, для яе самы лепшы падарунак, каб вось так пасядзець разам зь дзецьмі. Гладзіць маю руку і гаворыць:

– Твае ручкі – мае рукі… Гэта зьлепак… Успомніш, калі мяне ня будзе…

І распавядае пра дзіўны сон, які бачыла сёньня ўначы. Быццам бы вялізная Чырвоная Кабылка хоча яе ўкусіць, але тут зьяўляюцца «божыя жанчынкі», ратуюць яе, адганяюць Чырвонага Каня, кажучы: «Не чапай яе… у яе харошыя дзеткі, богаўгодныя…»

Сядзіць, нават я яе ўжо і не падтрымліваю, сама трымаецца на крэсьле.

– Жыцьцё ляціць як птушка…

– Маці, ты нам у дзяцінстве распавядала казку пра Зязюлю, якой дзеці ня слухаліся і тады яна ад іх адляцела… назаўсёды…

Не адлятай ад нас, наша Зязюля…

Ратуй нас, Божа…

[image]
3 мамай. 1977.

1997 год. Вадохрышча

На Вадохрышча бачыў сон. Быццам бы ідуць па Траецкім трое: Тоўсьцік, Савіч ды Коля Селяшчук, якога зьбіла хваля марская ў Італіі. Дзіўлюся: Селя жывы.

Бачу нейкі Вэртыкальны Прамень. Нешта падказвае мне: ён не загінуў, проста Хваля марская перанесла яго ў гэты Сьветлы

Прамень.

Прачынаюся, маці просіць вады папіць:

– Сынок, я без вады засыхаю, прагну піць…

Голас

Гэта не істотна, што многія ня чуюць,
Куды істотней, калі нехта адчуў…

Маці другі год хварэе. Чую, нешта гаворыць. Пытаюся:

– Мама, каго ты завеш?

– Бога… І вас…

– Мама, што ты ўвесь час клічаш Герасімаўну? Яна ж ня чуе цябе, яна ў Гомлі, як яна цябе пачуе?

– Пачуе, яшчэ як пачуе. Голас па паветры вецер данясе.

Нечакана прыехала Герасімаўна наведаць маці. Жартам пытаюся:

– Мама, як яна цябе пачула?

– Пачула! Бог голас ветрам данёс.

18 сакавіка 1997 году

У «Імені» надрукаваны «Кадар тыдня»: падчас акцыі «Горад – наш» нехта вывесіў бел-чырвона-белы сьцяг на комін кацельні гарадзкой лазьні па вуліцы Танкавай.

Памятаю, як гэтую вежу-комін узводзілі рабочыя ў 1954 годзе. Вучыўся я ў шостай клясе, і праз школьнае акно было добра відаць, як штодня цагляная вежа-комін уздымаецца на мэтар-паўтара ў неба. Настаўніца-матэматычка рабіла мне заўвагі: «І што гэта ты, Шатэрнік, усё глядзіш у акно?»

Ганна Барысаўна часам мяне дапякала, на што я адказваў, што не зьбіраюся быць матэматыкам, а буду мастаком. Любіла яна паўтараць: «Художник» – ад слова «худо».

Празь некалькі дзесяцігодзьдзяў я сустрэў Ганну Барысаўну ў аптэцы на Танкавай, мы зь ёй прыязна пагутарылі. І сапраўды, я на яе не крыўдую.

Драўляныя дамы і 37-ю школу даўно зьнеслі, а лазьня засталася, вежа-комін не псуе паветра, не дыміць і часам бывае вельмі карыснай, асабліва калі на ёй лунае бел-чырвона-белы сьцяг і нагадвае пра тое, што Вясна-97 – пачалася.

15 красавіка 1997 году

«Чалавек ты чалавек вучоны, а дзе ж мой труд, дзе мая навука?» – так маці сказала, калі яе карміў.

26 чэрвеня 1997 году

Калі мы кормім маці, яна пытае:

– А Бог разрашыў?

– Разрашыў, разрашыў, Мама.

– А вы?.. А Валянціна Андрэеўна?

– Маці, ну калі Бог разрашыў, дык што ты нас пытаеш?

6 ліпеня 1997 году, 23.00

Маці распавядае, як на іхную вёску Качына зь неба звaліўся вялікі шэры камень: «...А блішчэў вельмі моцна, добра, што звaліўся на канец вёскі, а то ня дай Божа б на хату».

Зь Менску панаехала вучоных, і забралі той камень. Відаць, гэта быў мэтэарыт. Памаўчаўшы, дадае: «У той год шмат зорак падала зь неба».

Зразумела чаму, бо гэта былі трыццатыя гады мінулага стагодзьдзя. Колькі было вынішчана інтэлігенцыі ў Беларусі? Гэты аповед пра «камень» мне маці распавяла, калі ўжо была цяжка хворая, на запыт па тэлефоне Валі Аксак, карэспандэнткі з радыё «Свабода»: «Скажы, Алесь, а ці памятае твая маці Галубка?»

Памятае, ды нават у якіх дэталях! Галубок не аднойчы прыяжджаў да іх у вёску са спэктаклямі, маці нават гатавала яму заціpачку з жытнёвай мукі, ён еў яе, «сёрбаючы», і прыгаворваў: «Вось цуда! Вось цуда! Тудэма-сюдэма, тудэма-сюдэма…»

[image]

23 ліпеня 1997 году

Вайшкуны. Раніца. Сяджу на даху, ладжу канёк. Насупраць нашай хаты выходзіць пані Сулкоўская па ваду. «Тацяна, – кажу, – сёньня мне прысьніўся дзіўны сон… і словы ў ім: «Міска – малітва Быцьця».

Таня робіць некалькі крокаў наперад, задумваецца: «Так… У гэтым нешта ёсьць», – адказвае і глыбакадумна крочыць сабе за вадою.

Мудрая Сулкоўская квартаю вады
Ля сядзібы ўвечары мыла агуркі.
Агуркі зялёныя на стале стаяць,

Есьць Валодзя зь Ленаю і частуюць нас.

Будзем есьці смачныя Таніны гуркі,
Будзе ў хаце весела ад такой яды,
Ну ды жарты кіну я, не пра гэта сказ,
Кажуць у Вайшкунах хутка будзе Спас…

Яблыкі чырвоныя, агуркі зялёныя
На стале стаяць…

Лука адпачывае ў Сочы, а ў гэты час над Беларусьсю пранеслася бура незвычайнай сілы. Загінула пяць чалавек. Пазносіла дахі дамоў, дрэвы ў лесе паваліліся, як запалкі…

19 жніўня 1997 году. Спас

Аблокі над возерам і маладымі таполямі.
Ціхае шапаценьне лісьцьця і плёскат вады
Закалыхвае мяне.
Я позіркам узношуся высока ў неба, дзе павольна
Лётаюць ластаўкі.
Ад вышыні яны такія маленькія, што часам
Зьнікаюць з вачэй…
Недзе блізка мама, высокая і дужая, разьвешвае бялізну
Паміж гнуткіх таполяў.
Сонца і вецер хутка робяць сваю справу, бялізна высыхае,
Таполі выпрастваюцца,
Час сплывае…
Пройдзе сорак пяць гадоў…
Роўна палова доўгага веку мамінага жыцьця…
Вайшкуны. Яблыневы сад. Прад Спасам.
Высока ў вечаровым небе я ўбачыў чатыры дзіўныя
Птушкі, адну зь іх я нават упаляваў у бінокль,
Яна пакружыла трошкі над садам і зьнікла.
Як я пазьней здагадаўся, гэта былі чорныя буслы.
І гэта быў знак – Божы знак. З мамай нас было чацьвёра.
Сумная казка дзяцінства зьдзейсьнілася.

Адляцела наша матуля ў Вечны вырай…
Да Спаса мама ня ела яблык. Сёньня
Спас. Сухі сонечны дзень…

Травень 1999 году. Клён № 1

На даляглядзе абсягу кармянскага поля адзінока ўзвышаецца клён. Сівыя вішнягі ды зьдзічэлае кустоўе нагадваюць, што на гэтым месцы калісьці стаяў хутар. Клён перад вайною пасадзіў васьміклясьнік Валодзя Галімскі, з хаты, адабранай бальшавікамі ў Галімскіх і ператворанай у Кармянскую сярэднюю школу. Па прыходзе немцаў хату вярнулі былым гаспадарам, ды толькі не прыйшлося ў ёй Валодзю больш пажыць. Забралі хлапца ў Нямеччыну, у выгнаньне, у далёкі Оснабрук, адкуль ён даслаў бацькам чатыры паштоўкі. Пісаў больш не пра сябе, а настальгічна распытваў, як там, у родным краі. Апошнія радкі былі: «У вас, відаць, зелянее рунь». Гэта быў май 1943-га. Больш зьвестак пра яго ня мелі.

І толькі празь сямнаццаць гадоў стаў вядомы ягоны трагічны лёс. Зьвесткі пра яго адшукаў брат маёй жонкі Віктар, які служыў у савецкім войску ва Ўсходняй Нямеччыне. Празь Міжнародны Чырвоны крыж ён атрымаў даведку пра тое, што «польскі падданы, народжаны 10 лютага 1926 году ў Карме, сельскагаспадарчы рабочы Ўладзімер Галімскі памёр у Оснабруку 3 кастрычніка 1943 году ад агульнага зьнясіленьня і пахаваны на могілках у Хазе, поле Ф, рад 4, магіла 7». Даведка датаваная 6 траўня 1946 году і 29 сакавіка 1961 году.

У доўгую, цёмную, змрочную ноч вецер стогне і плача галінамі клёну, часам разгорне ў небе хмары і праб'ецца да долу сьвятло далёкай Зоркі – мо гэта Валодзя глядзіць з высокіх нябёсаў на родную зямельку, у якой нават не давялося быць пахаваным, бо сканаў юнак на чужыне ад Вялікай Тугі і Любові да Радзімы.

Клён № 2

У Беларусі павінны адбыцца прэзыдэнцкія выбары. Лукашэнка пры ўладзе і ні з кім ня хоча ёй дзяліцца.

Дэмакратычная апазыцыя вылучае двух кандыдатаў: Міхаіла Чыгіра і Зянона Пазьняка. Праводзіцца перадвыбарчая кампанія. Улады моцна ціснуць на тых, хто ўключаецца ў гэтую барацьбу. Мяне выклікаюць у КДБ, пракуратуру, робяць папярэджаньне.

У гэтыя ж дні нечакана прыходзіць запрашэньне з Хорстмару ад Марыі Цыман зрабіць мастацкую выставу ў Мюнстары. Гэтая выстава плянавалася раней, але тое, што яна адбудзецца ў траўні, для мяне прыемная нечаканасьць.

Па шыкоўным аўтабане еду ў Нямеччыну. Са мною «Жоўтыя Вяргіні» Валодзі Сулкоўскага.

Тыдзень, праведзены ў Нямеччыне, быў плённы, шмат што паглядзеў, нават зьезьдзілі ў суседнюю Галяндыю. Але галоўнае тое, што пабываў у Оснабруку. Марыя звазіла туды, дзе пахаваны Валодзя Галімскі, і гэта адбылося 6 траўня, якім была датаваная даведка пра ягоную сьмерць. Адно што гэта быў травень 1999-га.

7 траўня вяртаўся ў Менск, за акном на палях зелянела рунь.

І ў гэты ж дзень бясьсьледна зьнік былы міністар МУС Беларусі Юры Захаранка, апанэнт Лукашэнкі.

19 жніўня 1999 году

Сёньня два гады, як Маці няма.

У Катэдральным саборы пасьвяціў некалькі яблыкаў. Адзін езьдзіў на Паўночныя могілкі да бацькоў. Запаліў сьвечкі.

Сьмерць – гэта Дзьверы Пакуты: адчыніў, а яе няма.

«Сьмерцю сьмерць адмовіў».

14 лістапада 1999 году

Боскасьць – гэта Люстэрка Душы, не забывай заглядваць у яго.

Я пайду па гары, каб бліжэй быць да Бога.

28 ліпеня 2000 году

Дабраліся да Італіі, да места Рыміні. Першае, што зрабіў, акунуўся ў Адрыятыку, пра што марыў усё жыцьцё.

Мора цёплае, а вецер даволі моцны, так што вада ў зімовай Сьвіслачы паказалася цяплейшай.

Выпілі з Валенсіяй па келіху *cinzano*. І ўсё добра. Чакаем турыстычны аўтобус зь Менску, які выехаў на паўдня раней за нас.

2200 кілямэтраў да Вэнэцыі праехаў за стырном «Опэль-Кадэта». Адолеў дарогу за двое сутак, праз Польшчу, Славакію, Аўстрыю. У адным месцы стаяў указальнік на Падую, да якой заставалася ўсяго 40 кілямэтраў, згадалася пра Скарыну. Колькі ж яму спатрэбілася часу, каб адолець гэты шлях з Полацку ў XVI стагодзьдзі?

31 сьнежня 2001 году. Возера

Возера, вакол цябе бяжыць маё жыцьцё.
Бэзавыя сьцяжынкі юнацтва вабілі да барвовых адкрыцьцяў.
Летнія дажджы змывалі штодзённую віхуру.
Шчымліва-пахмурнае неба зьвеставала надыход восені.
У шэра-чорную ноч над табою ўзвышаецца Зорка-Прадвесьніца.
Кранутае тонкім ільдом, вяртаеш летнія мроі.

Ты стаіш у сутоньні сьнегавой цішыні.
Сьцягнутыя шэраньню ціхія вольхі, стромкія таполі
зачаравана слухаюць Мэлёдыю Часу.
Возера, ты надаеш мне натхненьня,імпэту і сілы…
Я выходжу з тваёй сьцюдзёнай палонкі…

Гучыць мэлёдыя *BOSSON «One In A Million».*

27 сьнежня 2002 году

Учора быў вельмі прыгожы захад. Сонца ўжо схілілася за даляглядам, а па блакітна-ружовых нябёсах рассыпаліся лёгкія пёркі аблокаў. Быццам вітаючы, нагадваючы пра дзевяностапяцігодзьдзе мамы…

Маці нарадзілася 26 сьнежня 1907 году…

27 сьнежня 2002 году

Вясна на Беларусь прыходзіць непрыкметна,
Лета – паступова,
Восень – зьнянацку,
Зіма – адразу.

5 траўня 2002 году

Адны глядзяць на «Чорны квадрат» Малевіча ды «мудрствуют лукаво». Нехта нават заклаў мільён даляраў за яго.

Цікава, а колькі каштуюць «Гракі прыляцелі» Саўрасава? Пра гэта згадаў, калі на канале «Культура» ў музычнай застаўцы да прагнозу надвор'я мільгалі кадры з шэдэўрамі сусьветнага жывапісу. Відаць, сучасны бізнэс за Саўрасава столькі б не

адваліў, але ад таго ён ня менш каштоўны за Малевіча ці нават за «Сланечнікі» Вінцэнта Ван-Гога, апошні кошт якіх 40 мільёнаў даляраў.

Кошт Саўрасава самадастатковы… сам у сабе. А Малевіч?

Націснуў кнопку, згаслы экран тэлевізара *«BLACK CINETRON»* – вось і квадрат Малевіча.

Паглядзеў у акно, а там жывая прырода, і птушкі даўно прыляцелі, нават квітнее бэз…

У Маскве сьпяваюць:
«Хрыстос уваскрэсе!
Хрыстос уваскрэсе!
Хрыстос уваскрэсе!»

Травень 2002 году
Мой травень 1945-га

Скончылася вайна… На падлозе сьпіць салдат, як Хрыстос, шырака раскінуўшы рукі. Леваруч – аўтамат, справа – гармонік. Хлопчык пераступае цераз рукі салдата. Разважае, што ўзяць? Да чаго дакрануцца?

Сонечны прамень сьлізгае па пералінавых кнопках гармоніка…

Хлопчык кранае гармонік.

На адной зь менскіх вуліц месьціліся дзьве вучэльні – суворaўская ды мастацкая. Да таго ж мастацкая знаходзілася ў будынку Опэрнага тэатру, насупраць суворaўскай, што была збудавана ўлетку 1953 году, у стылі сталінскага нэаклясыцызму, і куды я ледзь ня трапіў вучыцца, нават пасьпяхова здаў уступныя іспыты.

Мяне не прынялі, бо найперш у суворaўскую набіралі дзяцей-сірот, а ў мяне былі бацькі.

Пазьней ужо вучыўся ў мастацкай…

14–15 верасьня 2002 году

Сьвята гораду – 935 гадоў Менску. Улады зладзілі такую фантасмагорыю, што здаецца, гэта сьвята – ня сьвята, а «баль падчас паляндрыі».

З гісторыі вядома, што гэта дата спаленьня Менску.

1 лістапада 2002 году

Аказваецца, у Менску ёсьць вуліца Літаратурная. Месьціцца яна ў так званым Сельгаспасёлку побач зь Першай, Другой, Трэцяй і г. д. пасялковымі вуліцамі. Кантрасты на ёй такія ж, як і ў сучасным беларускім грамадзтве: сярод драўляна-цагляных дамоў пара шыкоўных катэджаў. Дом пад нумарам адзін, да якога была прыбіта шыльда з назвай «Вул. Літаратурная», у такім занядбаным стане, як і наша літаратура.

Прыгадайма навастворaны так званы «літаратурны холдынг». На гэтай жа Літаратурнай абсалютна недарэчна ўзвышаецца васямнаццаціпавярховы жылы гмах, паўночная сьцяна якога ня мае аніводнага акна. Побач, ля прыватных гаражоў, сноўдаюць паўднёвай зьнешнасьці людзі. Дзьверы ў гаражах прыадчыненыя, выяўляецца, з гэтых месцаў ідзе бойкі гандаль семкамі.

Няўжо гэтае сьмецьце запоўніць усю Беларусь?

А побач яшчэ ёсьць вуліца Тыражная…

13 лістапада 2002 году

Сёньня пахадзіў па старажытным рэчышчы Нямігі. Чысьцяць Сьвіслач – і агалілася дно. Аказваецца, Няміга цячэ на паўмэтра вышэй за Сьвіслач, утвараючы бурлівую крыніцу з надзіва чыстай, празрыстай вадою.

Знайшоў керамічныя чарапкі, некалькі манэтаў, цікавы цяжкі мэталёвы шар з крукам, відаць, вагавая гіра? А яшчэ латунную бірку з выбітай пяцікутнай зоркай, нумарам 916, літарамі ОГПУ і дзьвюма дзірачкамі, відаць, начаплялася на рукі.

Студзень 2003 году

Свой першы малюнак я зрабіў на адваротным баку бацькавага фатаздымку, дзе ён у вайсковай форме сядзіць на матацыкле.

Пёрка з чарнілам ня вельмі ўпэўнена трымалася ў маёй руцэ, мне хацелася намаляваць бацькаў матацыклет. Я намаляваў кола-круг, сьпіцы-крыж, а пасьля заўважыў, што гэткую ж форму мае акно на вежы шпіталю, у якім бацька працаваў доктарам.

Гэта было ўва Ўкраіне ў невялічкім гарадку Дубна, дзе мы стрэліся з бацькам пасьля сканчэньня вайны. Як я пазьней даведаўся, шпіталь месьціўся ў старажытных мурах замку князёў Астроскіх.

Старэйшыя хлапчукі ў падземных скляпеньнях гэтых муроў часам знаходзілі срэбныя ды залатыя манэты, нязвыкла буйныя ў параўнаньні з тагачаснымі савецкімі капейкамі. Відаць, гэта былі талеры часу Вялікага Княства Літоўскага.

Кола тое, ці то акно, зь цягам жыцьця пераўтварылася ў сымбалічную выяву сонцакрыжа.

Я маляваў СОНЦАКРЫЖ…

2 студзеня 2003 году

«Праз дастатак не спасьцігнеш праўды жыцьця…»

26 красавіка 2003 году

Хрысьцілі нас у маі 1947-га ў Катэдральным саборы на плошчы Волі ў Менску. Раней не было магчымасьці, бо ішла вайна. Цёплыя травеньскія дні. Напаўразбураны Менск. Асацыяцыі з карцінай Лакціёнава «Ліст з фронту».

Хрысьціў сьвятар, знаёмы цёткі Ганны з Зарэчча, якая й была хроснай. Велічны храм, урачыстая цішыня й малітва нязвыкла ўзьдзейнічалі на мяне.

Пра гэта нагадаў абраз Маці Божай, да якога паставіў сьвечку. Маці казала, быццам бы гэты абраз знаходзіўся ў іхнай царкве ў Тарасаве, што пад Менскам.

Цікавыя супадзеньні – гэтыя сямёркі: маці 1907 году нараджэньня, хрышчэньне нашае ў сорак сёмым і Спас 1997-га, калі мамы ня стала.

27 ліпеня 2003 году. Цёплае

Нічога дзіўнага ў тым не было б, каб хада часу ішла наадварот.

Зь першых веснавых вандровак пачаў маляваць навакольныя краявіды. Бераг возера… Некранутыя зелянінай дрэвы… На люстры блакітнай вады – жоўтыя купэны: «Красавік».

Затым квітнеючае кустоўе бэзу: «Травень».

Надалей сінія сьвечкі люпіну: «Чэрвень».

Атрымоўвацца сэрыя. Як яе назваць?

Еду па дарозе ў Шаркоўшчыну на восьмы пленэр, прысьвечаны

Язэпу Драздовічу. Якая цудоўная пара, калі ў Беларусі цёпла! Раптам заўважаю на прыдарожным знаку назву вёсачкі. Літары напаўсьцёртыя, але пра што думаю, тое і напісана. Праехаўшы колькі мэтраў наперад, пытаюся ў дзяўчат: «А як завецца вашая вёска?» Зразумела, адказваюць, як і чакаў: «Цёплае». Так і назавём сэрыю.

У Малых Алашках пісаў ліпеньскія сады Івана Сікоры.

13 жніўня 2003 году

За Астраўлянамі скончыўся бэнзін.

Праязджаючы праз гэтыя мясьціны, колькі раз думаў – прыпынюся, намалюю гэтыя ўзгоркі. Асабліва цікава, калі сьпелая вохрыстая збажына ды шэра-блакітнае неба.

Да найбліжэйшай запраўкі было яшчэ далёка. Ну і добра, буду сабе маляваць, а калі хто прыпыніцца, у таго і набуду трошкі паліва.

Ніхто не прыпыняўся, ды і машыны праходзілі даволі рэдка. Прыйшлося ісьці пехам. Напрыканцы поля знайшоўся даволі вялікі мэханізатарскі двор. Нават была і «запраўка», але паліва ў ёй – ані грама. Пагутарыў з мэханізатарамі, тыя скардзіліся, што жыта ўжо перасьпела, а заправіць камбайны няма чым.

Скаціўшыся на нэўтралцы з узгорку, нейкім чынам дацягнуў машыну да хаты, дзе добры чалавек прадаў мне ад свайго «жыгуля» пяць літраў бэнзіну, якіх хапіла дабрацца да Вялейкі.

Але галоўнае, што за яго хатай да самага далягляду раскідвалася шырокае перасьпелае поле з цудоўна пераплеценымі каласамі і рамонкамі.

Працавалася хутка. Здаецца, атрымаўся доўгачаканы «Жнівень».

23 лістапада 2003 году. Жар-птушка

У трэцяй клясе бацька даў мне грошы на піянэрскі гальштук. На кастрычніцкія сьвяты быў прыём у піянэры. Мяне прамінула гэткае шчасьце, і не таму, што я не хацеў быць піянэрам ці ня быў у ліку найлепшых вучняў. Проста па дарозе ў школу я зайшоў у кнігарню, дзе на вітрыне стаяла кніжка ў цудоўным пераплёце з ілюстрацыямі да казкі Яршова «Канёк-гарбунок» у выкананьні Білібіна, на вокладцы якой красавалася вельмі маляўнічая жар-птушка.

Кніга і гальштук каштавалі прыкладна аднолькава. Грошай хапала толькі на адну рэч. Зразумела, што я аддаў перавагу жар-птушцы.

Мяне не прынялі ў піянэры, бо не было гальштука. Ня быўшы піянэрам, ня быў і камсамольцам, ну а што да камуніста, дык лёс і Бог мяне мілавалі.

17 студзеня 2004 году. Клён № 3

І галосяць зьнічкі па жывых, галосяць,
Гэта ветах чорны люд крывіцкі косіць.

А. Сыс

Гэтыя словы Сыса мне выпадкова трапіліся падчас паездкі ў Салігорск на ўсталяваньне помніка, на якім я ніяк ня мог узгадніць эпітафію.

Зьбіраючыся ў дарогу, на вочы трапілася невялічкая кніжачка зь беларускімі эпітафіямі, большасьць зь якіх былі абсалютна банальныя, але сярод іх былі і сапраўдныя шэдэўры, адзін зь іх – верш Анатоля Сыса І галосяць зьнічкі. Гэтыя словы не выпадалі з маёй душы.

Едучы па дарозе Менск–Слуцак, стаў углядацца, а ці захаваўся

той клён на даляглядзе Кармянскага поля? Вёска Карма знаходзіцца за 35 кілямэтраў ад Менску, навакольныя вёскі забудоўваюцца катэджамі, шмат месцаў ужо і не пазнаць. Не спадзяваўся я ўбачыць звычайную карціну з адзінокім клёнам.

Раптам скончыліся катэджы, поле разгарнулася, і ўжо нічога не перашкаджала майму позірку ў далячынь, дзе па-ранейшаму ўзвышаўся той клён.

Помнік у Салігорску зладзілі добра, надвор'е паспрыяла таму, хоць быў ужо лістапад.

Вяртаючыся ў Менск, калі было ўжо цемна, на ўскрайку Слуцку прагаласавала дзяўчына. Зрабіўшы папрок і перасьцярогу аб небясьпецы быць адной у такіх вандраваньнях, падвёз яе да Менску, а па дарозе распавядаў гісторыю пра Валодзю Галімскага.

Мінаючы вёску Карма, над полем і адзінокім клёнам разьлівалася незвычайнай сілы сьвятло. Гэта было сьвятло далёкага месяца, што прабіваўся з высокіх нябёсаў скрозь туман. І згадаліся словы Сыса:

Мала зорак у небе, над маёю хатай…

Быў вечар 7 лістапада, зьвярнуў увагу на палову гадавога календара – 7 мая, 7 лістапада.

19 студзеня 2004 году

Скочылася вайна, але палонныя немцы заставаліся аж да 1949 году. Адбудоўвалі разбураны Менск. На ўскрайку гораду ўзводзіўся аўтазавод, дзе працавалі палонныя.

Бацька ўжо дэмабілізаваўся з войска і працаваў доктарам у мікрабіялягічным інстытуце. Каля аўтазаводу месьцілася досьледная станцыя, зь якой трусы і белыя мышкі аднойчы

разьбегліся па навакольлі і не бяз нашай дапамогі: мы проста забыліся зачыніць клетку. Неўзабаве белыя мышкі зьявіліся і ў нашай хаце, чым напалохалі маю сястрыцу Раю.

Часам з гораду да нас прыяжджаў мамін брат дзядзька Іван з сынам, маім стрыечным братам Васілём, старэйшым за мяне на два гады, якога нашыя мясьціны вельмі прываблівалі і заклікалі да незвычайных прыгодаў. То ён у мяне пытаўся, ці ёсьць у нас тутака ваўкі, і са сьцізорыкам гатовы быў ісьці на паляваньне.

А аднойчы змайстраваў пару рагатак. Бліз нашай хаты палонны немец вазіў у бочцы гаўно на кані. Маці сварылася на яго, маўляў, ці нельга праехаць недзе ў іншым месцы? І вось з Васілём мы вырашылі дапамагчы яму памяняць гэты маршрут.

Побач зь ялінкамі пачыналася сьпелае жыта, у якое аднойчы мы схаваліся. Як толькі бедны гаўнавоз наблізіўся да нас, мы пачалі камянёвы абстрэл. Думаю, што ў самога немца мы ня трапілі, але калі аб бочку шчоўкнуў каменьчык, немец спыніў каня і з пугаю панёсься за намі. Васька, той хітрэйшы, адразу скочыў, прыгнуўшыся ў жыта, а я так напалохаўся, што папёр напрасткі, спатыкнуўся, паваліўся – і во нечаканасьць: мне падалося, што немец ня бачыць мяне, стаіць разгублены і ці то робіць выгляд, што ня бачыць, ці то сапраўды так... Але празь невялікую паўзу апусьціў пугу, павярнуўся і пакрочыў да каня, відаць, пашкадаваў мяне, несьвядомага...

Сёньня роўна 37 год, як няма Раечкі, маёй старэйшай сястры.

5 траўня 2004 году. Сон і душа

«Гэта душа бачыць сон, а пасьля мы яго доўга разгадваем».

18 траўня 2004 году

Ідэя прыціснуць апошні прытулак Васіля Быкава халодным

фінскім каменем мне здаецца ня надта ўдалай. Калісьці скандынаўскія ледавікі дасягнулі нашых межаў сілаю прыроды.

На тое, відаць, была Воля Боская. Зараз тое, што я пачуў ад паважаных сяброў-пісьменьнікаў, нібыта Валодзя Някляеў дасылае на магілу Васіля Быкава фінскі камень, мне здаецца штучным.

Тыя ж камяні-ледавікі ў вялікай колькасьці раскінутыя па ўсёй Беларусі, асабліва іх шмат на радзіме Быкава – Вушаччыне, што мажліва было б і скарыстаць падчас праектаваньня надмагільнага помніка, і гэта было б ня менш сымбалічным.

Некалькі апошніх гадоў свайго жыцьця Васіль Уладзімеравіч правёў у Фінляндыі. Яму падабаўся фінскі камень як зьява прыроды.

Ёсьць цікавы малюнак – накід алоўкам, зроблены самім Васілём Уладзімеравічам, дзе ён сярод гэтых камянёў адпачывае, грэецца на сонейку. Выкананы вельмі непасрэдна, гэта быў у яго своеасаблівы спосаб фіксаваньня Часу. Быкаў – мастак, але ж гэта і дапамагала яму ў галоўнай пісьменьніцкай працы.

Жонка яго, Ірына Міхайлаўна, кажа, што ў іх з сабою не было фотаапарату, але Быкаў наўмысна не карыстаўся фотатэхнікай, а каб вось так зрокава зафіксаваць зьявы, час і падзеі, рабіў уласнаручныя накіды-малюнкі.

2 чэрвеня 2004 году

Сёньня паехалі з Уладзімерам Кішкурнам, сакратаром управы БНФ, і Алесем Марачкіным у Курапаты. Абышлі пешшу ўвесь лясны масіў. Крыжы, усталяваныя сябрамі КХП, уражваюць.

З паўночнага ўсходу, за Курапацкім лесам, пралягае невялікая шаша, па якой носяцца так званыя «байкеры» на матацыклах. Кажу: «Ненармальныя. Куды яны так нясуцца?» «Алесь, а ўспомні, як ты сам насіўся!» – адказвае Марачкін. І сапраўды,

калісьці зьезьдзіў дзьве «Панонії» – былі такія вугорскія матацыклеткі.

Юрка Палякоў, мой аднакурсьнік па мастацкай вучэльні, жартаваў: «Монстар сеў на свой монстра-тацыкал і паехаў у сваю монстра-сьцярскую».

Вяртаючыся бліжэй да Крыжа Пакутнікам Беларусі, убачылі дзіўнага чалавека, «мастака-схімніка», які, лежачы на зямлі, маляваў абразы на камянях – Серафіма Сароўскага, Арханёла Міхаіла...

13 чэрвеня 2004 году

Быў у мяне добры знаёмы Косьця Гурвіч. Складаны лёс меў гэты чалавек, падчас вайны застаўся сіратою; як і многія габрэі, меў добрыя здольнасьці да навук. Сам, без усялякіх блатаў, выбіўся ў людзі, атрымаў вышэйшую адукацыю і працаваў у Менску гандлёвым экспэртам.

Жонка ў Косьці была расейка, мілая, добрая, невысокага росту бляндынка, але са складаным характарам. Мелі дваіх дзяцей, дзяўчынку ды хлопчыка. Хлопчык нарадзіўся з парокам сэрца, зрабілі яму некалькі апэрацыяў, і такім чынам дажыў ён да сямнаццаці гадоў. Скончыў школу і неўзабаве памёр. З тае пары незаладзілася сямейнае жыцьцё ў Гурвіча.

У пачатку 1980-х зьехаў Косьця ў Амэрыку. Мінула дзесяць гадоў, і нечакана Косьця аб'явіўся ў Менску. На гэты час СССР ужо «кануў у Лету». Стрэліся мы з Косьцем, вядома, за гэты час для размоваў тэмаў назьбіралася больш чым дастаткова.

Свайго часу любіў Косьця бываць у мяне дома. Жонка мая частавала нас смачнымі катлеткамі. І гэтым разам паехалі ў Траецкае, дзе мы атрымалі новую кватэру. Добрае старажытнае адноўленае месца. Косьця ўсё хваліў і дзівіўся, што мы тутака атрымалі жытло. А я яму: «Ну Косьця, што ты дзівісься, ты ж быў у Амэрыцы». «Што тамака тая Амэрыка…» – і распавядае мне аб сваім жыцьці за дзесяць гадоў за акіянам.

Працаваў на прыватнай фабрыцы, клеіў нейкія каробкі. Месца для працы было непрыдатнае, у выніку пасадзіў сэрца. Зрабілі яму апэрацыю-шунтаваньне (коштам пяцьдзясят тысячаў даляраў, што пакрыла страхоўка) і адправілі містэра Гурвіча на пэнсію. Жыў сабе нядрэнна. Акрамя пэнсіі падзарабляў тым, што мог дакладна складьці юрыдычныя паперы для рэпатрыянтаў, але трэба было сплачваць за гэтую працу падатак.

Неяк выходзіць Косьця раніцай на вуліцу, а пажылая габрэйка дзівіцца: «Ой, как красіва!» Косьця ёй ў адказ: «Ну і што ты тут дзівісься?.. Ружы тутака – ня пахнуць. Елкі – ня колюцца. А кілбасы – несалёныя».

Вярнуўся Косьця зноў у Менск.

– Пойдзем да маёй Валянціны, хай пачастуе яна нас нашымі катлеткамі.

«Пасадзілі хлопца ў залатую клетку, ні табе дарогі, ні табе палеткаў» (красавік 2005, Нью-Джэрзі).

Кастрычнік

[image]

Не зважаючы на тое, што вучыўся я на скульптурным аддзяленьні, з ахвотаю ўзяўся за гэтую працу, каб трошкі падзарабіць, а разам з тым і спасьцігнуць таямніцы сцэнаграфічнага мастацтва. Можна сабе ўявіць уражаньні рамантычна настроенага мастака-пачаткоўца ад усяго ўбачанага, ад тых знаёмстваў са знакамітымі людзьмі, вядомымі артыстамі. Гэта быў тэатар, які яшчэ захоўваў традыцыі клясычнагу тэатру, не абцяжаранага выбрыкамі сучаснага постмадэрнізму. Мне пашчасьціла ў маладыя гады ўбачыць яго ня звонку, а, як кажуць, «самім у сабе», знутры.

Першае знаёмства з атрыбутамі сцэны: вялізныя маляваныя

халсьціны-кулісы, змацаваныя на сетках, вёдры з фарбаю і пэндзлі-флейцы на доўгіх кійках. За кулісамі мяне сустрэў ускудлачаны мастак-дэкаратар Валодзя Трыфанаў, які адсыпаўся на гэтых скручаных халсьцінах ці то пасьля запозьняй працы, ці пасьля добрай выпіўкі, хутчэй за ўсё і таго, і другога разам. «Ну вот, юноша, берите это ведро и делайте вот так». Паказваючы, як яркія анілінавыя распырсканыя кроплі ператвараюцца ў прыгожае бярозавае лісьце, што падчас спэктаклю асьвятлялася ліхтарамі, і на тле якога разгортвалася заключная дзея зь «Беспасадніцы» Астроўскага. Раманс з гэтага спэктаклю ў выкананьні Клімавай зачароўваў мяне, акампанавалі ёй на гітары два студэнты, прозьвішча аднаго зь іх было Скорабагатаў. Так паціху ўцягваўся ў тэатральнае жыцьцё, у дадатак яшчэ рабіў і тэатральную рэкляму.

Галоўным мастаком тэатру на той час быў заслужаны дзеяч мастацтваў БССР Армэн Грыгар'янц – цікавы, высокага росту інтэлігентны чалавек, якога я аднойчы зьдзівіў арыгінальным падыходам да ўласнага гардэробу. Зьбіраючыся на гастролі, я набыў сабе новую чэскую марынарку сьветлага колеру, амаль што белую. І неяк на працы, малюючы нябёсы, выпэцкаў яе ў блакітную фарбу. А пасьля ўзяў дый уласнаручна флейцам перафарбаваў яе ў блакітны колер. Армэну Сяргеевічу гэта вельмі спадабалася.

Іншымі маімі начальнікамі былі намесьнік дырэктара тэатру Давід Ісакавіч Рубінчык ды адміністратар Моня Моніч. З Монічам мне прыйшлося працаваць і ў Акруговым доме афіцэраў. У 1963-м я ўжо працаваў мастаком тамака, а Моня падрабляў. У мяне былі нібыта дзьве працы: за аклад рабіў афармілаўку для Дому афіцэраў, а на тэатральную рэкляму наймаліся асобныя мастакі.

І вось аднойчы да мяне, як да старога знаёмага, зьвяртаецца Моня Моніч. «Слухай, Саша, у Менск прыяжджае вядомы сьпявак з Францыі, трэба напісаць афішу», – і дае наступны тэкст: «Песни Франции поёт Шарль Азнавур», што я і выканаў, а заадно пабываў на ўсіх трох яго канцэртах у Менску.

Сваім выступам Шарль Азнавур шакаваў менскую публіку. Ён свабодна рухаўся па сцэне, падчас выступу мог зьняць

марынарку, вольна перакінуць яе цераз плячо, сесьці проста на падлогу і сьпяваць, сьпяваць. Усё гэта, у параўнаньні з савецкай эстрадай, было выклікам. Нейкі службіст-афіцэр, відаць, з палітработнікаў, заглянуў на галёрку, дзе я сядзеў, трошкі паслухаў, скрывіўся, кінуў абразьлівую фразу і пайшоў. Між тым Азнавур сьпяваў: «Ізабэль… Ізабэль… Ізабэль…»

А мне на той час немагчыма было і ўявіць сабе, да якой выключнай зьявы я спрычыніўся.

5 ліпеня 2005 году

Сёньня, на другі дзень па нашым вяртаньні з Амэрыкі, адбылося ўрачыстае адкрыцьцё помніка Касьцюшку, які я зрабіў для Амэрыканскай амбасады, што месьціцца побач з суворaўскай вучэльняй і Опэрным тэатрам.

Тадэвуш Касьцюшка вучыўся на мастака, а пасьля стаў генэралам.

27 верасьня 2005 году. Узьвіжаньне. Клён № 3. Сыс

Вясна сёлета выдалася запозьненая. Сакавіцкім марозным ранкам, засланяючы сабою яркае сонца, у расчыненых дзьвярах стаяў Сыс. Гэтым днём я чакаў заказчыкаў, на замову якіх зрабіў скульптурны партрэт бацькі. Зьяўленьне Анатоля было не зусім чаканым, але я быў рады ягонаму прыходу, мне даўно хацелася яго пабачыць. Адразу ў дзьвярох я пачаў цытаваць яму ягоныя вершы: «Як па зорках па расе твой апошні шлях праляжа, памірай, а жыта сей, рунь пра сейбіта раскажа». «І ты, Алесь, гэта помніш?» – зьдзіўлена запытаў ён мяне. Гэтыя словы я скарыстаў як эпітафію да аповеду пра Валодзю Галімскага. На жаль, Сыс ня быў у стане ўспрымаць гэтую сумную доўгую гісторыю, яму проста хацелася выпіць.

Неўзабаве прыйшлі заказчыкі, адзначылі, што падабенства з бацькам асабліва дакладнае. А Анатоль, адчуваючы зручнасьць моманту, прапанаваў заканчэньне працы замацаваць шклянкаю

віна.

Ужо захмялелы, Сыс пачаў прасіць мяне падарыць яму якую-небудзь скульптуру, нават толькі што зроблены партрэт, карцін яму чамусьці не хацелася. Гэтай раніцай трапіў ён да мяне ад Алеся Марачкіна, якому, відаць, не схацелася проста так бавіць час, хай сабе і з геніем. І ён адправіў яго да мяне. Пазьней Аляксей выбачаўся за гэта.

У той дзень Анатоль чамусьці ішоў да мастакоў. Была ў яго яшчэ спроба сустрэцца зь земляком, Эдзікам Агуновічам, майстэрня якога была побач з маёй, але яго не было на месцы. Пайшоў Анатоль ад нас, калі сонца ўжо схілялася за далягляд. Па Ўсходняй вуліцы, праз сквэр, у жоўтым скураным караценькім плашчыку фігура яго аддалялася, аддалялася, пакуль зусім ня зьнікла.

А па пажоўклым сакавіцкім сьнезе цягнуліся доўгія сінія цені таполяў.

Магчыма, у гэты момант у яго нараджаліся апошнія вершы яго жыцьця.

«Шрыфтам Брайля па калядным сьнезе… Птушкі вершы пішуць… Я чытаю… Рукі зьмерзьлі… Свае руны мне ня вышыць… Я асьлепнуў. Я аглохнуў. А вясновы сьнег пажухнуў. Часу тры сьняжынкі маю...»

Памёр Анатоль на пачатку мая, калі ў полі ўжо зелянела рунь…

Сыс – гучыць як SOS для Беларусі.

8 лістапада 2005 году. Далёкія краіны

А была яшчэ ў мяне любімая кніжка савецкага пісьменьніка Аркадзя Гайдара «Далёкія краіны» зь вельмі сьціплымі ілюстрацыямі. Яна вельмі кранала душу і будзіла мроі аб далёкіх старонах. Ці давялося б убачыць мне тую ж Амэрыку ды

шмат якіх яшчэ краёў? Мо так і жылі б за жалезнай заслонай, каб не 1991 год і такія людзі, як унук таго ж Гайдара, Ягор, што спрычыніліся да падняцьця гэтай заслоны.

Бяз даты

Маці распавядае, як у лютым 1943-га праводзіла Бацьку на фронт.

Жылі мы ў Южы, маленькім гарадку ў Расеі. Да найбліжэйшай станцыі было дваццаць кілямэтраў, і дабірацца да яе трэба было пехам. Узялі з сабою саначкі, на якіх маці вазіла дровы зь лесу, паклалі бацькаву торбу і пайшлі ў зімовую сьцюжу. Цяжар сямейных турбот ляжаў на матчыных плячох, бацька вучыўся ў Іванаўскім мэдычным інстытуце, як скончыў яго, так і пайшоў на фронт. Разам прайшлі дзесяць кілямэтраў, прыпыніліся і сталі разьвітвацца.

Дарога прамая ішла празь лес і па ўзгорках. Бацька спусьціўся з гары, узышоў на ўзгорак, другі, трэці, фігура аддалялася, аддалялася, пакуль зусім ня зьнікла.

Раптам узьнялася завіруха, навокал пацямнела, наляцела сьнежная бура. Маці стала млосна. Ужо ледзь не губляючы прытомнасьць, праз хмары яна заўважыла, як прабіваецца сьвятло.

Божы голас ёй цьвердзіў – вернецца, вернецца.

ANATOL SIDAREVIČ
historyk, stały aŭtar «ARCHE».

Anatol Sidarevič
Hulni maryjanetak

---

1 января 1919 года: Временное рабоче-крестьянское советское правительство Белоруссии: документы и материалы. – Минск: Лимариус, 2005.

Ideja hetaje knihi naradziłasia 27 vieraśnia 1973 hodu. Aŭtar idei – archivist i adzin z pačynalnikaŭ encyklapedyčnaje spravy ŭ Biełarusi Mikałaj Kaminski. Ciaper ja viedaju, čamu hetaja ideja nie mahła realizavacca za savietami: bo vyjavilisia b fakty, jakija raźviejvali b mity balšavickaje histaryjahrafiji. Knihu padrychtavali supracoŭniki Nacyjanalnaha archivu Viačasłaŭ Sielamienieŭ, Jaŭhien Baranoŭski, Alaksandra Hieś i Vital Skałaban, a Michał Šumiejka – jaje navukovy redaktar, hryfu hetaje ŭstanovy my nia bačym. I heta taksama maje svajo tłumačeńnie.

Ale pierš pra strukturu knihi. Jak i naležyć navukovamu vydańniu, pačynajecca jana z pradmovy. Dalej drukujucca biełaruskija i rasiejski teksty Manifestu Časovaha rabotniča-sialanskaha savieckaha ŭradu Biełarusi. Biełaruski tekst drukujecca ŭ dvuch varyjantach: pavodle sučasnaje artahrafiji (narkamaŭki) z zachavańniem, skažam tak, žyłunovickich leksyčnych asablivaściaŭ i pavodle tahačasnaha pravapisu, ale nie našaniŭskaha, nie taraškievicy, a specyfičnaha Žyłunovičavaha.

U trecim raździele my možam pračytać pratakoły pasiedžańniaŭ Časovaha rabotniča-sialanskaha ŭradu, a ŭ čaćviortym – pratakoły pasiedžańniaŭ Centralnaha Biuro KP(b)B, «kirujučaj i nakiroŭvajučaj siły», bo jano pradvyrašałaŭsie bolš-mienš važnyja kroki ŭradu i paasobnych kamisaryjataŭ. Dalej idzie kronika padziejaŭ u karotkačasovaj pieršaj BSSR. Asobny raździeł zajmajuć bijahrafiji siabroŭ uradu ź jich fotapartretami (zdymki čatyroch kamisaraŭ nia vyjaŭlenyja, a tamu ŭ knizie adsutničajuć).

Kali pratakoły pasiedžańniaŭ Časovaha ŭradu i CB KP(b)B možna paraŭnać ź dziejaj na scenie, dyk materyjały, nadrukavanyja ŭ raździele «Dadatki», pakazvajuć nam – choć častkova, – što dziejałasia ŭ toj čas za kulisami. Praŭda, nia ŭsie materyjały ŭ hetym raździele aŭtaryzavanyja. Tak, paznajomiŭšysia z dakładnoj zapiskaj «Sovietskaja vlast' v Biełorussii», ja vykazaŭ V. Skałabanu mierkavańnie, što jaje aŭtar – Alaksandar Burbis. Nakolki mnie viedama, hetaja zdahadka znajšła dakumentalnaje paćviardžeńnie. Šmat čym cikavy i raździeł «Ilustracyji». A jak dla mianie, dyk najcikaviejšy tam materyał – fatakopija pratakołu pasiedžańnia CK Rasiejskaj kampratyji balšavikoŭ, datavany 16 studzienia 1919 hodu. Na tym pasiedžańni była pryniataja pastanova adrezać ad Biełarusi Viciebskuju i Smalenskuju huberni. Praŭda, heta praduhledžvałasia «pravieści» praz miascovyja saviety, a potym praź źjezd savietaŭ Biełarusi. Tak nadrukavana ŭ pratakole. Dy voś rukoju Jakava Śvierdłava pratakoł papraŭleny: vyrašana było «proviesti... vydielenije iz Biełorusskoj Respubliki» i Mahiloŭskaj huberni. I chto skaža, čyja heta była pastanova – nasamreč Centralnaha Kamitetu ci Lenina–Śvierdłava–Stalina? U tym samym pratakole nadrukavana, što źjezd savietaŭ Biełarusi pavinen vystupić z prapanovaju «o načale pieriegovorov ob objedinienii s Sovietskoj Rossijskoj Respublikoj», a Śvierdłaŭ upisvaje, što źjezd pavinien «vyniesti rešienije ob objedinienii Biełorussii s Litvoj».

Dy vierniemsia jašče raz da struktury knihi i skažam, što jaje zaviaršajuć, jak i treba ŭ navukovym vydańni, pakazalniki i śpis skarotaŭ.

Što da techniki vydańnia, dyk zastajecca tolki panarakać, što knižka vyjšła ŭ miakkaj vokładcy. Śmieła možna pradkazać: tyja asobniki, što trapiać uva ŭniversyteckija i publičnyja biblijateki, chutka

daviadziecca raparavać, bo niama sumnievaŭ, što zbornik apyniecca ŭ śpisie abaviazkovaj i rekamendavanaj litaratury.

Ja nie zajzdrošču studyjozusam: ad dzieda-pradzieda jim viadoma (i toje ŭ padručnikach zapisana), što Savieckaja Sacyjalistyčnaja Respublika Biełaruśi abvieščana 1 studziena 1919 hodu. I ŭ Encyklapedyji historyji Biełarusi čytajem, sto hetaja padzieja adbyłasia 1 studzienia. A voś u hetaj knižcy studyjozus pračytaje, što nasamreč Manifest Časovaha rabotniča-sialanskaha savieckaha ŭradu Biełarusi byŭ padpisany 2 studzienia. I nia ŭsimi siabrami ŭradu. I nia ŭ Miensku, a ŭ Smalensku. A kab pakazać, što dyrektyva CK RKP(b) vykananaja, pad Manifestam pastavili falšyvuju datu i falšyvaje miesca padpisańnia aktu. Vychodzić, što Manifest – u peŭnym sensie – falšyŭka.

Ja zajzdrošču studyjozusam: jany buduć viedać praŭdu, a nia mit. Viedaćmuć, što nia tolki Manifest padfalšavany, ale j sama pieršaja SSRB była falšyŭkaju. Hetkaju mistyfikacyjaj, fikcyjaj.

Kali nie pamylajusia, anhielskaje słova «fiction» pierakładajecca jak «mastactva, mastackaja litaratura». Fikcyja 1 studzienia sparadziła takuju fikcyju, jak małapomny ciapier raman Illi Hurskaha «Viecier vieku». Było niešta niecikavaje z vobrazami Miaśnikiana dy inšych dziejačaŭ i na televizii, a ŭ hetaj knizie repradukujecca karcina Leanida Dudarenki «Miensk, 1919 hod», na jakoj pakazana toje, čaho nikoli nie było: mitynh na placy Voli ŭ Miensku, Žyłunovič, Miaśnikian, Čarviakoŭ dy inšyja na trybunie...

Zbornik, padrychtavany supracoŭnikami Nacyjanalnaha archivu, kančatkova raźviejvaje i druhi mit – ab pryrodzie KPB. Heta praŭda, što jana była zasnavanaja 30 śniežnia na VI Paŭnočna-Zachodniaj abłasnoj kanferencyji RKP(b) u Smalensku, ale niapraŭda, što ŭ jaje zasnavańni brali ŭdzieł pradstaŭniki biełaruskich sekcyjaŭ RKP(b). Aŭtary artykułaŭ «Kamunistyčnaja partyja Biełarusi» i «Pieršy źjezd KP(b)B» u EHB (a hetyja artykuły padvodzili vynik usich raniejšych daśledavańniaŭ) dalikatna abychodzili pytańnie ab tym, ci byli pradstaŭniki biełaruskich sekcyjaŭ na toj kanferencyji, što abviaściła siabie I źjezdam KP(b)B. Paznajomiŭšysia z materyjałami ŭ razhladanaj knizie, my možam ćvierdzić: «małodšyja braty» (hetak Stalin nazvaŭ siabroŭ biełaruskich sekcyjaŭ) trapili ŭ Smalensk na razbor šapak. Da taho

ž nivodzin ź jich nia byŭ paŭnamocnym delehatam. U Centalnaje Biuro KPB(b) uvajšli ludzi Miaśnikiana i Knorynha. Jak adčepnaje, u hetym Biuro dali dva miescy biełarusam (Žyłunoviču i Łahunu), ale pieršy ź ich adrazu ž zajaviŭ, što vychodzić z CB. I jon sapraŭdy nie prysutničaŭ na šasnaccaci z vasiamnaccaci pasiedžańniaŭ CB. Adsutničaŭ i na troch z šaści pasiedžańniaŭ uradu; zamiest jaho staršyniavaŭ Miaśnikian.

Palaki kažuć, što adsutny nia maje racyji. Choć Žyłunoviču davodziłasia vieści spravu z dobra śpietaj kamandaj, dla vyznačeńnia sutnaści jakoje ŭ palitalohiji jość termin «klika», a ŭ narodnym słoŭniku – «zhraja», kamandaj, jakaja navučyłasia padmanvać i svajo kiraŭnictva ŭ Maskvie (a jinšy raz Maskva, asabliva Stalin, i radyja byli, što joj padnosiać chłuślivuju infarmacyju pra nacyjanał-kamunistaŭ), choć kiraŭnikom spravaŭ uradu nasupierak usim damoŭlenaściam klika pastavila Vilhielma Knorynha, a nie Kłyša (jaho adpraviać u Zachodniuju Biełaruś, u Biełastoku jon budzie aryštavany i rasstralany i pamre, jak paviedamlaje Anton Łuckievič, z vokličam «Niachaj žyvie niezależnaja Biełaruś!»), choć pamiž biełarusami – siabrami ŭradu nie było jednaści, Žyłunovič chiba nia mieŭ racyji, unikajučy baraćby na pasiedžańniach CB i ŭradu.

Cikava čytać, jak hetyja miaśnikiany-knorynhi hulajuć u suverenaŭ-dziaržaŭnikaŭ. Jany, napačatku vorahi biełaruskaj dziaržaŭnaści, tym lahčej uvajšli ŭ rolu, što pad šyldaju Biełaruskaje Respubliki i Biełaruskaje kampartyi (i tak nazyvali jany ŭ dakumentach hetyja ŭtvareńni) možna było ŭva ŭpor nia bačyć biełaruskaha narodu (jak rabiŭ Žyłunovičaŭ ziamlak Isaak Rejnhold) abo, bačačy hety narod, zaklikać da likvidacyji jaho kulturnaj samabytnaści (Knorynh).

Tut nie mahu nie zhadać histeryku vakoł pytańnia ab niezależnaści Biełarusi, jakaja raz-poraz usčynałasia ŭ kancy XX – pačatku XXI stahodździa. Ja, naprykład, užo zmaryŭsia supakojvać panoŭ histerykaŭ dy kazać im pra nieabchodnaść spakojnaj tvorčaj pracy. Dareču, sam termin «histeryka» ŭ dačynieńni da asobaŭ, schilnych hipertrafavać pahrozu našaj niezależnaści, užyŭ u adnoj hutarcy Zbigniew Brzeziński. Ale kali da Brzezińskiego nie prysłuchalisia, pahatoŭ, jak ad muchi, admachvalisia ad mianie abo jašče j

zdradnikam nazyvali. A lohika maja prostaja: jak tolki dzieści źjaŭlajecca dziaržava ci dziaržavapadobnaje ŭtvareńnie i, ergo, źjaŭlajucca nośbity ŭłady ŭ hetym utvareńni, jany pačynajŭć baranić cełasnaść hetaje dziaržaŭnaje (dziaržavapadobnaje) adzinki. Niama takich nośbitaŭ ułady, jakija dobraachvotna admaŭlajucca ad jaje dziela niapeunych perspektyvaŭ. Ja viedaŭ, što takaja linija pavodzinaŭ była ŭłaścivaja miaśnikianam-knorynham, kali jany pačuli ab rašeńni Maskvy adarvać ad Biełarusi try jaje ŭschodnija huberni. U hetym možna dastatkova pierakanacca, kali pačytać razhladanuju tut knihu. Nie žadali miaśnikiany-knorynhi i Litoŭska-Biełaruskaje SSR. Znakamity balšavicki dyplamat Adolf Iofe, jaki niamała kpiŭ ź pieršaha savieckaha ŭradu Biełarusi, bieruču samo słova *ŭrad* u dźviuchkośsie, i jakomu CK RKP(b) daručyŭ realizavać ideju SSRLiB, vymušany byŭ kanstatavać, što j hrupa Žyłunoviča, i hrupa Miaśnikiana–Knorynha «nikuda nie godiatsia»: «Biełorusy – nacionalisty i poetomu nasaždajut sieparatizm, a naši, chotia i nie nacionalisty, no sieparatisty gorazdo chudšej marki». Kali ŭžo Miaśnikian i Knorynh byli separatystami ŭ vačoch Maskvy, dyk ź jakoje racyji mahli imknucca «zdać» Biełaruś jich duchovyja dzieci, jakija darvalisia da ŭłady ŭ 1994 hodzie?

Delehavanamu ŭ Miensk Adolfu Iofe było ciažkavata. Jakich tolki arhumentaŭ nie vynachodzili miaśnikiancy-knoryncy suproć adryvu ad Biełarusi troch huberniaŭ. Ale ŭ pratakołach CB KP(b)B dla mianie nia mienš cikavyja matyvy, pavodle jakich balšaviki pajšli na ŭtvareńnie SSRB. Iofe: «…my v CK rešili Sovietskuju Rossiju otdielit' buferami ot Jevropy. No čtoby eto nie był barjer, otdielajuščij nas (ad Eŭropy. – **A. S.**)». I heta nie arhument Iofe – heta arhument Lenina. Pakolki ž Viciebskaja, Smalenskaja dy Mahiloŭskaja huberni ad Eŭropy dalekavata, CK (Lenin skazaŭ pra heta asabista) vyrašyŭ dałučyć jich da Rasieji. Druhaja pryčyna ŭtvareńnia SSRB vykładziena Rejnholdam: «Suščiestvovanije Biełorusskoj Rady zastaviło vydvinut' Biełorusskuju Respubliku».

I jaki durań budzie paśla hetaha spračacca z tezisam «Nie było b BNR – nie było b BSSR»? Viedama, cikava było b pačytać, ci spasyłalisia na čyńnik BNR maskoŭskija pravadyry, dy voś biada: adpaviedny pratakoł pasiedžańnia CK KP(b)B nie zachavaŭsia, jak, darečy, nie zachavaŭsia j archiŭ Žyłunoviča. Ci niechta naŭmysna

jich źniščyŭ?

Takim čynam, pieršaja BSSR nia jość praduktam dobraje voli balšavikoŭ i tak zvanaje leninskaje nacyjanalnaje palityki, uhruntavanaje ŭ marksiźmie, bo jana, leninskaja nacyjanalnaja palityka, źjavicca ŭ 1921–1922 hadoch. A ŭ 1919 hodzie «ciennyj rabotnik» Piatroŭ, apelujučy da marksizmu i da samoha Engelsa, kazaŭ pra škodnaść samavyznačeńnia małych nacyjaŭ (nakolki pomnicca, Engels padzialaŭ nacyji nie na vialikija i małyja, a na žyćciazdolnyja i niežyćciazdolnyja). Ale, staŭšy častkaju kamandy Miaśnikiana–Knorynha, i tavaryš Piatroŭ nie chacieŭ raźvitvacca z uładaju ŭ SSRB. Tolki jak partyjny čałaviek, jon musiŭ padparadkavacca rašeńniŭ CK, choć i nazyvaŭ jaho pamyłkovym. Za hetuju padatlivaść Piatrova pavysiać: pryznačać zamiest nacyjanał-kamunista Ůsievałada Falskaha zahadčykam (nie kamisaram – kamisaraŭ u pieršaj BSSR nie było) kamisaryjatu pa zamiežnych spravach.

Kab dasiahnuć padatlivaści ŭsioj kliki Miaśnikiana–Knorynha, aŭtarytetu Iofe nie chapiła, i Maskva nakiravała ŭ Miensk Jakava Śvierdłava, jaki ŭ adnoj kišeni vioz dekret ab pryznańni niezależnaści SSRB, a ŭ druhoj ultymatum. I choć miaśnikiancy-knoryncy sprabavali tuzacca, prapanoŭvajučy na pasadu staršyni ŭradu budučaj Litbieł «nejtralnaha» čałavieka, a nie biełarusa ci litoŭca, usio ž CB KPB(b) 2 lutaha 1919 hodu pad pilnym vokam Śvierdłava prahałasavala za punkt, pavodle jakoha «okončatelnoje utvierždienije sostava pravitielstva (budučaj Litbieł. – **A. S.**) prinadležit RKP». A CK RKP(b) znojdzie zhavorlivych chłopcaŭ u Vilni. Jany ŭznačalvali mikraskapičnuju SSR Litvy i byli zacikaŭlenyja ŭ pavieličeńni płoščy svajoj «dziaržavy». Pakul ža na karotki čas – da 27 lutaha – isnuje SSRB. I Śvierdłaŭ dazvalaje svajim maryjanetkam pahulać. 3 lutaha pad jahonym nahladam jany dzielać partfeli ŭva ŭradzie, vydalajučy ź jaho biełarusaŭ (što praŭda, pakinuli Źmitra Čarnuševiča, «tožie biełarusa» Ivana Savickaha i čałavieka niavyznačanaj nacyjanalnaści, ale blizkaha da biełaruskich sekcyjaŭ RKP(b) Iłaryjona Puzyrova). I choć heta ŭžo nie časovy ŭrad, čas jaho isnavańnia byŭ karaciejšy, čym pieršaha ŭradu pieršaj SSRB. A ŭ kiraŭnictvie Litbielu my ŭžo nie sustreniem ni Miaśnikiana, ni Knorynha. (Darečy, razhladanaja kniha dazvalaje raźvitacca ź jašče adnym mitam – što ŭ CVK i ŭva ŭradzie SSRLiB

nie było biełarusaŭ).

Čytajučy hetuju knihu, ja mižvoli paraŭnoŭvaŭ u dumkach jaje źmiest sa źmiestam pieršaha tomu «Archivaŭ BNR», składzienaha Siarhiejem Šupam. Usie try Ůstaŭnyja hramaty vydadzieny ŭ Miensku, nichto papiarednie nie razhladaŭ i nie zaćviardžaŭ jich ani ŭ Maskvie, ani ŭ Berlinie, ani ŭ Varšavie, nijaki CK RKP nie zaćviardžaŭ i ŭradu BNR, i nia jechaŭ hety ŭrad u Miensk z Maskvy ci Smalensku, dyj radavod svoj vioŭ ad Usiebiełaruskaha źjezdu ŭ Miensku... Ci nie tamu siabroŭ hetaha ŭradu prymali i ŭ Prazie, i ŭ Paryžy, i ŭ Koŭnie, i ŭ Varšavie?.. Ci nie tamu na hety ŭrad azirałasia Maskva, a Čyčeryn vioŭ ź jim pieramovy (viedučy, što praŭda, paralelnyja pieramovy z uradam Litvy)?

Raz kniha navodzić na paraŭnańni j rozdum, treba kanstatavać: dobruju spravu zrabili historyki z Nacyjanalnaha archivu. Kniha zasłuhoŭvaje, kab pra jaje viedali nia tolki admysłoŭcy, studenty j aśpiranty, ale j šyrokaja publika.
[image]
[image]

List u redakcyju. Majstravańnie **[mk]**. Abnaŭleńnie **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Pačatak" magazine
Apošniaje abnaŭleńnie: **2006/08/06**
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 6 (46) - 2006**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам Форум

[image]

рэцэнзіі [image]-[image]2006

"да Зьвяткаў"

аналітыка • крытыка • гісторыя • эсэістыка • літаратура • **рэцэнзіі**

[image] [image] [image]

Павал Абрамовіч Глыток вады з крыніцы

ПАВАЛ АБРАМОВІЧ крытык літаратуры. Рэгулярна друкуецца ў «ARCHE».

Баяя А. *Зваўчэньне* / Пер. з чэск. М. Мартысевіч. – Менск: Логвінаў, 2006. – 230 с. – (Чэская калекцыя).

Сёлета ў перакладзе на беларускую мову пабачыў сьвет раман 64-гадовага чэха Антаніна Баяя «Зваўчэньне» (2003). Аўтар гэтага твору, уганараванага на радзіме літаратурнай прэміяй Magnesia Litera, скончыў Сельскагаспадарчы інстытут у Брне і доўгі час працаваў па спэцыяльнасьці, а потым пачаў займацца журналістыкай і выкладаць творчае пісьмо ўва ўнівэрсытэтах Аламоўца і Зьліна. Дэбютаваў у літаратуры Баяя ў 1982 годзе.

«Зваўчэньне» пакідае дзіўнае ўражаньне.

Гэты раман быццам створаны беларусам, бо працягвае нашу слаўную літаратурную традыцыю, запачаткаваную яшчэ Міколам Гусоўскім. Прырода, сьвет жывёлаў і расьлінаў робіцца прадметам філязофскага асэнсаваньня і эстэтычнага пераўвасабленьня. Адным з галоўных пэрсанажаў твору, нарэшце.

Сюжэты амаль усіх клясычных беларускіх літаратурна-мастацкіх тэкстаў, створаных да апошняй чвэрці XX стагодзьдзя ўключна, разгортваюцца, так бы мовіць, на фоне прыроды.

Аднак гэта вонкавая дэталь. Насамрэч мы маем справу з глыбокім узаемпранікненьнем, узаемадапаўненьнем прыродных стыхіяў і беларускага літаратурнага героя: «На змроку высокая постаць узвышалася над рэкаваю лукою. Чалавек маўчаў, як і ўсё, што было навокал яго. Доўга стаяла высокая постаць. Змрок пагусьцеў, неба яшчэ не запаліла зораў» (Кузьма Чорны. «Лявон Бушмар»). Прырода і мікракосмас пэрсанажа неадлучныя, пульсуюць, дыхаюць, як адзінае цэлае. Гэтак і ў рамане Антаніна Баяя, прынцыпам сьветабачаньня якога ёсьць экалягізм.

Як наагул ставіцца да прыроды беларускі празаік? Найбольш поўны адказ на гэтае пытаньне даў адзін з клясыкаў – Ян Баршчэўскі, які прызнаваўся, што «любіў чытаць у кнізе прыроды». Гэтая кніга, пісаў аўтар «Шляхціца Завальні», «вучыла мяне сапраўднай паэзіі, сапраўдным пачуцьцям лепей, чым сёньняшнія гаваркія крытыкі».

Менавіта майстэрства ў перадачы сапраўдных пачуцьцяў, глыбокая лірычная інтанацыя (чытай, «сапраўдная паэзія») і ёсьць неаспрэчным здабыткам нацыянальнага прыгожага пісьменства, важкім унёскам у «агульналюдзкую скарбніцу» (выраз крытыка і пісьменьніка Вацлава Ластоўскага). Гэты ўнёсак быў бы немагчымы бяз своечасовага асэнсаваньня беларускай літаратурай сваёй галоўнай тэмы, без сумеснай працы некалькіх пакаленьняў айчынных пісьменьнікаў на шляху яе разьвіцьця і ўзбагачэньня. Дарэчы, згаданы вышэй Ластоўскі ад імя «нашаніўскіх» чытачоў нагадваў беларускім пісьменьнікам у эсэ «Сплачвайце доўг», што ім трэба «вучыць нас любіць і разумець гоман бору, плеск вады ў сонцы, задуму змеркаў, яснату ўсходаў». Вельмі важная думка і – своечасовая. Агучаная ў 1913 годзе, яна сьведчыць пра самаўсьведамленьне маладой беларускай літаратурай свайго прызначэньня, плённасьць яе творчых пошукаў.

Запытайцеся ў сябе, ці мог маніфэст беларускай літаратуры – раман Уладзімера Караткевіча «Каласы пад сярпом тваім» – не пачынацца сказам «Груша цьвіла апошні год» і не заканчвацца фразай «Рэдкае на такім поўдні і таму слабое, уставала над зямлёй паўночнае зьзяньне»?

Мог бы. Але тады гэта быў бы анталягічна чужы твор, *не беларускі*.

Да апошняга часу здольнасьць па-мастацку пераканаўча зьліць у адзінае цэлае Стыхіі, Прыроду і Чалавека належным чынам ацэньвалася беларускімі чытачамі і крытыкамі. Абгарэлая ліпа са страшным дуплом, якая расьце ля хутарской сядзібы, апісанай у «Знаку бяды», мела для Васіля Быкава і першых чытачоў ягонага раману значэньне ня меншае, чым лёс галоўных герояў кнігі – Петрака і Сьцепаніды.

Аднак прайшоў час, беларусы перабраліся ў гарады. Кнігі пачалі чытаць па-іншаму, мінаючы вачыма апісаньні прыроды. Тым ня менш, заўважце, стварaць паўнавартасную ўрбаністычную літаратуру ў Беларусі ніхто не сьпяшаўся. Прайшло яшчэ колькі гадоў – і новая навала: у кнігах нацыянальных празаікаў, узгадаваных падобна Баршчэўскаму на «кнігах прыроды», пачалі вышукваюць тое, чаго няма. Прыкладам, паважаны многімі крытык Леанід Галубовіч у апавяданьні Івана Пташнікава «Пагоня» (1999), дзе апісваецца перасьлед ваўкамі лася (гэта – абалонка твору!), убачыў адну толькі «агонію сучаснага беларускага грамадзтва» (Наша свабода. 2000. 11 ліпеня).

Галубовіч, ці не наўмысна, сказіў сэнс сумна-прыгожага апавяданьня, якое мае эпіграф-прысьвячэньне «Ўсяму жывому на зямлі». Пташнікаў – гуманіст. І ў трагічнай падзеі, што адбылася ў часе суворай, змрочна-задуменнай беларускай зімы (« у векавечным лесе ля пракаветнай ракі Вяльлі», як удакладняе аўтар), няма іншага сэнсу, акрамя наступнага: усё жывое – сьмяротнае, яно незваротна гіне, і таму вартае жалю, спачуваньня. Аднак жыцьцё, сьцьвярджае Пташнікаў, будзе працягвацца: «…асіны, дрыжачы лісьцем, шапталі на вуха сваю ціхую журботу, ад якой павявала сном, лагодай і няскончанасьцю сьвету і жыцьця».

Як і ў апавяданьні Івана Пташнікава – гэтым велічным гімне прыродзе, у якім славіцца ўсё жывое на зямлі, – у рамане Антаніна Баяя няма ані каліўца палітыкі. Чысты дыямэнт. Аўтар апісвае жыцьцё дзьвюх сем'яў – ваўчынай і чалавечай, лёсы якіх, як адзначаецца ва ўступе, «пакрысе зьбліжаюцца, каб

урэшце таямніча пераплесьціся». Ужо зь першых старонак раману ўсьведамляеш: у гэтай цяжкай кнігі – трагічны фінал. Аўтар «Зваўчэньня» ня хоча пацешыць, ён прымушае думаць. Баяя даў узор добрай традыцыйнай прозы, ён быццам нічога ня ведае пра постмадэрнізм, «сьмерць аўтара» і іншыя «цацкі», у якія яшчэ не нагулялася сучасная беларуская літаратура. Выпускнік Сельскагаспадарчага інстытуту, Баяя піша ў пачатку XXI стагодзьдзя так, як пісаў бы ў 60-я гады мінулага стагодзьдзя выпускнік Горы-Горацкага каморніцка-агранамічнага вучылішча Максім Гарэцкі, калі б камуністы пакінулі яму жыцьцё. Нагадаю, што Гарэцкі, пераадолеўшы свой «стыхійны містыцызм», у далейшым рашуча адмяжоўваўся ад імажынізму, футурызму і іншых «ізмаў». Ён дбаў пра тое, каб вытокі беларускай літаратурна-мастацкай традыцыі не закаламуціліся.

Выклікае павагу ўвага Баяя да дэталі, факту. Гэта родніць ягоную кнігу з раманам чэскай пісьменьніцы Ганны Андранікавай «Гук сонечнага гадзіньніка», выдадзенай летась у «Чэскай калекцыі». Андранікавай трэба бачыць, да болю ў вачах, як працуе абутковая кампанія, як адбываюцца пахавальныя рытуалы індусаў, як мінае дзень «дзявочага дому» ў канцлягеры, як ваююць амэрыканцы з гітлерцамі ў Афрыцы, якія колеры мае на досьвітку рака Ганг. Гэтак жа і Баяя: яго да драбніцаў цікавіць праца псыхалягічнай кансультацыі і распарадак дня лясьнічага, адрасы праскіх бараў і паводзіны ваўчынай зграі. Нармальны «пісьменьніцкі пэдантызм».

Напісаньню раману «Зваўчэньне» папярэднічала вялікая падрыхтоўчая праца. «Дзякую ахоўнікам прыроды і лесьнікам з мараўскіх Карпатаў, – выказваецца аўтар на пачатку кнігі, – бібліятэкаркам абласной бібліятэкі імя Францішка Барташа ў Зьліне, прафэсару этнагарафіі Карлу Паўлішціку і паэтцы, апякунцы жывёлаў Яне Штроблавай, якія натхнілі на гэтую кнігу і ласкава падалі матэрыял для яе, а таксама пісьменьніку Людвіку Вацуліку за «ваўчыную» песеньку». Гэта звычайная практыка – згадваць тых, хто дапамагаў у стварэньні кнігі, і выказваць ім падзяку. У той жа час у сучаснай беларускай мастацкай прозе чамусьці не пазначаецца, хто альбо што зьяўлялася натхненьнем, апірышчам для пісьменьнікаў у часе

працы над творам. Нашы літаратары, я так разумею, альбо саромеюцца прызнацца, што ім нехта «дапамагаў», альбо ня маюць патрэбы зьвяртацца да некага ў пошуках зьвестак, гісторыяў, словаў, фарбаў, бо «самі з вусамі». Можа быць, калі б пісьменьнік Сяргей Балахонаў зьвярнуўся да гісторыкаў і пры іх удзеле аднавіў бы кожны рух, гук, пах губернскага Менску, а потым у рамане «Імя грушы» выказаў падзяку за тое, што яны дапамаглі яму *адчуць* горад, то крытыкі не наракалі б, што Менск Балахонава «не выявіўся» (Жукоўскі Д. «Вылоўліванне ідэй з паветра» // ARCHE. 2006. № 3).

Баяя «старамодны». Такім калісьці выглядаў Гарэцкі ў вачах «маладнякоўцаў». Аўтар «Зваўчэньня» верыць у лёс і ў тое, што «ўсё складаецца разам, бо нічога не бывае такім, якім яно падаецца». У канцы твору галоўная гераіня Маркета, дачка лесьніка, якая з маленства верыла ў тое, што жывёлы маюць розум і здольныя на сьвядомыя ўчынкі («Глядзіце! – крыкнула яна. – Павук прывязаў ваш ровар да нашага плота!»), выпадкова забівае Ваўка, а потым на некалькі хвілінаў абменьваецца сваёй існасьцю, снамі і ўспамінамі з Ваўчыцай. Гэта каштуе Маркеце жыцьця. Яна робіцца Ваўчыцай, яе забіваюць («У пацямнелых вачах яе таялі рэшткі бурштыну. Куля патрапіла ёй у лоб, струменьчык крыві гусьцеў і засыхаў»). Але ж Ваўчыца, якая вяртаецца ў лес да сваіх дзяцей, цяпер больш чым жывёла, – старая Эстэр Патакава бачыць, як яна бяжыць праз сад, іншым разам падымаючыся на заднія лапы і галосячы.

«Зваўчэньне» – ня проста раман-ілюстрацыя папулярнай у сусьветным мастацтве тэмы «ваўкалацтва» («перасяленьне душаў» – таксама адна з спрадвечных беларускіх літаратурных тэмаў, якая была «закладзена» Янам Баршчэўскім).

Яна – пра Чалавека на ўлонньні Прыроды і «ваўчыныя міты», якія Ваўчыца-маці апавядае на ноч маленькім ваўчаняткам. Пра тое, што ў людзкіх сэрцах знаходзіць водгук і легенда пра сьвятых Францішка і Кляру, і язычніцкія прымхі і галашэньні. Пра тое, што «ў пачатку ўсёй музыкі быў сьмех і плач». Пра тое, што ў Лёсу – вочы бурштынавага колеру.

Раман Баяя ўтрымлівае ўсё, чаго прагне сасьмяглая беларуская душа. Ніхто не забараняе нам пакаштаваць вады з гэтай

крыніцы.

Цікава, ці чытаў «Зваўчэньне» Пташнікаў?
[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/08/06
[image]